4-2008

# ARCHE

пачатак

4-2008




ARCHE 4 (67)
красавік 2008

ARCHE ПАЧАТАК 4-2008

**Навуковы, навукова-папулярны, грамадзка-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс «ARCHE Пачатак» выдаецца зь верасьня 1998 году штомесяц.**

**РЭДАКЦЫЯ:**

**Валер Булгакаў** — галоўны рэдактар
**Віктар Жыбуль** — рэдактар
**Алена Казлова** — сакратарка рэдакцыі
**Аляксандра Макавік** — рэдактар
**Сяргей Макарэвіч** — распаўсюднік

**ARCHE is a Partner of European Cultural Journals Network Eurozine (www.eurozine.com).**

**Адрас для допісаў:** ARCHE, а/с 3, 220018, Менск-18.
**E-mail:** arche@arche.org.by.

Гэты нумар выходзіць ахвярнасьцю Міхася Баяроўскага (Вялікабрытанія).

Часопіс можна замовіць у распаўсюднікаў:

**Баранавічы** — Руслан Равяка, п/с 13, 225409, Баранавічы-9, тэл. (029) 767-20-37.

**Барысаў** — Алег Лучына, п/с 714, 222120, Барысаў-1, тэл. (029) 33-99-161.

**Берасьце** — Ігар Бараноўскі, тэл. (0162) 25-61-55.

**Віцебск** — Барыс Хамайда, тэл. (0212) 34-52-41.

**Гомель** — Ларыса Шчыракова, тэл. (029) 341-66-94.

**Полацак** — Алесь Аркуш, тэл. (0214) 41-85-19.

**Магілёў** — Алесь Асіпцоў, тэл. (0222) 25-57-85, (029) 625-57-85.

**Менск** — Сяргей Макарэвіч, тэл. (029) 505-39-11.

Шукаем распаўсюднікаў зь іншых мясьцінаў.

**Падпіска на часопіс «ARCHE Пачатак» прымаецца ўва ўсіх аддзяленьнях «Белпошты».**

**Заснавальнік:** Андрэй Дынько.
**Выдавец:** установа «Рэдакцыя часопісу «Архэ-Пачатак».
Пасьведчаньне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 530 ад 4.05.2001.
ISSN 1392-9682
**Юрыдычны адрас:** вул. Нававіленская 24/1А, каб. 2П, 220053, Менск.
Цана дамоўная.

Рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе рукапісаў. Рэдакцыя рэдагуе матэрыялы, прынятыя да друку.

Падпісана ў друк 18.04.2008.
Выход у сьвет 28.04.2008. Фармат 70х100 1/16.
Друк афсэтны. Гарнітура Школьная. Ум. друк. арк. 15,5.
Наклад 500 асобнікаў. Замова

Надрукавана з гатовых дыяпазытываў заказчыка ў друкарні ТАА «Палікрафт», вул. Кнорына, 50, 220103, Менск.

У афармленьні першай старонкі вокладкі выкарыстаная мапа Ёганэса Буцыюса (Johannes Bucius) «Europa Regina» (каля 1537). Дызайн Ягора Шумскага.

© «ARCHE Пачатак», 2008

**Падпісны індэкс 00345**

**ARCHE on-line:** http://arche.org.by

4-2008

ARCHE

П А Ч А Т А К

4-2008

## ЗЬМЕСТ

**АНАЛІТЫКА**

5 **ПЁТРА РУДКОЎСКІ** Новыя аблічча ненавіснай апазыцыі

15 Блеф як тавар шантажысцкай дзяржавы. Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»

**ЭСЭІСТЫКА**

27 **ДЗЯНІС МЕЛЬЯНЦОЎ** Навошта Беларусі ўступаць у Эўрапейскі Саюз?

33 **ЯЎГЕН МІРАНОВІЧ** Ці патрэбна Беларусь Эўропе?

43 **АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ** Эсэ пра беларусаў

**КРЫТЫКА**

47 **ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ** Да Беларусі праз Эўропу. Лягічны шлях расейскамоўных лібэралаў

55 **ДЗЬМІТРЫ КАРЭНКА** Эўрапейская пэрспэктыва Беларусі: неабходнасьць камунікацыі і пошуку агульных падставаў

68 **УЛАД НАВІЦКІ** Постсавецкія тэарэтыкі ў віры інтэлектуальнай глябалізацыі

78 **АЛЕСЬ ПАШКЕВІЧ** Плянка для беларускіх гісторыкаў новага пакаленьня?

97 **АНДРЭЙ ПАЧОБУТ** Польскі супраціў (1939—1954) вачыма беларускіх гісторыкаў

**ПАЛЕМІКА**

104 **ІГАР МАРЗАЛЮК** «Адраджэнская» гістарыяграфія: хлусьня з дапамогай гістарычных фактаў

**ГІСТОРЫЯ**

108 **АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ** Урады БНР і кабінэт Рамана Скірмунта

**АНАЛІТЫКА**

127 **ЭНДРУ ЎІЛСАН** Крамлёўская «апэрацыя «Пераемнік 2.0»

143 **ПІРЭТ ЭХІН** Палітычная падтрымка ў краінах Балтыі (1993—2004)

**ЛІТАРАТУРА**

164 **ЛЮБКО ДЭРЭШ** Культ (частка 1)

**РЭЦЭНЗІІ**

232 **ПАВАЛ УСАЎ** Тры канцэпцыі беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці

4-2008 ARCHE ПАЧАТАК 4-2008

# CONTENTS


**ANALYSES**

5 **PIOTRA RUDKOŬSKI** New Faces of the Odious Opposition

15 Round Table. Bluff as a Face of a Blackmailer State. ARCHE's Round Table

**ESSAYS**

27 **DZIANIS MIELJANCOŬ** Why Should Belarus Join the EU?

33 **JAŬHIEN MIRANOVIČ** Does Europe Need Belarus?

43 **ALAKSIEJ BACIUKOŬ** Essay On the Belarusians

**CRITICISM**

47 **VITAL SILICKI** To Belarus Via Europe. A Logic Path for Russian-Speaking Liberals

55 **DŹMITRY KARENKA** Belarus' European Prospect: A Need for Communication and Search for Common Grounds

68 **UŁAD NAVICKI** Post-Soviet Theorists in the Whirlpool of Intellectual Globalization

78 **ALEŚ PAŠKEVIČ** A Limit For Belarusian Historians of the New Generation?

97 **ANDREJ PAČOBUT** Polish Resistance (1939—1954) through the Eyes of Belarusian Historians

**DEBATE**

104 **IHAR MARZALUK** «Nativist» Historiography: Lies Through Historic Facts

**HISTORY**

108 **ANATOL SIDAREVIČ** Belarusian People's Republic Governments and Raman Skirmunt's Cabinet

**ANALYSES**

127 **ANDREW WILSON** Meeting Medvedev: the Politics of the Putin Succession

143 **PIRET EHIN** Political Support in the Baltic States, 1993—2004

**LITERATURE**

164 **LUBKO DERESH** The Cult (Part I)

**REVIEWS**

232 **PAVAŁ USAŬ** The Three Concepts of National Identity

ПЁТРА РУДКОЎСКІ

# Новыя аблічча ненавіснай апазыцыі

Публікацыі, якія згадваюцца ў артыкуле:

Максимов, Андрей. *Дима Железниченко как зеркало несостоявшейся «васильковой революции»* // Белорусская военная газета. 2008. 30 января.

*Адкрыты ліст старшыні Партыі БНФ да галоўнага рэдактара «Белорусской военной газеты»* // Белорусская военная газета. 2008. 6 февраля.

*Кому же подражает БНФ?* // Белорусская военная газета. 2008. 6 февраля.

Brzeziecki, Andrzej, Nocuń, Małgorzata. *Ograbiony naród. Rozmowy z intelektualistami białoruskimi.* Wrocław: Kolegium Europy Wschodniej, 2008.

Шевцов, Юрий. *Гуманитарная опп. корпорация как структурный аналог исламистов 80-х* // http://guralyuk.livejournal.com

90-я ўгодкі свайго сымбалічнага нараджэньня Беларусь адзначыла драматургічна. У конадзень Дня Волі «Советская Белоруссия» заінтрыгавала даволі станоўчай ацэнкай Беларускай Народнай Рэспублікі і міралюбным пасылам: «Не следует «приватизировать» идеи БНР». А на наступны дзень надышла разьвязка інтрыгі: дзясяткі зьбітых, сотня арыштаваных і асуджаных, тысячы брутальна разагнаных — вось так міліцыя з спэцназам баранілі «ідэю БНР» ад «прыватызацыі». Інакш кажучы, дыскусія дыскусіяй, а дубінка — па распарадку.

***Пётра Рудкоўскі** — філёзаф, багаслоў, ляўрэат прэміі «ARCHE» «За сумленнае слова» (2005). Апошняя кніжка — «Паўстаньне Беларусі» (Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007). Аўтарская назва тэксту — «Старыя і новыя легенды пра «беларускі нацызм».*

Але апроч «дубінкі Паўлічэнкі» існуе іншая дубінка, прызначэньне якой — атакаваць душу. Прапаганда. Інфармацыйныя маніпуляцыі. Чорныя легенды.

Гэтыя легенды і будуць аб’ектам гэтага артыкулу.

## 1

У студзені гэтага году з Гомельскага ўнівэрсытэту быў адлічаны студэнт-выдатнік Зьміцер Жалезьнічэнка. Амаль адразу яго прызвалі ў войска. Зьміцер адмовіўся прымаць прысягу і заявіў, што ня будзе выконваць загадаў, калі яны будуць давацца не па-беларуску. Гэта, здаецца, першы выпадак, калі беларускай вайсковай сыстэме кінуты такі сур’ёзны выклік.

**Казус Жалезьнічэнкі — першы выпадак, калі беларускай вайсковай сыстэме кінуты такі сур’ёзны выклік**

Казус Жалезьнічэнкі стварыў нагоду афіцыйным ідэолягам яшчэ раз прадставіць сваю нарацыю пра «фашыстоўскую сутнасьць» беларускага адраджэнскага руху, «мудрасьць народу», якая адкінула яе, і бездакорную палітыку Першага Прэзыдэнта, гаранта ісьціны і парадку. Гэта нарацыя да болю ўжо знаёмая, яна сотні разоў пракручвалася прапагандысцкай машынай і паводле свайго зьместу, стылістычных прыёмаў ды рытарычных фігураў характарызуецца бэтоннай стабільнасьцю. Але на гэты раз здарылася нешта яшчэ: вось, прадстаўніку «фашыстоўскай сутнасьці», Лявону Баршчэўскаму, дазволілі загаварыць на старонках «Белорусской военной газеты».

Тое, што «Белорусская военная газета» не пашкадавала першай паласы (з працягам на апошняй) на тое, каб адрэагаваць на казус Жалезьнічэнкі, а пазьней, пасьля публікацыі адкрытага ліста Лявона Баршчэўскага, узмацніла прапагандысцкі наступ на беларускі нацыянальны рух, сьведчыць, бадай, пра тое, што гэты казус атрымаў немалы рэзананс унутры беларускага войска, прычым рэзананс гэты быў яўна не на карысьць паноўнай ідэалёгіі. Ня выключана, што паводзіны Зьмітра, які не пабаяўся кінуць выклік, — прычым ідэйны выклік аднаму з наймагутнейшых дзяржаўных інстытутаў, выклікалі зацікаўленьне і, магчыма, прыхаваныя аплядысмэнты ў шэрагах узброеных сілаў. Вось чаму рэжымныя рупары пасьпяшаліся адразу ляпіць вобраз хлопчыка, які «закапризничал», «пачаў свае парадкі ўводзіць» і выявіўся «ахвярай гульняў нацыяналістычных сілаў».

«Гульням нацыяналістычных сілаў» адведзена асобнае месца ў гэтым прапагандысцкім наступе. Нагадаем (знаёмыя нам ужо з часу «Дзяцей хлусьні») яго тыповыя прыёмы:

*1) Для белорусской оппозиции главными героями и, собственно, духовными предтечами были и остаются коллаборационисты...* — і гэтак далей.

*2) В июне 1942 года генеральный комиссар Беларуси В. Кубе сказал, что немецкие власти постановили разрешить белорусам организовать корпус самообороны для борьбы с партизанщиной. Белорусы должны занять видное место в этой войне и показать, что они готовы бороться за новую Европу,* — цытуе аўтар (Андрэй Максімаў) Ф. Кушаля. І ад сябе дадае: *Беларусь — в Европу… — любимый лозунг оппозиции и сегодня*, пасьля чаго рытарычна пытае: *Какие здесь нужны ещё комментарии?*

*3) А тем временем,* — узрушана працягвае Максімаў, — *из 9 миллионов жителей наша страна потеряла каждого третьего… Гитлеровцы уничтожили 2 миллиона 220 тысяч человек, 380 тысяч угнали в рабство, более 800 тысяч бойцов и командиров Красной Армии — белорусов погибли на фронтах Великой Отечественной войны,* — і дадае: — *Мы ничего не забыли...*

**Рыторыка, пры дапамозе якой атаясамліваецца гітлераўская і сучасная Эўропа, — гэта вяршыня прымітывізму.**

А ўсё ж такі вы нешта забылі, спадару Максімаў! Адносна (3) вы забыліся паставіць пытаньне, які працэнт спасярод гэтых 2 220 000 быў зьнішчаны хвалёнымі вамі партызанамі, забылі згадаць, колькі вёсак было спаленых фашыстамі ў выніку *партызанскіх* акцый, гэтаксама як забыліся падумаць, чаму беларускія салдаты гінулі ў Берасьцейскай крэпасьці пры поўным бязьдзеяньні тагачаснага «бацькі» — Ёсіфа Сталіна.

Што тычыцца (2), то тут і сапраўды ніякіх камэнтароў ня трэба. Стасаваньне рытарычных прыёмаў, пры дапамозе якіх імплянтуецца атаясамліваньне гітлераўскай Эўропы і сучаснай Эўропы, — гэта вяршыня (дакладней, нізасьць) прымітывізму.

У выпадку (1) камэнтар усё ж такі патрэбны. Перадусім трэба было б разабрацца, што ў гэтым выпадку значаць словы «коллаборационист», «духовная предтеча» і «белорусская оппозиция».

Інтэрпрэтацыя слова «калябарацыянізм» залежыць ад інтэрпрэтацыі паняцьця «сталінскія рэпрэсіі 1930-х гг.», у выніку якіх Беларусь страціла найлепшых сваіх пісьменьнікаў, навукоўцаў, грамадзкіх і дзяржаўных дзеячаў. Хоць, магчыма, Сталін не дацягнуў да паказчыка «1 : 4» (пэўна, калі б не вайна, то лёгка дацягнуў бы, а то й перагнаў бы), але затое ў вынішчэньні беларускага народу дасягнуў лепшых посьпехаў, чым Гітлер, бо зьнішчыў менавіта *эліту*. Сутнасная дыскусія над «калябарацыянізмам» 1940-х можа пачацца толькі і толькі тады, калі Максімаў (і ягоны рэдактар) адкажа на пытаньне: *як ён ацэньвае сталінскую палітыку 1930-х гг. у дачыненьні да Беларусі?* Калі гэтая ацэнка адназначна станоўчая, то тут трэба спыніць дыскусію, бо яна ня мела б сэнсу. Сталінская эпоха — гэта сэрыя брутальных злачынстваў супраць чалавецтва, таму кожны, хто падтрымлівае сталінізм, павінен несьці крымінальную адказнасьць, як тое дзеецца на Захадзе ў дачыненьні да гітлерызму.

Калі ж Максімаў прызнае злачыннасьць сталінізму і ведае пра генацыдную палітыку Сталіна 1930-х гг. у дачыненьні да Беларусі, то тады дыскусію можна прадоўжыць. Што ж, уявім цяпер беларусаў-патрыётаў, якіх не пасьпеў яшчэ зьнішчыць Сталін, якія апынаюцца ў агні Другой сусьветнай вайны і бачаць, з аднаго боку, Карычневага тырана, а з другога боку — Чырвонага тырана. І што б вы зрабілі, спадар Максімаў? Пайшлі б ваяваць «За Беларусь» пад камандаваньнем Сталіна? Таго самага Сталіна, якому напляваць было на беларусаў амаль цэлы тыдзень пасьля 22 чэрвеня, калі гітлераўцы імгненна акупавалі адзін за другім абшары нашай зямлі? Таго Сталіна, чые рукі яшчэ ня высахлі ад крыві нашых слаўных продкаў? А можа, вам напляваць на беларускую зямлю і на нашых продкаў?

**Максімаў, як і большасьць прапагандыстаў, паводзіць сябе як тыповы сэктант-інтэрпрэтатар.**

Спадзяюся, што не. А калі так, то давайце прадоўжым узнаўленьне рэаліяў таго часу. Калі ты бачыш з двух бакоў аднолькавых паводле сваёй «велічы» тыранаў, то якая думка можа да цябе прыйсьці? У такой сытуацыі натуральна будзе паставіць наступнае пытаньне: а ці ня ўдасца нейкім чынам выкарыстаць гэтую сытуацыю, каб зрабіць нешта карыснае сваёй зямлі? Выкарыстаць антыбальшавізм немцаў і антынацызм саветаў? Прыняць некаторыя правілы ворага, для таго, каб у зручны момант вызваліцца ад іх? Пачытайце трохі гісторыю і пераканайцеся, што такімі прыкладамі пазначаны лёс кожнага, бадай, народу. Змагаючыся супраць бабілёнскага ярма, ізраільцяне супрацоўнічалі з пэрсамі, змагаючыся супраць пэрскай няволі, супрацоўнічалі з грэкамі, змагаючыся з сэлеўкідамі, якія праводзілі палітыку элінізацыі, супрацоўнічалі з рымлянамі, каб праз нейкі час кінуць выклік таксама й Рымскай імпэрыі...

Можна, канечне, дыскутаваць і спрачацца, наколькі апраўданым было такое рашэньне тых беларусаў, якія вырашылі пайсьці на супрацоўніцтва зь немцамі, гэтаксама як і разважаць, ці не задалёка яны пасунуліся ў гэтым. Неабходна таксама дасьледаваць ідэалягічную скіраванасьць тых ці іншых дзеячаў ваеннай пары і высьветліць, ці былі ў іх сапраўды нацысцкія погляды. Калі былі, то трэба разабрацца, якія асобы ці якія арганізацыі былі правадніком нацызму ў беларускай вэрсіі. Ясна, што дзейнасьць тых беларусаў, якія *сапраўды* кіраваліся нацысцкімі ідэямі і якія зьдзяйсьнялі альбо бралі ўдзел у забойствах, матываваных такімі ідэямі, павінна быць асуджаная.

Максімаў, як і большасьць прапагандыстаў, паводзіць сябе як тыповы сэктант-інтэрпрэтатар. Хочучы даказаць якуюсь «ісьціну», ён цытуе, скажам, Біблію, вырываючы пры гэтым фразу з кантэксту і надаючы ёй якую заўгодна інтэрпрэтацыю. І калі чытач не абазнаны ў тэме, то можа «клюнуць» на довады сэктанта-дэмагога. Публіцыст, а ўсьлед за ім і рэдактар «Белорусской военной газеты», вырываюць пэўныя падзеі гісторыі з шырэйшага кантэксту, безь якога немагчымая іх адэкватная інтэрпрэтацыя.

Вось жа «калябарацыянізм» неабходна прачытваць у кантэксьце сталінскага тэрору і палітыкі Сталіна ў часе вайны. Неабходна таксама высьветліць намеры

і ідэйную скіраванасьць тых ці іншых «калябарантаў», а ўжо потым выносіць вэрдыкт, хто здраднік, а хто патрыёт.

Пасьля гэтых заўвагаў наконт «калябарацыянізму» можна перайсьці да пытаньняў наконт інтэрпрэтацыі выразаў «духовная предтеча» і «белорусская оппозиция». Як Максімаў, так і рэдактар «БВГ» трактуюць «апазыцыю» як групу духоўных насьледнікаў «фашыстоўскіх калябарацыяністаў». У іхных тэкстах я знайшоў толькі два «доказы» таго, што паміж апазыцыяй і «калябарацыяністамі» існуе сутнасная повязь. Першы: апазыцыя выкарыстоўвае бел-чырвона-белы сьцяг і герб «Пагоня» і другі: апазыцыя выступае зь лёзунгам «У Эўропу!». Пачаткова здавалася, што існуе яшчэ трэці доказ: выкарыстоўваньне беларускай мовы. Лявон Баршчэўскі ў сваім допісе таксама выказаў такое ўражаньне, але рэдактар «БВГ» пасьпяшаўся запярэчыць і назваў гэта выдумкай Баршчэўскага. Ну, што ж, хай так будзе, значыць, застаюцца толькі два «доказы».

**Прадстаўнікі беларускай сыстэмы абароны характарызуюцца дылетантызмам.**

Прыкра, канечне, усьведамляць, што прадстаўнікі такой ключавой для Беларусі інстытуцыі, як сыстэма абароны, характарызуюцца такім узроўнем дылетантызму. Няўжо ж Максімаў са сваім рэдактарам нідзе не чыталі, што бел-чырвона-белы сьцяг з «Пагоняй» зьявіліся як сымбалі беларускага адраджэньня тады, калі ніякага фашызму яшчэ не было? Нават калі і прыняць крайне радыкальны тэзіс, што ўсе «калябарацыяністы» былі сапраўды здраднікамі і «отпетыми» нацыстамі, то і ў гэтым выпадку застаецца незразумелым, якая тут віна беларускіх нацыянальных сымбаляў, што паўсталі безь якога-кольвечы ўдзелу фашыстаў? Можа, давайце забаронім нямецкую мову як сымбаль фашызму? Чаму менавіта нейкі адзін адрэзак часу (1941—1945) узяты публіцыстамі «БВГ» пад увагу для вызначэньня сэмантыкі згаданых сымбаляў? Тут адно з двух: альбо маем дачыненьне з гістарычным дылетантызмам, альбо атрафіяй лягічнага мысьленьня. Альбо, цалкам магчыма, і тым і тым.

## 2

Нядаўна ўнутры ідэалягічнага істэблішмэнту зьявілася іншая вэрсія генэалёгіі беларускай апазыцыі. Павал Якубовіч, шэф «Советской Белоруссии», у інтэрвію журналістам польскага «Tygodnika Powszechnego» назваў беларускіх апазыцыянэраў... нэасталіністамі! Толькі тут ужо не было спасылак ані на сымболіку, ані на лёзунгі, былі толькі згадкі пра тое, што ў шэрагах апазыцыі ёсьць апэтыты на Беласточчыну... Ну што ж, тут адразу дзьве тэзы падлягаюць лягічнаму аналізу:

1) *апазыцыя мае тэрытарыяльныя прэтэнзіі да суседніх дзяржаваў* (у прыватнасьці — да Польшчы);

2) *кожны, хто мае тэрытарыяльныя прэтэнзіі да суседніх дзяржаваў, зьяўляецца нэасталіністам.*

У той час, як (1) зьяўляецца сафізматам індукцыі (лягічнай заганай, што палягае ў нацягненым абагульненьні), то (2) — гэта нешта на мяжы прастацкай аўтаэкспрэсіі. Паміж тэрытарыяльнымі прэтэнзіямі і быцьцём нэасталіністам няма аніякай лягічнай сувязі.

Рэч, аднак, у тым, што за гэтай прастацкасьцю Якубовіча хаваецца далёка пасунутая сафістыка. Якубовіч нездарма ў размове з палякамі выкарыстоўвае кляймо «нэасталіністаў» (а не, як прынята «дома», «фашыстаў» альбо «нацыстаў») у дачыненьні да апазыцыі і нездарма пазыцыянуе сябе як ахвяру камуністычнага рэжыму. Клеймаваньне апазыцыі як «нэасталіністаў» мае на мэце стварыць уражаньне, што лукашэнкаўскі рэжым, які рэпрэзэнтуе Якубовіч, дыстанцыюецца ад камуністычнай мінуўшчыны. Для палякаў, якія прывыклі лічыць Лукашэнку пераапранутым камуністам, гэта і сапраўды будзе на мяжы сэнсацыі.

**Клеймаваньне апазыцыі то «фашыстамі», то «нэасталіністамі» маскіруе рэальную прысутнасьць як фашызму, так і нэасталінізму ўнутры беларускага істэблішмэнту.**

Што ж, трэба прызнаць, што гэта быў неблагі прапагандысцкі ход, хоць тут Якубовіч трохі перастараўся. У той час, як ягоны аповед пра сваё гаротнае жыцьцё ў савецкі час месцамі выглядае даволі пераканаўча, вельмі кідаецца ў вочы яго нарцысізм і прапагандысцкі запал. Празьмернае і неаднаразовае акцэнтаваньне таго, што «каліноўцы», якіх Польшча спансуе, быццам бы носяцца з ідэяй забраць Беласточчыну, вельмі яскрава дае адчуць, што суразмоўца выступае тут у ролі бессаромнага дыскрэдытатара. Такія прыёмы маглі б спрацаваць у выпадку праварадыкальнай аўдыторыі, але ня той аўдыторыі, якая станецца спажыўцом кнігі «Rozmowy z białoruskimi intelektualistami» Малгажаты Ноцунь і Анджэя Бжазецкага, дзе і зьявілася гэтае інтэрвію зь Якубовічам.

## 3

Як бачым, вобраз «фашыста», пры дапамозе якога зьдзяйсьняецца дэмаралізацыя апазыцыі, ужо не адзіны ў дзяржпрапагандзе. Цяпер можна называць апазыцыянэраў «нэасталіністамі», «камуністамі» альбо проста «саветамі». Вось такі ў нас забаўны плюралізм. Застаецца, аднак жа, нязьменнай вярхоўная догма дзяржаўнага веравучэньня:

Якубовіч (у інтэрвію з Ноцунь і Бжазецкім): *Лукашэнка — гэта збаўца Беларусі*;

Максімаў (у цытаваным артыкуле): *Белорусский народ сделал свой выбор в 1994 году. С избранием Президентом Республики Беларусь А.Г. Лукашенко возвращены символы и смыслы самого яркого события XX века — Победы советского народа в Великой Отечественной войне.*

Такім чынам, калі апазыцыя ўмудрылася быць «фашысцкай» і адначасова «нэасталінісцкай», то Аляксандар Лукашэнка, трэба меркаваць, умудрыўся быць вялікім антыфашыстам і адначасова вялікім антысталіністам. Вось якая цікавая канфігурацыя ідэалёгіяў...

Абсурдныя спаборніцтвы ў клеймаваньні апазыцыі то «фашыстамі», то «нэасталіністамі» маскіруюць *рэальную прысутнасьць* элемэнтаў як фашызму, так і нэасталінізму ўнутры беларускага істэблішмэнту. Беларусь зьяўляецца, бадай, адзінай краінай, дзе ёсьць нешта такое, як «Лінія Сталіна», і адзінай, дзе забаранілі паказ брытанскага фільму «Гітлер: узыход д'ябла». У Беларусі каторы год дзейнічае расейская фашыстоўская арганізацыя «Русское национальнае единство», добра вядомая сваімі сэрыйнымі злачынствамі, раскрыцьцё якіх аказваецца не па зубах праваахоўным органам. Дзейнічае таксама шэраг іншых рухаў антысэміцкага і панславісцкага характару (усе пагалоўна выступаюць ад імя расейскай нацыі) — як, напрыклад, «Славянские соколы». Дзесьці ад 1997 г. назіраецца нарастаньне антысэміцкай прапаганды ў дзяржаўнай прэсе, радыё і тэлебачаньні. Згадаць хаця б публіцыстыку А. Малашка і У. Акулава, якія на старонках «Славянского набата» (27 лістапада — 3 сьнежня 1997 г.) апантана выкрывалі «реакционную сущность сионистского капитализма», атаясамліваючы яго з... фашызмам.

Ваяўнічым антысэмітам свае старонкі ласкава даюць выданьні «Белорусская нива», «Личность», «Знамя юности». Апошнюю газэту, дарэчы, адмыслова пахваліў за «патрыятызм» вядомы ў Беларусі антысэміт і ксэнафоб, дэпутат Нацыянальнага сходу, член Камісіі па міжнародных справах Сяргей Касьцян. Часам брудныя антысэміцкія міты зьяўляліся ў тэлепраграме «Сущность», а 8 сакавіка мінулага году слухачы беларускага радыё змаглі даведацца, што «сионские мудрецы стремятся уничтожить православие» ды ўвогуле ўсю славянскую цывілізацыю[1].

Адно шчасьце, што на чале найбольшай беларускай газэты «Советская Белоруссия» стаіць чалавек, дзякуючы якому яна ня стала антысэміцкай. Хоць дасьледнікі заўважаюць, што антысэміцкія тэксты праточваліся і на яе старонкі. А як жа не праточвацца, калі сам прэзыдэнт, прамаўляючы ў Бабруйску, прыкмеціў:

*Если вы были в Бобруйске, вы видели, в каком состоянии город? Страшно было зайти, свинушник был. Это в основном еврейский был город, вы знаете, как евреи относятся к месту, где они живут. Посмотрите в Израиле, я вот был… Я ни в коем случае не хочу их обидеть, но они не очень заботятся, чтобы подстрижена трава была, как в Москве, у россиян, белорусов.*

«Нельга, канечне, назваць гэта выказваньне вяршыняй аратарства», — пракамэнтаваў яго Павал Якубовіч, спрабуючы ўлагодзіць скандал. Так, спадару Яку-

[1] Болей пра антысэмітызм у Беларусі можна даведацца з артыкулу: Мельцер Давид. Будет ли конец юдофобству в Беларуси? // http://www.vestnik.com/issues/98/0804/win/melts.htm.

бовіч, нельга гэтага назваць вяршыняй аратарства, гэтаксама як нельга запярэчыць, што вы, рэалізуючы свае амбіцыі, ублыталіся ў сыстэму, унутры якой квітнеюць ксэнафобія, славянафашызм і антысэмітызм. Тут рэч зусім не ў аратарстве...

Вось так, панове, існуюць, з аднаго боку, легенды пра «беларускі нацызм», а з другога боку — факты пранікненьня ў беларускую дзяржаўную сфэру элемэнтаў расейскага славянафашызму.

## 4

Варта ўвагі тое, што легенды пра «беларускі нацызм» карыстаюцца попытам таксама па-за сфэрай беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі. Напрыклад, вядомы камэнтатар Юры Шаўцоў у сваім *Live Journal* любіць часам «выкінуць» пропаведзь вось такога, напрыклад, зьместу:

**Павал Якубовіч ублытаўся ў сыстэму, унутры якой квітнеюць ксэнафобія, славянафашызм і антысэмітызм.**

*Когда такое, как наша опп-корпорация, выстроенное на ложных основаниях сообщество начинает влиять на политику — что это? Это новый вид «нацизма» — политические и культурные движения, развившие антиобщественную идеологию в дозволенных обществом социальных формах, с перспективой легально взять кое-где и власть?*

Нягледзячы на тое, што слова «нацызм» тут узятае ў двукосьсе, а сказ канчаецца пытальнікам, з кантэксту вынікае, што Шаўцоў і сапраўды ўспрымае «нашу опп-корпорацию» (гэта значыць, апазыцыю) як нацысцкую структуру. У гэтай «опп-корпорации» камэнтатар выкрывае «*игровую идентичность плюс сектантскую нетерпимость к иному мнению*». Тым часам беларускі «рэжым» (слова «рэжым» ён зноў чамусьці бярэ ў двукосьсе) характарызуецца «неигровой идентичностью» і заключае хаўрусы толькі зь «неигровыми идентичностями» (ці не інтрыгуе вас сэмантыка словаў «неигровая» versus «игровая» ідэнтычнасьць?). А што тычыцца тых «игровых», дык гэта

*даже не коррупционная система. Это не просто «секта» и не просто «игра». Это — своего рода язва внутри самого европейского социального организма.*

А зь якой прычыны беларуская апазыцыя — гэта «язва»? Чытайма:

*Это сообщество атакует под прикрытием борьбы с режимом или точнее в ходе борьбы с режимом саму основу европейской идентичности — принцип рационального анализа, гуманизм, проверямость вывода фактом, универсальную мораль, систему европейской безопасности, право личности на частную жизнь и т. д. Все, что попадает в сферу внимания и влияния этой антисистемы, атакуется на уровне самого отношения к реальности и к жизни.*

Тут амаль кожная фраза па-свойму вартая ўвагі, але мяне, як чалавека, які займаецца мэтадалёгіяй навук, найбольш заінтрыгавала вось гэтая:

*Это сообщество* (беларуская апазыцыя. — **П. Р.**) *атакует* (...) *проверяемость вывода фактом*.

З-за гэтай фразы, прызнаюся вам, я нават трапіў у крыху няёмкую сытуацыю. Я чытаў гэты допіс Шаўцова, седзячы ў бібліятэцы. Калі пачаў аналізаваць у думках сэнс прыведзенай тут фразы, дык у пэўны момант папросту не стрымаўся ад сьмеху, і людзі пачалі на мяне азірацца. Якім чынам можна заатакаваць «*проверяемость вывода фактом*»? У прыватнасьці, як *палітыкі* могуць гэта заатакаваць???

**Юры Шаўцоў успрымае апазыцыю як нацысцкую структуру.**

«Правяральнасьць высваду фактам», інакш, прынцып вэрыфікацыянізму/фальсыфікацыянізму, палягае ў тым, што калі існуе 1) *дэдукцыйна кагерэнтная сыстэма*, зь якой можна лягічна вывесьці 2) *вывад сьцьвярджальнага характару*, то павінна існаваць 3) *мноства фактаў*, эмпірычна даступных, якія б уяўлялі стан рэчаў, апісваны гэтым вывадам. Прыступ сьмеху найшоў на мяне, калі я паспрабаваў уявіць, якім чынам беларускія апазыцыянэры атакуюць «прынцып правяральнасьці выводу фактам». Ну, зьбіраюцца, скажам, Лябедзька, Калякін, Вячорка і іншыя «язьвеньнікі» і прымаюць рашэньне... пісаць навуковы трактат, у якім будзе аспрэчаны прынцып вэрыфікацыянізму/фальсыфікацыянізму. Пускаюць пыл у вочы заходнім донарам, выбіваць грошы і сядаюць за працу. Напісаўшы трактат, апазыцыянэры выяжджаюць у Эўропу і пачынаюць яго там распаўсюджваць, умудраючыся пры гэтым зрабіць выгляд, што «змагаюцца з рэжымам». Увесь гэты працэс «вайны з прынцыпам правяральнасьці» старанна назірае Шаўцоў, каб урэшце зрабіць у ЖЖ сэнсацыйную заяву: *беларуская апазыцыя атакуе прынцып правяральнасьці фактаў*! Магчымы і іншы варыянт. Паколькі галоўнымі прыхільнікамі прынцыпу правяральнасьці былі нэапазытывісты і Карл Попэр, то беларускія апазыцыянэры, езьдзячы па Эўропе і пускаючы пыл у вочы эўрапейцам, зьбіраюць кнігі нэапазытывістаў і Карла Попэра, а потым вяртаюцца ў Беларусь і гэтыя кнігі паляць...

Абсурдныя вобразы? Можа і так, але я, прабачце, больш ня ведаю, як яшчэ можа заатакаваць «правяральнасьць выводу фактам» беларуская апазыцыя. У любым выпадку, гатовы паабяцаць Шаўцову куфаль добрага піва, калі ён мне раскажа, якім чынам можна эмпірычна праверыць *ягоныя* вывады. Давайце іх па пунктах тут пералічым:

беларуская апазыцыя

1) *атакует саму основу европейской идентичности*;
2) *атакует принцип рационального анализа*;
3) *атакует гуманизм*;

4) *атакует проверяемость вывода фактом* (самае цікавае!);
5) *атакует универсальную мораль*;
6) *атакует систему европейской безопасности*;
7) *атакует право личности на частную жизнь и т. д.*;
8) *все, что попадает в сферу внимания и влияния этой антисистемы, атакуется на уровне самого отношения к реальности и к жизни*.

Што ж, спадару Шаўцоў, чакаем ад вас «проверяемости вывода фактом»!

* * *

Сёлетні сакавік яшчэ раз паказаў, наколькі глыбокі і сур'ёзны раскол у грамадзтве. Паказаў таксама, што не БНР зьяўляецца ідэйным прататыпам лукашэнкаўскай дзяржавы. Крыніцай дзяржаўнасьці РБ зьяўляецца СССР, безь якога-кольвечы «Б». Сёньняшняя Рэспубліка Беларусь — гэта мініятурная савецкая дзяржава, арыентаваная на савецкі народ і ўфармаваная савецкімі ідэаламі. Ну і крыху адаптаваная да новых умоваў.

**Асновай унутранай еднасьці беларускага рэжыму зьяўляюцца чорныя легенды і чорна-белы сьветапогляд.**

Гэтак, як і ў выпадку савецкай дзяржавы, асновай унутранай еднасьці беларускага рэжыму зьяўляюцца чорныя легенды і чорна-белы сьветапогляд. Культ лідэра становіцца элемэнтам самазахаваньня, дэманізацыя апанэнтаў — найвышэйшым маральным абавязкам, гвалт над сумленьнем — прыкрай неабходнасьцю. Жыве Беларусь! — гэта фашызм, слава Сталину! — гэта пік дэмакратыі.

Чорныя легенды, як паказвае гісторыя, раней ці пазьней зьнішчаюць сваіх стваральнікаў. Нянавісьць і хлусьня спараджаюць масу ўнутраных супярэчнасьцяў, з-за якіх легенды сыходзяць у нябыт, а іхныя прапагандысты адыходзяць у цень гісторыі.

# АНАЛІТЫКА

# Блеф як тавар шантажысцкай дзяржавы

У круглым стале, які адбыўся 2 красавіка, узялі ўдзел сурэдактар сайту «Наше мнение» **Валерыя Касьцюгова**, дырэктар Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў **Віталь Сіліцкі**, незалежны экспэрт Янаў Палескі і галоўны рэдактар «ARCHE» **Валер Булгакаў**.

**Валерыя Касьцюгова**: Наша сёньняшняя задача — абмеркаваць камбінацыю падзеяў, якія адбыліся ў кантэксьце актуальнага «дыялёгу» Менску з Захадам. І тым самым паспрабаваць выявіць нейкую сувязь паміж унутранай і замежнай палітыкай Беларусі. Разгон дэманстрантаў падчас сьвяткаваньня Дня Волі, рэйды супраць журналістаў замежных СМІ, санкцыі супраць амэрыканскай амбасады — гэта нейкія скаардынаваныя дзеяньні, падначаленыя агульнай лёгіцы, альбо аўтаномныя падзеі, што проста супалі ў часе?

**Валер Булгакаў:** Сувязь паміж гэтымі працэсамі існуе. Сьпярша ціск быў аказаны Злучанымі Штатамі Амэрыкі. Я маю на ўвазе санкцыі супраць «дачок» і бізнэс-партнэраў «Белнафтахіму», зарэгістраваных у ЗША. Гэта рашэньне азначае, што ў выпадку іх супрацоўніцтва зь «Белнафтахімам» амэрыканскі ўрад будзе прымаць супраць іх штрафныя меры. Чаму гэта было ўспрынята так балюча з боку беларускіх уладаў — калі прыкладна 1 % беларускага экспарта прыпадае на ЗША і 40 % —— на Эўрапейскі Саюз? Мы ведаем, што ў геапалітычных, каштоўнасных арыентацыях ЗША і ЭС вельмі часта выступаюць як адзінае цэлае. Больш за тое, Злучаныя Штаты задаюць тэмп і тон замежнай палітыкі Эўрасаюзу — і беларускі рэжым сур’ёзна заклапаціўся, што ЭС пасьледуе прыкладу ЗША.

Валер Булгакаў:
**Злучаныя Штаты задаюць тэмп і тон замежнай палітыкі Эўрасаюзу.**

Чаму так было зроблена? Беларускія ўлады неканвэнцыйнымі сродкамі ствараюць новую прастору для дыялёгу. Адбываюцца кропкавыя ўдары супраць ценявога сэктару грамадзянскай супольнасьці, беспрэцэдэнтныя па сваім публічным водгуку, канфіскоўваецца тэхніка, кнігі і офісныя прылады. Але адначасова нікога не затрымліваюць, хоць людзі пасьля выклікаюцца ў ГБ на допыты. Такім

чынам Захаду як бы даюць зразумець: калі будзе працягнуты курс на канфрантацыю, грамадзянская супольнасьць і яе інфраструктура будуць знаходзіцца пад пастаянным ударам. Чаму, напрыклад, 27 сакавіка адбывалісяператрусы, а 28-га міністар замежных спраў С. Мартынаў заявіў, што Беларусь гатовая да канструктыўнага дыялёгу са Злучанымі Штатамі? Не сакрэт, што прадметам гэтага дыялёгу ці таргоў можа быць захаваньне статус-кво, які існаваў да лістапада 2007 г. Без заходніх рынкаў Беларусь ня здольная забясьпечыць сацыяльнай стабільнасьці і эканамічнага росту. Таму я ня думаю, што гэтыя захады могуць перажыць яшчэ большую кульмінацыю — напрыклад, пачнуцца судовыя працэсы, фігуранты якіх будуць асуджаныя на вялікія тэрміны. Але трымаць у падвешаным стане гэты грамадзянскі ценявы сэктар беларускі рэжым можа…

Віталь Сіліцкі: **Беларускі рэжым быў шантажысцкім з самага пачатку і практыкаваў шантаж нашмат раней, чым Кучма.**

Акрамя гэтага я хацеў бы правесьці паралель з украінскім рэжымам часу Кучмы, які амэрыканскі палітоляг Кейт Дардэн (Keith A. Darden) назваў «шантажысцкім». Пры Кучму рэпрадукцыя аўтарытарных тэндэнцыяў у краіне забясьпечвалася раўнавагай страху сярод эліты, найперш існаваньнем кампрамату на алігархаў, палітычных лідэраў і г. д. — кампрамату, якім можна было іх шантажаваць. Тое самае мы бачым сёньня ў Беларусі, якая ператвараецца ў шантажысцкую дзяржаву. Бо тое, што адбываецца на нашых вачах, — гэта шантаж заходняй палітычнай супольнасьці.

**Віталь Сіліцкі:** На мой погляд, беларускі рэжым быў шантажысцкім з самага пачатку і практыкаваў шантаж у тым сэнсе, у якім казаў Дардэн, нашмат раней, чым Кучма. Бо ў нас з 1995 г. пачаўся адбор людзей на дзяржаўныя пасады паводле прынцыпу існаваньня кампрамату. Паглядзіце фільм Хашчавацкага «Звычайны прэзыдэнт» — там былыя паплечнікі Лукашэнкі пра гэта шмат апавядаюць.

Віталь Сіліцкі: **Сёньня рэжыму, каб забясьпечыць сваё існаваньне, трэба дамаўляцца з больш шырокім колам актараў, чым гэта было дзесяць гадоў таму.**

Што тычыцца сувязі паміж замежнай і ўнутранай палітыкай беларускай улады, то я б адзначыў некалькі акалічнасьцяў.

Па-першае, у апошнія гады адбылася дзіўная інтэрнацыяналізацыя беларускай эканомікі — у тым сэнсе, што яна адбылася дзякуючы ня зьменам у самой беларускай эканоміцы, але дзякуючы тэндэнцыям у навакольным асяродзьдзі. Пашырэньне ЭС, уздаражэньне нафты і г. д. вядуць да новай палітычнай эканоміі рэжыму. З гледзішча палітычнай эканоміі аб'ектам удару быў абраны «Белнафтахім». Пасьля вядомых падзеяў у расейска-беларускіх адносінах Беларусі патрэбная гульня на Захадзе, але, на мой погляд, уся яна цалкам вытворная ад гульні на Ўсходзе.

Па-другое, сёньня рэжыму, каб забясьпечыць сваё існаваньне, трэба дамаўляцца з больш шырокім колам актараў, чым гэта было чатыры-пяць, дзесяць гадоў таму. Тады можна было амбасадараў выкінуць з амбасадаў — і нічога… У параўнаньні з дыпляматычным скандалам вакол Драздоў сёньняшні не выглядае вельмі вострым. У той жа час, калі рэжыму трэба дамаўляцца з больш шырокім колам гульцоў на замежнай арэне, колькасьць гульцоў, зь якімі рэжым дамаўляецца на ўнутранай арэне, значна зьнізілася. Палітычная канкурэнцыя ў нас існуе толькі паміж групамі ўлады, з аднаго боку, а з другога — існуе дысыдэнцкі супраціў… Ува ўмовах, калі аўтарытарная ці таталітарная краіна залежыць ад зьнешняга ўплыву (як залежаў Савецкі Саюз, які сам сябе накарміць ня мог і купляў пшаніцу за мяжой), дачыненьні з дысыдэнтамі ператвараюцца ў абменную фішку ў гульні. Што мы цяпер і назіраем у Беларусі.

Янаў Палескі:
**Апошні час беларускай замежнай палітыкі стала болей.**

**Янаў Палескі:** Паколькі я ня бачу ў выступах сваіх папярэднікаў таго, што называецца памылкамі, я папросту згадаю пра некаторыя тэхнічныя аспэкты шантажнай палітыкі. Раней нам (то бок, ня толькі мне) ужо даводзілася гаварыць, скажам, пра «стаўкі адмовы». У прыватнасьці, выгнаньне амэрыканскага амбасадара — гэта стаўка адмовы, такая стаўка, якой нібыта даводзіцца ахвяраваць, каб угода адбылася. У сапраўднасьці ж вядзецца пра гандаль пагрозамі. Выганяючы амбасадара канкрэтнай краіны, беларускія ўлады зусім не разьлічваюць на тое, што ён ніколі больш ня вернецца. Наадварот, яны мяркуюць, што вернецца, але пры гэтым адбудзецца фактычная дамоўленасьць пра тое, што будуць зьнятыя тыя ці іншыя санкцыі ў абмен на ягонае вяртаньне, бо ў такім вяртаньні, як тут мяркуюць, дадзеная краіна вельмі зацікаўленая. Магчыма, ня моцна зацікаўленая — тады лягічна выкарыстоўваць больш шырокі спэктар ставак адмовы, улучна з рэпрэсіўнымі захадамі супраць замежных СМІ. Ці мала дзе спрацуе? Такім чынам, гандаль ідзе ў такім маятнікавым рэжыме: выстаўляюцца стаўкі адмовы, канфлікт даводзіцца да пункту кіпеньня, да кульмінацыі, калі да простага сутыкненьня, здавалася б, застаецца зусім крыху, пасьля чаго ціск пара зьніжаецца, і далей, калі ўгода сяк-так адбылася — лёгкая эўфарыя і рэляксацыя да наступнага раўнду гульні.

Што ж тычыцца ўзаемасувязі замежнай і ўнутранай палітыкі, то сувязь гэтая больш ці менш відавочная, паколькі замежная палітыка Беларусі — у дактрынальных і тэхналягічных адносінах — дагэтуль ня склалася і ў строгім сэнсе зьяўляецца працягам унутранай. Можна сказаць іначай: замежная палітыка — гэта набор сродкаў (даволі выпадковых), якія дазваляюць давесьці ўнутраную палітыку да пэўнай дактрынальнай і тэхналягічнай цэльнасьці. Дастаткова ацаніць сам мэханізм ажыцьцяўленьня, так бы мовіць, замежнапалітычных ініцыятываў: правесьці перамовы з Захадам, гэта, у існасьці, выступіць на старонках дзяржаўных СМІ, якія, як мяркуюць у нас дома, там, за даляглядам актыўна чытаюць. Іншая рэч, што — тут я шмат у чым пагаджуся зь Віталем — у апошні час бела-

рускай замежнай палітыкі стала болей. Беларускі рэжым стаў усьведамляць пэўныя складанасьці міжнароднай палітыкі і комплекснасьць зьвязаных зь ёй камбінацыяў, а таксама комплекснасьць уласнага сувэрэнітэту і, адпаведна, залежнасьцяў — так што ў замежнай палітыцы Беларусі стаў праглядацца нейкі сэнс. Гэтага сэнсу стала болей. Раней мы выганялі ўсіх заходніх амбасадараў на знак абурэньня і толкам ня ведалі, што з гэтай сытуацыі можна займець. Сёньня мы выганяем амэрыканскага амбасадара, разьлічваючы вярнуць яго на месца, і практычна дакладна ведаем, чаго мы хочам дамагчыся. У найлепшым выпадку — адмены санкцыяў супраць «Белнафтахіму», у горшым — хаця б непашырэньня санкцыяў. Гэта ўжо, як сказана, шантажная палітыка, то бок штосьці, што мае пэўную лёгіку.

Янаў Палескі:
**Іміджавыя страты маюць вялікае значэньне, бо перад рэжымам стаіць задача прыцягненьня значных крэдытных і інвэстыцыйных сродкаў.**

**В.К.:** Калі падвесьці рысу пад першым турам, то, наколькі я зразумела, удзельнікі гутаркі згодныя з тым, што дыялёг працягваецца — у тым ліку з дапамогай разгону дэманстрацыяў, рэйдаў супраць СМІ і націску на амбасаду ЗША.

**В.С.**: Дыялёг — гэта не абавязкова абмен ласкамі. Як кажуць, дыялёг перайшоў на падвышаныя тоны.

**В.К.:** А якая мэта падобнага дыялёгу? Калі верыць беларускаму МЗС, мэта ягоная — адмена санкцыяў супраць «Белнафтахіму». Ня так даўно мы зь Віталем абмяркоўвалі гэтую праблему і прыйшлі да высновы, што такая мэта пры выкарыстаньні акурат такіх сродкаў вядзеньня дыялёгу практычна недасяжная…

**В.С.**: Я паспрабую растлумачыць. І крыху папраўлю. Сам «Белнафтахім» і санкцыі супраць яго не зьяўляюцца галоўнай мэтай дыялёгу. Існуе шмат шляхоў пазьбегнуць санкцыяў альбо абысьці іх абсалютна бязбольна — мы з адным маім сябрам селі і налічылі сямнаццаць такіх шляхоў. Напрыклад, хто перашкаджае «Белнафтахіму» стварыць структуру «Я & Я International», як любіць казаць Міхал Залескі? «Белнафтахім» прадае нафту па сабекошце «Я & Я International», а потым «Я & Я International» выходзіць на сусьветны рынак і прадае яе каму заўгодна, не трапляючы пры гэтым пад санкцыі. Як вынік, гутарка ідзе не пра фінансавыя, а пра іміджавыя страты.

З другога боку, сэнс супрацьстаяньня ў тым, каб прадэманстраваць Расеі, Захаду і ўнутранаму спажыўцу: Лукашэнку не зламаць, з намі такімі мэтадамі нічога не зробіць. Акрамя практычнага тут ёсьць вялікі іміджавы сэнс. Глядзіце: уводзіліся новыя і новыя візавыя санкцыі, замарожваліся актывы вядучых чыноўнікаў — і ўсё праглынулі. У мяне тады сустрэчнае пытаньне: чаму цяпер? Існуе вэрсія, што цяпер іх гэта балюча ўдарыла. Я ня думаю, што вельмі ўдарыла. Але ж чаму цяпер беларускія ўлады пайшлі на канфлікт?

**Я.П.:** Згодны з тым, што вялікае значэньне маюць іміджавыя страты — асабліва на фоне таго, што перад рэжымам стаіць задача прыцягнуць значныя крэдытныя і інвэстыцыйныя сродкі. Аднак апроч гэтай мэты, увядзеньне санкцыяў,

наколькі мы ведаем «клясычную» лёгіку тых, хто іх уводзіць, мае і іншую агульнавядомую мэту — зьнякровіць канкрэтную дзяржаву, аслабіць палітычны рэжым. Я, такім чынам, спрабую вярнуцца на папярэдняе кола. Можна доўга казаць пра эфэктыўнасьць санкцыяў, але ў бальшыні выпадкаў амэрыканцы дамагаліся гэтай мэты даволі пасьпяхова: так быў аслаблены рэжым Садама Хусэйна, зьнякроўлены рэжым Мілошавіча. Праўда, эфэктыўнасьць санкцыяў — і нават іх функцыянальнасьць — заўсёды пад пытаньнем у зьвязку з, так бы мовіць, заключным акордам. Калі заключны акорд ёсьць — у прыватнасьці, ужываньне вайсковай сілы, тады сьвет якраз і бачыць, што санкцыі эфэктыўныя, што па той бок тэлевізійнай харызмы Хусэйна альбо Мілошавіча няма нічога моцнага, надзейнага і вартага павагі. Іншая рэч, што наконт гэтага фінальнага дзеяньня, ці гэта вайсковая апэрацыя, ці выступ апазыцыі, вельмі цяжка дасягнуць кансэнсусу — прычым, ня толькі эўрапейскім з амэрыканскімі палітыкамі, але амэрыканскім з амэрыканскімі. Карацей, я хацеў бы сказаць, што разнастайныя санкцыі супраць беларускага рэжыму ў любым выпадку наносяць яму адчувальную шкоду, і гэтая шкода з часам нарастае.

Янаў Палескі: **Разнастайныя санкцыі супраць беларускага рэжыму ў любым выпадку наносяць яму адчувальную шкоду, і гэтая шкода з часам нарастае.**

**В.С.:** Кропля камень точыць.

**Я.П.:** Так. Давайце прасочым гісторыю санкцыяў супраць грамадзянскай супольнасьці з боку ўлады на працягу апошніх дзесяці-дванаццаці гадоў. Што мы бачым? Кропля камень точыць.

**В.К.:** У мяне невялікі дадатак з нагоды адчувальнасьці санкцыяў у дачыненьні да «Белнафтахіму». Я мяркую, што гэта ўдар ня проста па дзяржаўным бізнэсе, гэта ўдар па бізнэсе, арганізаваным пэўным чынам. Як будуецца дзяржаўны бізнэс у Беларусі? Пад шыльдай «Белнафтахіму» дзейнічае пэўная колькасьць прадпрыемстваў, якія вырабляюць матэрыяльныя каштоўнасьці, то бок тавары. Вытворцы гэтыя тавары маглі б і самі прадаваць, але «дзяржаўны бізнэс» не дазваляе гэтага рабіць. Мэты дзяржаўнага канцэрну выключна ў тым, каб жыць коштам прадпрыемстваў-вытворцаў. Дзяржаўны канцэрн накшталт «Белдзяржхарчпраму» альбо «Белнафтахіму» — гэта своеасаблівы пасярэднік. З аднаго боку, гэта пасярэднік паміж: а) беларускімі прадпрыемствамі, у якіх ён набывае прадукцыю па «ўнутраных», то бок навязаных ім жа самім цэнах; і б) сусьветнымі і рэгіянальнымі рынкамі, дзе гэтая прадукцыя прадаецца па «сусьветных» цэнах. З другога боку, гэта пасярэднік паміж урадам і прадпрыемствамі, які даводзіць да іх заданьні ўраду, у тым ліку што да росту вытворчасьці, інвэстыцыйных і падатковых адлічэньняў і пытаньняў цэнаўтварэньня. І я бачу пасланьне, зьмешчанае ў санкцыях, менавіта так: цяпер весьці бізнэс звыклым для нас чынам будзе складана. І найбольш адэкватны адказ на санкцыі — гэта зусім не стварэньне яшчэ адной пераразьмеркавальнай гіпэрструктуры. Гэта вяртаньне беларускім вытворцам, у якіх «Белнафтахім», як правіла, не валодае буйнымі долямі ўласнасьці, іх «натуральнага» права весьці

гандаль самастойна.

**Я.П.:** Тут дарэчы нагадаць гісторыю з «Інфабанкам», санкцыі супраць якога былі ўведзеныя пасьля ірацкай кампаніі. Гэты банк у свой час валодаў эксклюзіўным правам абслугоўваньня ўгодаў на Блізкім Усходзе. Пасьля ўвядзеньня санкцыяў банк, па-першае, давялося перайменаваць (схема Віталя Сіліцкага), і, па-другое, прадпрыемствам (гэта пераважна вядомыя вытворцы аўтамабіляў і трактароў) дазволілі адкрываць валютныя рахункі ў розных банках адначасова (схема Валерыі Касьцюговай). Беларускім бокам быў усталяваны крыху больш вольны рэжым гандлю ў гэтым рэгіёне. Так што ўсё нармальна — у тым сэнсе, што санкцыі так ці іначай працуюць. Яны фармуюць пэўную сыстэму стымулаў, ігнараваць якія сабе даражэй. Мы можам гаварыць пра ўзрастаньне трансакцыйных коштаў.

**В.С.:** Сапраўды, павышаюцца кошты вядзеньня дзяржаўнага бізнэсу. І калі мы кажам пра тое, што беларуская эканоміка інтэрнацыялізуецца, то страты — іміджавыя, фінансавыя, прамыя, непрамыя — вылазяць у розных кірунках. Разнастайныя санкцыі павялічваюць страты, і калі рэжым ідзе на нейкія саступкі, гэта паказвае, што санкцыі працуюць. Гэтаксама, калі Лукашэнка выпускае палітычных вязьняў і замест гэтага нешта атрымлівае, то гэта як бы працуе. Значыцца, палітычных закладнікаў можна браць і надалей. Баўгарскія мэдсёстры...

**В.Б.:** Японскі палітоляг Кімітака Мацузата назваў Лукашэнкаў рэжым «выспай папулізму ў акіяне кланавай палітыкі». На яго думку, выжывальнасьць лукашэнкаўскага рэжыму моцна залежыць ад узроўню жыцьця і спажываньня ў суседніх дзяржавах. У гэтым сэнсе сытуацыя для рэжыму сёньня даволі драматычная. Сацыяльна-эканамічная сытуацыя ў трох суседніх дзяржавах-членах Эўрасаюзу значна лепшая, чым у Беларусі; разьбежка паміж сярэдняй зарплатай у Беларусі і ўва Ўкраіне імкліва меншае; сярэдняя зарплата ў Расеі на 30—40 % большая, чым у нас. Увядзі яшчэ санкцыі і павяліч гэтую разьбежку — і сыстэма нават знутры, гэта значыць людзямі, якія атаясамліваюць сябе зь ёй, будзе ўспрымацца як неэфэктыўная. Урэшце выходзіць, што рэжым блякуе канкурэнцыю, у прыватнасьці палітычную канкурэнцыю, дзякуючы чаму ўся сыстэма становіцца неканкурэнтаздольнай у рэгіянальным маштабе.

Заклопачанасьць гэтым назіраецца на самым версе. Нагадаю нядаўнюю нараду з удзелам прэм'ер-міністра Сідорскага, падчас якой было адзначана, што беларускія будаўнікі зарабляюць менш, чым будаўнікі ў суседніх краінах, таму масава выяжджаюць туды на заробкі.

Паралелі з Іракам, мне здаецца, ня вельмі ўдалыя, паколькі Блізкі Ўсход — іншая культурная і палітычная прастора. Прыклады польскай «Салідарнасьці» або прыбалтыйскіх нацыяналістычных рухаў савецкага часу нам бліжэйшыя. Іх базавым эканамічным лёзунгам, як і дэмсілаў канца 1980-х і пачатку 1990-х ва Ўкраіне, было цьверджаньне, што дэмакратычная трансфармацыя будзе азначаць рэзкі рост узроўню жыцьця. Час можа вярнуцца...

**Я.П.:** Заўвага не беспрадметная, хоць калі я праводзіў паралелі з Іракам, то меркаваў, што паралелі гэтыя ўмоўныя. Тым ня менш, я ўсё ж імкнуўся рабіць

акцэнты не на асаблівай культурнай прасторы, але на сіле ўзьдзеяньня, на эфэктах узьдзеяньня санкцыяў з гледзішча самаго ўзьдзеяньня. Вядома, што гэтыя санкцыі папярэднічалі фінальнай акцыі з удзелам вайсковай сілы і, нарэшце, апазыцыі. Напрыклад, у Югаславіі, апроч усяго іншага, былі падкупленыя многія дзяржаўныя функцыянэры альбо замарожаныя рахункі атачэньня Мілошавіча — то бок, у нейкі момант сябраваць з дыктатарам стала нявыгадна. І вось калі незадаволеныя людзі (а сьпярша іх было ня вельмі шмат) апынаюцца на вуліцы, то абараняць Мілошавіча няма каму.

**В.С.:** Падчас бамбаваньня людзі выйшлі крычаць «Мілошавіч, Мілошавіч!», а праз тры месяцы пачаўся поўны маральны ступар.

**Я.П.:** Яны маглі крычаць усё, што заўгодна, але ж рэч у тым, што бараніць парадак не было каму.

**В.Б.:** А чаму так адбываецца? Таму што ідзе маральная карупцыя або, дакладней сказаць, маральны расклад органаў правапарадку. Сёньня любяць гаварыць пра сацыяльныя кантракты. Як на мяне, асноўны сэнс дамовы Лукашэнкі з супрацоўнікамі органаў правапарадку наступны: калі вы будзеце бездакорна выконваць мае загады, то ваш дабрабыт будзе бесьперапынна ўзрастаць. Калі гэты рэжым пачне прабуксоўваць, і гэта будзе працягвацца ня месяц, ня два, а значна даўжэй, то паміж так званай праваахоўнай або рэпрэсіўнай сыстэмай і актарамі пераменаў, у тэрміналёгіі А. Вардамацкага, можа пачацца дыялёг…

**В.С.:** Давайце не пра гіпатэтычныя рэчы, а пра тое, што мы назіраем. Мы ўжо сказалі пра інтэрнацыяналізацыю беларускай эканомікі, пра сацыяльны кантракт, і цяпер мы пачынаем казаць пра зьмены ў паводзінах беларускай эліты. Сёньня да ўлады прыйшла новая генэрацыя службоўцаў, абслугі рэжыму, у якіх ужо іншыя запыты. Калі старая генэрацыя плявала б на візавыя санкцыі, бо ім і тут каўбасу добра есьці, то для новай генэрацыі важна мець замежныя рахункі. Мы ня вельмі добра пра ўсё гэта ведаем, але ж гэта закон сыстэмы. Проста кажучы, ёсьць катэгорыя службоўцаў, якія ўжо ня згодныя жыць так, як жылі ў 1990-я. Ізаляваная краіна — гэта ня іхны стандарт, нават калі прыняць да ўвагі расейскі фактар. Але каб трымаць сытуацыю пад кантролем старымі мэтадамі, неабходна пагадзіцца на вядомую ступень ізаляцыі, г. зн. наяўнасьць візавых санкцыяў і г. д. І мы ведаем, што прадстаўнікі пэўнага сэгмэнту ўлады спрабавалі стварыць парадак дня для лібэралізацыі — словам, адбываліся рэчы, якіх раней не было. У той жа час ёсьць сэгмэнт, які будзе трымацца да апошняга. Вось ён і паказаў сябе ў нядаўніх рэпрэсіўных акцыях.

**В.К.:** Калі сьпярша мы гаварылі пра рэпрэсіі як сродкі вядзеньня дыялёгу — з чым мы нібыта ўсе пагадзіліся, хоць і з засьцярогамі, то цяпер мы гаворым пра рамкі рэсурсаў, то бок рамкі заходаў і сродкаў, закліканых гэты дыялёг забясьпечваць. І гэтыя рамкі выяўляюцца дзесьці ў сфэры канкурэнтаздольнасьці нашых элітаў. Калі цяпер эліты не забясьпечваюць адпаведнага ўзроўню разьвіцьця ў рэгіянальным кантэксьце, то ім варта скарыстаць зь іншых сродкаў і іншых мэтадаў?

**Я.П.:** Альбо працягваць фармаваць такое інфармацыйнае асяродзьдзе, у якім

наша адставаньне ў рэгіянальным кантэксьце ня будзе заўважнае. Адсюль, прынамсі, вынікае, што ціск на незалежныя сродкі масавай інфармацыі мае ўзрастаць. Што, у прынцыпе, і адбываецца. Словам, трэба ствараць вялікую хлусьню — вялікую настолькі, каб неканкурэнтаздольнасьць беларускіх палітыкаў і адміністратараў ня кідалася ў вочы. Але гэта, ведаеце, вельмі складаная, рэсурсапажыральная задача.

**В.Б.:** Усё большае значэньне мае, калі так можна выказацца, тактыльная камунікацыя. Сярэдні беларус у два-тры разы больш наведвае краіны Эўрасаюзу, чым сярэдні расеец. Гэта азначае, што беларусы часьцяком засвойваюць інфармацыю пра перавагі і недахопы ўласнага і суседзкага жыцьця не на матэрыяле ідэалягічных пасланьняў, а на ўласным непасрэдным вопыце.

Янаў Палескі:
**Стварэньне вялікай хлусьні, каб неканкурэнтаздольнасьць беларускага рэжыму ня кідалася ў вочы, вельмі рэсурсапажыральная задача.**

**Я.П.:** Я б дадаў рост капіталізацыі ў галіне чутак. Пра гэта някепска неяк выказаўся Ўмбэрта Эка на матэрыяле Італіі часу Мусаліні. Вось і ў нас: адна рэч — сказалі па тэлеку альбо надрукавалі ў газэце, зусім іншая рэч — сусед паведаміў нягучным, але вельмі пераканаўчым голасам.

**В.К.:** Ці павінны мы яшчэ штосьці дадаць пра калідоры перамоўнага працэсу, у якім знаходзяцца ўлады? Што яны могуць сабе дазволіць, чаго ня могуць — ці можна нешта спрагназаваць у гэтым пытаньні? Якія пэрспэктывы дыялёгу?

**В.Б.:** Лукашэнкаўскі рэжым па-свойму рацыянальны, і цяпер, паводле лёгікі рэчаў, павінна быць вытрыманая паўза. Ужо сёньня можна сьцьвярджаць, што кантакты афіцыйнага Менску з Эўрасаюзам ня спыненыя, і, хутчэй за ўсё, ня будуць спыненыя ў найбліжэйшай будучыні. У выніку інтэрнацыялізацыі беларускай эканомікі рэжым абмежаваны ў выбары сродкаў узьдзеяньня на заходніх партнэраў па бізнэсе. Можна «наехаць» на структуры грамадзянскай супольнасці, на замежныя дыпляматычныя місіі і г. д., але немагчыма наяжджаць на іх тымі ж ламавымі мэтадамі, якія практыкаваліся ў выпадку з Драздамі.

Валер Булгакаў:
**У выніку інтэрнацыялізацыі беларускай эканомікі рэжым абмежаваны ў выбары сродкаў узьдзеяньня на заходніх партнэраў па бізнэсе.**

**Я.П.:** Ну, у выпадку з Драздамі наагул многае залежала ад часу. Раней Менск жыў у адпаведнасьці з дагандлёвай схемай «нафта ў абмен на пацалункі». Карацей, нейкі час таму рознага роду палітычныя і дыпляматычныя жэсты чагосьці каштавалі, і ў іх нібыта быў шчодры пакупнік. Цяпер ягоная шчодрасьць ужо ня тая, што раней. Адпаведна, колькасна і якасна мяняецца прапанова — гэта, напэўна, на карысьць тэзы аб агульнай рацыянальнасьці рэжыму?

**В.С.:** Усё гэта гульня — у тым ліку і бітва за расейскія фінансавыя, нафтавыя ды іншыя гранты. Іншымі словамі, у паводзінах прадстаўнікоў рэжыму, акрамя

рацыянальных аспэктаў, праглядаецца ірацыянальнае зерне, нават момант куражу. А што, калі паспрабаваць згуляць з Расеяй у такую гульню, у якой усякая спроба перавесьці ўзаемадзеяньне на рынкавыя рэйкі будзе выглядаць як падтрымка палітыкі ЗША? Мала таго, што мы з Амэрыкай ваюем, а вы тут нам яшчэ і цэны на газ падвышаеце!

**В.К.:** О так, для нашых кіраўнікоў такая гульня можа здасца цалкам прыдатнай.

**В.Б.:** Ня трэба пераацэньваць узьдзеяньня беларускага рэжыму на расейскую інфармацыйную прастору. Калі будзе працягвацца тое, што адбываецца цяпер…

**В.С.:** А што працягваецца цяпер? Адбываецца саміт НАТО, працягваецца дыскусія наконт уступленьня ў гэтую арганізацыю Ўкраіны і Грузіі. Вядома, яны ня ўступяць у НАТО, але гістэрыка будзе прыкметная. Інфармацыя пра канфлікт Беларусі і ЗША будзе разнастаіць расейскі інфармацыйны фон. Да яе ў Крамлі могуць не прыслухоўвацца, але такая інфармацыя будзе… Разумееце, гэта адна з гіпотэзаў, але яе ня варта скідаць з рахункаў. Зь іншага боку, для Расеі сёньня няма неабходнасьці біцца за Беларусь больш, чым, скажам, за Ўкраіну. Можна ня біцца — можна проста падкінуць яшчэ адзін нафтавы грант або яшчэ адзін крэдыт.

Віталь Сіліцкі:
**Гэта бітва за расейскія фінансавыя, нафтавыя і іншыя гранты.**

**В.К.:** Некаторыя экспэрты мяркуюць, што ўсе гэтыя дзеяньні беларускіх уладаў у адносінах эўрапейскіх СМІ і амэрыканскай амбасады — выключна тэатралізаванае прадстаўленьне для расейскага спажыўца. Андрэй Суздальцаў наагул мяркуе (тут, адзначу, прысутнічае асаблівая лёгіка), што існуе таемная змова паміж адміністрацыяй беларускага прэзыдэнта, эўрапейскімі структурамі і ЗША, мэта якой — прымусіць Расею і далей датаваць беларускі рэжым.

**Я.П.:** Вось як?

**В.К.:** Але, вось так. Але я гэта да чаго? Мы згаджаемся ў тым, што вайна — гэта форма камунікацыі, што дыялёг пры дапамозе мэтадаў, звыклых для беларускіх уладаў, — гэта, тым ня менш, дыялёг. Разам з тым нам — экспэртам, аналітыкам — цяжка прачытаць мэсыдж, закладзены ў гэтыя «дыялёгавыя» акцыі і сродкі. Мы нават ня можам сьцьвярджаць, што яны сапраўды маюць нейкае выразнае пасланьне. Але калі мы ў Беларусі ня вельмі добра чытаем гэтыя пасланьні, то хто іх чытае наагул, хто разумее гэтую мову?

**В.С.:** Ну чаму ж? Гэта як, ведаеце, сыцылійская мафія: спачатку здохлую рыбу дасылае, потым адрэзаны палец… Мне здаецца, што разгон людзей падчас Дня Волі — гэта больш-менш яснае пасланьне.

**В.Б.:** Наш рэжым — гэта ўсё ж ня сталінскі рэжым. Ён ня можа націскаць на пэдальку газу да ўпору. Калі мы згаджаемся ў тым, што ў рэжыму абмежаваны калідор магчымасьцяў (і калі ён выйдзе за межы гэтага калідору, то папросту ляжа), то апошнія рэпрэсіі можна расцаніць як свайго роду блеф. І гэты блеф досыць добра кладзецца ў кантэкст постсавецкай палітыкі. Гэты спэцыфічны блеф выступае ня гэтулькі ў ролі нейкага пасланьня, колькі сам пераўтвараецца

ў камэрцыйную прапанову, у тавар…

**Я.П.:** Як наагул фармуюцца стаўкі адмовы? Адна рэч, калі ў цябе ёсьць пазытыўная камэрцыйная прапанова, то бок тавар, на які, мяркуецца, ёсьць рынкавы альбо палітычны попыт. Іншая рэч, калі ў цябе нічога такога няма — і вось тады можна гандляваць гэтай пэўным чынам аформленай адсутнасьцю, ствараючы гэтым адпаведную прапанову. Напрыклад, калі некаторы час таму Менск і Кіеў гандляваліся з «Газпромам» наконт «транзыту», то пад цаной апошняга (і, адпаведна, пад цаной газавых паставак) разумелася «стабільнасьць транзыту», якая ў сваю чаргу азначала ўстрыманьне транзытных дзяржаваў ад спакусы незаконнага адбору расейскага газу з трубаў. Такое ўстрыманьне ў гэтай шантажысцкай лёгіцы павінна быць узнагароджанае. Такім жа чынам, свабода чалавека — гэта базавая каштоўнасьць, частка ягонага «натуральнага» грамадзянскага стану. У строгім сэнсе гэтая каштоўнасьць нічога не каштуе. Але калі пасадзіць чалавека за краты, то ягоная свабода, так бы мовіць, капіталізуецца. Зь ёй можна ажыцьцяўляць прыблізна тыя самыя апэрацыі, што і з капіталамі пазытыўнага кшталту, — інвэстыцыі, рэінвэстыцыі, абменныя апэрацыі ды інш. Напрыклад, можна абмяняць свабоду Казуліна на адкліканьне амэрыканскіх санкцыяў. У любым выпадку такі гандаль можа ісьці даволі доўга, хоць і не бясконца, паколькі на кожным вітку ўзровень ставак адмовы зьніжаецца: сьпярша патрабуюць адкліканьня ўсіх санкцыяў, потым — некаторых, потым — нерасшырэньня пераліку тых, што ўжо ўвялі…

**В.С.:** Такі гандаль можа працягвацца доўга яшчэ і таму, што ён далёка не заўсёды канчаецца актам угоды. Нейкі час я актыўна выкарыстоўваў тэрмін «прэвэнтыўны аўтарытарызм», які прыжыўся ў міжнароднай паліталёгіі. Лёгіка беларускага рэжыму ў тым, што ён заўсёды працаваў на апярэджаньне — ён душыў усё, што магло абярнуцца супраць яго. Але гэта ўжо, як Валер заўважыў, ня сталінскі рэжым. У 1940-я гг. расстрэльвалі, у 1970-я кідалі ў псыхушкі, сёньня прыходзяць з падатковай інспэкцыі. Гэта прагрэс.

**Я.П.:** Прагрэс чалавечага разьвіцьця альбо, паводле гэгелеўскай лёгікі, пераход да больш свабодных формаў рэпрэсіяў.

**В.С.:** Згодны, гэта гэгелеўская лёгіка. Але што адбываецца ў сытуацыі, калі сыстэма «прэвэнтыўнага аўтарытарызму» павінна працаваць на апярэджаньне і прэсынгаваць усё, што можна, але прэсынгаваць сёньня можна, як мы пагадзіліся, толькі да пэўнай мяжы? Пачынаецца працэс эрозіі сыстэмы. Але гэтая эрозія — зусім не лібэралізацыя, зь якой яе часта блытаюць, паколькі лібэралізацыя прадугледжвае скіраванасьць і палітычную волю. А для эрозіі ня трэба прымаць ніякіх рашэньняў, і яна можа нікуды ня весьці. Напрыклад, можна казаць пра тое, што рэжым Кастра перажывае эрозію, але яна працягваецца даволі доўга. І невядома, да чаго вядзе.

**В.К.:** Добра, але гэта калі гаварыць пра сыстэму як пра нешта цэлае. Калі разглядаць працэсы, якія адбываюцца апошнім часам у эканоміцы, а менавіта — адмену залатой акцыі, продаж часткі актываў замежным інвэстарам, прыкметную лібэралізацыю банкаўскага сэктару і г. д. — то можна меркаваць, што яны

маюць прыкметы больш ці менш сыстэмнай палітыкі. Ці не?

**В.С.:** Гэта зусім не лібэралізацыя, гэта эрозія. Гэта змушаныя саступкі тэрыторыі. Сыстэмная лібэралізацыя мае шмат узроўняў — гэта і зьмена ідэалёгіі, і падрыхтоўка маштабнай рэформы, і г. д. А продаж некалькіх банкаў — гэта яшчэ не рэформа.

**Я.П.:** Я болей скажу: калі мы нават прадамо ўсё заходнім інвэстарам, але пры гэтым ня будзе створаная, прыкладам, надзейная сыстэма правоў уласнасьці, то гэта нават прыватызацыяй назваць цяжкавата. Ня тое каб рэформай.

**В.С.:** Для мяне тыя працэсы, пра якія вы кажаце, якраз і ёсьць прыкметамі эрозіі. Вось калі ў эліты зьмяняюцца мэты — вось тады пачынаюцца сыстэмныя зьмены. Цяпер ува ўладзе знаходзяцца людзі, мэта якіх — заставацца каля руля да канца. Гэта значыць, гаворка ня проста пра зьмену ідэалёгіі. А тут мэты не зьмяняюцца, яны застаюцца старымі, у той час як рукі ўсё больш і больш зьвязаныя. Выходзіць, што трэба ісьці на нейкія саступкі, уводзіць у абарачэньне нейкія новыя практыкі, нацэленыя на вынік, які ў поўнай меры ўжо не дасягаецца.

Валер Булгакаў: **Я згаджуся з Лукашэнкам, які нядаўна заявіў, як гэта ні парадаксальна, што Расея сваімі дзеяньнямі ўмацоўвае беларускі сувэрэнітэт.**

**Я.П.:** Згодны з прапановай наконт эрозіі, паколькі сілы ў сыстэме не дадаецца... Здаецца. А ўсялякі таталітарны альбо аўтарытарны рэжым — гэта, у існасьці, рэжым пашыранага ўзнаўленьня рэпрэсіяў. І рэжым альбо расьце разам з рэпрэсіямі, альбо, як правіла, пасьля пэрыяду росту, пераходзіць у фазу эрозіі і распаду.

**В.К.:** Мы дастаткова доўга сёньня гаварылі, але на заканчэньне я хацела б вярнуцца да пытаньня, якое часта ўздымаецца. Ці падзеі апошняга часу ствараюць нейкія дадатковыя пагрозы беларускаму сувэрэнітэту — у прыватнасьці, калі мець на ўвазе расейскі фактар? Мо хай Валер выкажацца з гэтай нагоды?

**В.Б.:** Я лічу, што падобныя пытаньні кансэрвуюць стыль мысьленьня дзесяцігадовай даўніны. Гавару ня толькі пра палітыкаў, але і пра экспэртаў. Праблема ў тым, што ў нас парушаная камунікацыя паміж першымі і другімі, у выніку шматлікія прадстаўнікі эліты і контарэліты працягваюць існаваць у сьвеце знакаў, каштоўнасьцяў і ідэяў, папулярных на момант распаду СССР і раней. Падкрэсьлю, гэта ў вялікай меры тычыцца і апазыцыйнага лягеру.

Мяне сёньня гутаркі пра страту сувэрэнітэту ня тое што не чапляюць, а ўжо выклікаць ідыясынкразію. Небясьпека страты беларускага сувэрэнітэту ператвараецца ў парнаграфію: сярод эўрапейскіх палітыкаў бытуе погляд, што беларускі рэжым нельга сур’ёзна прэсынгаваць, паколькі гэта кіне Беларусь у абдымкі Расеі. І наадварот: расейская эліта баіцца моцна падымаць цэны на газ, паколькі гэта кіне яе ў абдымкі Захаду. Я згаджуся з Лукашэнкам, які нядаўна заявіў, як гэта ні парадаксальна, што Расея сваімі дзеяньнямі ўмацоўвае беларускі сувэрэнітэт.

Сувэрэнітэт — гэта не самамэта, а сродак выхаваньня палітычна актыўных

грамадзянаў, фармавання дзейнай грамадзянскай супольнасьці, эмансыпацыі грамадзянаў ад аўтарытарнай дзяржавы. Сувэрэнітэт ня зводзіцца да стварэньня і граніц, і іншых лініяў падзелу.

**В.К.:** Падвядзем рысу. Мы прыйшлі да парадаксальнай высновы, што апошнія рэпрэсіўныя дзеяньні ўладаў зьяўляюцца своеасаблівымі сродкамі вядзеньня дыялёгу. У прыватнасьці, дыялёгу з Захадам. Мы таксама пагадзіліся, што дыялёг гэты мае форму шантажнай палітыкі і дыпляматыі. Мне здалося, што даволі выразна прагучала думка пра тое, што гэты дыялёг ня столькі ўсьвядомленая ініцыятыва, колькі неабходнасьць, перад якой пастаўлены беларускі рэжым у сытуацыі абмежаваных рэсурсаў і абмежаваных выбараў. Нарэшце, прагучала думка аб зьмяншэньні зь цягам часу магчымасьцяў для рэпрадукцыі рэжыму, то бок ягонай эрозіі, прычым сама «дыялёгавая» сытуацыя можа трактавацца як яе сымптом.

*Занатаваў Янаў Палескі, пераклад выказваньняў Валерыі Касьцюговай і Янава Палескага на беларускую мову — рэдакцыі*

## ЭСЭІСТЫКА

ДЗЯНІС МЕЛЬЯНЦОЎ

# Навошта Беларусі ўступаць у Эўрапейскі Саюз?

Адкрыцьцё амбасады Эўрапейскага Саюзу, паступовае пацяпленьне стасункаў зь некаторымі эўрапейскімі дзяржавамі, павелічэньне таваразвароту з ЭС чарговы раз абуджаюць у пэўнай частцы беларускага грамадзтва надзею на эўрапейскую будучыню для нашай краіны, якая бачыцца найперш у пэрспэктыве сяброўства ў Эўрапейскім Саюзе. Такая прага Эўропы сталася для дэмакратычай супольнасьці беларусаў настолькі звыклай і натуральнай, што большасьць зь іх перастала задавацца пытаньнем пра мэтазгоднасьць гэткага кроку для краіны. У гэтым невялічкім эсэ я паспрабую паказаць, што пытаньне пра эўрапейскую інтэграцыю Беларусі зьяўляецца нашмат больш складаным, чым падаецца на першы погляд, і што на пачатку гэтага шляху мы мусім самім сабе адказаць на цэлы шэраг няпростых пытаньняў, каб потым не апынуцца там, дзе апынацца мы зусім не плянавалі.

### ІНТЭГРАЦЫЯ: ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ МОДА ЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ТРАДЫЦЫЯ?

Беларусаў апанавала мода на інтэграцыйны дыскурс. Бадай кожны выступ маладых і ня надта маладых незалежных і залежных беларускіх дасьледчыкаў падчас навуковых канфэрэнцыяў пачынаецца з фразы «Ва ўмовах глябалізацыі…» ці «Сусьветныя інтэграцыйныя працэсы патрабуюць…». І гэтак ня першы год. Палітычныя эліты постсавецкіх дзяржаваў гэтаксама схільныя пераацэньваць важнасьць працэсаў інтэграцыі ў міжнародных дачыненьнях, што можа быць вытлумачана фантомным болем, які застаўся пасьля распаду СССР. І хоць

***Дзяніс Мельянцоў*** *— аналітык Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў, сталы аўтар «ARCHE».*

прайшло багата часу, савецкая рэчаіснасьць паціху забываецца, разбудоўваюцца інстытуты новых незалежных дзяржаваў, усталёўваюцца міжнародныя стасункі, прага інтэграцыі не пакідае галовы і сэрцы людзей, што прымаюць палітычныя рашэньні, і тых, хто пра гэтыя рашэньні толькі марыць. Інтэграцыя гэтая можа быць разнавэктарная і нават шматвэктарная, але яна абавязкова прысутнічае ў публічным дыскурсе.

Інтэграцыю, як вядома, можна разумець двaіста: як збліжэньне паміж дзяржавамі ў розных сфэрах жыцьця, інтэнсіфікацыю эканамічных, палітычных, культурных і іншых сувязяў або як удзел у наднацыянальных аб’яднаньнях або арганізацыях, што прадугледжваюць абмежаваньне сувэрэнітэту ў пэўных галінах. У нашай частцы Эўропы дамінуе менавіта другое разуменьне інтэграцыі. Калі ўжо інтэгравацца, дык да канца. І калі не з Усходам, дык з Захадам. То бок з Эўропай. Але абавязкова інтэгравацца. Гэта дастаткова дзіўна для краінаў, якія толькі-толькі вызваліліся з аднаго інтэграцыйнага аб’яднаньня і дэкляруюць неабходнасьць захоўваць незалежнасьць і сувэрэнітэт.

Некаторыя беларускія дасьледчыкі сьцьвярджаюць пра наяўнасьць у беларускім мэнталітэце гэтак званай унійнай традыцыі, якая прымушае беларусаў, якія маюць небагатую на рэсурсы тэрыторыю і транзытнае геаграфічнае становішча, уключацца ў больш вялікія палітычныя канструкцыі, каб падвысіць узровень уласнай бясьпекі і дабрабыту. Такая рыса нашага мэнталітэту прымушае нас, у прыватнасьці, уступаць у адносіны неэквівалентнага абмену з Расеяй («газ у абмен на пацалункі») або дамаўляцца з Украінай пра мытны саюз.

Як бы там ні было, але інтэграцыйны вірус (або ген) прымушае нас шукаць кірунак для аб’яднаньня. Дэмакратычная супольнасьць пастанавіла: «Беларусь — у Эўропу».

## МАТЫВЫ

Ня мы першыя задаемся пытаньнем, навошта далучацца да Эўрапейскага Саюзу. Гэты шлях ужо прайшлі многія эўрапейскія нацыі, а некаторыя праходзяць яго цяпер. Але матывы далучэньня ў тых, хто ўжо там, крыху адрозьніваюцца ад матываў тых, хто яшчэ на парозе ці толькі зьбіраецца з духам пагрукаць у эўрапейскія дзьверы. «Старая» Ўсходняя Эўропа кіравалася на шляху эўраінтэграцыі наступнымі матывамі:

- далучэньне да заходняй цывілізацыі і рэалізацыя жаданьня «вярнуцца» ў Эўропу;
- уступленьне ў Арганізацыю Паўночнаатлянтычнай дамовы дзеля атрыманьня гарантыяў бясьпекі (у першую чаргу ад ЗША);
- канчатковы і незваротны выхад з расейскае сфэры ўплыву.

Палітычныя эліты (у выпадку Беларусі — контарэліты) краінаў «новай» Усходняй Эўропы маюць троху адрозныя матывы:

- канчатковае разьвязаньне праблемы геапалітычнай ідэнтычнасьці праз уваходжаньне ў эўраатлянтычныя структуры;

- завяршэньне працэсу фармаваньня нацыяў праз далучэньне да шматнацыянальнай Эўропы;
- выхад з расейскага культурнага і інфармацыйнага поля;
- паляпшэньне стану эканомік пры дапамозе датацыяў Эўрапейскага Саюзу;
- атрыманьне гарантыяў бясьпекі.

Як бачым, фундамэнтальная розьніца ў інтэграцыйных памкненьнях «старой» і «новай» Усходняй Эўропы палягае ў сфэры каштоўнасьцяў. Калі Польшча, Чэхія, Вугоршчына і іншыя дзяржавы апошніх дзьвюх хваляў пашырэньня цалкам падзялялі каштоўнасьці заходняй цывілізацыі і разглядалі «вяртаньне ў Эўропу» як самамэту і аднаўленьне гістарычнай справядлівасьці, то для Малдовы, Украіны і Беларусі інтэграцыя ў ЭС уяўляецца ў большай ступені інструмэнтам вырашэньня ўласных эканамічных і палітычных праблемаў.

Ні для каго не сакрэт, што Эўропа ў беларускага абывателя асацыюецца перадусім з эўрарамонтам і купюрай эўра, якая даражэйшая за даляр. Недалёка ад такога разуменьня адышлі і дэмакратычныя палітыкі, якія агітуюць электарат інтэгравацца з гэтай самай Эўропай. Яны мяркуюць, што дэмакратычная Эўропа стабілізуе за іх беларускую палітычную сыстэму, што заможная Эўропа падыме за іх беларускую эканоміку, што мультыкультурная Эўропа выратуе за іх беларускую мову і культуру, што бясьпечная Эўропа гарантуе за іх бясьпеку беларускіх грамадзянаў. Мабыць у гэтым ёсьць рацыя, але што да яе Эўрапейскаму Саюзу?

## КАШТОЎНАСЬЦІ, АБО ЭЎРОПА ЯК ПОСТМАДЭРНЫ КАНСТРУКТ

У якасьці прычынаў, паводле якіх ЭС абавязкова павінен далучыць да сябе Беларусь, прыводзяцца некалькі асноўных меркаваньняў. Па-першае, Беларусь геаграфічна знаходзіцца на эўрапейскім кантынэнце, і безь яе канчатковы праект эўрапейскай інтэграцыі ня можа быць завершаны; гэтаксама Беларусь гістарычна належыць да эўрапейскай цывілізацыі і мае далейшыя пэрспэктывы разьвіцьця толькі ў яе кантэксьце. Па-другое, Беларусь займае важнае геапалітычнае становішча, і кантроль над гэтай тэрыторыяй дае магчымасьць кантраляваць стратэгічны транзыт з Усходу на Захад. Па-трэцяе, інтэграцыя Беларусі мае важнае значэньне для бясьпекі аб'яднанай Эўропы, бо эўравыбар Беларусі аўтаматычна зьніжае бясьпеку Расеі, адначасова ўсталёўваючы кантроль над дастаткова значным паводле ўсходнеэўрапейскіх мерак вайсковым патэнцыялам.

Гэткая матывацыя мела б сэнс, калі б яна ўспрымалася як дастатковая рацыянальная ў самім Эўрапейскім Саюзе. Але палітычныя практыкі ЭС выразна нам дэманструюць, што там далёка не заўсёды кіруюцца патрабаваньнямі рэальнай палітыкі, а часта дзейнічаюць насуперак сваім стратэгічным інтарэсам. Абвяшчэньне незалежнасьці Косава яскравае таму сьведчаньне.

Прыклады апошніх пашырэньняў і перамоваў у межах палітыкі пашырэньня паказалі, што Эўрапейскі Саюз зьяўляецца постмадэрнісцкім канструктам,

які фармуецца на базе сумесных каштоўнасьцяў. Перадусім гэтымі каштоўнасьцямі зьяўляюцца правы чалавека, лібэральная эканоміка, дэмакратыя. Пры гэтым эканамічныя і геапалітычныя крытэры ёсьць другаснымі. Адпаведна, прыём новых сябраў адбываецца менавіта на падставе супольнай ідэнтычнасьці і падзяляных сумесных каштоўнасьцяў. Для ЭС цяпер ня важна, дзе геаграфічна разьмешчаная краіна-кандыдат і ці ўпісвалася яна ў эўрапейскую цывілізацыю сярэднявечча. Нашмат большае значэньне мае тое, ці датрымліваюцца ў ёй дэмакратычных стандартаў, і наколькі моцна яна хоча быць Эўропай. Беларусь сёньня ня мае ні таго, ні другога, і таму шлях у ЭС для яе закрыты. Ці будзе ён адкрыты ў будучым, такім чынам, ніяк не залежыць ад пастаянных якасьцяў самой краіны (геаграфія, гісторыя, этнічны склад і інш.), але залежыць толькі ад палітыкі ўраду гэтай самай краіны. Таму эўрааптымісты могуць спаць спакойна — усе мы там будзем. Пытаньне толькі ў тым, навошта нам гэта трэба?

## НАВОШТА НАМ ГЭТА ТРЭБА?

Пра моду на інтэграцыю я ўжо напісаў. Таму ў будучым нам ніяк не абмінуць маштабных і жорсткіх дэбатаў пра тое, ці трэба Беларусі далучацца да ЭС, і калі трэба, то навошта. Тут жа я паспрабую вельмі каротка і без прэтэнзіяў на паўнату пералічыць магчымыя выгады ад інтэграцыі.

Па-першае, далучэньне Беларусі да ЭС дазволіць гарантаваць далейшае дэмакратычнае разьвіцьцё краіны. Наднацыянальныя органы ЭС будуць выконваць ролю дадатковых супрацьвагаў для беларускай палітычнай сыстэмы. Эфэктыўнасьць такіх супрацьвагаў мы мелі магчымасьць назіраць на прыкладзе Аўстрыі некалькі гадоў таму.

Па-другое, сяброўства ў Эўрапейскім Саюзе дазволіць паправіць эканамічнае становішча, правесьці рэформы ў гаспадарцы, дасьць доступ да эўрапейскіх фондаў разьвіцьця. Як з розумам выкарыстаць магчымасьці, што надае ЭС, трэба будзе павучыцца ў Ірляндыі, якая за адносна невялікі прамежак часу ператварылася ў адну з найбагацейшых краінаў Эўропы.

Па-трэцяе, уступленьне ў ЭС дазволіць захаваць беларускую мову і культурную спадчыну, дасьць шанец пазьбегнуць канчатковай русіфікацыі, падключыўшыся да кардынальна іншай інфармацыйнай і культурнай прасторы, заснаванай на разуменьні важнасьці культурнай разнастайнасьці.

Па-чацьвёртае, сяброўства ў ЭС азначае канчатковы выхад са сфэры палітычнага ўплыву Расеі і далучэньне да эўраатлянтычных структураў бясьпекі. Іншымі словамі, Беларусь атрымлівае гарантыі бясьпекі ад Эўрапейскага Саюзу.

Можна пералічваць і далей, але, па вялікім рахунку, гэтыя выгады ад сяброўства ў ЭС зьяўляюцца найважнейшымі. Вядома, каб гэтыя выгады атрымаць, спачатку трэба нечым ахвяраваць. Напрыклад, прыняць іншыя (эўрапейскія) палітычныя і прававыя стандарты, адмовіцца ад часткі сувэрэнітэту ў прыняцьці ўнутрыпалітычных рашэньняў і інш.

## АДВАРОТНЫ БОК

Нельга забывацца, што ў любой зьявы ёсьць і адваротны бок. Ёсьць ён і ў Эўрапейскага Саюзу, нягледзячы на жаданьне многіх (у тым ліку і беларускіх дэмакратычных палітыкаў) бачыць у ім ідэал.

Галоўным выклікам для краіны-кандыдата зьяўляецца, безумоўна, неабходнасьць адмовіцца ад пэўнай часткі дзяржаўнага сувэрэнітэту на карысьць наднацыянальных органаў ЭС. На сёньняшні дзень гэтая частка сувэрэнітэту ўсё больш пашыраецца, ахопліваючы ня толькі эканоміку, але і ўнутраную палітыку і нават, часткова, замежную палітыку і бясьпеку. Калі для заходнеэўрапейскіх краін дэлегаваньне сувэрэнітэту адбылося вельмі паступова разам з разьвіцьцём самаго Эўрапейскага Саюзу, то новым краінам-кандыдатам прапануецца зрабіць гэта адначасна і ў большым памеры, чым гэта было на раньніх этапах пашырэньня Саюзу. Для Беларусі, якая толькі нядаўна атрымала дзяржаўную незалежнасьць і намагаецца (пакуль ня вельмі ўдала) пабудаваць эфэктыўныя дзяржаўныя інстытуты, сяброўства ў ЭС азначае пераход з адной залежнасьці ў іншую, хай сабе і не такую жорсткую.

Апрача гэтага, плата за сяброўства ў ЭС новых краінаў нашмат вышэйшая, бо яны ня ўдзельнічаюць у выпрацоўцы «правілаў гульні», а вымушаныя адаптаваць для сябе тыя тысячы старонак *aquis communitaires*, якія прыняў Эўрасаюз за час ягонага разьвіцьця. Гэта пакідае новым сябрам вельмі мала магчымасьцяў для манэўраў.

Колькі б там ні казалі пра роўнасьць і дэмакратыю ў ЭС, і там ёсьць краіны, якія раўнейшыя за іншых. Менавіта яны прымаюць рашэньні пра магістральныя кірункі разьвіцьця ЭС і кіруюць бягучай палітыкай, часта не прымаючы пад увагу інтарэсаў «малых» краінаў Эўропы. Прыклады, якія на слыху, — пабудова Паўночна-эўрапейскага газаправоду, сустрэча нямецкага амбасадара сп. Вайса з Лукашэнкам і інш.

Яшчэ адзін непрыемны момант, зь якім сутыкнуліся новыя сябры Эўрапейскага Саюзу, — гэта знакамітая брусэльская бюракратыя, якую некаторыя нават параўноўваюць з савецкай намэнклятурай празь яе інэртнасьць і непаваротлівасьць. Гэтая аграмадная машына перашкаджае хутка і эфэктыўна вырашаць надзённыя праблемы Саюзу — а на яе ўтрыманьне ідзе значная частка эўрасаюзаўскіх грошай.

Не спрыяе падвышэньню канкурэнтаздольнасьці ЭС і звышрэглямэнтацыя і зарэгуляванасьць тых сфэраў жыцьця, якія адносяцца да кампэтэнцыі цэнтру. Такі спосаб мэнэджмэнту ўсё больш і больш нагадвае плянавую эканоміку за саветамі. Дадайце сюды яшчэ й традыцыйна вялікія сацыяльныя адлічэньні ў большасьці эўрапейскіх краінаў, датаваньне сельскай гаспадаркі, і тады стане зразумела, чаму ЭС ня можа дагнаць ЗША па канкурэнтаздольнасьці…

Вялікую занепакоенасьць выклікае і праводжаная Эўрасаюзам і асобнымі яго сябрамі палітыка ў дачыненьні да мігрантаў — у прыватнасьці, з мусульманскіх краін і былых эўрапейскіх калёніяў. Ні для каго не сакрэт, што мігранты ўжо

цяпер утварылі колькасна значныя этнічныя меншасьці ў такіх краінах, як Вялікая Брытанія, Нямеччына, Францыя, Швэцыя. Гэтыя групы збольшага захоўваюць сваю культуру і не зьбіраюцца інтэгравацца ў грамадзтвы, якія іх прынялі. Больш за тое, усё часьцей чуваць галасы пра неабходнасьць палітычнага прадстаўніцтва гэтых іншаэтнічных груп і забесьпячэньне іх права разьвіваць сваю культуру і жыць паводле сваіх законаў. Пры тым, што далёка не паўсюль мігранты паводзяць сябе паважліва ў дачыненьні да краіны, якая дала ім прытулак. Патураньне гэтым групам, якое выдаецца за палітыку талерантнасьці і мультыкультуралізму, у стратэгічым пляне можа стацца самазьнішчальнай палітыкай для аб'яднанай Эўропы — і на сёньня ўжо генэруе цэлы комплекс праблемаў унутры яе.

Гэта толькі некаторыя элемэнты адваротнага боку аб'яднанай Эўропы. Але ўжо толькі яны могуць прымусіць задумацца над пытаньнем: ці вартае патэнцыйнае вырашэньне беларускіх праблемаў праз эўрапейскую інтэграцыю таго, каб ублытвацца ў яшчэ большыя праблемы?

## ШТО РАБІЦЬ?

Прымаючы пад увагу, што ў сёньняшніх палітычных варунках Беларусь ня мае ніякіх шанцаў далучыцца да ЭС і афіцыйны Менск не артыкулюе такога жаданьня, а таксама тое, што Эўрапейскі Саюз пастанавіў узяць паўзу ў працэсе пашырэньня, Беларусь мае вельмі добрую магчымасьць для таго, каб заняцца разьвязаньнем унутраных праблемаў, галоўнай зь якіх ёсьць дабудова нацыі. Бяз гэтага мы ня будзем здольныя зрабіць канчатковага геапалітычнага выбару, бо ня будзем здольныя ўсьвядоміць свае нацыянальныя інтарэсы.

Варта таксама памятаць, што вяртаньне ў Эўропу неабавязкова азначае ўступленьне ў Эўрапейскі Саюз. Вяртаньне ў Эўропу можа азначаць усьведамленьне сябе як эўрапейскай нацыі. А ўсьведамленьне сябе нацыяй немагчымае без аддзяленьня ад «іншага», якім можа быць як Расея, гэтак і ЭС або ЗША. І гэта цалкам нармальна. І ўжо пасьля замацаваньня ідэнтычнасьці можна весьці гутарку пра далучэньне ці недалучэньне да хаўрусаў. У гэткім кантэксьце паўза ў эўраінтэграцыі і аўтарытарны момант у беларускай унутранай палітыцы могуць стаць тым спрыяльным часам, які варта выкарыстаць для гартаваньня нацыянальных сілаў дзеля дабудовы беларускай нацыі ў клясычным эўрапейскім разуменьні гэтага слова. Будзем жа над гэтым працаваць.

## ЭСЭІСТЫКА

ЯЎГЕН МІРАНОВІЧ

# Ці патрэбна Беларусь Еўропе?

Адказ на пастаўленае ў загалоўку пытанне на першы погляд здаецца досыць простым: Беларусь як палітычны суб'ект да 1991 г. не была патрэбна Еўропе, бо ніколі не выступала ў гісторыі апошняй у такой якасці. Выключэннем можа быць хіба што перыяд ранняга сярэднявечча і эпоха Полацкага княства, якое на працягу больш як ста гадоў паспяхова супраціўлялася інтэграцыі ў рамках агульнаўсходнееўрапейскай дзяржавы — Рускага каганату, які ў сучаснай гістарыяграфіі фігуруе пад назвай «Кіеўская Русь». Полацк быў не толькі ўдзельнікам еўрапейскай палітыкі, але і важным цэнтрам эканамічнага жыцця кантынента. Яго магутнасць грунтавалася на пасярэдніцтве ў гандлі паміж Балтыйскім і Чорным морамі. Захоп у канцы XII — пачатку XIII ст. вусця Дзвіны нямецкімі рыцарамі-крыжаносцамі прывёў да маргіналізацыі палітычнага значэння Полацка. Полацкае княства, гэтак жа як і Кіеўскае, было дзяржавай скандынаўскіх князёў і мясцовых славянскіх эліт.

Пра Вялікае Княства Літоўскае, што потым узнікла на беларускіх землях, беларускія інтэлектуалы часта гавораць як пра форму ўласнай дзяржаўнасці, якая адстойвала беларускія нацыянальныя і палітычныя інтарэсы. У гістарыяграфіі,

---

***Яўген Мірановіч*** *— гісторык, загадчык катэдры беларускай культуры Беластоцкага ўнівэрсытэту. У 1980 г. закончыў факультэт гуманітарных навук філіялу Варшаўскага ўнівэрсытэту ў Беластоку. Доктарскую дысэртацыю на тэму «Беларуская нацыянальная меншасьць у Народнай Польшчы (1944—1949)» абараніў у 1990 г. на факультэце журналістыкі й палітычных навук Варшаўскага ўнівэрсытэту, а габілітацыю «Нацыянальная палітыка Польскай Народнай Рэспублікі» ў 2000 г. на факультэце гістарычных навук Варшаўскага ўнівэрсытэту. Рэдактар «Беларускага гістарычнага зборніка» («Białoruskie Zeszyty Historyczne»). Апошняя кніга — «Białorusini i Ukraincy w polityce obozu piłsudczykowskiego» (Białystok: Wydawnictwo Uniwersyteckie Trans Humana, 2007).*

аднак, бракуе фактаў, якія пацвярджалі б гэты тэзіс. Ад пачатку свайго існавання ВКЛ было дзяржавай літоўскіх і жамойцкіх княжацкіх родаў, якія рэалізоўвалі свае мэты без уліку інтарэсаў рускіх князёў. Міндоўг быў паўнаўладным суверэнам над праваслаўнымі прынёманскімі землямі. Прымаючы ў 1250 г. ад вялікага магістра Лівонскага ордэна каралеўскую карону разам з хрышчэннем у лацінскім абрадзе, ён не пытаўся меркавання праваслаўных наваградскіх баяр, якія кармілі і ўзбройвалі яго дружыну. Міндоўгавы наступнікі беспераашкодна дзялілі беларускія княствы паміж сваімі сынамі і братамі. За часамі Гедыміна і Альгерда цяжка назваць хоць які лапік беларускай зямлі, што знаходзіўся б пад суверэнным панаваннем рускіх князёў.

Падкрэсліваны гісторыкамі довад, што мовай справаводства і дыпламатыі ў Вялікім Княстве Літоўскім была старабеларуская, а таксама тое, што Вільня была насычана помнікамі руска-візантыйскай культуры, зусім не мяняе літоўскага характару дзяржавы. Мова і дзяржаўна-юрыдычная культура рускіх гарадоў былі пераняты «кунігасамі» чыста інструментальна, для разбудовы дзяржаўнай структуры. Гэтаксама ў старажытнасці мова і культура пакораных рымлянамі грэкаў стала трывалым элементам рымскага інтэлектуальнага жыцця, хоць ніхто не прыпісвае Рымскай імперыі, якая ўвабрала ў сябе ўвесь эліністычны свет, грэчаскіх рысаў. Нічога не вынікае і з таго, што мовай справаводства і дыпламатыі Польскага каралеўства шмат стагоддзяў была латынь. Занадта імпэтна такім элементам, як культура і мова, у выпадку Вялікага Княства Літоўскага надаецца сучаснае значэнне індыкатара культурнага характару дзяржавы ці самасвядомасці яе жыхароў.

Беларуская гістарыяграфія, нават за савецкім часам, з гордасцю пісала пра перамогу рускіх, польскіх і літоўскіх войскаў над немцамі ў 1410 г. Між тым пад Грунвальдам, дзе пад сцягамі Тэўтонскага ордэна змагалася рыцарства з усёй каталіцкай Еўропы, вырашаўся перш за ўсё лёс літоўскай дзяржавы. Без Аўкштайціі і Жамойці, якія былі буферам паміж Літвой і Лівоніяй, цяжка ўявіць захаванне літоўскага дамінавання на рускіх землях.

Перамога над Тэўтонскім ордэнам адсунула ад самой Літвы небяспеку, што пагражала ёй на працягу двух стагоддзяў. Пры падтрымцы саюзнай Польшчы літоўскія роды Гарадзельскім прывілеем ад 1413 г. надалі сабе выключнае права панаваць над усімі рускімі землямі, што забяспечыла ім велізарныя надзелы і вырашальную палітычную перавагу над праваслаўнымі князямі. Спроба бунту і рэалізацыі ўласных палітычных амбіцый з боку Свідрыгайлы закончылася поўным крахам. Беларуская эліта з усіх гледзішчаў апынулася ў падпарадкаваным стане. Імкнучыся трапіць у вышэйшыя слаі, яна шукала сваяцкіх сувязяў з літоўцамі або ўцякала пад маскоўскую апеку. У любым выпадку гэтаму спадарожнічала прызнанне чужога панавання і адмаўленне ад уласнай самастойнасці. Беларускія землі сталі прадметам спярша літоўска-маскоўскага, а затым польска-расійскага спаборніцтва і аб'ектам каланізацыі.

Ідэя Рэчы Паспалітай была з энтузіязмам успрынята рускімі феадаламі як шанец на ўраўнаважанне літоўскіх уплываў. Фактычна гэта была унія польскіх

і рускіх эліт, скіраваная супраць літвінаў. У новай дзяржаве вельмі хутка адбылася асіміляцыя як рускіх, так і літоўскіх феадалаў у польскай культуры. Бясспрэчна, Рэч Паспалітая была імперыяй, якая належала палякам. Спробы затрымаць палітычны заняпад Вялікага Княства Літоўскага праз заключэнне уніі са Шведскай імперыяй, якія рабіліся ў сярэдзіне XVII ст. Радзівіламі, скончыліся няўдачай.

Ва ўмовах глыбокага палітычнага крызісу 1654—1655 гг. і нападу на Рэч Паспалітую казацкіх і маскоўскіх войскаў беларускія эліты ўпершыню ў новай гісторыі акрэслілі беларускае пытанне ў міжнародным маштабе. Палкоўнік Канстанцін Паклонскі, імкнучыся засцерагчы Магілёўшчыну ад грабяжоў і гвалту з боку казакаў наказнога гетмана Івана Залатарэнкі, выступіў як саюзнік цара Аляксея Міхайлавіча ад імя шляхты Белай Русі — не Літвы і тым больш не Рэчы Паспалітай. Расіі ў той час, аднак, не быў патрэбны ніякі суверэнны ці нават паўсуверэнны беларускі анклаў.

Пасля войнаў з казакамі, маскавітамі і шведамі, што цягнуліся ад 1648 да 1658 гг., Літва, па сутнасці, перастала ўяўляць самастойную палітычную сілу. У 1791 г. польская шляхта прыйшла да высновы, што патрэба ў такой фікцыі, як Вялікае Княства Літоўскае, канчаткова адпала. Яго эліты думалі і гаварылі па-польску. Хто ж мог чакаць, што ліквідацыя саюзнай дзяржавы выкліча актыўнае супраціўленне гэтых самых паланізаваных эліт? Дзяржава, што існавала цалкам у рэчышчы польскай палітыкі, зрабілася, аднак, самакаштоўнай вартасцю для яе шляхты. У выніку на Таргавіцкай канферэнцыі было пастаноўлена, што гарантам існавання ВКЛ стане расійская імператрыца Кацярына II. Але Расійскай імперыі, што імкнулася да экспансіі, самастойная Літва была патрэбна выключна на час яе інкарпарацыі.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай на Беларусі — там, дзе захавалася праваслаўе, — склаліся спрыяльныя ўмовы для русіфікацыі. На захадзе, дзе дамінавалі рыма- і грэка-каталіцызм, і ва ўмовах расійскага панавання — ад часу Паўла I аж да паўстання 1830—1831 гг. — узмацняліся польскія ўплывы. Нават дзекабрысты, якія марылі пра пабудову расійскай нацыянальнай дзяржавы — свайго роду «Расіі для расійцаў», — заходнюю частку Беларусі, дзе жыло акаталічанае і апалячанае насельніцтва, хацелі папросту аддаць Польшчы.

Толькі пасля паўстання 1863—1864 гг. расійскія палітыкі звярнулі належную ўвагу на гэтую частку колішняй Рэчы Паспалітай. «Заходняросы», поруч з «велікаросамі» і «маларосамі», павінны былі скласці адно з адгалінаванняў рускага народа. Для праваслаўных эліт, якія процістаялі каталікам, гэта была вельмі прывабная канцэпцыя. Разам з магутным саюзнікам у іх з'яўлялася перспектыва атрымання дзяржаўных пасад і пашырэння ўласнага ўплыву на сваёй зямлі. Расійскія ўлады і ўсе, хто мысліў падобна да аднаго з праваслаўных беларускіх шляхціцаў Міхаіла Каяловіча, былі зацікаўлены ў тым, каб каталіцызм у Беларусі заставаўся сімвалам польскасці і чужароднасці.

Беларускі нацыянальны рух, які зарадзіўся ў канцы XIX ст., не меў нават тэндэнцыі да пастаноўкі беларускага пытання ў міжнародным маштабе, як гэта спра-

бавалі зрабіць, напрыклад, галіцкія ўкраінцы. Усе палітычныя памкненні беларускіх эліт да 1915 г. абмяжоўваліся максімум патрабаваннем аўтаноміі ў складзе дэмакратычнай Расіі. Зрэшты, і такія патрабаванні расцэньваліся як недарэчныя нават самымі ідэйнымі расійскімі дэмакратамі.

На пачатку XX ст. у праграме Польскай сацыялістычнай партыі, асабліва ў канцэпцыі Юзафа Пілсудскага, для Беларусі сапраўды прадугледжвалася нейкае асобнае месца ў палітычнай сістэме, якую мела збудаваць Польшча. Але, ацэньваючы гэтыя дэкларацыі з гледзішча пазнейшай палітычнай практыкі лідэра санацыйнага рэжыму, можна смела канстатаваць, што яны былі толькі інструментамі бягучай палітыкі. Істотна, аднак, тое, што беларускі фактар упершыню стаўся аб'ектам увагі польскай палітыкі і прынамсі на ўзроўні дэкларацый быў заклікаactive адыграць у ёй нейкую ролю. Упершыню ў палітычных раскладках на абшарах паміж Польшчай і Расіяй з'явілася Беларусь.

Украіна, якая да таго часу заставалася ў аналагічным становішчы, павінна была, у сваю чаргу, адыграць ключавую ролю ў германскіх і аўстра-венгерскіх планах пабудовы новага парадку ва Усходняй Еўропе. Адасабленне Украіны ад Расіі і ўключэнне яе ў нямецкую сферу ўплыву магло, па сутнасці, радыкальна змяніць палітычную карту Еўропы.

Дзякуючы Германіі расло таксама палітычнае значэнне Літвы як аднаго са складнікаў так званай *«Mitteleuropa»* і падступу да даўнейшай Курляндыі і Лівоніі. Кавалкі беларускай тэрыторыі павінны былі задаволіць амбіцыі палітычных эліт, праектаваных немцамі сумежных краін — Літвы і Украіны. Існаванне Беларусі як асобнага дзяржаўнага ўтварэння не прадугледжвалася.

Заняўшы ўлетку 1915 г. землі заходняй Беларусі і Украіны, а таксама ўсю Літву, немцы пачалі рыхтаваць глебу для рэалізацыі сваіх планаў. Прапановы братоў Луцкевічаў наконт аднаўлення Вялікага Княства Літоўскага як супольнай дзяржавы беларусаў, літоўцаў, яўрэяў і палякаў, якія з восені 1915 г. знайшлі падтрымку часткі віленскіх яўрэяў, былі праігнараваны немцамі, літоўцамі і палякамі. Немцы, хутчэй за ўсё, не верылі, што ў эпоху ўсё мацнейшых нацыяналізмаў магчыма ўзнікненне і функцыянаванне такой федэрацыі. Палякі і літоўцы, у сваю чаргу, хацелі будаваць уласныя нацыянальныя дзяржавы.

Узнікненне ў канцы 1917-га — пачатку 1918 г. літоўскіх і ўкраінскіх дзяржаўных структур падштурхнула беларускія эліты пайсці тым самым шляхам. Аднак наколькі намаганні літоўцаў і ўкраінцаў былі падтрыманы немцамі, настолькі Беларуская Народная Рэспубліка ўзнікла насуперак іх волі. Брэсцкі мірны дагавор пакінуў Беларусь у межах Расіі, адарваўшы ад яе на карысць Украіны значную частку Палесся.

Абвяшчэнне 25 сакавіка 1918 г. незалежнасці Беларусі адбылося ў выніку развіцця ўнутранай сітуацыі і эвалюцыі палітычнага мыслення часткі эліт пад уплывам няўдалых спроб прызнання аўтаноміі ў межах Расіі, спачатку з боку Часовага ўрада, а потым бальшавікоў. Дзяржава без арміі і саюзнікаў не мела вялікіх шанцаў на выжыванне.

Для вялікіх дзяржаў, якія вырашалі ў Парыжы лёс народаў Еўропы, Беларусь

была нейкай новай праблемай, якая магла быць развязана толькі з удзелам Польшчы і Расіі. Калі б не бальшавікі, беларускае пытанне, безумоўна, залічылі б да ўнутрырасійскіх, але неабходнасць процістаяння камунізму прымушала пагадзіцца з рэалізацыяй польскіх імперыялістычных планаў на ўсходзе. Лёгкасць, з якой палякі занялі землі заходняй і цэнтральнай Беларусі, вяла да перакананьня не толькі сярод мясцовых памешчыкаў, але і ў лагеры Пілсудскага, што няма патрэбы лічыцца з якім бы там ні было голасам беларусаў. Надараліся, праўда, некаторыя мясцовыя кампрамісы, накшталт арганізацыі беларускіх школ на Міншчыне, але комплекснае развязанне праблемы абяцала настаць пасля заканчэння вайны, якая вялася без удзелу Беларусі як самастойнага палітычнага суб'екта. Не было ніякіх сведчанняў, што нехта з польскага боку збіраецца ўвасабляць ранейшыя федэралісцкія планы. Наадварот, на практыцы з самага пачатку рэалізоўвалася інкарпарацыйная палітыка, якая нішчыла ўсякія структуры, што ствараліся беларускімі незалежнікамі.

Бальшавікі, хочучы стрымаць працэс распаду імперыі Раманавых, які ў канцы 1917-га — пачатку 1918 г. ішоў яўна паводле этнічных межаў, былі вымушаны прызнаць нацыянальнае пытанне важным інструментам унутранай палітыкі. Утварыўшы Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (напачатку ў шэрагу варыянтаў), яны прычыніліся да таго, што беларуская дзяржаўнасць фармальна стала прадметам міжнароднай палітыкі. Хоць межы і лад гэтай дзяржавы вынікалі з бягучых палітычных патрэб кіраўніцтва бальшавіцкай партыі, усё ж культурна-этнічная адметнасць Беларусі ўпершыню была прызнана расійскай цэнтральнай уладай.

У гэты пераломны перыяд еўрапейскай гісторыі суверэнная Беларусь была патрэбна дзяржавам, якія ўзнікалі ў падобных абставінах і лёс якіх быў гэткі ж няпэўны, — Украіне, Літве, Латвіі, Арменіі, Грузіі. Найболей Беларусь была патрэбна Украіне, якая на ўсходзе цярпела ад атак бальшавіцкай Расіі, а на захадзе вымушана была ісці на цяжкія кампрамісы з Польшчай коштам часткі сваіх зямель і некалькіх мільёнаў супляменнікаў-галічан, найбольш, дарэчы, адданых ідэі ўласнай дзяржаўнасці. Урад Украінскай Народнай Рэспублікі, які сам знаходзіўся ў цяжкай сітуацыі, гатовы быў нават фінансава паспрыяць захаванню беларускай дзяржаўнасці.

У паверсальскай Еўропе Ліга Нацый патрабавала ад уладаў другой Рэчы Паспалітай утварэння той ці іншай формы аўтаноміі для галіцкіх украінцаў. Украінскія пратэсты супраць польскай палітыкі падымалі на ногі дыпламатыю Брытанскай імперыі, лідэры якой марылі ачысціць усход кантынента ад камунізму і вялікія надзеі ў сувязі з гэтым ускладалі на развіццё ўкраінскага сепаратызму.

Затое аб правах беларусаў у Польшчы, хоць бы на культурную аўтаномію, ніхто ў Еўропе не ўспамінаў. Пратэсты беларускіх дзеячаў супраць дыскрымінацыі, як таго і хацелася польскім уладам, Ліга Нацый лічыла інтрыгамі сіл, звязаных з Камінтэрнам. Пэўнай праблемай для Польшчы ў 1920-я гг. была Савецкая Беларусь, беларусізацыя грамадскага жыцця ў якой абуджала велізарныя сімпатыі з боку беларускіх насельнікаў другой Рэчы Паспалітай. Сімпатыі, у сваю чаргу,

нараджалі волю да барацьбы за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з рэспублікай, кіраванай беларускімі камуністамі. БССР у руках бальшавікоў стала надзвычай эфектыўным інструментам уплыву на ўнутраную сітуацыю ў Польшчы. Толькі знішчэнне нацыянальнай інтэлігенцыі ў Савецкай Беларусі сталася для санацыйных уладаў сігналам, які адкрываў дарогу для радыкальных метадаў вырашэння беларускага пытання ў Польшчы. У канцы 1930-х гг. у міжваеннай Польшчы практычна перастала існаваць беларускае грамадскае жыццё. Ураду ўдалося нават царкву зрабіць бязвольнай выканаўцай уласных асімілятарскіх планаў.

У другой палове 1930-х гг. супалі інтарэсы Трэцяга Рэйху і ўсіх народаў, якія адчувалі сябе пакрыўджанымі або дыскрымінаванымі ў паверсальскай Еўропе. Германія была надзеяй і для польскіх украінцаў ды беларусаў. Немцы ж планавалі выкарыстаць беларускае пытанне ў сваёй палітыцы як адносна Польшчы, так і адносна СССР. Польскі ўрад, ліквідуючы беларускія нацыянальныя структуры ў Польшчы, не мог, аднак, прадухіліць стварэння антыпольскіх і пранямецкіх арганізацый за яе межамі. Не мог гэтаму даць рады і савецкі ўрад, які пад канец 1930-х гг. звёў Беларусь выключна да геаграфічнага і этнаграфічнага паняцця. У пачатку 1939 г. урад фашысцкай Германіі спрыяў узнікненню розных беларускіх арганізацыйных структур на эміграцыі — напрыклад, беларускіх рэгістрацыйных камісарыятаў, афіцыйнай задачай якіх мела быць стварэнне нацыяльных цэнтраў, неафіцыйнай жа — падрыхтоўка беларусаў на эміграцыі да выканання місіі на ўсходзе. У студзені 1939 г. у Берліне ўзнікла «Беларускае бюро даверу», мэтай якога было ўзаемнае збліжэнне беларусаў, якія жылі ў Трэцім Рэйху, а таксама спрашчэнне іх кантактаў з нямецкімі афіцыйнымі органамі. Кіраўніком «Бюро» быў Лявон Сапега — нямецкі палкоўнік у адстаўцы, кіраўнік беларускай дыпламатычнай і вайсковай місіі пад эгідай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Беларускі фактар рабіўся адным з палітычных элементаў падрыхтоўкі Германіі да вайны і стварэння «новага парадку» ў Еўропе. Нямецкія вучоныя даследавалі праблемы Беларусі паабапал рыжскай мяжы гэтак жа інтэнсіўна, як і ўкраінскую праблематыку.

Няма сумневу, што немцы ўспрымалі беларускую праблему з чыста інструментальнага гледзішча. Дагэтуль не з'явілася ніводнага даследавання, якое переканаўча паказала б, што немцы мелі нейкі план утварэння хоць бы марыянетачнай беларускай дзяржавы. Яны стваралі ілюзію для нацыянальных дзеячаў, у часе вайны давалі ім пасады ў цывільнай адміністрацыі ці ў паліцыі, але рашуча знішчалі ўсіх, хто рабіў нешта, што выходзіла за рамкі звычайнай калабарацыі (як у выпадку каталіцкага святара Вінцука Гадлеўскага). Другі Усебеларускі кангрэс, праведзены ў канцы чэрвеня 1944 г., нельга лічыць крокам да рэалізацыі нейкіх беларускіх памкненняў. Гэта была спроба стварэння антысавецкай структуры, закліканай нейкім чынам затрымаць прасоўванне Чырвонай Арміі на захад.

У 1939 г. Масква, шукаючы ідэалагічнай базы для будаўніцтва новай імперыі,

зноў сталася выразнікам волі так званага беларускага народа. Да Савецкай Беларусі былі далучаны заходнія землі, пра якія ніколі не марылі нават самыя радыкальныя нацыянальныя дзеячы. У час вайны Сталін на перамовах з саюзнікамі атрымаў іх згоду на ўстанаўленне паваеннай граніцы з Польшчай паводле этнічнага крытэру. Беларусь, разам з СССР і Украінай, стала адным з заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, выступаючы як асобнае дзяржаўнае ўтварэнне. Зрэшты, гэта мела толькі сімвалічнае значэнне: пасля 1945 г. Беларусь зрабілася адным з самых надзейных звёнаў савецкай дзяржавы.

На працягу наступных дзесяцігоддзяў пра вольную Беларусь, як і пра заняпад СССР, не думаў ніхто ні ў Еўропе, ні ў свеце, паколькі да гэтага не было ніякіх перадумоў. Цяпер ужо менавіта Савецкі Саюз уплываў на ход падзей на палове тэрыторыі зямнога шара, у тым ліку і на ўзнікненне ці заняпад дзяржаў на ўсіх кантынентах.

Выключэннем быў выдаваны ў Парыжы (з 1954 г.) польскімі эмігрантамі часопіс «Kultura». Ежы Гедройць здзейсніў крок, які прынёс яму шмат ворагаў на эміграцыі, але адначасова запачаткаваў гістарычны паварот у польскай палітычнай думцы. Некалькі наступных дзесяцігоддзяў польскія эліты прызвычайваліся да канцэпцыі выдаўцоў «Kultury», паводле якой неад'емнай умовай незалежнасці Польшчы было здабыццё суверэнітэту і правасуб'ектнасці яе ўсходнімі суседзямі. Каб заахвоціць літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў да выхаду з-пад маскоўскай апекі, логіка гэтага праекта прадугледжвала дэкларацыю аб адмаўленні Польшчы ад прэтэнзій на землі, якія ўваходзілі ў склад польскай дзяржавы да 1939 г.

Цяжка адназначна сказаць, у якой ступені пад уплывам «Kultury», а ў якой — у выніку ўласных разваг да падобных высноваў прыйшла таксама польская антыкамуністычная апазіцыя. Пасля вялікага палітычнага пералому 1989 г. ідэя падтрымкі незалежніцкіх рухаў у суседніх савецкіх рэспубліках была ўжо досыць пашыраная сярод польскіх палітычных эліт. Аднак сярод членаў чарговых кабінетаў Рэспублікі Польшчы не было гатоўнасці ні паглыбляцца ў працэсы, што адбываліся за ўсходняй граніцай, ні тым больш несці нейкія ахвяры, хоць бы ў выглядзе рэсурсавай ці матэрыяльнай падтрымкі тамтэйшай апазіцыі. Палітычныя эліты ў Польшчы, як, зрэшты, і ва ўсёй Еўропе, з асцярогай прыглядаліся да працэсу распаду СССР. Праўда, у адрозненне ад Еўропы, у Польшчы значная частка палітыкаў з надзеяй вітала з'яўленне новых дзяржаў як буфера, які аддзяляў іх краіну ад спрадвечнага канкурэнта ці ворага — Расіі.

Такое стаўленне, аднак, зусім не было ўласціва польскім інтэлектуальным элітам. У літаратуры і публіцыстыцы ў дачыненні да Беларусі і Украіны пераважаў пагардлівы, насмешлівы, часам здзеклівы тон. Шмат з якіх публікацый у беластоцкім друку можна было скласці ўражанне, што суверэнная Беларусь уяўляла сабой большую небяспеку для Польшчы, чым некалі Савецкі Саюз. Артыкул у беларускім літаратурным часопісе пра Армію Краёву выклікаў лавіну палемічных публікацый і палітычных спекуляцый наконт палітыкі постсавецкай Беларусі.

У жніўні 1991 г. амаль усе еўрапейскія краіны прызналі суверэнную дзяржаву Беларусь. Усеагульнае прызнанне Беларусі ў 1991 г., вядома ж, не было вынікам дыпламатычнай дзейнасці надзвычай некампетэнтных уладаў рэспублікі. Еўропа некалькі дзесяцігоддзяў жыла з пачуццём савецкай пагрозы. Таму ўсе новыя палітычныя суб'екты, якія ўзнікалі на руінах зніклай імперыі, у тым ліку і Беларусь, рабіліся сімваламі надыходнай міжнароднай бяспекі. Еўропа прымала кожную новую дзяржаву на ўсходзе кантынента, якая не прыносіла ёй клопату і абвяшчала пра намер будаваць дэмакратыю. Такой дзяржавай, вядома, была і Беларусь. Адмова Беларусі і Украіны ад ядзернай зброі яшчэ больш узмацняла пачуццё бяспекі ў Еўропе. Надалей уладальнікам ядзернага арсеналу заставалася Масква, а з ёй на Захадзе ўжо навучыліся сяк-так ладзіць.

З'яўленне ў 1994 г. Лукашэнкі трохі разбурыла вобраз Усходняй Еўропы, якая рухаецца ў кірунку дэмакратыі, свабоднага рынку і дабрабыту. Разнастайныя праекты аднаўлення саюзу з Расіяй абуджалі асаблівую трывогу ў суседніх краінах — Польшчы і Літве. На невялікім лапіку Еўропы на працягу некалькіх гадоў была адроджана логіка савецкага палітычнага ладу, пры адначасовым захаванні досыць шырокай свабоды эканамічнай дзейнасці, а таксама значных вольнасцяў у светапогляднай сферы.

Сёння ніхто ў Еўропе не ставіць пад сумненне патрэбы існавання беларускай дзяржаўнасці, але ўсе палітычныя сілы вымагаюць іншай Беларусі. Польшчы найменш выгадная Беларусь, якая застаецца ў расійскай палітычнай і вайсковай прасторы, інакш кажучы, з'яўляецца працягам Расіі. Для Польшчы, як вынікае з аналізу яе дзеянняў, што прадпрымаюцца ў апошнія гады, аптымальнай была б Беларусь, звязаная з Польшчай ці з Захадам і якая б выконвала ролю буфера паміж ім і Расіяй. Мяркую, што ў такім выпадку нават сучасная палітычная сістэма Беларусі магла б быць прызнана не дыктатурай, а спецыфічнай ці «абмежаванай» дэмакратыяй, бо і пры ёй жа адбываюцца выбары, нават з некалькімі кандыдатамі на пасаду прэзідэнта.

Германію, як і большасць краін «старой» Еўропы, не надта страшыць візія Беларусі, якая застаецца ў сферы расійскіх уплываў. Дыскамфортам для гэтай часткі Еўропы з'яўляецца затое парушэнне Беларуссю дэмакратычных прынцыпаў і правоў чалавека. Менавіта яно абумоўлівае цяперашняе стаўленне гэтых краін як да беларускага рэжыму, так і да апазіцыі. Вербальная крытыка і сімвалічная падтрымка ўсё слабейшай апазіцыі ды непрыманне ў сваіх салонах прадстаўнікоў беларускай улады — вось усё, што Еўропа можа зрабіць, часам прызнаючы нават такую сваю пазіцыю занадта радыкальнай. Раз-пораз Лукашэнка атрымлівае сігналы аб гатоўнасці Еўропы прызнаць яго спецыфічную сістэму ўзамен на больш лагоднае абыходжанне з апазіцыяй і хоць бы фармальнае ўшанаванне дэмакратычных прынцыпаў, асабліва свабоды слова. Склалася, аднак, такая сітуацыя, што хутчэй Еўропе патрэбна Беларусь, чым Беларусі Еўропа.

Еўропе, асабліва Германіі, Беларусь патрэбна як стабільная і бяспечная прастора з добрымі дарогамі, па якіх можна было б перавозіць тавары з Расіі і ў Расію. Усё гэта Беларусь пад кіраўніцтвам Лукашэнкі гарантуе Еўропе. Таму ў сапраўд-

насці краіны, якія вызначаюць палітыку Еўрапейскага Саюза, не будуць прыкладаць ніякіх намаганняў ці тым больш ісці на ахвяры дзеля змянення ўнутранай сітуацыі ў Беларусі, паколькі невядома, якія вынікі гэта можа выклікаць на стратэгічным кірунку паміж Усходам і Захадам. З ідэалагічнага гледзішча Еўропа, вядома, шчыра зацікаўлена і ў дэмакратызацыі гэтага абсягу нашага кантынента. Таму запэўніванні ў маральнай падтрымцы ўсіх апанентаў Лукашэнкавага рэжыму застануцца асноватворным канонам паводзін у дачыненні да Беларусі.

Пытанне русіфікацыі ці знішчэння нацыянальнай культуры ў выніку палітыкі, што праводзіцца рэжымам Лукашэнкі, у Еўропе не выклікае ніякіх эмоцый. Для сярэдняга немца ці чэха, які стараецца больш дасканала гаварыць па-англійску, чым на сваёй роднай мове, рускамоўная Беларусь выглядае цалкам нармальнай з’явай. У свеце, што імкнецца да глабалізацыі, страта культурнай ідэнтычнасці не ўяўляецца нечым заганным.

Беларусь, нават як не ў поўнай меры суверэнная дзяржава, з’яўляецца цяпер элементам нейкага дастаткова стабільнага палітычнага ўкладу ў Еўропе. Мяркую, што ліквідацыя такой дзяржаўнасці і ўключэнне Беларусі ў склад Расіі, як некалькі гадоў таму прапанаваў прэзідэнт апошняй Уладзімір Пуцін, парушыла б гэты стабільны ўклад. Еўропа як супольнасць, перш-наперш з гледзішча ўласнай бяспекі і нежадання да аднаўлення нават зменшанай копіі Савецкага Саюза, зацікаўлена ў захаванні Беларусі нават у сучаснай палітычнай форме.

Суверэнная Беларусь, мабыць, найбольш патрэбная Украіне. І прычына гэтага, як і ў 1918 г., не ў палітычных сімпатыях ці культурна-цывілізацыйнай роднасці двух народаў, а ў геапалітычным становішчы. Незалежная Беларусь — гэта ў вялікай ступені гарантыя незалежнай Украіны. Аднак няшмат было жэстаў з боку паўднёвай суседкі Беларусі, якія сведчылі б пра жаданне збудаваць найбольш адпаведныя адносіны паміж дзвюма дзяржавамі, асновай якіх была б супольная палітыка ў дачыненні яе да Усходу, так і да Захаду. З часу Чарнавіла ніхто ва Украіне не разважаў у такіх катэгорыях. Яўна лягчэй можа быць рэалізаваны прарасійскі саюз з удзелам Беларусі і Украіны, але ён магчымы толькі ў выпадку апанавання ўкраінскага палітычнага жыцця лагерам Віктара Януковіча і да яго падобных.

Бачнасць суверэннай Беларусі сталася патрэбная і Расіі. Беларусь як фармальна незалежная дзяржава ў апошнія гады выконвае важную функцыю ў расійскай замежнай палітыцы. Пры пасярэдніцтве Беларусі, якая мае ў свеце кепскую рэпутацыю, Расія магла досыць доўга падтрымліваць Ірак, сёння — Іран, уплываць на палітыку Венесуэлы, прадаваць зброю ў краіны, абкладзеныя эмбарга. Апошнім часам Федэральная служба бяспекі Расіі, выкрываючы сетку польскіх шпіёнаў у Беларусі, дэманструе свету, якую пагрозу для стабільнасці ў Еўропе ўяўляе палітыка Варшавы.

Расіі, насуперак некаторым дэкларацыям, патрэбна таксама прадказальная Беларусь, дзе добра забяспечваліся б расійскія інтарэсы. Прыбытковае функцыянаванне расійскіх банкаў, нафтаперапрацоўчых і газатранспартных прадпры-

емстваў патрабуе стабільнага палітычнага падмурку, які так ці інакш гарантуе прэзідэнт Лукашэнка. Такіх гарантый тым часам не дае апазіцыя, хоць, як вынікае з розных паведамленняў у сродках масавай інфармацыі, частка гэтай апазіцыі гатова ўзяць на сябе і такую ролю.

Уяўляецца, што ў выпадку Беларусі пры ацэнцы яе статусу ў Еўропе пануе свайго роду згода як на Усходзе, так і на Захадзе. Найбольш каштоўнай вартасцю гэтай краіны лічыцца стабільнасць і бяспека транзіту тавараў. Рэжым, у сваю чаргу, не настолькі брутальны, каб яго абавязкова трэба было замяняць нейкім іншым ладам. Бясспрэчна, краінай, найбольш зацікаўленай у зменах у Беларусі, з'яўляецца Польшча, у тым ліку і з прычыны наяўнасці тут вялікай польскай меншасці: прэзідэнт Лукашэнка абыходзіцца з палякамі, як і з іншымі сваімі грамадзянамі ці падданымі, што ў Польшчы выклікае страшныя эмоцыі.

*З польскай мовы пераклаў Сяргей Петрыкевіч паводле аўтарскага рукапісу.*
*Пераклад гэтага тэксту на англійскую мову змешчаны ў гадавіку «Annus Albaruthenicus. Год Беларускі». № 9. 2008. Крынкі: Аб'яднаньне Villa Sokrates.*

## ЭСЭІСТЫКА

**АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ**

# Эсэ пра беларусаў

Пішу эсэ. Набраў. Сьцёр. Набраў. Сьцёр. Паніка. Для аўтара няма нічога горшага, чым адсутнасьць сублімацыі. Нішто не выходзіць празь мяне, я перастаў быць зьвяном паміж космасам і людзьмі. Я перастаў належаць ім адначасова! Я чалавек. Значыць, у мяне ёсьць несьвядомае. Значыць, яно сублімуецца. Значыць, празь мяне нешта пачынае выходзіць.

Набраў.

Калі ірляндцы дбалі пра сваю нацыянальную ідэю, яны бачылі яе ў элінізацыі сваёй культуры. Ніяк не адкручуся ад гэтай думкі. Скіраванасьць у будучыню заўсёды бывае такой — у выглядзе культурнага праекту з дакладна ўсьвядомленымі гістарычнымі каштоўнаснымі элемэнтамі. Калі ірляндцы захацелі стаць нацыяй, ім спатрэбілася стаць элінамі, а значыць, перастаць быць ірляндцамі. Калі беларусы не задаволеныя сабой, ім трэба перастаць быць сабой, а стаць іншымі. Таксама элінамі, напрыклад. У іх усё роўна гэта ня выйдзе, другіх элінаў быць ня можа. Але беларусамі яны перастануць быць, стануць іншымі. Будуць глядзець на сябе і зьдзіўляцца, радавацца, знаходзіць у сабе новае. А значыць, палюбяць сябе. І ім стане да аднаго месца, ці любяць іх іншыя. Гэта вычварны нарцысізм — любіць сябе за тое, што ты спадабаўся камусьці яшчэ.

І хрэстаматыйная беларуская гасьцінасьць — гэта толькі счарсьцвелая корка на глыбінным нарцысізьме беларуса. Мы любім падабацца іншым, мы хочам

*__Аляксей Бацюкоў__ (нар. у 1977 у Магілёве) — эсэіст, журналіст і пісьменьнік. Скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Аркадзя Куляшова, асьпірантуру БДУ. Працаваў на Магілёўскай абласной тэлевізіі, цяпер старшы выкладчык Беларуска-Расійскага ўнівэрсытэту. Сталы аўтар газэты «Наша Ніва» і часопісу «ARCHE».*

падабацца, мы падабаемся ім, наталяючыся сваёй лагодай. «Мы — ваша туга па нашай шчырай радасьці вас бачыць». Першым словам зь вялікай літары, хочаце ня хочаце, тут было Мы. Як і любы, беларускі нарцысізм у сваёй прыродзе мяшае шляхотную фанабэрыю з эгаізмам, за часы супрацiву зь невысакароднымі супернікамі завуаляванымі ў сялянскую пачцівасьць. Вось толькі за гэтую фанабэрыю беларусаў чакала помста — асьляпленьне масаў, згуба сувязі паміж першаснай задачай традыцыйнай маны *іншага* і захапленьнем ад эфэкту гэтай маны. Яшчэ — навязваньне комплексу гнутых сьпінаў.

Не, мы хочам, хочам быць іншымі, толькі дзьве нашыя душы выюць на розных мовах кожную эпоху кожная пра свой шлях. Лацінства і бізантызм, або ліцьвінства і русінства — гаспадарліва думаем мы — так татальна супярэчаць адно аднаму, што проста неабходна ўтрымаць іх у сабе. І, утрымаўшы, застаўшыся сам-насам, дастаём іх са свайго неспакойнага нутра і травім іх паміж сабой, пляскаючы ў далоні.

Нішто так не супакойвае, як кубачак малака зь пячэньнем.

Тое, чаго так дбалі ірляндцы, здабылі нарэшце мы. Хіба яшчэ няясна, што менавіта мы і ёсьць той сумны фінал элінаў, што распусьціліся па сьвеце і вярнуліся самі да сябе ў сваіх супярэчнасьцях.

Сьцёр.

Беларусы як дух сьвяты ў нашай усходнеславянскай тройцы. Ніхто не разумее, што ён робіць.

Беларусь гэта Галятэя. Кожны, хто пра яе дбае, — Пігмаліён. Пігмаліёны абляпілі яе мармуровае цела, і труць, стукаюць. І расчароўваюцца — нежывая! А што ад іх залежыць? Жыцьцё Галятэі мусяць даць не Пігмаліёны, а багі. А ад Пігмаліёнаў залежыць, якою будзе Галятэя пасьля, калі багі дадуць ёй жыцьцё, — прыгожая ці не.

Расчараваньне эпохай — яна зьменлівая. Расчараваньне Беларусяй — яна выцякае скрозь пальцы. Яна існуе, яна бытуе, але ніхто ня ведае, што за субстанцыя забясьпечвае гэтае бытаваньне. Космас, Бог, людзі?

Магчыма, Беларусь стала вынікам чыйгосьці валявога намаганьня. Тады справядлівасьці няма ў сэнсе яе жыцьця, а ёсьць толькі інэрцыя. Гнаная валюнтарыстамі, яна коціцца па зямлі, падскокваючы на купінах і пэцкаючыся ў калюжынах. Не-не, яе спрабуюць зачапіць бутсай гульцы каманды-суперніка. І ўвесь сэнс гульні — забіць гол, атрымаць сатысфакцыю, спраўдзіцца на сьвет цэлы. Беларусь вымушаная апраўдваць сваё існаваньне, дацягваючыся да нябёсаў. Магчыма, калі б на працягу гадоў пяці ніводная беларуская зборная, і ніводны беларускі спартсмэн, і ніводны беларускі музыка, і ніводны беларускі ніхто не перамог бы дзе-небудзь, дзе былі б ня толькі беларусы, а наадварот, заўсёды яны займалі б толькі апошнія месцы, гэта паставіла б у грамадстве пытаньне пра мэтазгоднасьць існаваньня самой нацыі? Калі так, то беларусы — гэта цудоўны, проста фантастычна цудоўны матэрыял для нацыятварэньня, бо лёгка адмаўляючыся ад свайго, ён лёгка прымае чужое, а значыць, сваё

ён лёгка пачынае ўважаць за чужое, якое ў сваю чаргу лёгка зможа прыняць як сваё. Запісваю ў штодзёньніку на наступную пятніцу — трэба гэтым сур'ёзна заняцца.

Я думаю, што кожнаму сьвядомаму беларусу трэба ўзяць на сябе дадатковы грамадзянскі абавязак і стварыць аднаго-двух сапраўдных беларусаў. Для гэтага можна ўзяць любога звычайнага чалавека і праводзіць зь ім вопыты. Трэба часта зь ім бачыцца, да такой ступені часта, каб выведаць у ім усё, асабліва думкі. Трэба выклікаць яго на размовы пра культуру і каштоўнасьці, і запісваць яго рэакцыі ў адмысловы журнал. Гэты журнал неабходна будзе пастаянна перачытваць, каб заўважаць асноўныя тэндэнцыі ў зьменах яго сьветапогляду. Пасьля абагульненьня падобных назіраньняў вялікай колькасьці выхаваццеляў зьявіцца магчымасьць распрацаваць агульныя мэтадычныя рэкамэндацыі, што палегчыць і пашырыць падобную практыку ў грамадзтве. Адзін-два беларусы на год — атрымай грамату. А калі тыя ў сваю чаргу выхаваюць аднаго-двух, табе мэдаль. Гэта ж можа атрымацца цэлая нацыянальная піраміда.

Праўда, для гэтага беларусам патрэбны свой ордэн езуітаў, свая масонская ложа. Таемная арганізацыя Пігмаліёнаў.

Вернемся.

Калі кажуць, што беларусы гэта, сутнасна, русіны ВКЛ, то я ня бачу ніякай супярэчнасьці, калі адначасова іншыя сьцьвярджаюць, што беларусы гэта спадчыньнікі ліцьвінскай славы. Таму што, нагадваю, беларусы як хамэлеоны, сёньня русіны, заўтра ліцьвіны. Русінамі больш нецікава, хлоп, і Міцкевіч наш. Дзе што дрэнна валяецца, беларусы падбяруць, абдуюць, паставяць на палічку. Падыдзе хто іншы, скажа: «Гэта маё!», а беларусы яму: «Цьху, чорт, на, забірай» — і вачыма па падлозе. Нішто так не ўзбуджае беларуса, як чужое, якога яму захацелася.

За беларусамі трэба заўсёды сачыць. То выйграюць што, то народзяць каго. Здаецца, нічога ў іх такога гэткага няма, а тут раз, на табе 2:0.

Магчыма, Беларусь і беларусаў стварыў Бог. Калі ўдумацца, мы працягваем яго праект. Калі дапусьціць думку, што пачынальнікі эўрапейскай цывілізацыі гэта не эліны ўсё ж, а габрэі, то зноўку на табе — на нас эўрапейскі сьвет клінам у выніку і сышоўся. Ёсьць яшчэ ўкраінцы, якія маглі б на гэта прэтэндаваць, скажаце вы, але ж не, украінцы гэта не адзін народ, а два, тады як беларусы — адзін. Імі толькі займацца трэба і даглядаць, каб не запаўзьлі куды.

Усё, вырашана. Трэба ордэн пігмаліёнаў. Якія прапановы?

Яшчэ трэба правесьці конкурс на ўзорнага беларуса. Няхай гэта будуць гістарычныя пэрсанажы, сучасьнікі не заслужылі. Зянон? Ён уцёк.

Можна Каліноўскага, але будуць праблемы. Яшчэ я прапанаваў бы селяніна, удзельніка казацкага паўстаньня, якога схапілі шляхцюкі ў палон. Пра яго тут[1]

[1] Бярнацкі В. Паўстаньне Хмяльніцкага: Ваенныя дзеяньні ў Літве ў 1648—1649 гг. // ARCHE. 2008. № 1—2. С. 63.

піша Вітальд Бярнацкі: «чым больш яго мучылі, тым менш гаварыў і папросту, зубы сьцяўшы, маўчаў». Вось чаму. Я прапанаваў бы яго, бо ён ваяваў і загінуў за народ. Не за дзецюкоў у палацава-замкавых комплексах, якія заўтра-пасьлязаўтра стануць пшэкаць, калі яшчэ не пачалі, і нос вярцець ад мужыка, а за гэтага самага мужыка. Да таго ж гэта просты і мужны чалавек, яго мужнасьць будзе зразумелая кожнаму.

Дзеля чаго гэта ўсё. Пры наступным пэрманэнтным канцы часоў сыдуцца ў вырашальнай бітве захад і ўсход. Будзе іх усіх пароўну, адны толькі беларусы застануцца пасярэдзіне, не далучаныя ні да каго. І пачнецца бітва. І беларусы ўздымуць зброю. А калі ня стаць ім на чыйсьці з бакоў, біць гэтай зброяй прыйдзецца сябе. Разам з тым — а можа, так і трэба?

# КРЫТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

# Да Беларусі праз Еўропу

## Лагічны шлях расійскамоўных лібералаў

Выданне, якое разглядаецца ў артыкуле:

*Европейская перспектива Беларуси: интеллектуальные модели* / Сост. О. Шпарага. — Вильнюс: ЕГУ, 2007. — 280 с.

Цікавыя і своечасовыя кнігі трэба чытаць. Зборнік пад рэдакцыяй Вольгі Шпарагі падаецца менавіта такой кнігай. Чытанне яе вымагае разумення канцэпцый і паняццевага апарату, што выкарыстоўваюць аўтары, пераважная большасць якіх — выкладчыкі філасофскага факультэта віленскага ЕГУ. Менавіта філасофскага, канцэптуальнага асэнсавання як самаго феномена Еўропы і месца Беларусі ў ёй, суадносінаў беларускіх і еўрапейскіх ідэяў і дыскурсаў у самой Беларусі адчувальна не хапае. Нават калі зборнік прачытае толькі некалькі сотняў чалавек, увядзенне новых перспектываў, актуалізацыя новых схемаў самарэфлексіі і самаадчування, будзем спадзявацца, палепшыць якасць інтэлектуальнага і палітычнага дыскурсаў у Беларусі.

Прынамсі акурат такая праца дае надзею на паляпшэнне гэтай якасці. Перапісваць кніжкі ў рэцэнзіях для мяне заўжды было сумна і нецікава. Таму я вырашыў замест гэтага проста выкласці пэўныя думкі, якія нарадзіліся ў працэсе чытання зборніка. Урэшце, менавіта стымуляванне мыслення ёсць мэтай любой добрай літаратуры — асабліва акадэмічнай.

На адно пералічэнне ўсіх магчымых сэнсаў тэрміну «Еўропа» можа спатрэбіцца некалькі старонак, на іх аналіз — некалькі жыццяў. Еўропа адначасова рэальная і міфічная, матэрыяльная і іманентная. Яна існуе і як фізічнае цела (канты-

---

***Віталь Сіліцкі*** *— дырэктар Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» — аналіз «Анатомія прэвэнтыўнага аўтарытарызму» (2007, № 10). Назва тэксту паходзіць ад рэдакцыі.*

нент), і як ідэя, і як супольнасць людзей, і як інстытут. Таму, калі мы размаўляем пра «еўрапейскую перспектыву», то адразу ўзнікае пытанне, пра якую перспектыву Еўропы (фізічнай ці ўяўнай, рэальнай ці міфічнай) мы кажам. Еўропа філасофскіх дэбатаў і Еўропа палітычных інстытутаў, Еўропа футбольных баталій і Еўропа гандлёвых сувязяў, Еўропа акадэмічных абменаў і Еўропа памежнага супрацоўніцтва — у гэтай шматпланавай, шматузроўневай і супярэчлівай прасторы знайсці і вызначыць сваё месца можа даслоўна кожны, хто падзяляе падставовыя каштоўнасці, якія гэтыя прасторы «сшываюць».

Менавіта з-за шматграннасці Еўропы варыянтаў «еўрапейскай інтэграцыі» сапраўды безліч, прычым можна і не чакаць дзесьці адсталых на цывілізацыйным шляху суродзічаў. Можна стаць еўрапейцам у індывідуальным парадку і інтэгравацца ў еўрапейскі рынак працы — што сёння зусім не цягне сталай эміграцыі. Яшчэ менш праблемна (абы дазваляла адукацыя) інтэгравацца ў еўрапейскія культурныя практыкі. Можна, седзячы ў аднапакаёвай хрушчоўцы, пачынаць дзень з «Le Monde» на стартавай старонцы інтэрнэт-броўзэра. Можна, забіўшы на якасць унутранага футбольнага першынства, зрабіцца фанатам «Чэлсі» ці «Мілана» і нават стварыць мясцовы фан-клуб дзе-небудзь у Смілавічах (калі ўжо Хаім Суцін адтуль, то чаму ў Смілавічах не можа быць фан-клуба «Мілана»?). Вядома, такая еўрапеізацыя мае свае выразныя абмежаванні. Перарабіўшы трапную заўвагу Альміры Усманавай пра тое, што працэс нацыянальнага адзінства ў Беларусі прасоўваецца афіцыёзам праз «абагульненне практык спажывання», можна сказаць, што працэс «еўрапеізацыі» ў Беларусі пакуль што збольшага абмежаваны тым самым. З іншага боку, менавіта практыкі спажывання легітымізуюць «еўрапейскія нормы» і ў іншых галінах жыцця.

**Беларускі нацыяналізм застаецца ізаляваны ў межах палітычнай і інтэлектуальнай субкультуры.**

Каштоўнасная інтэграцыя, хоць і стварае перадумовы для пабудовы супольных інстытутаў і паглыблення практык, таксама можа заставацца ізаляванай ад інстытутаў, часам вымушана, з-за пэўнага ходу гістарычных абставінаў. Цэнтральна- і ўсходнееўрапейскія інтэлектуалы, паводле вызначэння іх брытанскага калегі Цімаці Гартана Эша, былі за часам халоднай вайны індывідуальнымі сябрамі еўрапейскай супольнасці і вольнага свету. Такая інтэграцыя была найперш праявай нонканфармізму і бунту супраць дыктатарскай рэчаіснасці, і шмат у чым гэты шлях паўтараюць і сённяшнія беларускія інтэлектуалы.

Што ж да інтэграцыі на ўзроўні практык і каштоўнасцяў, то яна магчымая ў індывідуальным і дробнагрупавым фарматах. Інтэграцыя інстытуцыйная магчыма толькі на ўзроўні палітычнай супольнасці. Яна вымагае вызначэння еўрапейскай інтэграцыі як фундаментальнай мэты і каштоўнасці, аднак нават перад гэтым — інстытуцыяналізацыю (у шырокім сэнсе) самой палітычнай супольнасці. Папросту кажучы, неабходным чыннікам еўрапейскай інтэграцыі Беларусі як супольнасці (а не беларусаў як індывідуумаў, сем'яў, групаў ці арганізацый) ёсць

канчатковае афармленне нацыянальнай дзяржаўнасці.

Паколькі праблематыцы нацыянальнага будаўніцтва ў зборніку адведзена даволі шмат месца, то яго з’яўленне можа лічыцца своеасаблівым сігналам пра збліжэнне пазіцый дзвюх адметных праеўрапейскіх плыняў на беларускім інтэлектуальным ландшафце. З аднаго боку, гэта адэпты «адраджэнскага праекту», якія даўно выкарыстоўваюць лозунг «Беларусь у Еўропу» ў якасці палітычнага слогану. З іншага, расійскамоўныя інтэлектуалы, якія доўгі час пазіцыянаваліся як «антыадраджэнскія еўрапейцы», для якіх беларускі нацыяналізм і еўрапейскія каштоўнасці былі не сумяшчальныя. Разрыў паміж гэтымі плынямі праходзіў зусім не толькі ў балючым для беларускай інтэлектуальнай супольнасці моўным пытанні. Можа, шмат хто з маіх калег і не пагодзіцца, але «антыадраджэнская» дэмакратычная інтэлігенцыя першапачаткова выразна прытрымлівалася каланіяльных пазіцый, разглядаючы акурат памкненні да эмансіпацыі ад палітычнай і культурнай метраполіі як галоўную пагрозу ліберальным палітычным праектам на тэрыторыі Беларусі. Для многіх прадстаўнікоў нашага інтэлектуальнага бамонду шлях у Еўропу да самага апошняга часу ляжаў калі не праз аэрапорт «Шарамецьева-2», то праз маскоўскія даследчыя інстытуты, універсітэты і бібліятэкі, але ў першую чаргу праз расійскія рэформы, галоўным ворагам якіх бачыліся нават не камуна-рэваншысты, а нацыянал-калектывізм адраджэнскай апазіцыі. Магчыма, з такім меркаваннем не пагодзяцца мае калегі, аднак чаму тады незалежнаму грамадству яшчэ зусім нядаўна навязваўся лозунг «Разам з Расіяй у Еўропу»?

**Беларускі нацыяналіст для многіх у Еўропе застаецца экзатычнай з’явай.**

Трэба адзначыць, што каланіяльныя ілюзіі расійскамоўных інтэлектуалаў толькі жывіліся палітычным і інтэлектуальным нарцысізмам адраджэнскай плыні і яе нежаданнем перайсці ад пропаведзяў да дыялогу, пра што ў зборніку нагадвае Пётра Рудкоўскі. За апошнія пятнаццаць гадоў абедзве інтэлектуальныя плыні прайшлі працэс глыбокай эвалюцыі — хтосьці канчаткова расчараваўся ў лібералізуючым патэнцыяле Расіі, іншыя сталі больш цвяроза ацэньваць шанцы на трыумф беларускага нацыяналізму, калі ён застанецца замкнёны ў межах палітычнай і інтэлектуальнай субкультуры. Застаецца толькі спадзявацца, што дыялог колішніх апанентаў будзе мець плён і для працэсаў нацыянальнага будаўніцтва, і для еўрапеізацыі Беларусі.

Калі нацыяналісты-адраджэнцы прыходзяць да Еўропы праз Беларусь, то «ЕГУшныя лібералы» прыходзяць да Беларусі праз Еўропу. «Еўрапеізацыя» адраджэнскага дыскурсу не выклікае асаблівых пытанняў. Урэшце, нацыя як сродак самаарганізацыі грамадства — гэта суцэльна еўрапейскае ноў-хаў, таму казаць пра будаўніцтва беларускай нацыі ў адрыве ад пытання пра еўрапейскую будучыню Беларусі проста нелагічна. Акрамя таго, Еўропа ў нацыянальным дыскурсе ёсць сродкам дэкаланізацыі і палітычнай эмансіпацыі ад былой (?) метраполіі — адрозна ад Расіі, Еўропа для беларускага нацыяналіста гэта «не экзотыка» — нават калі беларускі нацыяналіст можа дагэтуль для многіх у Еўропе (і

не толькі) заставацца экзатычнай з'явай.

Што да нашых расійскамоўных ліberalаў, то яны, падаецца, Беларусь «вылічылі» лагічным шляхам. Разважаючы ў сваім артыкуле пра сумяшчэнне еўрапейскага і нацыянальнага, Уладзімір Фурс цікавіцца ў чытача, ці не дзіўна для апошняга, што «ліберал-ЕГУшнік» кажа пра тое, што афармленне беларускай нацыі ёсць неабходнай умовай руху Беларусі ў Еўропу. Аднак гэтая тэза наўпрост вынікае з логікі яго разважанняў: «далучэнне» да Еўропы ёсць палітычным праектам, дзеля рэалізацыі якога неабходная палітыка як элемент грамадскага жыцця, якая ў сваю чаргу магчымая толькі ва ўмовах палітычнай супольнасці, якая і складае нацыю. Засталося няшмат — вызначыцца з рабочай дэфініцыяй нацыі, аднак і тут на абодвух баках інтэлектуальнага ландшафту адбыліся значныя перамены, якія дазваляюць спадзявацца, што нацыянальнае пытанне стане аб'яднаўчым, а не канфліктным чыннікам для беларускай інтэлектуальнай супольнасці.

Безумоўна, нацыянальная праблематыка ў адносінах да еўрапейскага праекта натыкаецца на вядомыя супярэчнасці, якія згадваюць у сваіх аналізах, сярод іншых, Альміра Усманава і Рыгор Мінянкоў. Сучасны еўрапейскі праект прынамсі імкнецца быць постнацыянальным. Хаця з гэтай тэзай не згодныя ўсе тэарэтыкі і практыкі еўрапейскага адзінства, але казаць уголас пра нацыянальныя каштоўнасці і нацыянальнае адраджэнне ў сённяшняй Еўропе, асабліва на захад ад Одры, — гэта як мінімум праява непаліткарэктнасці, як максімум — сцвярджэнне ўласнай адсталасці. Таму гэткая ўзаемасувязь паміж нацыянальным будаўніцтвам і еўрапейскай інтэграцыяй, зразумелая і лагічная з беларускага гледзішча, здавалася б, можа не заўжды быць адэкватна ўспрынятая паліткарэктнай Еўропай, асабліва пасля польска-нямецкіх «разборак» у 2006—2007 гг. Таму нашыя нацыянальныя памкненні вымагаюць лепшага маркетынгу ў Еўропе — на што, дарэчы, ёсць спадзяванні. Паказальна, што акурат у хвіліны, калі пісалася гэтая рэцэнзія, у Страсбургу святкавалі гадавіну Беларускай Народнай Рэспублікі на ўзроўні, на якім дай бог, каб хутка давялося адзначыць 25 сакавіка ў Мінску. Канечне, такое святкаванне і яго падтрымка інстытуцыямі ЕС — найперш палітычная акцыя. Але зноў-такі — тое, што менавіта ідэалогія беларускага нацыянальнага адраджэння аформіла сябе як візітоўку праеўрапейскіх памкненняў беларусаў і здолела прэзентавацца як такая астатняй Еўропе, ёсць, бадай, адбытым фактам. Мы жыццёва зацікаўленыя ўва ўмацаванні менавіта гэтага праеўрапейскага боку беларускага нацыяналізму, у выпрацоўцы супольнага культурнага кода, які грунтуецца на тых самых еўрапейскіх прынцыпах адкрытасці, павагі і дыялогу.

Еўропа ўяўляецца і прапагандуе сябе як прастора салідарнасці і дыялогу, аднак у той самы час яна наскрозь прасякнута духам выключнасці і выключэння, які найбольш выразна выяўляецца ў феномене еўропацэнтрызму. Многія аўтары кнігі ўказваюць на «падпарадкаваны» статус «новай» Еўропы ў адносінах да «старой». Сапраўды, «старая» Еўропа не толькі дамінуе ў эканамічным і палітычным сэнсе, але і задае сваёй усходняй палове ўсю сістэму каштоўнасцяў і спо-

саб мыслення пра сябе, не падпускаючы перыферыйных паўчужынцаў да святая святых — вызначэння ўласнага культурнага кода. Маючы на ўвазе, што зборнік пісалі пераважна філосафы, можна ўявіць, што менавіта такая эксклюзіўнасць Еўропы выклікае ў іх асяродку найбольшы дыскамфорт. Хоць з іншага гледзішча, такое ўяўленне пра ўсход Еўропы як новага «падпарадкаванага» характэрны найперш для лявацкіх інтэлектуальных плыняў, прадстаўнікі якіх робяцца надзвычай папулярныя ў беларускіх афіцыйных медыях. (У гэтым сэнсе аналізы Альміры Усманавай і Андрэя Горных больш трапна выглядалі б у пары адзін з адным.)

Што да аўтара гэтых радкоў, то яму застаецца прыйсці да іранічнай высновы, што беларускім сантэхнікам, якія могуць нават не падазраваць пра сваю падпарадкаванасць, бо ад іх здольнасці перакрыць кран залежаць лёсы людзей, інтэграваціца ў Еўропу будзе нашмат хутчэй, чым беларускім філосафам, — прымаючы пад увагу сітуацыю на рынках працы нашых суседзяў. Рынкі былі папросту аголеныя масавай эміграцыяй маладых літоўцаў і палякаў у Англію і Ірландыю. (Урэшце, гэтая выснова і вынікае з аналізу спадарыні Усманавай.) Аднак, калі больш сур'ёзна, то далучэнне да Еўропы сапраўды зводзіцца да прыняцця каштоўнасцяў, інстытутаў і практык, у вызначэнні якіх мы не ўдзельнічалі. У самім гэтым працэсе дыскрымінацыі не больш, чым у навучанні школьніка па падручніках, якіх ён сам не пісаў.

Калі менавіта Еўропа здолела прапанаваць мадэль дачыненняў паміж людзьмі, супольнасцямі і дзяржавамі, якая грунтуецца на прынцыпе дыялогу і выключае прынцып татальнага знішчэння апанента, калі менавіта ЕС стаў мадэллю пабудовы стабільнага парадку, які грунтуецца на прынцыпе таго самага дыялогу і ўзаемнай адказнасці, то нічога дрэннага ў еўропацэнтрычным свеце, якога так баяцца еўрапейскія ж паліткарэктныя інтэлектуалы, няма. Пытанне раўнапраўя Захаду і Усходу — гэта не пытанне пабудовы «альтэрнатыўных» светапоглядных і каштоўнасных сістэм, а роўнага ўдзелу ў падтрыманні, развіцці і пашырэнні тых каштоўнасцяў, ідэяў і інстытутаў, што на сёння склалі аснову еўрапейскай цывілізацыі. І толькі далучэнне да гэтай супольнасці на ўсіх трох узроўнях — каштоўнасцяў, інстытутаў і практык, — дае шанец на такое раўнапраўе. Калі нешта і можа быць прыкладам таго, як маленькія «падпарадкаваныя» краіны могуць заняць годнае месца ў свеце, дык гэта перадача старшынёўства ў Еўрапейскім Саюзе ад маленькай Партугаліі да маленькай Славеніі ў студзені 2008 г.

Дарэчы, ні ў водным еўрапейскім інстытуце падпарадкаванасць не выяўлена так відавочна, як у Лізе чэмпіёнаў УЕФА, дзе ўсходнія клубы далей за групавы этап прабіваюцца раз на некалькі гадоў. З іншага боку, нідзе так не рэалізавана ідэя еўрапейскай роўнасці, як у «Еўрабачанні». Што з іх глядзець — рашайце самі. Абодва інстытуты, дарэчы, ствараліся дзеля прасоўвання еўрапейскага адзінства.

Праблема Усходняй Еўропы і, у прыватнасці, Беларусі — не ў яе падпарадкаванасці і нецікавасці Захаду. Экзотыка прыцягвае ўвагу толькі на нейкі час і пераважна ў пару вакацый. Сапраўды цікавая не-экзотыка, агульная сутнасць —

нават у нязвыклым афармленні. Цэнтральная Еўропа стала сапраўды цікавай для палітыкі, бізнесу і культуры, таму што яна была і стала «сваёй». Выбух інтарэсу да Украіны падчас памаранчавай рэвалюцыі таксама тлумачыўся тым, што еўрапейцы пабачылі ва ўкраінцах працяг саміх сябе.

Цэнтральна- і ўсходнееўрапейскія інтэлектуалы могуць не быць заканадаўцамі інтэлектуальнай моды на Захадзе, але без іх удзелу, ці, больш дакладна, без гістарычнага досведу рэгіёну Цэнтральнай і Усходняй Еўропы нельга растлумачыць, як паўстала і афармілася тое, што сёння ўяўляе з сябе Еўропа. Памежжа, якое часцяком пагардліва мянуюць лімітрофам, мае адну перавагу перад метраполіяй: яно вызначае межы, а значыць і найбольш базавы, асноўны параметр яе ідэнтычнасці. Магчымае, але неабавязковае пашырэнне Еўропы далей на Усход (на Усходнюю Еўропу ў адным кірунку і Турцыю на іншым) ставіць перад еўрапейскай метраполіяй такі самы, калі не больш грунтоўны, выклік пераасэнсавання сябе, як і пашырэнне ЕС на Польшчу, Балтыю ды Балканы. У гэтым сэнсе для беларускіх інтэлектуалаў працы не менш, чым для беларускіх сантэхнікаў, якія будуць мусіць замяніць усе краны на еўрастандарт. Калі «новая» Усходняя Еўропа пачне грукацца ў дзверы ЕС, еўрапейскаму грамадству давядзецца прайсці праз новы раунд пераасэнсавання. І дапамагчы ў гэтым пераасэнсаванні будзе справай ужо нашых інтэлектуалаў — як калісьці гэта было справай Гаўла і Патачкі, Калакоўскага і Гедройця.

**Калі «новая» Усходняя Еўропа пачне грукацца ў дзверы ЕС, еўрапейскаму грамадству давядзецца прайсці праз новы раунд пераасэнсавання.**

Адзінства інтэлектуальнага дыскурсу — безумоўна важны фактар у мацаванні еўрапейскага адзінства, але не менш, а, магчыма, і больш істотнае адзінства гістарычнага досведу. Таму мне падаюцца вельмі важнымі і актуальнымі разважанні Вольгі Шпарагі пра «салідарнасць узрушаных» — гэтую геніяльную формулу Яна Патачкі, якая выразіла сутнасць еўрапейскага адзінства і ў пэўнай ступені адлюстроўвала ўвесь *raison d'être* еўрапейскіх інтэграцыйных працэсаў і праектаў. Траўма сусветных войнаў (якія найперш былі войнамі еўрапейскімі) і масавага знішчэння еўрапейцамі адзін аднаго падштурхнула аб'яднаўчыя працэсы, натхняльнікамі якіх сталі Манэ і Шуман.

Можна сказаць, што першапачатковы еўрапейскі праект, натхнёны жаданнем ніколі болей не мець на кантыненце крывавых братазабойчых войнаў, быў даведзены да лагічнага завяршэння на ўзроўні «Еўропы 15-ці» ў 1992—1995 гг., калі быў створаны Еўрасаюз і пад сцягам ЕС аб'яднаўся, у той ці іншай форме (ЕС, Шэнгенская зона, Еўрапейская эканамічная прастора), увесь еўрапейскі абшар, што пазбегнуў камуністычнага панавання. Траўма ад падзелаў Еўропы ў паваенны час таксама спрычыніла экзістэнцыйны страх яшчэ аднаго ўзроўню. Працэс яго пераадольвання быў запачаткаваны 9 лістапада 1989 г. разбурэннем Берлінскага муру і быў даведзены да лагічнага завяршэння 1 траўня 2004 г. далучэннем да ЕС васьмі цэнтральна- і ўсходнееўрапейскіх краінаў.

Нарэшце, трэцяе ўзрушэнне, якое спрычынілі балканскія войны пачатку і сярэдзіны 1990-х гг., прымушае ЕС пашырацца ў паўднёва-ўсходнім кірунку. Гэтае апошняе пашырэнне найбольш непрадказальнае ў выніках (незразумела, як паўнапраўнымі і адказнымі сябрамі еўрапейскай супольнасці могуць стаць тэрыторыі кшталту Босніі і Косава, само існаванне якіх як дзяржаўных адзінак без патранажу ЕС было б немагчыма. А дзе вы бачылі, каб інвалід, які прыкуты да шпітальнага ложка, вызначаў правілы працы і распарадак дня шпіталя?). Так ці інакш, узрушэнне было неад'емным чыннікам, які вызначаў логіку і дынаміку працэсу будаўніцтва адзінай Еўропы — прычым гэтае ўзрушэнне не лакалізавалася ў рамках аднаго рэгіёну, яно было калі не трагедыяй, то драмай усяго кантыненту.

Гэтыя ж узрушэнні вызначылі і яшчэ адно еўрапейскае вымярэнне, пра якое, на жаль, у кнізе сказана зусім няшмат — еўраатлантычнае. Адзіная Еўропа не магла ні захавацца, ні паўстаць, ні інстытуцыяналізавацца інакш як складнік шырэйшай супольнасці «заходняга свету» — прынамсі, двуадзінага цэлага разам са Злучанымі Штатамі. Праект адзінай Еўропы выжыў з расійскімі танкамі ў Берліне, але калі б яны дайшлі да Парыжа, то наўрад ці ідэі Шумана і Манэ нават нарадзіліся б. «Знесці гэты мур» заклікаў генсека Гарбачова не канцлер ФРГ і нават не старшыня Еўракамісіі, а прэзідэнт Рэйган. Ну і «вялікі скачок» з пашырэннем ЕС у 2004 г. быў магчымы толькі таму, што прэзідэнт Буш прасунуў рашэнне пра фарсіраванае пашырэнне НАТО ў 2002-м. «Безатлантычнай» Еўропы не магло быць ні ў тэорыі, ні ў практыцы. «Салідарнасць узрушаных» — гэта найперш апеляцыя да гэтага еўраатлантычнага адзінства, у якім і толькі ў якім Еўропа магла набыць свой, магчыма, найвялікшы сэнс — як тэрыторыі Свабоды. І, што важней, менавіта адшуканнем і падкрэсліваннем гістарычных, духоўных і культурных каранёў з гэтай тэрыторыяй абаранялася права на Свабоду там, дзе яна яшчэ не ўступіла ў свае правы.

У Еўропе падыходзіць да канца эпоха ўзрушэнняў — прынамсі такіх, што вымагаюць далейшага пашырэння ЕС. Выглядае, што акурат апошнія пашырэнні Еўропы былі больш значнымі ўзрушэннямі для жыхароў ЕС, чым раскол ці аддзяленне ад каго б там ні было. Мы можам, канечне, паспрабаваць інтэрпрэтаваць постсавецкую дыктатуру ў Беларусі як агульнаеўрапейскую траўму, аднак ці з'яўляецца яна траўмай для саміх беларусаў? З іншага боку, беларускія еўрапейцы пакуль не толькі не імкнуцца асэнсаваць атлантычны бок еўрапейскага адзінства, але і свядома замоўчваюць пытанне, зыходзячы з пэўных і добра вядомых маркетынгавых меркаванняў. Што, аднак, не адмяняе рэчаіснасці — казаць пра еўрапейскую інтэграцыю ў рэальным жыцці без вызначэння адносінаў з Паўночнаатлантычным альянсам немагчыма. (І менавіта з-за гэтага адэпты расійскага ўплыву ў Беларусі апошні час прыкладаюць столькі намаганняў для дыскрэдытацыі еўрапейскай ідэі ў Беларусі — для іх яна легітымізацыйны сродак для інтэграцыі ў НАТО.) Магчыма, гэтыя два чыннікі ствараюць найбольш моцныя знешнія абмежаванні для руху Беларусі ў Еўропу ў будучым.

І ўсё ж такі мы не можам сабе дазволіць раскошы не быць еўраоптымістамі.

Калі еўрапейская ідэнтычнасць паўстае тады, калі «не адчуваеш сябе ані ў якім яе пункце цалкам чужынцам», то можна сказаць, што еўрапейцам робяцца тады, калі цябе ўжо немагчыма цалкам выпіхнуць з адной са шматлікіх еўрапейскіх «прастораў».

Еўрапейская перспектыва ў Беларусі не будзе выключаная ніколі проста таму, што Еўропа ніколі не будзе для Беларусі суцэльнай экзотыкай — і наадварот. Еўропа як цывілізацыя пачыналася з вялікіх ідэяў, Еўропа як інстытут — з малых крокаў тэхнічнага характару. Калі гэтым малым крокам дадаецца неабходны філасофскі сэнс — наша еўрапейская будучыня выглядае ўжо і не такой безнадзейнай.

## КРЫТЫКА

ДЗМІТРЫ КАРЭНКА

# Еўрапейская перспектыва Беларусі

## Неабходнасць камунікацыі і пошуку агульных падставаў

Выданне, якое разглядаецца ў гэтым артыкуле:

*Европейская перспектива Беларуси: интеллектуальные модели* / Сост. О. Шпарага. — Вильнюс: ЕГУ, 2007. — 280 с.

### Уступ: асноўныя пазіцыі

Гэты навуковы зборнік, выдадзены ў снежні 2007 г. у межах праекта «Сацыяльная трансфармацыі ў памежжы: Беларусь, Украіна, Малдова», улучае ў сябе шэраг тэкстаў, прысвечаных аналізу сучаснай (посткамуністычнай) беларускай сітуацыі і спробам яе канцэптуалізацыі ў святле пэўнай еўрапейскай перспектывы. Сярод іншага, крытыкуецца сучасная афіцыйная беларуская ідэалогія ў дачыненні да вобразу Еўропы (шырэй — Захаду), а таксама асэнсоўваюцца перспектывы палітычнай еўраінтэграцыі Беларусі. Апроч таго, у дадатку зборніка прадстаўлена некалькі перакладаў такіх вядомых еўрапейскіх сацыяльных тэарэтыкаў і філосафаў, як З. Бауман і Я. Патачка.

Як можна даведацца з аўтабіяграфічнай даведкі, пададзенай у канцы зборніка, большасць аўтараў звязаныя з Еўрапейскім гуманітарным універсітэтам, які працягвае працу ў Вільні. Такі склад аўтараў вядзе да непазбежнай тэкстуальнай абмежаванасці, хоць і не звужае шырокайварыятыўнасці прапанаваных метадалагічных падыходаў. Аднак гэта можа павышаць інтэлектуальную рэпрэзентатыўнасць зборніка, у тым ліку адносна той ранейшай працы, якая ўжо была зробленая яго аўтарамі.

---

***Дзьмітры Карэнка*** *нарадзіўся ў 1981 г. у Менску. Скончыў Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт па спэцыяльнасьці «культуралёгія». Магістар Ланкастэрскага ўнівэрсытэту. У 2006—2007 гг. выкладаў у Саўтвэстэрн каледжы (ЗША). Працуе сурэдактарам інтэрнэт-часопісу «Новая Эўропа» (http://n-europe.eu).*

Кніга працягвае калектыўную інтэлектуальную працу філосафаў ЕГУ па беларускай праблематыцы, пачатую яшчэ ў 2005 г. Менавіта ў той час выйшаў чарговы нумар створанага на базе ЕГУ філасофска-культуралагічнага часопіса «Топос». З прычыны закрыцця ЕГУ ў Мінску ў ім хіба ўпершыню цэнтральным прадметам аналізу сталася сучасная беларуская сітуацыя — у прыватнасці, суадносіны паміж уладай і універсітэтам. Наступны ж, 13-ты нумар «Топоса» быў прысвечаны аналізу феномена выбару і выбараў на прыкладзе беларускіх выбараў 2006 г.[1] Менавіта ў такой рэтраспектыве варта глядзець і на вынік апошняе калектыўнай працы, якая працягвае інтэлектуальнае заангажаванне Беларуссю яе аўтараў і развівае аўтарскія думкі, выказаныя раней.

Але і без гэтае перадгісторыі кніга актуальная для шырокай аўдыторыі. Па-першае, актуальная сама пастаноўка пытання аб еўрапейскасці Беларусі. Хоць пытанне еўрапейскасці ў дачыненні да Беларусі падаецца зусім не новым у беларускіх інтэлектуальных дыскусіях, тым не менш, пастаноўка пытання аб еўрапейскіх *перспектывах* Беларусі ў якасці *інтэлектуальнай мадэлі, то бок пэўнага філасофскага асэнсавання ці канцэптуалізацыі,* выглядае цалкам новай. Гэта значыць, што еўрапейскую перспектыву Беларусі сёння можна змадэляваць тут-і-цяпер.

Па-другое, актуальнасць кнігі абумоўлена сённяшнімі дачыненнямі Беларусі і Еўрасаюза. У снежні 2007 г. адбылося чарговае пашырэнне шэнгенскай зоны, у выніку якога Беларусь «зноў» апынулася на еўрапейскім памежжы. Пра «еўрапейскую перспектыву» нагадвае нядаўняе адкрыццё прадстаўніцтва камісіі ЕС у Мінску. Еўрапейскі кірунак таксама стаўся адным з вызначальных у незалежных грамадзянскіх акцыях накшталт Еўрапейскага маршу.

Такім чынам, ужо цяпер еўрапейская ідэя выкарыстоўваецца ў Беларусі рознымі сацыяльнымі групамі дзеля дасягнення сваіх мэтаў. Аднак бракуе яе тэарэтычнага і сістэматычнага аналізу, які б не абмяжоўваўся інтарэсамі тых ці іншых актыўных палітычных груп. Выканаць гэтую задачу і паспрабавалі аўтары кніжкі.

Першае пытанне, якое паўстае пры разглядзе тэкстаў: што агульнага можна вылучыць ва ўсіх (ці большасці) аўтарскіх пазіцыях? Які агульны аўтарскі «месідж» аб еўрапейскай перспектыве Беларусі?

Гэты «месідж» складаецца з трох элементаў. Па-першае, пачатковай умовай мадэлявання розных перспектываў з'яўляецца неабходнасць улічваць спецыфіку (унікальнасць, лакальнасць) беларускага кантэксту. Гэтая спецыфіка можа фармулявацца ў розных катэгорыях: постсавецкасці, нацыянальнай ідэі, сітуацыі памежнасці, пэўнай ідэалагізаванасці, інстытуцыянальнай канфігурацыі і г. д. Па-другое, агульнай рысай з'яўляецца сцверджанне неабходнасці пошуку (ці стварэння) грамадзянскай ідэнтычнасці альбо грама-

[1] Аўтар гэтае рэцэнзіі быў таксама адным з аўтараў «Топоса», прысвечанага выбарам 2006 г. (http://topos.ehu.lt/zine/2006/2/index.htm)

дзянскага дыскурсу, які б не супрацьпастаўляў сябе іншым праектам (да прыкладу, нацыяналістычным), а быў бы агульнай платформай, якая б злучала ўсе праекты, скіраваныя на усталяванне лакальнай аўтаноміі ў беларускім кантэксце (канцэпцыя «інклюзіўнага нацыяналізму» У. Фурса). Па-трэцяе, Беларусь дагэтуль не з'яўляецца сапраўдным самастойным суб'ектам, здольным свабодна вырашаць пытанні свайго далейшага лёсу. Каб стаць ім, неабходна ажыццявіць як перагляд культурных каштоўнасцяў (дэідэалагізацыя, імкненне да ідэалаў адкрытага грамадства), так і пэўныя інстытуцыянальныя трансфармацыі.

Каротка засяродзімся на прапанаваных мадэлях, каб закрануць іх найбольш істотныя моманты і заахвоціць чытача да прачытання кнігі і фармулявання ўласнай пазіцыі.

## Беларусь на еўрапейскім памежжы: у пошуках супольнасці і свабоды[2] (В. Шпарага)

Мадэль еўрапейскай перспектывы Беларусі, якую прапануе ў сваім артыкуле В. Шпарага, складаецца з двух канцэптуальных элементаў. Першы — гэта разуменне таго, чым сёння з'яўляецца «еўрапейская ідэя» (еўрапейскасць) на тэарэтычным узроўні, другі — асэнсаванне спецыфікі беларускага кантэксту. Менавіта ў спалучэнні гэтых элементаў можа быць выбудаваная пэўная еўрапейская перспектыва ў дачыненні да Беларусі.

Адноўлены еўрапейскі праект, пасля спусташальнага досведу дзвюх сусветных войнаў, варта сёння разумець з гледзішча такіх канцэпцый, як «*салідарнасць узрушаных*», г. зн. «салідарнасць чулых да розных праяваў гвалту», ці салідарнасць тых, хто зазнаў «абсалютную свабоду» ў выніку самаахвяравання падчас вайны і здолеў выстаяць перад татальнай бессэнсоўнасцю жыцця (Я. Патачка).

Аднак толькі «салідарнасці» недастаткова для таго, каб «еўрапейскі праект» займеў трывалую аснову. Другім складнікам мае стаць «вяртанне палітыкі ў нарматыўным сэнсе» — палітыкі як магчымасці *выбару* і стварэння на гэтай падставе «нялёгкай раўнавагі» (І. Берлін) каштоўнасцяў — таго, што можна ў гэтым кантэксце назваць «разнастайнасцю ў адзінстве». Такім чынам, В. Шпарага мяркуе, што двума найважнейшымі складнікамі еўрапейскай ідэі з'яўляюцца грамадзянская салідарнасць і грамадзянская творчасць, якая здзяйсняецца ва ўмовах палітычнай аўтаноміі (свабоды).

Не варта падманвацца, што згаданая вышэй раўнавага каштоўнасцяў была (ці будзе) лёгкадасягальнай мэтай. Хутчэй размова ідзе пра мінімальныя ступені канфлікту: паколькі каштоўнасці маюць абсалютнае вымярэнне, іх «кансенсус» немагчымы паводле вызначэння. У кожным выпадку адбываецца

[2] Тут і далей назвы падраздзелаў не супадаюць з назвамі адпаведных артыкулаў аўтараў. Нашы назвы сфармуляваныя для таго, каб зрабіць максімальна выразнай для чытача асноўную думку аўтараў адносна еўрапейскага вымярэння ў беларускім кантэксце. Арыгінальная назва артыкула В. Шпарагі ў зборніку: «У пошуках Еўропы, ці «Ідэя Еўропы» ў прасторы дыялогу».

*партыкулярны* выбар *універсаліяў,* у кантэксце якога можна казаць хутчэй пра мінімалізацыю канфлікту, чым пра іх спакойнае (ідэалістычнае) суіснаванне.

Калі разважаць пра еўрапейскі праект у больш строгіх катэгорыях, дык паводле такіх філосафаў, як Дэрыда і Дарэнхоф, яго трэба сфармуляваць як адказнасць за будучыню міжнароднага права. Апроч таго, еўрапейскі праект, еўрапейскую перспектыву трэба скарэктаваць і *еўрапейскай рэтраспектывай,* якая можа стацца як формай самакрытыкі (крытыкі праяваў еўрацэнтрызму), так і *творчым працэсам* інтэрпрэтацыі пэўных (філасофскіх) вытокаў палітычнага ладу. Напрыклад, зварот да традыцыяў антычнага *polis*'а альбо да хрысціянскай традыцыі размежавання духоўнай і свецкай улады, рэлігіі і палітыкі і г. д.

«Ідэя Еўропы» шырэйшая за геаграфічную лакалізацыю Еўропы і можа рэалізаваць сябе далёка за яе тэрытарыяльнымі межамі. І наадварот: факт знаходжання ў геаграфічнай Еўропе аўтаматычна не гарантуе прыналежнасці да «еўрапейскасці». Еўрапейская ідэя грунтуецца на падставе ідэалаў грамадзянскай салідарнасці і грамадзянскай творчасці. «Еўрапейская ідэя», альбо «еўрапейская перспектыва», мае ў сабе два элементы, якія нельга назваць узаемазамяняльнымі — салідарнасць і выбар[3]. Калі з дапамогай катэгорыі салідарнасці канстытуюецца пэўнае вымярэнне рэляцыйнасці і ўзаемнасці (Еўропа немагчымая без салідарнага стаўлення да праяваў гвалту як унутры яе, так і звонку), дык пытанне выбару вырашаецца шляхам звароту да саміх сябе — як выбару саміх сябе. Іншымі словамі, нават самыя важныя і моцныя праявы салідарнасці, звонку ці ўнутры краіны, не могуць замяніць праблемы ўласнага выбару дзеля таго, каб еўрапейская перспектыва сталася магчымай у дадзеным культурна-палітычным кантэксце.

Узнікае пытанне: дзе тут можна знайсці сувязь з Беларуссю? Як гэтую «еўрапейскасць» можна дастасаваць да беларускага кантэксту? На думку В. Шпарагі, элемент, які можа ўключыць Беларусь у еўрапейскі кантэкст, — гэта панятак «салідарнасці ўзрушаных». Менавіта такі досвед экзістэнцыйнай заклапочанасці, як унутры Беларусі, так і па-за яе межамі, можа стаць падставай для рэалізацыі еўрапейскай перспектывы Беларусі.

Тым не менш застаецца яшчэ пытанне спецыфікі беларускай сітуацыі (культуры) — таго, што ў пэўным сэнсе вылучае Беларусь адносна іншых еўрапейскіх культурных кантэкстаў. У сваіх развагах В. Шпарага прапануе вярнуцца да ідэяў, выказаных на пачатку XX ст. беларускім філосафам І. Абдзіраловічам у працы «Адвечным шляхам», дзе ў якасці падставовых рысаў беларускай культуры была зазначана неакрэсленасць, невыразнасць.

Такая неакрэсленасць культуры, з аднаго боку, не дазволіла канчаткова замацавацца тут ані ўсходняму, ані заходняму культурнаму ўплыву, але з іншага боку, пазбавіла магчымасці паў-

[3] В. Шпарага фармулюе гэтую праблематыку таксама ў тэрмінах «супольнасць» і «свабода». Гэтую пару можна разглядаць як эквівалент звязкі «салідарнасць» і «выбар».

стаць нацыянальнаму праекту ў яго класічных формах. Што ў такім выпадку можна *канцэптуальна акрэсліць* у якасці культурнай спецыфікі? Адштурхоўваючыся ад ідэяў В. Акудовіча і І. Бабкова, В. Шпарага бачыць яе *памежнае становішча* (ці неакрэсленасць, паводле Абдзіраловіча), у якім знаходзіцца і знаходзіць сябе беларуская культура. Менавіта такі памежны, гібрыдны стан беларускай культуры на працягу доўгай гісторыі прыводзіў і прыводзіць да цяжкасцяў адназначнай ідэнтыфікацыі мясцовых «культурных герояў», якіх даводзіцца апісваць у катэгорыях «свае чужакі» (Міцкевіч) альбо «чужыя свае» (Лукашэнка).

*Якая еўрапейская перспектыва вынікае з гэтых развагаў для Беларусі?* Ці, крыху перафармулюючы пытанне: чым *можа быць* беларускасць з гледзішча еўрапейскай перспектывы?

*Быць беларусам* [у еўрапейскай перспектыве. — **Дз. К.**], — зазначае аўтарка, — *можа значыць бесперапыннае даследаванне — разуменне і тлумачэнне — свайго памежнага існавання з мэтай усталявання «крохкай раўнавагі» культурнага, палітычнага, сацыяльнага наратываў з наратывамі суседзяў. Пры гэтым суседзі таксама мусяць быць уцягнутыя ў такое даследаванне, супольны ўдзел у якім, не адмяняючы ані сваёй унікальнасці, ані важнасці агульнай справы, і можна было б у выніку акрэсліць* Еўропай.

Адзначыўшы прадуктыўнасць прапанаванай мадэлі, хацелася б, аднак, зрабіць некалькі крытычных каментароў. Падкрэсліваючы неабходную ролю творчага аспекту ў канструяванні еўрапейскага праекта, В. Шпарага губляе яго ў дачыненні да беларускага кантэксту. Яна ставіць акцэнт хутчэй на даследчыцкую працу, што выклікае непазбежную празмерную інтэлектуалізацыю еўрапейскай перспектывы і тым самым звужае кола патэнцыйных удзельнікаў у такім (грамадскім) праекце. Па-другое, аспект каштоўнасцяў, выразна падкрэслены ў дачыненні да еўрапейскага кантэксту, застаецца не да канца выразна сфармуляваны адносна Беларусі. Ідэя пошуку і даследавання з'яўляецца хутчэй добрай і важнай інтэлектуальнай задачай, чым каштоўнасцю, якая была б зразумелая і прынятая шырэйшай часткай грамадства.

Пытанне, такім чынам, гучыць так: якія больш агульныя *каштоўнасці* мы можам знайсці, каб іх магло прыняць шырэйшае кола людзей і каб яны адначасова былі звязаныя з тым памежным становішчам, якое было акрэслена ў тэарэтычнай мадэлі як уласцівае для беларускай культуры? Прынамсі, у межах еўрапейскай перспектывы памежжа нельга інтэрпрэтаваць як аксіялагічнае памежжа, бо гэта пазіцыя рэлятывізму, у той час як каштоўнасці застаюцца абсалютнымі катэгорыямі. Адказ менавіта на гэтае пытанне трэба знайсці, каб стыкоўка паміж двума элементамі мадэлі («еўрапейскім» і «беларускім») сталася больш шчыльнай, а *пераход* да еўрапейскай перспектывы — больш шырокім у сэнсе колькасці заангажаваных сацыяльных групаў. Інакш кажучы, неабходна таксама сфармуляваць пытанне *беларускай перспектывы*, якую можна было б суаднесці з еўрапейскай.

## Інклюзіўны грамадзянскі нацыяналізм як форма лакальнай аўтаноміі (У. Фурс)

Артыкул У. Фурса адгукаецца на пастаўленую вышэй праблему каштоўнаснага вымярэння беларускага кантэксту. Яго аўтар спрабуе адказаць на пытанне, чым ёсць ці, хутчэй, чым можа быць (альтэрнатыўны) нацыянальны праект у Беларусі і на якія каштоўнасці ён можа быць арыентаваны.

Падобнае пытанне ўвогуле паўстала ў той інтэлектуальнай прасторы, якую сам аўтар вызначае як празаходнюю (кантэкст ЕГУ) і больш схільную да ліберальнай ідэалогіі, чым да нацыянальнай. Навошта ўвогуле спатрэбілася актуалізацыя пытання аб нацыянальным праекце?

Нацыянальны праект, на думку тэарэтыка, можа быць зразуметы не абавязкова ў эсенцыялісцка-прымардыялісцкіх катэгорыях, г. зн. выключна на падставе пэўных сімвалаў, мовы, гістарычных падзей і г. д. Альтэрнатывай гэтаму бачыцца такі нацыянальны праект, які быў бы прынцыпова адкрыты для інтэрпрэтацыі. Нацыянальная ідэя з'яўляецца хутчэй рэгулятыўнай ідэяй, то бок пэўнай абстракцыяй, якая ніколі не мае канчатковай зместавай напоўненасці. Важнасць гэтай ідэі тлумачыцца тым, што яна стварае пэўны нарматыўны ідэал, неабходнасць існавання і імкнення да якога мусіць падзяляць уся супольнасць. Аднак у сутнасным плане гэты ідэал не мае канчатковых параметраў.

Такую форму нацыяналізму з яго прынцыповай адкрытасцю да розных дыскурсаў аўтар прапануе называць *інклюзіўным (грамадзянскім) нацыяналізмам*. У існасці, гэта прапанова перавесці беларускі нацыянальны дыскурс у дэмакратычнае рэчышча шляхам ягонай унутранай плюралізацыі, стварэння камунікацыйнай прасторы, у межах якой розныя прыхільнікі нацыянальнай ідэі (адным з базавых складнікаў якой з'яўляецца незалежнасць Беларусі) змогуць знайсці паразуменне, прызнаючы роўнае права кожнага з бакоў на ўдзел у камунікацыі і — шырэй — у нацыятварэнні.

Гэтая думка не з'яўляецца цалкам новай. Новая тут хутчэй форма канцэптуалізацыі. Спасылаючыся на В. Акудовіча, прафесар Р. Мінянкоў даводзіць гэтую самую думку шляхам размежавання нацыянальнай ідэі і нацыянальнага дыскурсу, які супрацьпастаўляецца сваёй адкрытасцю («інклюзіўнасцю») нацыянальнай ідэі, як таму, што заўсёды імкнецца ўсталяваць пэўныя і нязменныя межы.

І ўсё ж такі мадэль «інклюзіўнага нацыяналізму» не бязмежная ў сваёй адкрытасці. Не менш важную ролю для канструявання нацыянальнага праекта адыграе супрацьстаўленне і адмежаванне ад таго, што прынцыпова не можа быць уключана ў сферу аўтаноміі, таго, што функцыянуе паводле іншых правілаў. Для «інклюзіўнага нацыяналізму» ролю іншага адыгрывае палітычная сістэма, пабудаваная на прынцыпах гетэраноміі, ці, кажучы простымі словамі, аўтарытарная сістэма. Такое канструяванне ў вялікай ступені ёсць і мусіць быць прадуктам (сацыяльнага) выабражэння, часам, магчыма, і беспадстаўнага, то бок якое не мае пад сабой «рэальных» фактаў. Іншымі словамі, дзеля таго, каб спрацоўвала стратэгія «інклюзіўнасці», убірання ў сябе разна-

стайных дыскурсаў, неабходна добра ўсвядоміць сваю адасобленасць ад іншага.

Праблема недахопу «рэальнасці» ў дачыненні да палітычных працэсаў не можа быць вызначальнай, паколькі як аўтаномны, так і гетэраномны палітычны лад грунтуюцца на выбражальных падставах, прынамсі з гледзішча сацыяльнага канструктывізму. Сапраўднае пытанне ў тым, якая з мадэляў выбражэння (ці канструявання) выбіраецца — калі такі выбар увогуле існуе — і дзеля якой канчатковай мэты. Адносна беларускай «рэальнасці», відавочна, што з гледзішча канструявання «інклюзіўнага нацыяналізму» такім «выбражальным іншым» можа выступаць сённяшняя дзяржаўная сістэма, якая з пэўнага часу яшчэ і падмацоўваецца ідэалогіяй дзяржаўнасці — чытай, аўтарытарызму.

Апроч праблемы канструявання «знешняй» мяжы грамадзянскага нацыяналізму застаецца не менш важная праблема шматлікіх межаў, якія ўзнікаюць у выніку далучэння разнастайных дыскурсаў і якія ў такім выпадку патрабуюць пераадолення ці ўзгаднення на падставах агульнай роўнасці. Той факт, што ў выніку адкрытасці на агульнай платформе (аўтаноміі) могуць апынуцца ўдзельнікі, якія ўвогуле падтрымліваюць дэмакратычныя каштоўнасці, яшчэ не гарантуе аўтаматычнага стварэння нейкай адзінай для ўсіх пазіцыі. Хутчэй наадварот: плюральнасць межаў, якая ўзнікае ў працэсе ўключэння разнастайных удзельнікаў, патрабуе даволі цяжкіх высілкаў у самаабмежаванні. Так, у беларускім выпадку рускамоўныя інтэлектуалы мусяць прызнаць нявольную віну за панаванне рускай мовы ў Беларусі і надаваць больш увагі лакальным (нацыянальным) справам, а этнанацыяналісты мусяць зразумець сваё месца не ў якасці камандзіраў-загадчыкаў, а тых, хто ўзначальвае агульны рух.

У плане практычнай рэалізацыі такая камунікацыя, паразуменне і сумесная праца застаецца вельмі складанай справай, прынамсі ў бліжэйшы час. Аднак падзеі сакавіка 2006 г., калі працэс грамадзянскай нацыятворчасці максімальна паскорыўся, нагадваюць пра непазбежнасць і неабходнасць такога руху (у тым ліку інтэлектуальнага). Тады дзеля пэўных маральных, палітычных і стратэгічных мэтаў удалося аб'яднацца супраць аўтарытарызму і яскрава засведчыць, што такі інклюзіўны нацыяналізм у практычным плане цалкам магчымы.

**Еўрапейская перспектыва Беларусі — гэта палітыка грамадзянскага нацыяналізму.**

Еўрапейская перспектыва сёння ў Беларусі — гэта стварэнне прасторы лакальнай аўтаноміі, якая супрацьстаіць і сцвярджае сябе насуперак гетэраномнаму, аўтарытарнаму кантэксту. Яна адначасова вымагае кансалідацыі тых, хто зацікаўлены ў кампрамісе і ўзаемапрызнанні дзеля дасягнення сваіх стратэгічных мэтаў. Еўрапейская перспектыва Беларусі — гэта палітыка грамадзянскага нацыяналізму.

Гэтая выснова малачаканая, улічваючы тую аналітычную парадыгму, якую абраў аўтар (глабалізацыя, касмапалітызм, посткамуністычны кантэкст і г. д.). Ёсць шматлікія сучасныя дыскурсы, дзе ўжыванне тэрміну «нацыя-

нальнае» без дадаткаў «пост-», «звыш-» ці «над-» лічыцца ледзьве не *mauvais ton*. Насуперак ім аўтар сцвярджае, што акурат нацыяналізм, хоць і ў мадыфікаванай форме, з'яўляецца той аптымальнай мадэллю, у межах якой можа быць рэалізаваная лакальная аўтаномія ў кантэксце постсавецкай глабалізацыі.

**Беларускі аўтарытарызм выявіўся здольным адаптавацца да глабалізацыі і нават выпрацаваць альтэрнатыўныя (анты-) глабалісцкія праекты.**

А вось аўтарава тлумачэнне паходжання беларускага аўтарытарызму як «структурнага эфекту» адмоўнай рэакцыі на працэсы глабалізацыі на пачатку постсавецкіх трансфармацый, якая прывяла ў сваю чаргу да «рэгрэсіўнай інкапсуляцыі», ці самазамыкання беларускага грамадства, падаецца спрэчным. Глабалізацыйны ўплыў быў вельмі нязначны, што, з аднаго боку, прывяло да адсутнасці сістэмных трансфармацыяў, а з іншага боку, адносна хутка і лёгка дазволіла заняць квазісамастойную позу ў сітуацыі, калі ў Беларусі адсутнічалі якія-кольвек сур'ёзныя міжнародныя абавязкі. Да таго ж што афіцыйны беларускі «ізаляцыянізм» ці «самадастатковасць» заўсёды мелі свой рэальны кошт, які забяспечваўся гульнёй у «саюзную дзяржаву» з Расіяй. З гэтага гледзішча феномен беларускага аўтарытарызму выглядае лакальнай ці рэгіянальнай з'явай, антыглабалісцкая рыторыка якога артыкулявалася значна пазней.

Больш адэкватным падыходам да спалучэння глабалізацыі і беларускага аўтарытарызму з'яўляецца іх разгляд у адваротнай сувязі, а менавіта як у пэўным сэнсе ўзаемадапаўняльных ці, прынамсі, не ўзаемавыключальных праектаў. У выпадку постсавецкай Беларусі аўтарытарная ідэалогія добра засвоіла спажывецкую рыторыку і пачала нават рэалізоўваць пэўныя альтэрнатыўныя глабалізацыйныя праекты (прыгадайма дружбу на дзяржаўным узроўні з Кітаем, Іранам ці Венесуэлай). Таму аналіз трываласці спалучэння (а не ўзаемавыключальнасці) аўтарытарызму з глабалізацыяй выглядае прадуктыўнай аналітычнай устаноўкай.

У падобным рэчышчы разважае ў зборніку А. Усманава, якая разглядае «спажывецкі нацыяналізм» як форму беларускай дзяржаўнай ідэалогіі. Думкі наконт сувязі беларускага аўтарытарызму і «спажывецкага грамадства» выказваліся значна раней і на старонках часопіса «ARCHE». Аўтарытарызм выявіўся здольным адаптавацца да глабалізацыі і нават выпрацаваць альтэрнатыўныя (анты-)глабалісцкія праекты.

Не маючы магчымасці засяродзіцца на гэтым пытанні тут больш падрабязна, зазначым, што праблема спалучэння аўтарытарызму з глабалізацыяй у беларускім выпадку яшчэ неглыбока прааналізаваная ў інтэлектуальных ды экспертных колах.

## «Казус Беларусі» як бунт і настальгія за Абсалютам. Беларуская перспектыва для Еўропы (П. Рудкоўскі)

У сваім артыкуле П. Рудкоўскі высвятляе, як крытыка Абсалюту ў межах еўрапейскай эпістэмалогіі прывяла да

супрацьлеглых наступстваў у сферы сацыяльнай практыкі. Татальны сумнеў у існаванні Абсалюту выклікаў устаноўку на рэлятывізм, якая на ўзроўні прымання сацыяльных рашэнняў спрычынілася да ідэалогіі «моцнае рукі» (калі Абсалюту і праўды не існуе, то яны мусяць быць кімсьці зацверджаны). З іншага боку, тая самая крытыка прывяла да палітыкі мультыкультуралізму. Мультыкультуралізм, альбо палітыка разнастайнасці, які грунтуецца на прынцыпе самаабмежавання ў пазнанні Абсалюту, вядзе да стварэння роўных умоваў з іншым: ніхто не ведае абсалютнае праўды, таму кожны мае роўнае права весці яе пошукі ў свой спосаб. Няцяжка заўважыць, што менавіта рэлятывізм першага кшталту ўласцівы сучаснаму афіцыйнаму беларускаму дыскурсу.

Спецыфіку беларускай сітуацыі аўтар апісвае ў катэгорыях амбівалентнасці: як адначасова бунт супраць Абсалюту і настальгію за Абсалютам. Гэты амбівалентны бунт-настальгія, хоць і суправаджаўся крытыкай усякіх абсалютаў («развітанне з Абсалютам»), але стаўся вяртаннем да Абсалюту ў форме сацыяльнага ладу (улады), у якой увасобілся ідэі калектыўнай, звышындывідуальнай свабоды — таго, што І. Берлін называў калектыўнай ці пазітыўнай свабодай. Інстытут моцнай дзяржавы, рэалізаваны ў постсавецкай Беларусі, згодна з задумай сваіх стваральнікаў, прызначаны для таго, каб забяспечыць цэльнасць, нязменнасць, дабрабыт сацыяльнай сістэмы і прадухіліць рознага кшталту небяспечныя ўплывы на яе чальцоў.

Аналізуючы беларускую дзяржаўную ідэалогію, П. Рудкоўскі прыходзіць да высновы, што такая ідэалогія з'яўляецца «таталітарнай нарацыяй», г. зн. уяўляе з сябе не толькі пэўную сістэму выказванняў адносна таго, чым ёсць «аб'ектыўная праўда», але таксама хавае ў сабе прымус да таго, каб прызнаць, што такая «праўда» прынятая добраахвотна. Хоць у межах дзяржаўнай ідэалогіі плюралізм дыскурсаў фармальна прызнаецца, гэтыя дыскурсы не маюць аўтаноміі (без якой няма і аўтаноміі чалавечай асобы) і мусяць заўсёды суадносіцца з сваім метадыскурсам. Прыкладам тут можа быць агульнавядомая ідэалагема «канструктыўнай крытыкі», якая лёгка абвяшчае ўсе альтэрнатыўныя тыпы дыскурсаў «дэструктыўнымі». Вынікам крытыкі Абсалюту ў выпадку постсавецкай Беларусі сталася поўнае замыканне і ўсталяванне ідэалагічнай артадоксіі ў форме дзяржаўнай ідэалогіі.

**Белдзяржідэалогія з'яўляецца таталітарнай нарацыяй.**

**Агульнавядомая ідэалагема «канструктыўнай крытыкі» лёгка абвяшчае ўсе альтэрнатыўныя тыпы дыскурсаў «дэструктыўнымі».**

Гэты працэс самазамыкання меў пэўную дынаміку і не быў звязаны выключна з высілкамі дзяржаўных (уладных) інстытуцый. Так, можна канстатаваць пэўную паўадкрытасць беларускага грамадства на пачатку 1990-х гг., калі існаваў больш-менш выразны ідэйны плюралізм розных субкультураў ці культурных элітаў. Аднак з цягам часу стасункі паміж культурнымі элітамі

пераўтварыліся ў стратэгіі ўзаемавыключэння, а не ўзаемапрызнання.

Дыягназ беларускага грамадства постсавецкае пары — культурная самаізаляцыя і замыканне ў субкультурах. З гэтага, у прыватнасці, вынікае, што праблема беларускага грамадства палягае не толькі ў аўтарытарызме, то бок існаванні пэўнага дзяржаўнага ладу. Другі тып эпістэмалагічнай крытыкі Абсалюту не прывёў да камунікацыі, абмену і прынцыпу самаабмежавання. Такім чынам, частка сённяшніх праблемаў ляжыць таксама ў плашчыні гарызантальнай камунікацыі розных сацыяльных груповак. У гэтым пункце П. Рудкоўскі збліжаецца з У. Фурсам, які звяртае ўвагу на неабходнасць камунікацыі і пошуку агульных падставаў для розных дэмакратычна арыентаваных бакоў.

**Дыягназ беларускага постсавецкага грамадства — культурная самаізаляцыя і замыканне ў субкультурах.**

Еўрапейская перспектыва Беларусі палягае ў тым, каб карыстацца такім спосабам крытыкі Абсалюту, які б прывёў да супрацьлеглай ад сённяшняй формы палітыкі — палітыкі ўзаемапрызнання і роўнасці, а таксама прызнання недасканаласці грамадскага ладу і неабходнасці імкнення да яго бесперапыннага і прынцыпова бясконцага ўдасканальвання. Іншымі словамі, еўрапейская перспектыва палягае ў прызнанні неабходнасці стварэння «адкрытага грамадства» ў Беларусі.

Можна казаць і пра пэўную «беларускую перспектыву» для Еўропы: шляху да ідэальнай дзяржавы з «дасканалым» (закрытым) грамадствам. «Казус Беларусі» магчымы ў іншых еўрапейскіх кантэкстах, калі да яго не паставіцца дастаткова сур'ёзна.

Крытычны аналіз самазамыкання беларускага грамадства (пад уплывам адпаведнае ідэалогіі) — вельмі важная задача. Тым не менш, хацелася б зрабіць некалькі крытычных заўваг да тэксту. Аналізуючы сучасную беларускую (дзяржаўную) ідэалогію, П. Рудкоўскі перабольшвае ўплыў на яе еўрапейскай інтэлектуальнай крытыкі. Так, можна прасачыць пэўную сувязь і пэўны інтэлектуальны кантэкст. Аднак беларуская дзяржаўная ідэалогія не выдумляе нічога новага (добра, калі тыя імёны заснавальнікаў еўрапейскага рэлятывізму, што згадваюцца ў тэксце, ёй увогуле знаёмыя) і выкарыстоўвае ў адпаведнасці з патрэбамі ранейшую савецкую (адзінапартыйную) ідэалогію. У гэтым сэнсе «вытокі» беларускай афіцыйнай ідэалогіі могуць быць зусім не еўрапейскімі і не звязанымі непасрэдна з сучаснымі еўрапейскімі інтэлектуальнымі дэбатамі адносна ролі Абсалюту, хоць пэўныя ідэалагічныя аргументы і могуць падмацоўвацца адсылкамі да сучасных прыхільнікаў рэлятывізму.

Па-другое, неабходна больш дакладна сфармуляваць мадэль пераходу ад «закрытага» да «адкрытага» грамадства. Высвятляючы інтэлектуальныя падставы, якія прывялі ў розных выпадках да рэалізацыі гэтых супрацьлеглых сацыяльна-палітычных ладаў жыцця, П. Рудкоўскі міжвольна стварае ўражанне бінарнасці гэтых мадэляў. Крытыка Абсалюту разглядаецца як нейкі зыходны пункт, пасля якога са-

цыяльныя змены адбываюцца ў адным ці супрацьлеглым кірунку. Не зусім ясна, якой мусіць быць новая эпістэмалагічная крытыка Абсалюту ў межах «закрытага грамадства» (базавай, здаецца, для П. Рудкоўскага ўстаноўкі), каб давесці, што менавіта іншая, «адкрытая», мадэль мае перавагі. Па-трэцяе, звяртаючы пільную ўвагу на ідэалагічныя стратэгіі замыкання грамадства ў выпадку Беларусі, важна было б таксама пачаць асэнсаванне магчымых дыскурсіўных стратэгіяў адкрыцця закрытага грамадства. Наяўнасць унутранай крытычнай пазіцыі адносна «замкнёнай» сітуацыі сведчыць, што пэўны патэнцыял «адкрытасці» ўсё ж такі існуе.

З гледзішча «закрытага грамадства» ідэалы адкрытасці ці недасканаласці не з'яўляюцца чымсьці ідавочным, хутчэй наадварот: пад уплывам ідэалагізацыі яны выглядаюць як нешта сумнеўнае і — вось тут спрацоўвае ідэалогія рэлятывізму, узведзенага ў абсалют — *адносна* лепшае. Праблема беларускай сітуацыі ў тым, што тут бракуе абсалюту ў прынцыпова іншым сэнсе, у сэнсе наяўнасці абсалютных прынцыпаў. Да прыкладу, дэмакратыя ў нашай краіне ўспрымаецца як *адносна* добрая.

Супрацьпастаўленне «адкрытае» ці «закрытае» грамадства як такое даволі ўмоўнае, паколькі як у адным, так і ў іншым выпадку адбываецца (ці адбылося раней) пэўнае сцверджанне/вяртанне да абсалюту. Розніца палягае ў тым, што калі ў выпадку «закрытага» грамадства гэты абсалют, сапраўды, увасабляецца ў выглядзе ўлады «моцнае рукі» і/ці персаніфікуецца ў фігуры «моцнага лідэра», дык у выпадку «адкрытага» грамадства гэты абсалют становіцца менш заўважным, паколькі прымае форму пэўных (дэмакратычных) прынцыпаў[4].

Крытыка абсалюту ў беларускіх умовах павінна стаць *працай дзеля дэідэалагізацыі* і адначасна пошукам іншага сацыяльнага месца для абсалюту, адрознага ад варыянтаў «моцнае рукі» ці «ўсенародна любімага лідэра». У гэтай сувязі сама пастаноўка П. Рудкоўскім пытання аб абсалюце як чымсьці, што мае прынцыпова амбівалентны характар («бунт-настальгія») у межах сацыяльнага, падаецца прадуктыўнай як для тэарэтычнага аналізу сучаснай беларускай сітуацыі, так і для пошуку эфектыўных стратэгіяў дзеля дэідэалагізацыі «закрытага» ў сваёй постсавецкасці беларускага грамадства.

## Высновы

Падсумоўваючы, адзначым наступныя пункты, пры дапамозе якіх можна ахарактарызаваць еўрапейскую перспектыву Беларусі:

1. Еўрапейская перспектыва для Беларусі вымагае *салідарнасці* (як унутры, так і звонку Беларусі) у адносінах да праяваў гвалту, якая б спалучалася з *еўрапейскай рэтраспектывай*, г. зн. крытыкай і самакрытыкай Еўропы. Гэты пункт уключае даследаванне памежнага стану беларускай

[4] Больш на гэтую тэму гл. мой артыкул «Критика идеологии выборов как поиск альтернативной политической коммуникации» // Топос. № 13. 2006. Электронная версія: http://topos.ehu.lt/zine/2006/2/index.htm.

культуры як *«еўрапейскага памежжа»* (В. Шпарага).
2. Неабходнасць грамадзянскага інклюзіўнага нацыяналізму для адстойвання лакальнай аўтаноміі ў глабальным (постсавецкім) кантэксце (У. Фурс).
3. Еўрапейская перспектыва як дыскурс еўрапеізму завязана на панятку «грамадзянскай ідэнтычнасці». У існасці, еўрапеізм тут з'яўляецца часткай больш глабальнай перспектывы — касмапалітызму і касмапалітычнага грамадства, формай рэалізацыі якога мае стаць «касмапалітычная публічная сфера», якая з'яўляецца пасярэднікам паміж транснацыянальнай, нацыянальнай і лакальнай публічнымі сферамі (Р. Мінянкоў).
4. Дэідэалагізацыя і адкрыццё закрытага грамадства праз перафармуляванне ідэі Абсалюту як рэгулятыўнай ідэі; развіццё культуры ўзаемапавагі, камунікацыі і ўзаемаабмену паміж living рознымі культурнымі і грамадскімі супольнасцямі дзеля ўнутранай кансалідацыі грамадства (П. Рудкоўскі).
5. Палітычная еўраінтэграцыя як магчымы, але вельмі малаверагодны ў бліжэйшай перспектыве праект. Для гэтага трэба прывесці нацыяльнае заканадаўства ў адпаведнасць з *«aquis communaitaire»* (блізу 80 тыс. старонак). Неабходнасць стварэння гэтых мінімальных перадумоваў адсоўвае магчымасць палітычнай еўраінтэграцыі Беларусі на вельмі далёкую перспектыву.
6. Еўрапейская перспектыва як (інтэлектуальная) утопія. Еўрапейскі характар мыслення, прыхільнасць да еўрапейскіх традыцый сучасных беларускіх інтэлектуалаў дазваляе ствараць прастору іншасці, адрозную ад (пост-)савецкага тыпу думкі, уласцівага сённяшняй палітычнай уладзе. Аднак больш шчыльны працэс еўраінтэграцыі можа прывесці да «гетэратопіі», г. зн. чарговай формы падпарадкавання (заходне-) еўрапейскаму дыскурсу (А. Усманава).
7. Сёння беларуская медыя-прапаганда замест «еўрапейскай інтэграцыі» рэалізуе «еўрапейскую праекцыю» (у тым ліку ў псіхааналітычным сэнсе), прадукуючы медыйныя прадукты, якія ўскосна сведчаць пра тыя праблемы, якіх хоча пазбегнуць і не заўважаць у самой сабе афіцыйная Беларусь. Пераадоленне гэтай зацыкленасці на карысць самааналізу і ёсць першапачатковай умовай для рэалізацыі «еўрапейскай перспектывы» ў Беларусі (А. Горных).

Пытанне аб еўрапейскай перспектыве Беларусі закранае шмат унутраных праблемаў. Яна бачыцца як зварот да саміх сябе, які вымагае актыўнага ўдзелу, выбару, рашучасці, салідарнасці, самаадкрытасці, самаразумення (дэідэалагізацыі), самаабмежавання і жадання зменаў. Многім з аўтараў яна бачыцца ў межах нацыянальнага (суверэннага) праекта, хоць і зразуметага больш шырока, чым культурна арыентаваны нацыяналізм.

Адной з галоўных праблем на шляху Беларусі да Еўропы з'яўляецца сённяшняя ідэалогія беларускай дзяржавы, якая спрыяе самазамыканню грамадства і стварае адмоўны вобраз Еўропы. Тым самым фобіі адносна сябе пераносяцца на фігуру «антыгероя». Другі бок праблемы — гэта пытанне ўнутранай кансалідацыі беларускага грамадства, адкрытай камунікацыі паміж рознымі

(культурнымі і не толькі) супольнасцямі.

Варта адзначыць прыклад рэдакцыйнай палітыкі адносна публікацыі П. Рудкоўскага. Матэрыял напісаны класічным правапісам, але мае такую дзіўную пазнаку: «у аўтарскай транскрыпцыі» (sic!) — нібыта рэдакцыя ў нечым выбачаецца перад сваім «строгім» чытачом[5]. Аднак для дасведчанага чытача такая пазнака можа азначаць фактычнае непрызнанне, несур'ёзнае ўспрыманне іншага тыпу дыскурсаў, рэдукаванне іх да «аўтарскае» спецыфікі як індывідуальных экзатызмаў.

Тым не менш трэба адзначыць важныя канцэптуальныя знаходкі, прапанаваныя ў зборніку. Наступным лагічным крокам мусяць стаць распрацоўкі гэтага аўтарскага калектыву — як мадэль еўрапейскай перспектывы можа быць практычна *рэалізаваная* ў Беларусі.

Пакуль жа гэтыя інтэлектуальныя мадэлі застаюцца толькі «інтэлектуальнымі *мадэлямі*». Паўстае заканамернае пытанне: што далей? Ці змогуць гэтыя мадэлі скласціся ў пэўную праграму дзеянняў і такім чынам перайсці адну з межаў, што падзяляюць сучасную беларускую рэчаіснасць? Здаецца, гэта і будзе адказам на пытанне іх жыццяздольнасці.

[5] Удакладнім, што наша крытычная заўвага тычыцца не В. Шпарагі, якая адначасова з'яўляецца і ўкладальнікам і аўтарам зборніка, а хутчэй выдавецтва ЕГУ, якое ўплывае на палітыку ў дадзеным пытанні.

## ◘ КРЫТЫКА

**УЛАД НАВІЦКІ**

# Постсавецкія тэарэтыкі ў віры інтэлектуальнай глабалізацыі

Выданне, якое разглядаецца ў гэтым артыкуле:

*Европейская перспектива Беларуси: интеллектуальные модели* / сост. О. Шпарага. — Вильнюс: ЕГУ, 2007. — 280 с.

Кніга, выдадзеная ў рамках праекта ЕГУ, з'яўляецца зборнікам артыкулаў, аўтары якіх тым ці іншым чынам пазначылі сябе ў межах беларускай інтэлектуальнай прасторы. Стрыжнёвай тэмай, як гэта бачна ўжо з назвы, выступае значная праблема — якое месца займае ідэя Еўропы ў працэсе вызначэння сучаснасці і будучыні беларушчыны. І першае, на што звяртаеш увагу пры чытанні кнігі, гэта перакананне, што аўтараў, апроч адзінае тэмы, яднае яшчэ і ў нечым аднолькавая пазіцыя ў дачыненні праблемы еўрапейскіх перспектыў Беларусі. Разважаючы на гэтую тэму, амаль што кожны аўтар ці то ў якасці высновы, ці то ў рэжыме «лірычнай» маргіналіі сцвярджае — «еўрапейскасць» гэта не рэч, якую можна прыдбаць, гэта, наогул, «якасць дзейнасці». Дэканструюючы, з аднога боку, субстантыўныя версіі ідэі «Еўропы», выяўляючы, з другога боку, наіўнасць большасці «заходнеарыентаваных» спадзяванняў, артыкулы імкнуцца паказаць: прыналежнасць да еўрапейскай культуры вызначаецца не падтрымкай усталяваных нормаў, але здольнасцю да аўтаноміі ва ўсіх сферах дзейнасці, ад культурнай да

---

*__Улад Навіцкі__ нарадзіўся ў 1984 г. у Салігорску. У 2006 г. скончыў факультэт філязофіі і сацыяльных навук БДУ па спэцыяльнасьці «Філязофія». Магістрант ЭГУ (Вільня), праграма «Сацыяльная тэорыя і палітычная філязофія». Акадэмічныя інтарэсы — гісторыя левых палітычных плыняў, супрацьстаяньне постмадэрнізму і нэамадэрнізму, філязофія часу (Гайдэгер, Левінас), мэтадалягічныя плыні XX ст. і г. д. Аўтарская назва тэксту — «Інтэграцыя праз дэзынтэграцыю».*

грамадска-палітычнай. І гэта прыемна здзіўляе, бо аніякай «школы», спасылаючыся на якую можна было б растлумачыць такую — хай і досыць шырокую, але ж пры гэтым добра адчувальную — еднасць, у Беларусі не існуе. Магчыма, гэта можна расцэньваць як нараджэнне калі і не адзінага, то паяднальнага гарызонта мыслення аб тым, чым з'яўляецца Еўропа для Беларусі і, адсюль, чым з'яўляецца Беларусь для нас саміх. Так гэта ці не, пакажа час, а зараз больш падрабязна наконт саміх артыкулаў і зборніка ў цэлым.

Кніга змяшчае восем, падзеленых на чатыры тэматычныя блокі, артыкулаў беларускіх мысляроў, а таксама тэкст Зыгмунта Баўмана «Незавершанае падарожжа ў Еўропу» і дзве невялічкія працы Яна Патачкі «Еўропа і еўрапейская спадчына да канца XIX ст. улучна» і «Войны XX ст. і XX ст. як вайна».

Першы блок — «Беларусь і ідэя Еўропы», рэпрэзентаваны артыкуламі Вольгі Шпарагі («Шукаючы Еўропу, або «Ідэя Еўропы» ў прасторы дыялогу») і Уладзіміра Фурса («Беларускі праект «сучаснасці»?»).

Вольга Шпарага імкнецца выявіць тую амбівалентнасць ідэі «еўрапейскасці», якая і дазваляе нам ацэньваць сучасную сітуацыю як «пошукі Еўропы». Відавочна, што і для «Захаду», і для «Усходу» з новай сілай паўстае пытанне, праз што можа вызначацца прыналежнасць да еўрапейскага свету. У адносінах да Заходняй Еўропы такія праблемы ўзнікаюць у выніку гістарычнага перагляду базы Еўразвязу — калі на пачатку самога працэсу задзіночання панавалі эканамічныя і ваенныя інтарэсы (нездарма найбольш паспяховым прыкладам узаемадзеяння еўрапейскіх краін у 50-х гг. было Еўрапейскае аб'яднанне вугаля і сталі), то шэраг недахопаў такой арыентацыі, якія яскрава праявіліся ў 80-я гг., пазначыў «змену» прыярытэтаў з эканомікі і бяспекі да захавання супольнай культурна-палітычнай прасторы. Тым больш, што рубеж 80—90-х гг. адзначыў і з'яўленне новых удзельнікаў еўрапейскай супольнасці. Таму і паўстае пытанне — на чым яна можа грунтавацца і дзе палягаюць межы «Новай Еўропы»?

Большасць інтэлектуалаў з Сярэдняй і Усходняй Еўропы сапраўды выступала за вяртанне да еўрапейскай культуры, часцей за ўсё ўвасобленай вобразамі «Захаду», але гэта было толькі адным з вымярэнняў стаўлення да яе. Другім вымярэннем было расчараванне ў магчымасцях Заходняй Еўропы быць рэпрэзентантам еўрапейскай культуры. Але гэтае расчараванне не проста пакінула былых «вернікаў» у роспачы, але было такім расчараваннем, якое

> *абяртаецца імпульсам да мабілізацыі ўласных сілаў, зваротным бокам якой і становіцца заклік «памерці за Еўропу», або стаць большымі еўрапейцамі, чым самі еўрапейцы* (с. 20).

Таму інтэлектуалы гэтага рэгіёну апынуліся перад той самай праблемай — як сфармаваць вобраз «Новай Еўропы» і якой павінна быць культура, якая можа ўвасобіць гэты вобраз.

Такім чынам, пошук Еўропы — супольны лёс як заходняга, так і цэнтральна-ўсходняга рэгіёнаў. Вольга Шпарага пазначае тыя кірункі, на якіх гэты пошук

можа паспяхова ажыццяўляцца. Яны зададзены, па-першае, палітыкай у нарматыўным сэнсе — г. зн. не так функцыянаваннем дзяржінстытутаў, як плюралізмам каштоўнасцяў. Гэты аспект адсылае да праблемы сумяшчэння ідэалаў свабоды і супольнасці, паміж якімі звычайна існуюць адносіны супярэчнасці. Відавочна, што гэта сумяшчэнне не можа быць усталявана індывідуальным рашэннем, але патрабуе пастаяннага ўзнаўлення гэтай «хісткай» (І. Берлін) раўнавагі. Аўтар раскрывае стратэгіі забеспячэння падобнай раўнавагі з дапамогай ідэй Яна Патачкі («салідарнасць узрушаных»).

Што гэта значыць для Беларусі? Перш за ўсё тое, што мы павінны сфармуляваць пазітыўны вопыт існавання на пагранiччы, дзе адзін з адным сутыкаюцца сілы з рознымі кірункамі. Бо наколькі гэты вопыт можа быць падставай для роспачы, настолькі ж ён можа ў перспектыве стаць неабходным элементам уваходжання ў еўрапейскую прастору. Відавочна, што існуе ўзаемасувязь паміж талентам знаходзіць пункт узнаўлення раўнавагі ва ўмовах плюралізму каштоўнасцяў і існаваннем у рэжыме «паміж». Таму высновай артыкула можна лічыць такія словы:

*Быць беларусам можа азначаць бесперапынна даследаваць — разумець і вытлумачваць — сваё памежнае існаванне з мэтай вызначэння «крохкай раўнавагі» культурнага, палітычнага і сацыяльнага наратыва з наратывамі суседзяў. Пры гэтым суседзі таксама маюць быць уцягнутыя ў падобнае даследаванне, сумесны ўдзел у якім… і можна ў выніку пазначыць як Еўропу* (с. 39).

Уладзімір Фурс у нарысе «Беларускі праект «сучаснасці»?» спрабуе паказаць, як на праблему еўрапейскіх перспектыў Беларусі ўплывае вызначэнне зместу мадэрнасці і глабалізацыі. Значнае месца ў Фурса займае ідэя «шматстайных мадэрнасцяў» Айзенштата, якая дазваляе адмовіцца ад еўропацэнтрызму класічнага прагрэсізму. Але культуралагічныя інтэрпрэтацыі гэтай ідэі павінны быць аднесены да занадта праблемных варыянтаў, бо часцяком хаваюць за сабой арыентацыю ўсё ж такі на заходнееўрапейскі ўзор мадэрнасці. Па-другое, спрабуючы акрэсліць месца Беларусі ў еўрапейскай прасторы, мы не можам пакладацца на ідэю касмапалітызму — яна ў найлепшым выпадку адлюстроўвае спадзяванне на блізкую эру «сусветнага грамадства», рэпрэзентуючы, такім чынам, занадта спрошчанае разуменне глабалізацыі. Таму У. Фурс прапануе звярнуцца да ідэй Кастарыядзіса (Castoriadis), бо яны дапамагаюць растлумачыць «эмансіпатарскую» ідэю мадэрнасці без звароту ці то да канцэпцыі «вестэрнізацыі», ці то да «культуралагічнага» разумення мадэрнасці. Апошняя звязваецца з ідэяй аўтаноміі індывідаў і грамадства — такога іх стану, пры якім яны ўсведамляюць сваё аўтарства ў дачыненні да існуючых сацыяльных інстытутаў. Відавочна, што гэтая ідэя не можа мець універсальны змест, бо кожны з выпадкаў гетэраноміі — стану, супрацьлегламу аўтаноміі — будзе ўзнікаць як своеасаблівы выпадак, патрабуючы канкрэтнага тлумачэння і разумення.

Можна сказаць, што Беларусь толькі тады будзе здольная ўвайсці ў еўрапейс-

кую прастору, калі ўсвядоміць існую ў межах Еўропы гетэраномію сацыяльна-палітычнага жыцця, акрэсліць яе канкрэтныя рысы[1] і ажыццявіць пэўныя намаганні, патрэбныя для надання гэтай сферы аўтаномнага характару. Такім чынам, мыназіраем вынік, які можа падацца нечаканым для «ЕГУшнага «заходніка»: «якраз нацыяналізм уяўляецца найбольш адэкватным увасабленнем «ідэі Еўропы» ў сённяшняй Беларусі». Трэба мець на ўвазе, што тут маецца на ўвазе не «этнічны» нацыяналізм, але «грамадзянскі», пры гэтым апошні ніколі не будзе мець завершанага выгляду — гэта заўсёды імкненне да «не пустой (праздной), а практычна значнай» утопіі. Магчыма, этнакультурны нацыяналізм і мог бы рэпрэзентаваць саму сітуацыю пошуку аўтаноміі сучаснай Беларуссю, але пры ўмове акрэслення сябе як «адной з» магчымых стратэгіяў — эксплікацыя самой магчымасці падобнага функцыянавання ажыццяўляецца аўтарам з дапамогай адпаведных ідэй Грамшы і Лакло. Тут маецца на ўвазе сама логіка гегемоніі, калі партыкулярная ідэнтычнасць пачынае ўвасабляць сабою ўсё сацыяльна-палітычнае поле цалкам, і такім чынам, застаючыся партыкулярнасцю, пачынае функцыянаваць як універсальнасць (рэвалюцыйны клас, «народ», і г. д.). У выпадку з сучаснай беларускай сітуацыяй гэта значыць, відавочна, што беларускі этнічны нацыяналізм і сапраўды мог бы стаць з'яднальным фундаментам апазіцыйна настроенных сацыяльных груп — але пры ўмове, што ён будзе разумецца як адна з некалькіх магчымых праграм таго, што значыць быць беларусам.

Падрабязнае даследаванне дынамікі еўрапейскай ідэі і значэння яе адносна сучаснага стану Беларусі мы знаходзім у артыкуле Рыгора Мінянкова «Еўрапейская ідэнтычнасць як гарызонт беларускага ўяўлення», які распачынае другі тэматычны блок «Еўропа і яе іншыя: супярэчнасці расшырэння Еўропы». Аўтар падкрэслівае, у першую чаргу, канструктыўны характар самой ідэі еўрапейскасці — з самага пачатку Еўропа была эфектам пошуку Еўропы. Яна не можа быць растлумачана як этнічная ці рэлігійная супольнасць (дарма што сам пошук еўрапейскасці адштурхоўваўся ад ідэі каталіцкага — усясветнага — з'яднання вернікаў). Іншымі словамі, гэтая ідэя наогул не дапускае аніякага «арганістычнага» тлумачэння. Такім чынам, працягвае аўтар, можна пагадзіцца з Дэленці (Delanty), што праблема еўрапейскай ідэнтычнасці павінна разглядацца як: а) рэгулятыўная ідэя, якая рэпрэзентуе полівaрыятыўнасць культурных формаў; б) форма ідэалагічнага абгрунтавання ідэнтычнасці — рэпрэзентацыя ператвараецца ў «прэзентацыю» і блакуе альтэрнатывы акрэслення Еўропы; в) вынік геапалітычнай рэальнасці. Гэта значыць, што ідэя Еўропы заўсёды функцыянавала дзякуючы падзяленню канкрэтных ландшафтаў на цэнтр і перыферыю. Такім чынам, можна бачыць, што адной з вызначальных рысаў вопыту еўрапейскіх культур

[1] «Мы мяркуем, што ключавая праява гетэраноміі ў нашым сацыяльным ландшафце палягае ў глыбокай і шматбаковай дэпалітызацыі беларускага грамадства. Гаворка ідзе, па-першае, аб самавызначэнні, «добраахвотна-прымусова» практыкаваным насельніцтвам <...>. Па-другое, маецца на ўвазе вялізная рэальная ўлада апарату <...>, якая дазваляе гаварыць пра Беларусь як пра адміністраванае (администрируемое) грамадства» (с. 53).

з'яўляецца вопыт адрознення.

Трэба зазначыць, што практыка усталявання межаў тычыцца не толькі геаграфічных граніц, але таксама і размежавання самаго грамадства. Наогул кажучы, прэтэнзіі нацыі-дзяржавы (базавай формы існавання еўрапейскасці ва ўмовах першага мадэрна, які, у адрозненне ад позняга мадэрна, адсылае да ўяўлення аб нерухомасці сацыяльных інстытутаў грамадства) рэпрэзентаваць сабою сканструяваную еднасць таксама ўвасабляюць сабою ўзаемадзеянне партыкулярных ідэнтычнасцяў у барацьбе за набыццё універсальнага статусу[2]. Калі такі механізм робіцца бачным, ён становіцца досыць зручнай падставай для паслядоўнай крытыкі еўрапацэнтрызму — апошні страчвае як палітычныя, так і эпістэмалагічныя пазіцыі. Іншымі словамі, дыскрэдытуецца любая магчымая практыка і любое магчымае сцверджанне, якія тычыліся б панавання Еўропы ў астатніх частках свету.

Такім чынам, вызначальная роля межаў і легітымізацыя партыкулярнасцяў у іх плюральнасці абумоўлівае сучаснае становішча ідэі Еўропы. Як гэта тычыцца Беларусі? Успамінаючы Абдзіраловіча, Акудовіча, Бабкова і Булгакава, аўтар паказвае, што ідэя існавання на памежжах як важнай рысы беларускага вопыту, вызваленая ад эсэнцыялісцкіх рысаў, досыць добра дапасоўваецца да агульнаеўрапейскага кантэксту. Не спыняючыся толькі на гэтых ідэях, Р. Мінянкоў імкнецца звязаць іх з канцэптамі гібрыдных ідэнтычнасцяў, мультыкультуральнага дыскурсу і сучасных варыянтаў касмапалітызму (Апіа, Бек) (Appiah, Beck).

Больш чым крытычнае стаўленне да праблем уваходжання Беларусі ў агульнаеўрапейскую прастору дэманструе Альміра Усманава ў нарысе «Усходняя Еўропа як новы падпарадкаваны суб'ект». Драматызм з'яднання Еўропы акрэсліваецца тымі праблемамі, з якімі сутыкаюцца прадстаўнікі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы ў культурнай і сацыяльна-палітычнай сферах. Нягледзячы на заяўленую роўнасць усіх еўрапейцаў, рэаліі функцыянавання палітычна-бюракратычнай машыны падзяляюць членаў Новай Еўропы на годных ды няўдалых:

> *У дыскурсе «расшырэння» (enlargement) Усходняя Еўропа нязменна рэпрэзентуецца як не да канца цывілізаваны рэгіён, як пацыент, які не цалкам вылечыўся ад цяжкай хваробы (імя якой — сацыялізм <...>), як рэгіён, які эканамічна, палітычна <...> і сацыяльна не дацягвае да еўрапейскіх стандартаў і г. д.*

Трэба разумець, працягвае аўтар, што са знішчэннем палітычных межаў засталася вялікая колькасць іншых межаў, часам не менш важных для магчымасцяў камунікацыі ды ўзаемадзеяння на шэрагу ўзроўняў, ад культурнага да сацыяльна-эканамічнага. Далей мы знаходзім факты, якія падмацоўваюць гэты тэзіс: уз-

[2] «Ідэю Еўропы, такім чынам, можна разглядаць як выраз універсалісцкага праекту нацыяналізму і нерэалізаваных прэтэнзіяў нацыі-дзяржавы на універсальнасць» (с. 72).

нікненне новых палітычных суб'ектаў, новых межаў, страта расійскай мовай функцыі міжнацыянальнай і універсальнай мовы зносінаў, распад калектыўнай гісторыі на самастойныя наратывы аб мінуўшчыне.

Апроч таго, зварот Усходняй Еўропы да заходніх палітычных, эканамічных ды культурных практык прывёў да ўсталявання непарушнай ідэалогіі, якая вызначае паноўную сістэму неалібералізму як адзіную магчымую і эфектыўную. Таму краіны Заходняй Еўропы маюць усе магчымасці дзейнічаць так, як ім падаецца найбольш адэкватным[3].

Мала таго, сапраўдныя праблемы мы маем і ў сферах мас-медыяў («вобраз усходнееўрапейскай мафіі») ды вытворчасці ведаў. Усходнееўрапейскім інтэлектуалам даводзіцца пастаянна азірацца на сваіх заходнееўрапейскіх калег, хоць тыя не адчуваюць неабходнасці рабіць тое самае адносна першых — роўнасці ў акадэмічным дыскурсе не існуе.

**Ідэя Еўропы дапамагае беларускім інтэлектуалам дыстанцыявацца ад існуючага рэжыму.**

Беларусь, такім чынам, выяўляецца тым месцам, дзе пэўныя сілы спрабуюць стаць у апазіцыі ўсяму неліберальнаму свету, але пры гэтым зусім не супраць пабудаваць варыянт капіталізму ў межах асобнай краіны. Таму ідэя Заходняй Еўропы з'яўляецца ўсё яшчэ дзейнай для беларускіх інтэлектуалаў — менавіта яна дапамагае ім дыстанцыявацца ад існуючага рэжыму. Таму з памянёнымі вышэй праблемамі Беларусь сутыкнецца толькі пасля змены цяперашняга палітычнага курсу:

*Толькі тады або толькі ў тым разе, калі мы станем цікавыя самім сабе, можна будзе разлічваць на ўключэнне постсавецкіх тэарэтыкаў у працэс інтэлектуальнай глабалізацыі не на правах спажыўцоў, а ў пэўнай іншай якасці.*

Трэці блок кнігі — «Дыялектыка «Еўропы» і беларуская дзяржідэалогія» — пачынаецца адзіным у кнізе беларускамоўным артыкулам Пётры Рудкоўскага «Адкрытае грамадства і спосабы яго замыкання». Аўтар артыкула, назва якога адсылае да вядомага твора Карла Попера, напачатку даследуе становішча ў эпістэмалогіі XX ст., вызначальнай рысай якога мусім лічыць сітуацыю «развітання з абсалютам» — гэта значыць, адмаўленне ад таго перакanання, быццам чалавечае пазнанне можа валодаць абсалютнымі і гарантавана дакладнымі ведамі наконт фізічнай і сацыяльнай рэчаіснасці. Апошнім усплёскам такіх перакананняў можна лічыць лагічны пазітывізм, але яго сцыентызаваная праграма панавала досыць нядоўга і была «пахавана» ў выніку невырашальных супярэчнасцяў.

Адным з найбольш удалых крытыкаў дадзенай праграмы быў Карл Попер,

[3] «Гатоўнасць «старой Еўропы» распахнуць абдымкі для братоў з Усходняй Еўропы не пашыралася на ўсіх і кожнага: не ўсе посткамуністычныя краіны атрымалі запрашэнне стаць членамі «Еўраклубу». Пашырэнне Еўрасаюзу на ўсход задумвалася як скрупулёзная і надзвычай фармалізаваная працэдура адбору, якая вызначала, хто і калі можа на гэтае членства разлічваць» (с. 117).

але вынікі ягонай працы былі развіты ў паслядоўна рэлятыўных праграмах Куна і Ліятара. Попер ніколі не працаваў дзеля трыумфу рэлятывізму — як у навуцы, так і ў палітыцы — наадварот, ягоная праграма «крытычнага рацыяналізму» імкнулася вызваліць шлях Розуму ад валуноў дагматызму і рэлятывізму. Крытычны рацыяналізм імкнуўся паказаць, што не варта чакаць увасаблення ідэі абсалютнай праўды — яна павінна стаць рэгулятыўнай ідэяй (с. 146).

З гэтым звязана і абарона Поперам ідэі свабоднага грамадства. Ідэал такога грамадства немагчыма ўвасобіць, але гэтага і не патрабуецца. Грамадства толькі тады з'яўляецца сапраўды свабодным, калі яно прынцыпова дапускае магчымасць альтэрнатыўных вырашэнняў што да грамадскага дабра і спробаў рэалізацыі такіх стратэгіяў. Зноў-ткі, трэба адрозніваць такі ідэал ад анархічнага рэлятывізму, бо рэлятывізм узнікае толькі тады, калі кожная партыкулярнасць упэўнена ў сваёй магчымасці ўвасобіць абсалют. У свабодным грамадстве абсалют выступае толькі ў якасці рэгулятыву, і ніхто не можа валодаць на яго манаполіяй.

Зыходзячы з гэткіх разважанняў, спадар Рудкоўскі аналізуе прыклады беларускай афіцыйнай ідэалогіі (падручнік В. Мельніка) і знаходзіць надзвычай цікавы механізм аргументацыі — напачатку адлюстроўваецца класічны тэзіс рэлятывізму:

*Няма і ня можа быць такой сацыяльна-палітычнае тэорыі <...>, якая была б гнасэалягічна чыстай <...>, г. зн. пазбаўленай якой-кольвек сувязі з тымі ці іншымі інтарэсамі сацыяльных групаў.*

Але з гэтага робіцца выснова, у пэўнай ступені супрацьлеглая азначанай тэзе:

*Дзяржаўная ідэалёгія ёсьць, па сутнасьці, ідэйнай «скрэпкай» грамадзянскай супольнасьці. <...> Ідэйная разнастайнасьць у грамадзянскай супольнасьці мае права на існаваньне толькі ў межах асновапалеглых каштоўнасьцяў нацыянальна-дзяржаўнай ідэалёгіі.*

Як бачым, адсутнасць абсалюту ў спазнанні можа прыводзіць да супрацьлеглых вынікаў — ці то прызнання абсалюту як рэгулятыўнай ідэі, ці то агрэсіўнага рэлятывізму, што надае адной з партыкулярнасцяў статус абсалюта. Таму аўтар засцерагае: «...нікому насамрэч невядома, ці Беларусь — гэта «апошняя дыктатура» ў Эўропе, ці наадварот — вястун вяртаньня «абсалютнага панаваньня» ў Эўропе» (с. 153).

Наступны артыкул гэтага блоку — артыкул Андрэя Горных «Беларуская тэлевізія: акно ў Еўропу або люстра для героя». Аўтар спрабуе выявіць «істотныя рысы як уяўлення Еўропы, так і ўласнай ідэнтыфікацыі афіцыйнай Беларусі» праз аналіз візуальных складнікаў дакументальнага серыяла «Раз'ядналыя Штаты Еўропы», дапасоўваючы некаторыя псіхааналітычныя разважанні на яго конт. Візуальныя вобразы, выкарыстаныя ў серыяле, імкнуцца паказаць няўдаласць

калі не ідэі Еўразвязу, дык яе наяўнай рэалізацыі — аповед пра Новую Еўропу ўвесь час звязваецца з вобразамі хваробы і фантомнага існавання. Шмат разоў падкрэсліваецца антыгуманны, механістычна-бюракратычны характар працы ўстаноў ЕЗ. Паводзіны ж новых удзельнікаў Еўразвязу — краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы — расцэньваюцца як здрада пэўным ідэалам. Але ж якім менавіта — гэта не вельмі растлумачваецца, бо, як лічыць спадар Горных, гэта магло б прывесці да шматлікіх пытанняў, не зусім камфортных для стваральнікаў серыяла[4]. Таму ствараецца досыць спецыфічны вобраз Еўропы — як новай каланіяльнай сістэмы, чыя мяжа пашырэння пралягае ўздоўж Беларусі, якая захавала «дзявочую чысціню».

Але серыял не зводзіцца да наіўных спробаў стварэння цалкам негатыўнага вобразу ЭЗ з мэтай уздзеяння на тую частку аўдыторыі, якая яшчэ давярае афіцыйным мас-медыям. Аўтар артыкула паслядоўна «раскручвае» псіхааналітычную інтэрпрэтацыю серыяла, бо, магчыма, ён выконвае сур'ёзную тэрапеўтычную функцыю для «ідэалагічнага суб'екта». Такую функцыю трэба вызначыць як трансфер непажаданых рысаў уласнай псіхікі на вобраз Іншага:

> *Ідэалагічны суб'ект Беларусі не прызнае тых антыноміяў, з якіх ён сам выраблены <…> Механізмы праекцыі выносяць усё, што замінае ідэалагічнаму суб'екту памысліць сябе цэльным і несупярэчлівым чынам, на вонкавую фігуру* (С. 171).

**СНД — гэта не толькі эканамічны ці культурны саюз, а хутчэй новы цэнтр легітымацыі палітычных эліт.**

Таму нават слушныя вызначэнні некаторых заганаў заходняга капіталізму, прадэманстраваныя беларускай прапагандай, з'яўляюцца збольшага вынікам нежадання ўбачыць гэтыя рысы ў беларускай сістэме.

Апошні — чацвёрты блок — прадстаўлены артыкуламі Анатоля Панькоўскага («Буферныя формы: у Еўропу цераз адмаўленне Еўропы») і Аляксея Пікуліка («Другая Еўропа. Беларусь як унікальны выпадак падвойнай трансфармацыі»).

Аўтар першага тэксту прапануе больш пільна ўгледзецца ў функцыянаванне СНД. Гэта не толькі эканамічны ці культурны саюз, а хутчэй новы цэнтр легітымацыі палітычных эліт, прыналежных да краін-удзельнікаў СНД. Пасля распаду СССР беларускі, украінскі, расійскі і г. д. палітычныя бамонды апынуліся ў сітуацыі абсалютнай анархіі — і яны мусілі знайсці новыя спосабы набыцця легітымнасці. Адным з іх з'явілася функцыянаванне ў складзе СНД. І трэба адзна-

[4] Параўнайце пры гэтым падкрэсленае аўтарам адсутнасць імя Леніна ў ліку тых, хто, на думку «дакументалістаў», адказны за вынаходжанне самой ідэі Злучаных Штатаў Еўропы: «В рамках беларускай ідэалогіі марксізм становіцца асаблівым аб'ектам высвятлення: блізкім, але незразумелым і таму небяспечным магічным прадметам продкаў» (сс. 158 — 159).

чыць, што некаторыя задачы былі сапраўды ажыццёўлены — напрыклад, тэрыторыя Садружнасці не ведае сур'ёзных міжнародных канфліктаў і г. д. Такую самую ролю выконвалі і іншыя арганізацыі, заснаваныя пасля распаду СССР, — АДКБ, ЕўрАзЭС і г. д. Па сутнасці, усе яны з'яўляюцца часовымі арганізацыямі, мэта якіх — забяспечыць максімальна небалючы пераход ад існавання ў рамках СССР да самастойнага арыентавання ў сучасным свеце. Таму крызіс СНД стаў заўважны, калі шэраг краін — яе ўдзельніц — паспяхова дапасаваўся да новых умоў існавання. Парадаксальным чынам існаванне ў рамках СНД было для іх сродкам уваходжання ў глабальную гульню.

Адсюль вынікае, што, чым больш краіна «завязана» на СНД-падобных арганізацыях і чым больш яна падкрэслівае «сур'ёзны» характар такіх аб'яднанняў, тым больш яна адцягвае сваё паўналецце. Сапраўдная ж роля СНД — «дэзінтэграваць праз інтэграцыю»[5].

Аляксей Пікулік — апошні аўтар зборніка — імкнецца паказаць, што перспектывы ўваходжання Беларусі ў еўрапейскую прастору, канкрэтна, у ЕЗ, павінны быць падлічаны больш дакладна, чым гэта рабілася дагэтуль. Па-першае, трэба разумець, што само пытанне, ці магчымая лібералізацыя эканомікі разам з дэмакратызацыяй палітычнай сістэмы, з'яўляецца досыць дыскусійным, бо шок першых крокаў лібералізацыі эканомікі можа стымуляваць імкненне большасці грамадзян вярнуцца да былога стану рэчаў. Разам з гэтым, адсутнасць належнай палітычнай культуры можа прывесці да значнага ўціску першых «бенефіцыярыяў» на дзяржаўныя інстытуты, у выніку чаго рэформы для лібералізацыі рынку і дэмакратызацыі палітычнага жыцця могуць быць запушчаныя імі ў пажаданых кірунках.

Аналізуючы магчымыя формы дэмакратыі (у аспекце сумяшчэння гарантыі грамадзянскіх свабод і выбарнасці дзяржаўнай эліты) і тыпы сучаснага ліберальнага рынку (у аспекце ролі дзяржаўнага рэгулявання) аўтар прыходзіць да высновы, што беларускі рэжым з'яўляецца камбінацыяй неліберальнай эканомікі і неліберальнага эканамічнага аўтарытарызму. Таму як бы ні распачынаўся працэс рэфармавання беларускага жыцьця — ён будзе не проста складаным, а беспрэцэдэнтным (таму і «унікальны выпадак двайной трансфармацыі»)[6]. Тым самым надзеі пэўнай часткі беларускага грамадства на хуткае ўваходжанне Беларусі ў ЕЗ не зусім рэалістычная — 80 000 старонак умоваў не могуць быць выкананыя імгненна. Высновы Пікуліка несуцяшальныя: умовы для еўрапеізацыі

[5] «Фундаментальны парадокс СНД можна сфармуляваць наступным чынам: будучы абарончым «экранам» ад дэмакратыі, СНД — у сілу заяўленых мэтаў — спрыяе дэмакратызацыі дзяржаваў — яго ўдзельніц» (с. 183).

[6] «У Беларусі можна чакаць з'яўлення алігархічных групаў акурат зь ліку цяперашняй намэнклатуры, якія будуць валодаць значным уплывам на бюракратычны апарат і змогуць устанаўляць максімальна выгадныя, далёкія ад празрыстага дэмакратычнага капіталізму, правілы гульні для сябе» (с. 213).

краіны адсутнічаюць, і з цягам часу іх набыццё становіцца ўсе больш праблематычным.

Што ж, вось і ўсе восем артыкулаў — восем адказаў на пытанне, што такое Еўропа для Беларусі. Трэба цяпер адзначыць выдатную працу ўкладальніцы зборніка Вольгі Шпарагі. Цяжка казаць з упэўненасцю, наколькі гэта было зроблена наўмысна, а наколькі з'яўляецца «работай» выпадковасці, але сама паслядоўнасць артыкулаў можа набываць розныя значэнні, тым самым змяняючы сам рэгістр агульнага ўспрымання зборніка. Па-першае, кнігу можна разглядаць як восем спробаў тлумачэнняў прывабнасці вобраза Еўропы — і бачыць кожнае з васьмі ў яго своеасаблівасці ў параўнанні з астатнімі. Па-другое, можна ўгледзець і пэўнае ранжыраванне адносна ўпэўненасці ў ажыццяўленні ідэі Еўропы ў Беларусі — ад усхвалення вопыту «паміж» у якасці пратаганіста еўрапейскасці (аўтаноміі), які мусіць быць развіты ў паслядоўным ажыццяўленні свядомага плюралізму каштоўнасцяў, да несуцяшальнага дыягназу наконт ідэалагічных дэфармацыяў ідэі ЕЗ і прынцыповай немагчымасці Беларусі ў сваім сучасным стане ўвайсці ў агульнаеўрапейскую прастору.

Але, па-трэцяе, за гэтай розніцай трэба бачыць і пэўнае разыходжанне аўтараў наконт таго, што лічыць сапраўднай мэтай еўрапеізацыі Беларусі — ці то аўтаномную палітыку (у сэнсе Кастарыядзіса), ці то ўваходжанне ў ЕЗ. Так, гэтыя дзве мэты адна другой не супрацьстаяць лагічна, але ў сучасных беларускіх умовах яны сапраўды пазначаны рознай ступенню рэчаіснасці і афектыўна-эмансіпацыйнага зместу.

Таму гэты спектр поглядаў трэба расцэньваць у першую чаргу не як прынцыповае разыходжанне, а як узаемадапаўняльныя меркаванні наконт еўрапейскіх перспектыў Беларусі. Пэўна, трэба перафразаваць аднаго з аўтараў і выказацца наконт зборніка як аб «інтэграцыі праз дэзінтэграцыю». Вынік — з кнігай мусова азнаёміцца ўсім, хто зацікаўлены дадзенай праблематыкай і сумежнымі пытаннямі.

## КРЫТЫКА

АЛЕСЬ ПАШКЕВІЧ

# Планка для беларускіх гісторыкаў новага пакалення?

Выданне, якое разглядаецца ў гэтым артыкуле:

Грыбоўскі, Ю. *Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фармаваннях 1918—1945.* — Санкт-Пецярбург: Неўскі Прасцяг, 2006. — 832 с.

Разгляданая ў дадзенай рэцэнзіі манаграфія выйшла ў свет у самым канцы ўжо пазамінулага 2006 г. і выклікала відавочную зацікаўленасць беларускага чытача. Увесь яе 500-асобнікавы наклад (а ва ўмовах сучаснай Беларусі для выразна навуковага выдання гэта не так ужо і мала) цалкам разышоўся ўжо праз паўгода. Тым больш дзіўным у такой сітуацыі было доўгае маўчанне беларускай навуковай супольнасці з нагоды выхаду гэтай кнігі. Парадаксальна, але за цэлы год у беларускай гістарычнай перыёдыцы (што праўда, на сённяшні дзень зусім колькасна нешматлікай) на гэтую працу не з'явілася аніводнай сур'ёзнай навуковай рэцэнзіі, калі не браць пад увагу некалькіх невялікіх паводле аб'ёму газетных публікацый.

Часткова патлумачыць такую сітуацыю можна тым, што даследаваная ў межах разгляданай працы тэма — абсалютна для Беларусі новая і на сур'ёзным навуковым узроўні ў беларускай гістарыяграфіі да Юрыя Грыбоўскага бадай што і не закранелася. Каб у гэтым пераканацца, дастаткова проста зазірнуць на с. 609—613 манаграфіі, дзе пералічваюцца выкарыстаныя пры яе напісанні працы беларускіх аўтараў. У асноўным гэтыя працы — агульнага

*Алесь Пашкевіч — гісторык, сталы аўтар «ARCHE».*

характару і датычаць тэматыкі даследавання толькі ўскосна. Тое ж нешматлікае, што датычыць тэмы непасрэдна — перадусім кароткія артыкулы, найчасцей публіцыстычнай скіраванасці, друкаваныя ў розны час на старонках перыядычных выданняў. Дзеля таго даследаванне Ю. Грыбоўскага крытычна разглядаць вельмі цяжка, у тым ліку і з маральнага пункту погляду: супрацьпаставіць яму па сутнасці няма чаго. Тым не менш, было б відавочна несправядлівым пакінуць гэтую несумненна грунтоўную працу ўвогуле без водгуку з боку беларускай гістарычнай навукі, тым больш што гэта — адна з першых манаграфій, выдадзеных беларускімі гісторыкамі новага пакалення, чыё фармаванне як навукоўцаў ад самага пачатку праходзіла ўжо ва ўмовах суверэннай Беларусі.

Структурна манаграфія складаецца з аб’ёмнага ўступу, чатырох раздзелаў і заключэння. Ва ўступе аўтар, апрача вызначэння асноўных прынцыпаў, якімі ён кіраваўся пры падрыхтоўцы манаграфіі, дае грунтоўны аналіз папярэдняга стану вывучэння праблемы і робіць апісанне і характарыстыку асноўных крыніц даследавання. Першы раздзел манаграфіі мае агульную назву «Беларусы на службе ва Узброеных сілах II Рэчы Паспалітай (1918—1939)». У першым яго параграфе аўтар разглядае пытанне ўдзелу беларусаў у польска-савецкай вайне на баку польскіх войскаў у 1919—1920 гг., а ў пяці наступных — розныя аспекты службы вайскоўцаў беларускага паходжання ў польскім войску ў мірны час — у 1921—1939 гг. Тры наступныя раздзелы прысвечаныя пытанням беларуска-польскага вайсковага супрацоўніцтва на працягу шасці гадоў Другой сусветнай вайны. Другі раздзел мае назву «У Войску Польскім на пачатку Другой сусветнай вайны» і храналагічна ахоплівае перыяд з верасня 1939 па чэрвень 1941 гг., хоць адзін з параграфаў, у якім ідзе гаворка пра знаходжанне жаўнераў-беларусаў Войска Польскага ў нямецкім палоне, даводзіцца ажно да 1945 г., што адлюстравана нават у ягонай назве. Апрача гэтага аспекту, у асобныя блокі аўтар вылучыў тут разгляд пытанняў пра службу жаўнераў-беларусаў у шэрагах Войска Польскага ў часе т. зв. верасьнёвай кампаніі 1939 г., пра становішча польскіх афіцэраў і жаўнераў беларускай нацыянальнасці, інтэрнаваных на тэрыторыі СССР і іншых краін, а таксама пра стаўленне тагачаснай беларускай эміграцыі да стварэння Войска Польскага ў Францыі ў верасні 1939 — пачатку 1940 гг. У апошніх двух раздзелах падрабязна разглядаецца ўдзел беларусаў у Войску Польскім на новым этапе Другой сусветнай вайны, які распачаўся ў чэрвені 1941 г. пасля пачатку вайны паміж дзвюма таталітарнымі дзяржавамі — нацысцкай Германіяй і бальшавіцкім СССР. Трэці раздзел называецца «У складзе польскіх узброеных сілаў на Захадзе (1940—1947), а чацвёрты — «У шэрагах Войска Польскага на Усходнім фронце (1943—1945 гг.)». Як вынікае з саміх назваў, у першым выпадку ідзе гаворка пра ўдзел беларусаў у вайсковых фармаваннях, арганізаваных і падпарадкаваных польскаму эміграцкаму ўраду ў Лондане, а ў другім — у фармаваннях, арганізаваных у СССР і падпарадкаваных польскім камуністам. Дапаўняюць кнігу 57 разнастайных дадаткаў (табліцы, біяграфічныя даведкі, архіўныя даку-

менты і інш.) і каля 200 (!) ілюстрацыйных матэрыялаў, пераважная большасць якіх публікуюцца ўпершыню.

Манаграфія Ю. Грыбоўскага мае, такім чынам, шырокія храналагічныя межы і фактычна ахоплівае тры ўзаемна звязаныя і пераемныя, але ў той жа час вельмі розныя перыяды гісторыі Польшчы ХХ ст., цесна пераплеценыя з гісторыяй Беларусі: 1918—1921 гг. — перыяд т. зв. «змагання за межы», 1921—1939 гг. — мірны міжваенны перыяд і 1939—1945 гг. — час Другой сусветнай вайны. У манаграфіі разгляду гэтых перыядаў, нягледзячы на іх насычанасць важнымі для беларуска-польскіх узаемаадносін падзеямі, у тым ліку і ў вайсковай галіне, прысвечана зусім не аднолькавая колькасць месца. Амаль што 4/5 тэксту працы (с. 156—594) аддадзена пад разгляд беларускай прысутнасці ў польскіх вайсковых фармаваннях у гады Другой сусветнай вайны (храналагічна гэта — усяго 6 гадоў з 27), у той час як аналіз аналагічных працэсаў, якія адбываліся на працягу 21 папярэдняга года, змясціўся ўсяго на 120 старонках. Такая дыспрапорцыя надае першаму раздзелу характар хутчэй аб'ёмістых і грунтоўных уводзінаў (трэба прызнаць, зусім не лішніх) у асноўную праблему, якой для самога аўтара несумненна з'яўляецца «ўдзел беларусаў у рэгулярных вайсковых фармаваннях у гады Другой сусветнай вайны» — менавіта так, без згадкі іншых перыядаў, акрэсліваецца тэматыка кнігі на апошняй старонцы вокладкі.

Пазітыўных бакоў у кніжцы можна адзначыць вельмі шмат, але што ўражвае ў першую чаргу, ужо пры самым першым і павярхоўным праглядзе выдання, — шырыня крыніцавай базы даследавання. Цяжка прыгадаць увогуле хоць бы якую працу беларускай гістарыяграфіі, пры напісанні якой былі б выкарыстаныя дакументальныя матэрыялы з фондаў 30 (!) архіўных і музейных установаў з 5 краін (Беларусі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Літвы і Расіі). Пры гэтым Ю. Грыбоўскі, скарыстаўшыся з матэрыялаў агульнавядомых у навуковым асяроддзі буйных архіваў і музеяў (да якіх можна залічыць Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, дзяржаўныя архівы Берасцейскай, Гарадзенскай і Менскай вобласцяў, Архіў новых актаў і Цэнтральны вайсковы архіў у Варшаве, Архіў Польскага інстытута і музея імя генерала Сікорскага ў Лондане і Беларускую бібліятэку імя Францішка Скарыны ў Лондане, Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў і Архіў замежнай палітыкі Расійскай Федэрацыі), дабраўся таксама да тых архіўных сховішчаў, нават пра само існаванне якіх, не кажучы ўжо пра непасрэдную працу з фондамі, ведае далёка не кожны гісторык (напрыклад, архівы інфармацыйна-аналітычных цэнтраў пры Віцебскім і Мінскім аблвыканкамах, Архіў Дэпартамента па справах ветэранаў і рэпрэсаваных Рэспублікі Польшчы, Архіў Цэнтральнага музея ваеннапалонных у Ламбіновічах-Аполі (Польшча), Архіў Польскага Чырвонага Крыжа і інш. У спісе наведаных аўтарам установаў фігуруе нават музей XIII Агульнаадукацыйнага ліцэя імя Герояў Монтэ-Касіна ў горадзе Шчэцін (!)). Акрамя таго, кажучы пра крыніцавую базу даследавання, немагчыма не згадаць пра 57 пазіцый польскіх і бела-

рускіх выданняў, змешчаных у рубрыцы «Апублікаваныя крыніцы». Тое, як аўтару ўдалося атрымаць доступ да ўсіх гэтых расцярушаных па свеце матэрыялаў, Ю. Грыбоўскі сам апавёў у прадмове, адзначыўшы, што

*напісанне гэтай працы было б немагчымым без падтрымкі Згуртавання беларусаў у Вялікай Брытаніі, Нямецкага гістарычнага інстытута ў Варшаве, Фундацыі імя Робэрта Боша (Варшава), Фундацыі падтрымкі навукі «Каса імя Юзафа Мяноўскага» (Варшава), Міністэрства адукацыі і спорту Рэспублікі Польшчы, польскай дабрачыннай фундацыі Polonia Aid Fundation Trust (Лондан), а таксама Усходнееўрапейскага дэмакратычнага цэнтра* (с. 4).

Менавіта дзякуючы дапамозе ўсіх гэтых установаў стала магчымай праца аўтара з неабходнымі яму крыніцамі ў архіўна-музейных установах Вялікабрытаніі і Польшчы. Гэта сведчыць пра тое, што сёння беларускія даследчыкі, нягледзячы нават на вядомую спецыфіку працэсу развіцця беларускай гістарычнай навукі на сучасным этапе, усё ж маюць, пры ўмове адпаведнай уласнай актыўнасці, дастаткова рэальныя магчымасці для падрыхтоўкі грунтоўных даследаванняў, карыстаючыся з падтрымкі шматлікіх міжнародных навуковых фундацый. Кніга Грыбоўскага ў тым выглядзе, у якім яна існуе, — яскравы прыклад умелага выкарыстання такіх магчымасцяў.

Няма сэнсу падрабязна пераказваць увесь змест кнігі Ю. Грыбоўскага. Нават простае пералічэнне ўсіх закранутых ім буйных і дробных пытанняў заняло б некалькі старонак, бо аўтар імкнуўся ў межах адной манаграфіі разгледзець праблему службы жаўнераўбеларусаў у польскім войску ў першай палове XX ст. шырока і комплексна, закрануўшы не толькі мілітарныя і агульнапалітычныя, але і чыста побытавыя аспекты. Таму ў гэтай рэцэнзіі мы звернем увагу толькі на тое, як праз прызму дастаткова вузкага вайсковага аспекту Ю. Грыбоўскаму бачацца агульныя праблемы супольнай гісторыі Беларусі і Польшчы, якія і сёння з'яўляюцца дыскусійнымі як у беларускай, так і польскай гістарыяграфіі. Адна з такіх складаных праблем, якой Грыбоўскі аніяк не мог абмінуць, бо мусіў так ці іначай канкрэтна вызначаць сам прадмет сваёй працы, — гэта нацыянальны склад насельніцтва ў заходняй частцы Беларусі (а менавіта выхадцы з гэтай тэрыторыі з'яўляюцца ў пераважнай большасці героямі разглядаемай працы) у першай палове XX ст.

Працэс фармавання сучаснай беларускай нацыі ў канцы XIX — пачатку XX стст. ішоў, як вядома, дастаткова складана і адавочна адставаў у параўнанні з аналагічнымі працэсамі ў суседніх народаў: палякаў, расійцаў, літоўцаў, украінцаў, габрэяў. Да пачатку Першай сусветнай вайны гэты працэс быў яшчэ вельмі далёкі да свайго завяршэння, і пераважная большасць вясковага насельніцтва заходняй часткі Беларусі не мела скрышталізаванай і ўстойлівай свядомасці ўласнай прыналежнасці да таго ці іншага народа. У выніку гэтага за душы мясцовых, у асноўным беларускамоўных, але неаднародных з канфесійнага пункту гледжання сялян увесь час ішло няспыннае і зацятае змаганне паміж польскім,

расійскім, беларускім, а часткова нават украінскім і літоўскім нацыянальнымі рухамі. Кожны з пералічаных рухаў меў у гэтым змаганні пэўныя поспехі, але ў цэлым заходнебеларускае сялянства на працягу ўсёй першай паловы XX ст. заставалася інэртнай у нацыянальных адносінах масай, асобныя выхадцы з якой маглі афіцыйна змяняць сваю нацыянальнасць нават і некалькі разоў на працягу жыцця. Дзеля таго і пытанне нацыянальнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі перад Другой сусветнай вайной — надта неадназначнае і здаўна з'яўляецца прадметам сур'ёзных навуковых (а часам, на жаль, і не зусім навуковых) дыскусій, у асноўным паміж прадстаўнікамі польскай і беларускай гістарычных школаў.

Дадзеная спецыфіка вымагае ад любога аўтара, прадметам даследавання якога з'яўляюцца не нейкія агульныя грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы на пэўнай тэрыторыі, але ўдзел у гэтых працэсах прадстаўнікоў дакладна акрэсленай нацыянальнасці, адразу ж перад пачаткам працы над даследаваннем вызначыцца з крытэрыямі, паводле якіх ён далучае тых ці іншых асобаў да якой-кольвек нацыянальнай супольнасці. Дзеля гэтага і Юры Грыбоўскі мусіў ужо ва ўступе да кніжкі даволі падрабязна растлумачыць — каго з жаўнераў розных польскіх фармаванняў ён лічыць беларусамі і чаму. Натуральна, што аўтар працы не меў магчымасці даследавання радаводу кожнага паасобнага жаўнера і таму так ці інакш вымушаны быў застасоўваць нейкія больш-менш агульныя падыходы, выкарыстоўваючы «ўзаемадапаўняльныя крытэрыі, як веравызнанне, месца нараджэння, сталае жыхарства, родная мова і самасвядомасць» (с. 10).

Такім чынам, аўтар кнігі безумоўна залічвае да беларусаў «ураджэнцаў паўночна-ўсходніх ваяводстваў II Рэчы Паспалітай праваслаўнага веравызнання, незалежна ад пададзенай імі нацыянальнай прыналежнасці», зрабіўшы выключэнне толькі для «нязначнай колькасці расійцаў, пераважная большасць якіх ня мела выкрышталізаванай нацыянальнай самасвядомасці і якіх магчыма ідэнтыфікаваць па прозвішчах і лакалізацыі кампактнага пражывання» (с. 11). Распаўсюджанае ў міжваеннай Польшчы паняцце «праваслаўны паляк» аўтар ацэньвае як «у значнай ступені штучную з'яву» (с. 90). У дачыненні да куды больш складанай у тагачасных умовах праблемы вылучэння беларусаў з агульнай масы жаўнераў польскага войска рыма-каталіцкага веравызнання Ю. Грыбоўскі выказвае думку, што «нельга залічваць да крэсавых палякаў тых каталікоў, якія ў штодзённым жыцці карысталіся беларускай мовай, а па-польску размаўлялі толькі ў касцёлах і ўрадавых установах (школах, гмінах, войску і інш.)», пры гэтым абгрунтаваўшы сваё меркаванне спасылкамі не толькі на беларускіх (А. Смалянчук), але і на польскіх даследчыкаў (Е. Тамашэўскага, П. Эберхардта, Ю. Зарэмбу і З. Сямашку) (с. 11).

Можна прадбачыць, што дадзеныя крытэрыі вызначэння нацыянальнай прыналежнасці асобных жаўнераў Войска Польскага не будуць адназначна станоўча і без пярэчанняў прынятыя ўсімі без выключэння навукоўцамі, асабліва прадстаўнікамі польскай гістарыяграфічнай школы. Аднак жа належыць аб'ектыўна прызнаць, што праб-

лема вызначэння нацыянальнай прыналежнасці насельніцтва паўночнаўсходніх ваяводстваў міжваеннай Польшчы ў любым выпадку належыць да ліку вечна дыскусійных і канчаткова не вырашальных, улічваючы ўжо згаданую вышэй практычную адсутнасць выразна акрэсленай нацыянальнай свядомасці ў пераважнай большасці насельніцтва дадзеных тэрыторыяў і, мякка кажучы, спрэчнасць афіцыйных вынікаў усеагульных перапісаў насельніцтва, якія праводзіліся на тэрыторыі Польшчы ў 1921 і 1931 гг. Несумненная тэндэнцыйнасць вынікаў апошніх пацвярджаецца тым, што яны, паводле Ю. Грыбоўскага, прызнаваліся нязгоднымі з рэчаіснасцю нават вайсковымі ўладамі ў міжваеннай Польшчы (с. 62—63). Вайсковае камандаванне ў большай ступені, чым цывільная ўлада, усведамляла, якую патэнцыйную небяспеку ў будучыні можа несці фактычнае ўвядзенне самім сябе ў зман занадта аптымістычнай афіцыйнай нацыянальнай статыстыкай, таму імкнуліся па меры магчымасці ў сваёй унутранай дакументацыі адлюстроўваць рэальную, а не ілюзорную сітуацыю ў дадзенай сферы. Найбольш характэрнай праявай гэтага можна лічыць наяўнасць у дакументах павятовых камендатураў у дачыненні да кожнага прызыўніка дзвюх графаў: «нацыянальнасць, пададзеная прызыўніком», і «фактычная нацыянальнасць». Пры гэтым Міністэрства вайсковых спраў (і тут ягоная тагачасная пазіцыя абсалютна не рознілася ад сённяшняга погляду аўтара рэцэнзаванай кнігі) наўпрост прадпісвала лічыць беларусамі ўсіх без выняткu праваслаўных, якія нарадзіліся і пражывалі на тэрыторыі 3-й (з цэнтрам у Горадні) і 9-й (з цэнтрам у Берасці) вайсковых акругаў, незалежна ад таго, якую нацыянальнасць яны самі падавалі (с. 64). Цікава, што прынцыпова не адрознілася пазіцыя міжваенных польскіх вайсковых уладаў ад меркавання Ю. Грыбоўскага і ў дачыненні да нацыянальнай прыналежнасці т. зв. «крэсовых» каталікоў. Так, даследчык прыводзіць выпадкі, калі такіх каталікоў, якія самі сябе перад прызыўной камісіяй акрэслівалі палякамі, функцыянеры мясцовай вайсковай камендатуры ў графе «фактычная нацыянальнасць» запісвалі беларусамі, і адзначае, што падобных выпадкаў было «мноства» (с. 65). Прыводзяцца таксама канкрэтныя факты, якія пацвярджаюць агульную думку аўтара манаграфіі пра недасканаласць і супярэчнасць польскай афіцыйнай нацыянальнай статыстыкі, сярод якіх заслугоўвае ўвагі, напрыклад, прыведзеная на с. 70 інфармацыя пра адначасовае фігураванне ў дакументацыі Баранавіцкай вайсковай камендатуры прызыўніка Хведара Кісяля ў якасці «паляка» і «беларускага нацыяналіста».

Увогуле, нягледзячы на разгледжаныя вышэй прынятыя аўтарам агульныя прынцыпы вызначэння нацыянальнасці жаўнераў, дадзенае пытанне ўсё ж не вырашаецца ім канчаткова з самага пачатку і зноў узнікае на працягу ўсёй працы фактычна кожны раз, калі аўтар прыводзіць тую ці іншую лічбу, якая датычыць вайсковых стратаў ці колькасці жаўнераў беларускага паходжання ў тым ці іншым польскім вайсковым фармаванні. Як правіла, Ю. Грыбоўскі, разгледзеўшы ўсе даступныя яму статыстычныя звесткі, ва ўсіх выпадках вызначае толькі

мінімальную колькасць жаўнераў у кожным з разгляданых ім фармаванняў, у якую ўключае толькі тых вайскоўцаў, наконт беларускасці якіх ніякіх сумневаў няма, усе ж астатнія лічбы падаюцца аўтарам як дастаткова верагодныя, але ў той жа час і дыскусійныя. Натуральна, такі асцярожны і ўзважаны, сапраўды навуковы падыход да вельмі далікатнай праблемы ў дадзеным выпадку можна толькі вітаць. Усё ж такі ад часу тых падзеяў, якія сталі аб'ектам увагі аўтара манаграфіі, прайшло ўжо дастаткова шмат гадоў, і відавочна прыспеў час наколькі магчыма аб'ектыўнага асэнсавання іх вынікаў, без бясконцага ўліку палітычна-ідэалагічнай мэтазгоднасці сённяшняга дня.

Акрамя агульных крытэрыяў, пра якія ішла гаворка вышэй, аўтар лічыць патрэбным у некаторых выпадках ужываць пры вызначэнні нацыянальнасці жаўнераў шэраг дадатковых крытэрыяў. З мэтазгоднасцю выкарыстання аднаго з іх, а менавіта факту ўдзелу таго ці іншага жаўнера ў беларускім руху ўжо пасля дэмабілізацыі з польскага войска, нягледзячы на нібыта польскую нацыянальнасць, занатаваную ў афіцыйных дакументах падчас службы (с. 175, 239, 300—301), можна цалкам пагадзіцца. У той жа час дастаткова сумнеўнай з навуковага пункту погляду ўяўляецца часам ужываная аўтарам методыка вызначэння нацыянальнасці таго ці іншага жаўнера, абапіраючыся перадусім на ягонае прозвішча. Так, напрыклад, як ужо згадвалася вышэй, вылучыць з агульнай масы праваслаўных жаўнераў польскага войска этнічных расійцаў магчыма, паводле Ю. Грыбоўскага, апроч усяго іншага, «па прозвішчах і лакалізацыі кампактнага пражывання» (с. 11). Але варта звярнуць увагу, што ў той самы час жаўнер 2-га Польскага корпуса ў Італіі Цімафей Іваноў самім Ю. Грыбоўскім адназначна акрэсліваецца ў кнізе як «беларус», хоць ягонае відавочна небеларускае прозвішча і месца нараджэння (Браслаўшчына) хутчэй сведчаць пра тое, што гэты жаўнер быў расійцам-старавeрам. Вядома, нельга выключаць, што аўтар манаграфіі меў, акрамя прозвішча і месца нараджэння, нейкія дадатковыя, не выкладзеныя на яе старонках звесткі пра Ц. Іванова, якія далі яму падставы адназначна далучыць апошняга да беларусаў. Аднак жа ў любым выпадку той факт, што Іваноў з Браслаўшчыны ўсё ж такі мог быць беларусам, сведчыць пра відавочную хісткасць і спрэчнасць выкарыстання «прозвішчавага» крытэрыю. У апраўданне аўтара можна, праўда, сказаць, што ў цэлым ён згаданым крытэрыем не злоўжывае, звяртаючыся да яго толькі час ад часу ў найбольш складаных сітуацыях, калі інакшым шляхам колькасць беларусаў вызначыць немагчыма нават прыблізна пры несумненнасці, аднак, самога факту іх наяўнасці (с. 175, 244—245).

Для канкрэтнай ілюстрацыі таго, наколькі складаная і часам увогуле невырашальная задача стаяла перад аўтарам пры вызначэнні нацыянальнага паходжання паасобных жаўнераў, можна згадаць прыведзены на с. 301 выпадак з жаўнерам Сяргеем Чарнабаем, які «адразу быў запісаны беларусам, аднак праз нейкі час па ўласным жаданні яму выкраслілі ранейшую нацыянальнасць і занатавалі палякам». Пры гэтым Чарнабай «належаў да рэлігійнай плыні старавераў і ў паўсядзённым жыцці

размаўляў па-беларуску». Пазней, згодна з успамінамі саслужыўцаў-палякаў, «ён канчаткова спаланізаваўся… пасля вайны жыў у Англіі і падтрымліваў кантакты з польскімі камбатантамі, у той час як з беларусамі не меў аніякай сувязі». Як вядома, прыналежнасць да рэлігійнай плыні старавераў гаворыць хутчэй за тое, што чалавек меў паходжанне не беларускае, а расійскае, у той час як родная беларуская мова, наадварот, сведчыць нібыта пра ягоную беларускасць. Сам жа жаўнер у дадзеным выпадку, як вынікае, не выказваў жадання мець нічога агульнага ані з расійцамі, ані з беларусамі і хіліўся, нягледзячы на відавочна няпольскае паходжанне, да польскасці (не факт, што з ідэйных меркаванняў, зусім магчыма, што і з чыста прагматычных). Прозвішча ж ягонае не можна залічыць ані да тыпова расійскіх, ані да тыпова беларускіх. Можна меркаваць, што падобны выпадак быў далёка не адзіны. Пытанне, ці магчыма ўвогуле ў такіх выпадках з поўнай дакладнасцю і аб'ектыўнасцю прыняць рашэнне аб залічэнні ці незалічэнні такіх жаўнераў да акрэсленай нацыянальнасці, выглядае рытарычным.

Акрамя таго, Ю. Грыбоўскі ў сваёй манаграфіі чамусьці ўвогуле не згадаў і яшчэ адну праблему, звязаную з нацыянальным пытаннем у Заходняй Беларусі: пра беларуска-ўкраінскія супярэчнасці на Заходнім Палессі. Сутнасць гэтай праблемы — у тым, што насельніцтва некалькіх паветаў былога Палескага ваяводства, якія на сённяшні дзень уваходзяць у склад Рэспублікі Беларусі (у першую чаргу Берасцейскага, Кобрынскага і Драгічынскага), у міжваенны перыяд не мела фактычна ніякай нацыянальнай свядомасці, апроч «тутэйшай», і размаўляла на дыялекце, набліжаным больш да ўкраінскай, чым да беларускай мовы. Пад уплывам палітычнага размежавання, якое адбылося ў пасляваенны час, насельніцтва згаданых тэрыторый да сённяшняга дня ў цэлым прызнала сябе часткай беларускага народа, але наколькі можна яго адназначна залічваць да гэтага народа ў часы, разгляданыя ў манаграфіі, — пытанне далёка не адназначнае і не бясспрэчнае. Падаецца, праўда, што ні Ю. Грыбоўскі, ні любы іншы аўтар не здолеў бы ў гэтым выпадку даць сабе рады з выпрацоўкай нейкіх аб'ектыўных крытэрыяў, таму самае большае, што можна было б аўтару тут закінуць, — што ён пра існаванне гэтай праблемы ўвогуле не згадвае.

Трэба адзначыць, што аўтар зусім не ставіць пад сумнеў тое, што вайскоўцы несумненна беларускага паходжання падавалі сваю нацыянальнасць як «польскую» звычайна цалкам добраахвотна, але імкнецца знайсці гэтым нярэдкім фактам тлумачэнне. Так, ён лічыць, што адной з прычын называння сябе палякамі з боку жаўнераў-беларусаў у міжваенны перыяд было, сярод іншага, натуральнае імкненне служыць бліжэй да дому, бо дзеля цалкам зразумелых стратэгічных інтарэсаў польскае вайсковае камандаванне імкнулася забяспечваць вайсковыя фармаванні, размешчаныя на т. зв. «крэсах усходніх», кадрамі польскага паходжання, у той час як прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў па магчымасці накіроўваліся ў этнаграфічныя польскія землі (с. 76). Акрамя таго, вялікае значэнне тут мела тое, што да жаўнераў і афіцэраў няпольскай нацыянальнасці ўлады, нягледзя-

чы на ўсе дэкларацыі аб адваротным, усё ж такі так ці іначай мелі засцярогі, і таму кар'ерны рост такіх асобаў быў значна абцяжараным у параўнанні з жаўнерамі і афіцэрамі палякамі (с. 79, 95, 101, 103). У выніку ад свайго беларускага паходжання пад пагрозай звальнення з войска ў міжваенны перыяд часам адхрышчваліся нават тыя асобы, якія да 1920 г. служылі ў складзе Беларускай вайсковай камісіі, як гэта сталася, напрыклад, з палкоўнікам А. Чуніхіным-Кавэцкім у 1922 г. (с. 99). Асаблівы выпадак — калі дэманстратыўна рабіліся палякамі людзі несумненна беларускага паходжання, якія пацярпелі ад савецкай улады пасля яе прыходу на заходнебеларускія землі ў 1939 г. Савецкая ўлада ўсе свае мерапрыемствы ў Заходняй Беларусі, у тым ліку і рэпрэсіўныя, здзяйсняла «ад імя беларускага народа», таму многія з тых беларусаў, якіх бальшавіцкія рэпрэсіі непасрэдна зачапілі, свядома прынялі польскасць у якасці своеасаблівага пратэсту. Найбольш характэрным і яскравым падобным прыкладам з'яўляецца прыведзены Ю. Грыбоўскім на с. 302 выпадак з праваслаўным беларусам Мікалаем Міклашэвічам, родным братам вядомай беларускай паэткі Ларысы Генюш, які ў 1941 г. уступіў у шэрагі Польскай арміі ў СССР і катэгарычна адмовіўся ад свайго беларускага паходжання, дэкларуючы, што беларусы — гэта тыя, хто ў 1940 г. дэпартаваў ягоную сям'ю ў Сібір. Вернасць польскасці ён захаваў да канца свайго жыцця. Ягоная ж сястра, напоўніцу зведаўшы ўсе жахі сталінскіх лагераў, аж да самай сваёй смерці ў 1983 г. цярпела сапраўдныя здзекі з боку той самай нібыта «беларускай» улады за сваю амаль фанатычную вернасць беларускай нацыянальнай ідэі. Такая вось іронія лёсу.

Пра прагматычныя падставы польскасці некаторых беларусаў вельмі яскрава сведчыць прыведзены Ю. Грыбоўскім прыклад з беларусам-палешуком Лявонам Марозам, які ў 1939 г. выпрасіў у знаёмага супрацоўніка Лунінецкай павятовай вайсковай камендатуры, каб той запісаў яго палякам, не хаваючы ад яго сваіх чыста кар'ерных памкненняў, а пасля прыходу на гэтыя землі Чырвонай арміі зноў афіцыйна вярнуўся да беларускай нацыянальнасці, якая нечакана, пасля змены палітычных умоваў, стала больш прэстыжнай (с. 107). Другі прыклад падобнага кшталту: калі ўжо пасля пачатку Другой сусветнай вайны частка польскіх жаўнераў беларускага паходжання апынулася ў нямецкім палоне, выдаваная ў Берліне беларуская газета «Раніца» ў 1940 г. паведамляла, што «некаторыя беларусы, якія ўжо запісаліся беларусамі, каб хутчэй звольніцца з лагера, зараз просяць перапісаць іх палякамі, матывуючы гэта тым, што быццам палякаў ужо звальняюць на волю, а беларусаў — не» (с. 209).

Другое важнае і неадназначнае пытанне, ад разгляду якога аўтар манаграфіі аніяк не мог ухіліцца: ці можна адназначна ўспрымаць беларусаў, якія ў міжваенны час з'яўляліся грамадзянамі Польшчы, як перакананых саветафілаў, камуністаў і, адпаведна, заядлых ворагаў польскай дзяржавы, да чаго нас прывучыла ранейшае даследаванне гісторыі беларускіх земляў у складзе міжваеннай Польшчы пераважна праз прызму дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і іншых

левварадыкальных арганізацый? Якi ўплыў мелі палітычныя погляды на ход службы жаўнераў-беларусаў у польскім войску і як гэта адбівалася на іх узаемаадносінах з жаўнерамі польскай нацыянальнасці? У кнізе Грыбоўскага дадзенае пытанне, як і папярэдняе, з той ці іншай ступенню вастрыні паўстае практычна ў кожным раздзеле, і агульная выснова аўтара — насуперак замацаваным стэрэатыпам жаўнеры-беларусы заўсёды, у тым ліку і ў ці не найбольш складаныя і супярэчлівыя для беларуска-польскіх міжнацыянальных узаемадачыненняў міжваенны перыяд, былі дастаткова лаяльнымі да польскай дзяржавы, а калі канфлікты паміж імі і жаўнерамі-палякамі ўсё ж такі здараліся, то звычайна не з палітычных прычынаў. Адлюстроўвае гэта хоць бы такі паказчык, як памеры дэзертырства беларусаў з польскага войска, асабліва ў лёсавызначальныя для польскай дзяржавы часы. Так, на с. 109 Ю. Грыбоўскі, прааналізаваўшы польскую афіцыйную статыстыку па дэзертырстве сярод жаўнераў міжваеннага польскага войска розных нацыянальнасцяў, высветліў, што толькі 5 % выпадкаў дэзертырства сярод беларусаў прадыктаваныя палітычнымі матывамі. У асноўным жаўнеры-беларусы, якія збольшага мелі сялянскае паходжанне і нізкі ўзровень адукацыі, імкнуліся дахаты, успрымаючы службу ў войску як «цяжкую жыццёвую дакуку» і імкнучыся дапамагчы сваякам падчас сельскагаспадарчых працаў. Тое ж датычыць і выпадкаў уцёкаў жаўнераў-беларусаў у СССР — звычайна падставай для гэтага былі чыста эканамічныя меркаванні. Увогуле Ю. Грыбоўскі, прааналізаваўшы афіцыйныя польскія крыніцы, не знайшоў асаблівых падстаў для таго, каб сцвярджаць, што нейкая этнічная група ў міжваенны перыяд вылучалася празмернай схільнасцю да дэзертырства ў параўнанні з іншай (с. 108). Пасля пачатку ж Другой сусветнай вайны, у якой беларусы-заходнікі бралі ўдзел з самага першага дня, яны сталі актыўна дэзертаваць з польскага войска толькі пасля 17 верасня 1939 г., бо гэты дзень «падарваў веру і сэнс далейшага змагання **ўсіх** (вылучэнне маё. — **А. П.**) польскіх жаўнераў». Пры гэтым казаць пра масавае дэзертырства можна ў дачыненні толькі да тых жаўнераў-беларусаў, чые вайсковыя часткі знаходзіліся тады на тэрыторыі Заходняй Беларусі, г. зн. у непасрэднай блізіні да месца жыхарства (с. 180), у той час як у цэнтральных і заходніх рэгіёнах Польшчы больш дэзертавалі польскія жаўнеры, бо было блізка да дому ім (с. 179). Здараліся выпадкі дэзертырства сярод беларусаў Войска Польскага з адначасовым пераходам да саветаў і на заключным этапе Другой сусветнай вайны, але і гэтыя людзі, як сцвярджае аўтар, «не былі перакананымі камуністамі альбо зацятымі прыхільнікамі Савецкага Саюза, а само дэзертырства не з'яўлялася вынікам варожага стаўлення беларусаў да Войска Польскага». Найбольш верагоднымі прычынамі дэзертырства Ю. Грыбоўскаму бачацца тут «абставіны, звязаныя з паўсядзённым жыццём жаўнераў», бо «асноўнай іх праблемай быў непакой за сваю будучыню, лёс сямей» (с. 339).

Варта падкрэсліць, што Ю. Грыбоўскі, адзначаючы такую характэрную якасць беларусаў, як «лаяльнасць да інстытута дзяржавы ўвогуле» (с. 190), стаўленне жаўнераў-беларусаў да

Польшчы ў той жа час і не ідэалізуе, сцвярджаючы і пацвярджаючы сваю думку канкрэтнымі фактамі, што ў першую чаргу матывы ўступлення большасці з іх у польскія вайсковыя фармаванні (калі дадзенае ўступленне адбывалася добрааахвотна) былі, як правіла, чыста практычныя, але амаль ніколі не ідэалістычныя. Так, калі ў 1941 г. беларусы, перад гэтым разам з палякамі дэпартаваныя з заходніх вобласцяў Беларусі, уступалі ў шэрагі фармаванай на тэрыторыі СССР польскай арміі пад камандаваннем Уладзіслава Андэрса, то іх станоўчае стаўленне да гэтай арміі тлумачылася тым, што «большасць з іх убачылі ва ўступленні ў польскія аддзелы адзіны шлях канчаткова пазбавіцца савецкага пераследу» (с. 288), а ў 1944 г. у Заходняй Еўропе для беларусаў — былых жаўнераў пранямецкіх фармаванняў «дэкляраванне сябе польскімі грамадзянамі і ўступленне ў Войска Польскае было адзіным шляхам уратавання ад рэпатрыяцыі ў «савецкі рай», дзе іх чакала непазбежная смерць», «рабілі яны гэта без вялікага маральнага задавальнення і разглядалі гэты крок выключна як неабходнасць» (с. 345).

Што тычыцца пытання, наколькі жаўнеры беларускага паходжання былі скамунізаваныя, то і тут Ю. Грыбоўскі, увогуле не аспрэчваючы таго відавочнага факту, што ўплыў камуністычнай партыі на пэўную частку гэтых жаўнераў меў месца, зусім не схільны ацэньваць згаданую з’яву як масавую і прыходзіць да высновы, што ў міжваенны перыяд большасць жаўнераў-беларусаў увогуле мала цікавіліся ідэямі і лозунгамі, якія прапагандавалі камуністы (с. 135). Самі камуністы, як вядома, так сама ў сваёй прапагандзе рабілі асноўны акцэнт на раздзьмуханне класавых супярэчнасцяў, а не нацыянальных, таму пад іх уплыў траплялі далёка не адныя толькі беларусы. Так, у 1936 г. было адзначана 104 выпадкі шпіянажу на карысць СССР, і толькі ў 21 з іх былі задзейнічаныя беларусы (с. 126). Падтрымка камуністаў у асяроддзі жаўнераў-беларусаў, калі яна ўсё ж здаралася, мела ў першую чаргу не ідэйную, а сацыяльна-эканамічную аснову. Такая асаблівасць беларускага светапогляду яскрава праявілася ў 1939 г., калі беларускае насельніцтва напярэдадні вайны выразна негатыўна ставілася да адначасовай з жаўнерамі мабілізацыі ў войска гаспадарчых элементаў — коней, вазоў і г. д., і да самой неабходнасці адлучацца з дому падчас жніва, у той час як выпадкі ігнаравання мабілізацыі з палітычных матываў былі рэдкія (с. 165, 171). Пэўныя сімпатыі да камуністаў грунтаваліся ў першую чаргу на перакананнях, што ў СССР, у параўнанні з Польшчай, лепшыя ўмовы для жыцця «працоўнага чалавека». Аднак гэтыя перакананьні хутка развеяліся пасля сутыкнення з жорсткай рэчаіснасцю. Падчас знаходжання жаўнераў былога польскага войска ў савецкім палоне ў 1939—1940 гг. «у першыя месяцы савецкага палону даходзіла да адкрытых сварак паміж палякамі — з аднаго боку, беларусамі і габрэямі — з другога. Падчас гэтых непаразуменняў ваеннапалонныя-беларусы абражалі польскую справу, цешыліся з паразы Польшчы і інш.» (с. 224—225), але, паводле сведчанняў ваеннапалонных-палякаў, «ужо праз месяц пасля знаходжання ў палоне беларусы пачалі нават адкрыта выказвацца супраць савец-

кай палітыкі, выступалі ў ролі завадатараў антысавецкіх выступаў» (с. 236).

Пасля прачытання ўсёй кнігі Ю. Грыбоўскага ва ўяўленні чытача складваецца пэўны зборны вобраз жаўнера-беларуса ў польскім войску ў першай палове XX ст. Гэты жаўнер вызначаўся стараннасцю, паслухмянасцю, непатрабавальнасцю, фізічным здароўем. Ён па магчымасці стараўся не вылучацца сярод іншых, дзеля чаго ахвотна прымаў польскую мову ў якасці размоўнай аж да такой ступені, што пачынаў гутарыць на ёй з землякамі. Жаўнер-беларус вызначаўся найніжэйшым узроўнем нацыянальнай свядомасці ў параўнанні з усімі іншымі нацыянальнымі меншасцямі, мала цікавіўся палітыкай. У данясеннях свайго камандавання такі жаўнер атрымліваў звычайна больш станоўчых характарыстык, чым адмоўных. Цікава, што прыблізна гэткія ж ацэнкі і характарыстыкі атрымлівалі ў пазнейшы час жаўнеры беларускага паходжання і ў савецкім войску, і гэта сведчыць пра абумоўленасць падобных паводзінаў беларусаў не чым іншым, як асаблівасцямі нацыянальнага менталітэту. Вядома, нельга абсалютна ўсіх жаўнераў-беларусаў (як і жаўнераў любога іншага паходжання) падагнаць пад адзін строгі шаблон, і на старонках кнігі Ю. Грыбоўскага прыводзіцца дастатковая колькасць фактаў, якія не зусім укладаюцца ў агульную схему. Аднак жа выключэнні, як вядома, толькі пацвярджаюць правілы.

Навуковая каштоўнасць манаграфіі Ю. Грыбоўскага, прытым не толькі для беларускай навукі, — несумненная. Сведчаннем гэтага можа быць хоць бы тое, што ўсяго праз паўгода пасля выхаду кнігі ў Беларусі з’явіўся і яе польскамоўны варыянт[1] . Выданне працы ажыццявіла вядомае варшаўскае выдавецтва «Рытм», прытым манаграфія выйшла ў т. зв. «Усходняй серыі» гістарычных даследаванняў, сярод заснавальнікаў якой фігуруюць у тым ліку такія заслужаныя і аўтарытэтныя навуковыя ўстановы, як Польская акадэмія навук і Гістарычны інстытут Варшаўскага універсітэта. Не малаважна, што Ю. Грыбоўскі стаў першым замежным аўтарам, праца якога была апублікавана ў гэтай серыі. А напрыканцы мінулага года высокі ўзровень выканання даследавання быў прызнаны польскай навуковай супольнасцю, што ўвасобілася ў прысуджэнні яе аўтару найбольш прэстыжнай для гісторыкаў у Польшчы штогадовай прэміі «Кліо» ў намінацыі «Навуковыя манаграфіі».

Аднак жа пры ўсім пры гэтым агульнавядома, што абсалютна ідэальных навуковых прац на свеце не бывае, і некаторыя заўвагі аўтару, у межах уласнай кампетэнцыі (аўтар рэцэнзіі не з’яўляецца прафесійным вайсковым гісторыкам) і *ў дачыненні выключна да беларускага выдання*, выказаць усё ж такі можна.

Так, на нашу думку, далёка не бездакорная сама структура працы Ю. Грыбоўскага, асабліва што датычыць першага яе раздзела — «Беларусы на службе ва Узброеных сілах ІІ Рэчы Паспа-

[1] Grzybowski, J. Białorusini w polskich regularnych formacjach wojskowych w latach 1918—1945. Warszawa, 2007.

літай (1918—1939)». Сумнеў выклікае мэтазгоднасць спалучэння ў межах аднаго гэтага раздзела разгляду пытанняў пра ўдзел беларусаў у польска-савецкай вайне на баку польскіх войскаў у 1919—1920 гг. і пра службу жаўнераў беларускага паходжання ў Войску Польскім у мірны перыяд — у 1921—1939 гг. Усё ж такі служба жаўнера падчас вайны і служба ў мірны час паміж сабой вельмі розняцца, таму падаецца, што ўдзел беларусаў у баявых дзеяннях на польскім баку ў польска-савецкай вайне заслугоўваў бы вылучэння ў асобны раздзел, хоць бы і невялікі паводле аб'ёму. У такім выпадку добрым агульным найменнем для наступнага раздзела была б назва «У Войску Польскім у мірны перыяд (1921—1939)», якую ў аўтарскай версіі мае другі параграф першага раздела. У гэтым параграфе аўтар дастаткова падрабязна раскрывае пытанні агульнай структуры польскага войска на тэрыторыі Заходняй Беларусі, сістэмы агульнага прызыву (у аўтарскай моўнай версіі — закліку) у гэтае войска і яго спецыфікі ў дачыненні да прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў, спрабуе вызначыць агульную колькасць жаўнераў-беларусаў у міжваенным польскім войску, асаблівасці стаўлення да іх з боку непасрэдных камандзіраў і вышэйшых вайсковых уладаў, а таксама стаўленне саміх беларусаў да самой неабходнасці службы ў войску і выканання сваіх службовых абавязкаў. У той жа час прадметам разгляду наступных параграфаў першага раздзела, нягледзячы на надзвычай шырокую і, можна сказаць, усёахопную назву вышэйзгаданага другога параграфа, Ю. Грыбоўскі вырашыў вынесці такія праблемы, як «Спробы паланізацыі беларусаў у Польскім Войску», «Афіцэры і падафіцэры беларускай нацыянальнасці ва Узброеных сілах II Рэчы Паспалітай», «Дэзертырства» і «Дзейнасць палітычных партыяў сярод вайскоўцаў-беларусаў (1921—1939)». Увогуле наконт мэтазгоднасці асобнага разгляду гэтых праблемаў аніякіх сумневаў не ўзнікае, бо аўтар сабраў па кожнай з іх вялікі аб'ём цікавага і арыгінальнага матэрыялу — пытанні тут выклікае, як ужо адзначалася, толькі занадта агульная назва другога параграфа. Падаецца, што ў дадзеным выпадку мы маем месца з відавочным недаглядам як з боку самога аўтара, так і з боку навуковага рэдактара кнігі. Тое самае можна сказаць у дачыненні да таго, што ў шэрагу выпадкаў храналагічныя межы ў назвах асобных параграфаў і раздзелаў не супадаюць з храналагічнымі межамі самой працы: ёсць дзве назвы параграфаў з крайнім 1946 г., назвы аднаго раздзела і аднаго параграфа з крайнім 1947 г. і нават назва аднаго параграфа з крайнім 1948 г.

Калі ўжо ўсё адно закранута праблема навуковай рэдакцыі манаграфіі, то варта тут яшчэ адзначыць, што не надта ўпрыгожвае гэтае выданне паўтарэнне ў розных месцах працы адных і тых дастаткова аб'ёмных цытат (як гэта мае месца, напрыклад, на с. 70 і 85, 407 і 415). Няўважлівасцю як аўтара, так і рэдактара можна растлумачыць таксама некаторыя супярэчнасці факталагічнага характару, якія захаваліся дзенідзе ў тэксце. Так, напрыклад, на с. 101 спачатку сцвярджаецца, што «ў 1930 г. ва ўсім Войску Польскім было зафіксавана толькі 6 **беларусаў**-афіцэраў», а далей у тым самым абзацы пішацца пра

тое, што «ў 1930 г. колькасць афіцэраў **праваслаўнага веравызнання** склала толькі 6 чал.» з адначасовым адзначэннем, што «безумоўна, далёка не ўсе праваслаўныя былі беларусамі». На с. 136 адзначаецца, што «па сутнасці БСРГ была інспіраваная камуністамі і ўяўляла сабой легальную плынь КПЗБ», але «дзеячы БСРГ заклікалі сваіх прыхільнікаў ухіляцца ад вайсковае службы», у той час як «КПЗБ не заклікала заходнебеларускую моладзь ухіляцца ад вайсковай службы, наадварот — асуджала прызыўнікоў, якія не жадалі ісці ў армію» (с. 128). З аднаго боку, «Грамада не мела спецыяльнай праграмы ў адносінах да войска» (с. 144), а з другога — «Грамада мела сваю пазіцыю ў адносінах да ўзброеных сілаў» (с. 136). На с. 90—91 сустракаецца сцверджанне, што «справы праваслаўнага веравызнання ў войску непасрэдным чынам датычыліся выключна вайскоўцаў беларускай нацыянальнасці», у той час як у іншых месцах сам аўтар зусім слушна заўважае, што ў міжваеннай Польшчы да праваслаўнага веравызнання належалі таксама расейцы і ўкраінцы.

На с. 116 сцвярджаецца, што Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ) уваходзіла ў склад Камінтэрну. На самай справе КПЗБ, як і Камуністычная партыя Заходняй Украіны (КПЗУ), з'яўлялася аўтаномнай часткай Камуністычнай партыі Польшчы (КПП), а ўжо апошняя прадстаўляла Польшчу ў Камінтэрне. На с. 128 газета «Чырвоны сьцяг» фігуруе як орган Камуністычнага саюзу моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), у той час як гэтае выданне паралельна з газетай «Большевик» было падпольным друкаваным органам КПЗБ.

Пры ўвогуле аб'ектыўным характары выкладання матэрыялу ў кнізе дзенідзе аўтару можна ўсё ж такі закінуць недастаткова крытычнае стаўленне да крыніц. Так, на с. 52 аўтар як пра неаспрэчны факт апавядае пра апанаванне Беларускай вайсковай камісіі сябрамі Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПСР), спасылаючыся пры гэтым выключна на сцверджанне далёка не заўсёды аб'ектыўных аўтараў падрыхтаванай у 1928 г. аналітычнай працы II аддзела Генеральнага штаба Войска Польскага пад назвай «Кароткі нарыс беларускага пытання» (дарэчы, у спасылках і ў спісе літаратуры ў аўтара некалькі разоў праходзіць нязгодная з арыгіналам польскамоўная назва гэтай працы — «Krótki zarys kwestii białoruskiej» замест «Krótki zarys zagadnienia białoruskiego» (с. 146, 618)). У той жа час крыніцай для апісання дзейнасці ў міжваенным польскім войску найбольш масавай тагачаснай беларускай арганізацыі — Беларускай сялянска-работніцкай грамады, паслужыў фактычна толькі адзін дакумент — стэнаграма працэсу над кіраўнікамі гэтай партыі, які адбываўся ў Вільні ў 1928 г. Сама важнасць гэтага дакумента як гістарычнай крыніцы, праўда, сумневу не выклікае, аднак жа пажадана ўсё ж было б дзеля большай аб'ектыўнасці гэтую спецыфічную інфармацыю «разбавіць» таксама сведчаннямі з крыніц іншага паходжання (с. 137—141).

Надта неверагоднай выглядае інфармацыя, нібыта пры вылучэнні беларускіх жаўнераў з агульнай масы ў адным з нямецкіх лагераў для ваеннапалонных пры адсутнасці асабістых дакументаў для вызначэння нацыяналь-

насці палонных «прымушалі чытаць пацеры на беларускай мове, каб такім чынам яны пацвердзілі сваё нацыянальнае паходжанне» (с. 195). Улічваючы тое, што ўжыванне беларускай мовы ў практыцы як Праваслаўнай царквы, так і Каталіцкага касцёла ў тыя часы было зусім не правілам, а толькі дастаткова рэдкім выключэннем, няведанне жаўнерам беларускамоўных пацераў аніякім чынам не магло сведчыць пра ягоную небеларускую нацыянальную прыналежнасць. Наўрад ці пра гэта маглі не ведаць тыя асобы, якія праводзілі вылучэнне беларускага элементу, тым больш настолькі абазнаныя ў праблеме, што былі ў стане адрозніць адну славянскую мову ад даволі падобнай на яе іншай.

Аднак усе вышэйпералічаныя недакладнасці і супярэчнасці, выяўленыя пры чытанні манаграфіі Ю. Грыбоўскага — дастаткова дробныя і прынцыпова ні на што не ўплываюць. Іх прысутнасць у тэксце — вынік у першую чаргу банальнай няўважлівасці аўтара і навуковага рэдактара працы. Дарэчы будзе сказаць, што пры выданні польскамоўнай версіі манаграфіі большасць адзначаных хібаў рэдакцыйнага характару была выпраўлена. У той жа час у манаграфіі ёсць і некалькі дастаткова сур'ёзных факталагічных памылак, якія лічу патрэбным разгледзець больш падрабязна дзеля таго, каб прадухіліць іх магчымае паўтарэнне са спасылкай на Ю. Грыбоўскага ў будучых навуковых выданнях[2].

На с. 11 і 94 былы пасол польскага сейму ў 1930—1938 гг. Генадзь Шыманоўскі называецца «айцом» і «праваслаўным святаром». Аднак жа, хоць гэты дзеяч і сапраўды падчас выканання пасольскіх абавязкаў сваю актыўнасць скіроўваў перадусім на справу абароны інтарэсаў Праваслаўнай царквы ў Польшчы, сам ён святарскага сану ніколі не меў. Да таго ж згаданага Шыманоўскага, як і іншага міжваеннага сеймавага пасла Фелікса Галавача, хіба што толькі з вялікай нацяжкай можна залічыць да «вядомых грамадска-палітычных і культурных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Польшчы», як аўтар гэта робіць на с. 277. Як пазначае сам Ю. Грыбоўскі на с. 94, Генадзь Шыманоўскі «ў перыяд сваёй дзейнасці ў 2-ой Рэчы Паспалітай лічыў сябе палякам», а ў сейм як у 1930, так і ў 1935 г. ён прайшоў са спісу праўрадавага Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам (ББСУ), стаўленне да якога з боку прыхільнікаў беларускага нацыянальнага руху было, мякка кажучы, стрыманым. У той жа час Галавач, хоць не адмаўляў свайго беларускага паходжання і нават пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. некаторы час браў удзел у працы Беларускай сацыялістычнай грамады, у 1922—1927 гг. быў паслом сейму зусім не ад беларускай меншасці, а ад Польскай народнай партыі «Вызваленне», у пасольскі клуб якой да 1924 г. уваходзіў (Ю. Грыбоўскі сам пра гэта згадвае на с. 457), а пасля (да свайго

[2] Пры падрыхтоўцы польскамоўнага выдання манаграфіі большасць з фактаграфічных недакладнасцяў, якія будуць адзначаны ніжэй, былі Ю. Грыбоўскім выпраўленыя, сярод іншага, і пад уплывам вусных заўваг, зробленых аўтарам гэтай рэцэнзіі.

арышту разам з чатырма паслaмі Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў студзені 1927 г.) быў адным з лідэраў таксама небеларускай Незалежнай сялянскай партыі. Непасрэдна ж у беларускім руху за ўвесь міжваенны перыяд гэты дзеяч не адзначыўся ніколі.

На с. 47 аўтар у якасці прыкладу змагання свядомых беларусаў у складзе Літоўска-Беларускай дывізіі згадвае пра тое, што «ў шэрагах Беластоцкага пяхотнага палка з 4 красавіка 1919 па 17 ліпеня 1920 гг. шарагоўцам служыў Фабіян Ярэміч, які ў пазнейшы час прадстаўляў інтарэсы беларускай нацыянальнай меншасці ў Сойме 2-й Рэчы Паспалітай». Інфармацыю пра гэта Ю. Грыбоўскі ўзяў з персанальнай справы Фабіяна Ярэміча, якая сёння захоўваецца ў Цэнтральным вайсковым архіве ў Рэмбертове (Варшава). У гэтай справе (са зместам якой аўтара гэтай рэцэнзіі ў свой час пазнаёміў сам Ю. Грыбоўскі, за што той яму вельмі ўдзячны), знаходзіцца заява, з якой згаданы Ярэміч у 1932 г. звяртаўся ў польскае Міністэрства вайсковых спраў і прасіў аб «залічэнні мяне да ліку кандыдатаў на бясплатнае надзяленне зямлёй і перакваліфікавання мне зямлі, якую я атрымаў па ўмовах зямельнай рэформы ў асадзе Вялікая Свенціца Мсцібаўскай гміны Ваўкавыскага павета памерам 7,16 га». Такім чынам, Фабіян Ярэміч, атрымаўшы зямельны надзел на Ваўкавышчыне, за які павінен быў паводле тагачаснага польскага заканадаўства заплаціць пэўны выкуп, імкнуўся займець яшчэ дадаткова і статус вайсковага асадніка, каб атрымаць такім чынам права на валоданне тым самым кавалкам зямлі, але ўжо абсалютна бясплатна. Дзеля пацверджання свайго права на статус асадніка Ярэміч прадставіў і адпаведную даведку з 79-га палка пяхоты (які з'яўляўся пераемнікам колішняга Беластоцкага стралецкага палка), у якой якраз і называліся прыведзеныя ў манаграфіі Ю. Грыбоўскага даты службы Ярэміча ў ягоных шэрагах[3].

Ю. Грыбоўскі ўвёў вышэйзгаданыя дакументы ў навуковы ўжытак не ўпершыню. Яшчэ перад ім гэта зрабіла складальніца біяграфічнага слоўніка «Паслы і сенатары Польскай Рэспублікі 1919—1939 гг.» Малгажата Смагажэўска, якая таксама ўспрыняла выкладзеную ў выяўленых ёй архіўных дакументах інфармацыю бескрытычна і ўнесла яе ў прысвечаны Ярэмічу біяграфічны артыкул як бясспрэчны факт[4]. Аднак жа, хоць грунтоўнае даследаванне, у якім знайшлі б адлюстраванне ўсе перыпетыі жыццёвага шляху гэтага вядомага і заслужанага беларускага дзеяча (адзінага, дарэчы, беларуса, які выбіраўся ў міжваенны польскі парламент ажно трох скліканняў), пакуль беларускімі гісторыкамі не напісана, нават тая інфармацыя, якую мы маем на сёняшні дзень, дазваляе паставіцца да гэтых новых фактаў ягонай біяграфіі як мінімум крытычна. Пры гэтым гаворка ў дадзеным выпадку ідзе ні ў якім разе не пра адмаўленне сапраўд-

[3] Centralne Archiwum Wojskowe (CAW). Akta personalne. Sygn. 3922 (Fabian Jeremicz).

[4] Posłowie i senatorowie Rzeczypospolitej Polskiej 1919—1939: Słownik biograficzny. T. II. Warszawa, 2000. S. 323.

насці і аўтэнтычнасці выяўленых архіўных дакументаў, але толькі пра магчымую неідэнтычнасць асобы Фабіяна Ярэміча — былога жаўнера польскага войска і Фабіяна Ярэміча — беларускага нацыянальнага дзеяча. Коратка выкладзем аргументы на карысць гэтай версіі.

Як вядома, у 1919—1920 гг. Фабіян Ярэміч жыў у Вільні (гэтая інфармацыя, дарэчы, фігуруе і ў вышэйзгаданым біяграфічным слоўніку М. Смагажэўскай), займаў дастаткова адказную пасаду начальніка віленскай тэлефоннай станцыі і адначасова з вясны 1920 г. з'яўляўся старшынёй віленскага Беларускага нацыянальнага камітэту. Паводле зборніка дакументаў «Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі», у Літоўскім цэнтральным дзяржаўным архіве на сённяшні дзень захоўваюцца дзве грашовыя распіскі Фабіяна Ярэміча, напісаныя ім у якасці старшыні Віленскага БНК у Менску 3 траўня 1920 г., згодна з якімі ён атрымаў пэўныя грашовыя сумы ў польскіх марках ад Беларускай школьнай рады дзеля наступнай выплаты іх віленскім беларускім адукацыйным установам і асобным беларускім настаўнікам[5]. Магчымасць таго, што чынны жаўнер польскага войска мог займацца актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасцю на карысць няпольскага нацыянальнага руху з раз'ездамі па справах гэтага руху, ды яшчэ падчас вядзення баявых дзеянняў, падаецца не проста сумнеўнай, але нават зусімневерагоднай. Да таго ж наўрад ці можна лічыць выпадковым, што настолькі важны факт біяграфіі сеймавага пасла, як больш чым гадавая служба ў польскім войску, быў цалкам праігнараваны складальнікамі афіцыйнага выдання, выдадзенага неўзабаве пасля заканчэння паўнамоцтваў польскага парламента I склікання[6].

Дарэчы, гэткай жа неверагоднай выглядае і магчымасць хадайніцтва Ярэміча перад уладамі за атрыманне статусу вайсковага асадніка ў 1932 г., бо ў той час ён яшчэ выконваў (да 1935 г.) абавязкі пасла ад беларускай нацыянальнай меншасці ў польскім сейме, і настолькі відавочная здрада ўласным прынцыпам (а вайсковае асадніцтва — гэта тая з'ява, у дачыненні да якой усе беларускія палітыкі ў міжваенны перыяд выказваліся выключна негатыўна) несумненна мела б водгалас на старонках друкаваных органаў ягоных шматлікіх палітычных апанентаў. Між тым анічога падобнага адзначана ў той час не было, хоць увогуле нельга сказаць, каб Фабіян Ярэміч карыстаўся ў тагачасных беларускіх асяродках бездакорнай рэпутацыяй. Такім чынам, з усяго вышэйсказанага напрошваецца выснова, што колішні жаўнер польскага войска Фабіян Ярэміч і беларускі грамадска-палітычны дзеяч Фабіян Ярэміч — поўныя аднайменнікі і нават землякі (Ярэміч-палітык паходзіў з вёскі Дуляўцы Ваўкавыскага павета), але не больш таго.

[5] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. Вільня—Менск—Нью-Йорк—Прага, 1998. С. 742—743.

[6] Parlament Rzeczypospolitej Polskiej 1919—1928 / Pod. red. H. Mościckiego i W. Dzwonkowskiego. Warszawa, 1928. S. 342.

Фабіян Ярэміч фігуруе ў манаграфіі Ю. Грыбоўскага і яшчэ ў адной якасці — чалавека, кандыдатуру якога ў 1940 г. польскія ўлады ў Францыі разглядалі «як прадстаўніка беларускай меншасці ў Радзе Нарадовай». Аўтар сам адзначае, што падае гэтую інфармацыю «паводле непацверджаных дадзеных», аднак не ўдакладняе, адкуль канкрэтна гэтая непацверджаная інфармацыя атрымана. Падобна, аднак, што крыніцай тут паслужыў усё той жа біяграфічны слоўнік «Паслы і сенатары Польскай Рэспублікі 1919—1939 гг.», у якім гэтая інфармацыя таксама прысутнічае. Аднак жа незразумела, якім чынам Ярэміч у 1940 г. мог апынуцца ў Францыі, ды калі і чаму вярнуўся адтуль назад у Беларусь: дакладна вядома, што падчас нямецка-савецкай вайны ён знаходзіўся менавіта тут і цесна супрацоўнічаў з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, займаючы пасаду бургамістра Барысава. У наяўных на сённяшні дзень беларускіх даведачных выданнях перыяд 1939—1941 гг. у біяграфіі Фабіяна Ярэміча ўвогуле выпадае[7], а Ю. Грыбоўскі на с. 277 сваёй манаграфіі згадвае ягонае прозвішча сярод «вядомых грамадска-палітычных і культурных дзеячаў беларускага нацыянальнага руху ў міжваеннай Польшчы», якія арыштоўваліся ў гэты час бальшавікамі. Відавочна, што прынамсі адно з гэтых двух супярэчных самім сабе сцверджанняў аўтара не адпавядае рэчаіснасці.

Завяршаючы рэцэнзію, немагчыма не закрануць справу самой якасці выдання манаграфіі. Маецца на ўвазе не паліграфічны ўзровень выдання (ён якраз такі даволі прыстойны), але ўзровень падрыхтоўкі манаграфіі да друку. На жаль, гэты аспект стаўся той самай лыжкай дзёгцю, якая бочку мёду цалкам сапсаваць не можа, але не зусім прыемнае ўражанне ўсё ж такі пакідае. Рэдка калі даводзілася бачыць настолькі элементарна нявычытанае выданне. У кнізе засталіся нявыпраўленымі велізарная колькасць відавочных паланізмаў (прысутнасці якіх у першапачатковым тэксце працы, па вялікім рахунку, няма чаго дзівіцца, улічваючы польскамоўнасць большай часткі выкарыстаных аўтарам крыніц), арфаграфічных памылак і нават элементарных апісак (некаторыя з якіх нават дзенідзе сказілі змест, як, напрыклад, напісанне прозвішча дастаткова вядомага беларускага дзеяча «Карачаб» замест належнага «Карабач» (с. 110) ці выраз «падгаландскія стральцы» замест «падгалянскія стральцы» (с. 255). Такі стан надрукаванага тэксту здзіўляе тым больш, што, згодна з выходнымі звесткамі, змешчанымі на апошняй старонцы манаграфіі, выданне мела не толькі навуковага, але і звычайнага рэдактара — Ігара Войніча. У чым знайшла сваё ўвасабленне рэдактарская праца

[7] Пяткевіч, А. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. Мінск, 2000. С. 352; Ліс, А. Ярэміч Фабіян // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6. Кн. 2. Мінск, 2003. С. 306; Маракоў, Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794—1991: Энцыклапедычны даведнік: У 3 т. Т. 2. Лавіцкі-Ятаўт. Мінск, 2003. С. 374; Чарнякевіч, А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909—1939 гг. (біяграфічны даведнік). Мінск, 2003. С. 289—290.

апошняга, асабіста для мяне — вялікая загадка.

Але ў любым выпадку, нягледзячы на адзначаны выдавецкі недахоп, Юры Грыбоўскі заслугоўвае павагі за свой несумненна важкі ўнёсак у вывучэнне айчыннай гісторыі. Праўда, мяркуючы па млявай рэакцыі на выхад ягонай кніжкі з боку беларускай навуковай супольнасці, наўрад ці можна спадзявацца, што выхад ягонага даследавання значна спрычыніцца да змены агульнага дастаткова складанага стану сучаснай беларускай гістарычнай навукі (у галіне даследавання гісторыі найноўшага часу) і ўздыму ў найбліжэйшы час ейнага ўнутранага і міжнароднага аўтарытэту. Аднак жа планка для беларускіх гісторыкаў новага пакалення пастаўлена. Хочацца верыць, што ахвотнікі яе пераадолець усё ж такі знойдуцца, і іх будзе нямала.

## КРЫТЫКА

АНДРЭЙ ПАЧОБУТ

# Польскі супраціў (1939—1954) вачыма беларускіх гісторыкаў

Выданне, якое абмяркоўваецца ў артыкуле:

*Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939—1954 гг.).* — Гродно: УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», 2004.

Гэтая манаграфія з'яўляецца на сённяшні дзень найбольш грунтоўным для беларускай гістарыяграфіі даследаваннем польскага антысавецкага супраціву на тэрыторыі БССР. Яе напісалі чатыры гродзенскія гісторыкі — Сяргей Сіткевіч, Станіслаў Сільвановіч, Віталь Барабаш і Наталля Рыбак. Манаграфія складаецца з чатырох частак: «Крыніцы і гістарыяграфія праблемы» (Сіткевіч), «Паўстанне і дзейнасць польскага падполля ў верасні 1939 — чэрвені 1941» (Сільвановіч), «Польскае падполле ў перыяд нямецкай акупацыі» (Барабаш) і найбольш сенсацыйная і палемічная частка «Дзейнасць польскага падполля і яго ліквідацыя ў перыяд 1944—1954» (Рыбак).

Аўтары выкарыстоўваюць шырокі абсяг крыніцаў: польскія і беларускія архівы, у тым ліку архівы Міністэрства ўнутраных справаў і КДБ, навуковыя працы польскіх, савецкіх, беларускіх гісторыкаў, успаміны ўдзельнікаў польскага пад-

***Андрэй Пачобут*** *(нар. 1973) — журналіст і грамадзкі дзеяч. Працаваў у беларускамоўных («День», «Народная воля») і польскамоўных («Głos znad Niemna» і «Magazyn Polski») выданьнях. Сябар не прызнанай уладамі галоўнай рады Саюзу палякаў у Беларусі, карэспандэнт польскага выданьня «Gazeta Wyborcza». Аўтар некалькіх дзясяткаў публікацыяў, прысьвечаных антысавецкаму супраціву на тэрыторыі Гарадзеншчыны.*

полля і супрацоўнікаў дзяржбяспекі — і гэта робіць манаграфію вельмі цікавай. Аднак праца пісалася рознымі аўтарамі, якія да таго ж не былі ў роўных умовах (найперш гэта тычыцца доступу да архіваў КДБ) — і гэта робіць яе ў пэўнай ступені няроўнай, часам нават унутрана супярэчлівай.

Да станоўчых момантаў трэба аднесці тое, што ўпершыню беларускі аўтар піша пра значны ўдзел беларусаў у атрадах Арміі Краёвай, а таксама пра іншыя формы падтрымкі беларускім насельніцтвам яе барацьбы, здымаючы гэтак яшчэ адно абсалютнае табу для беларускай навукі.

*Чырвоную Армію, якая прыйшла ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 года, беларускае насельніцтва сустракала кветкамі. Аднак хутка сацыяльна-эканамічная палітыка і масавыя рэпрэсіі значна змянілі стаўленне значнай часткі беларусаў да савецкай улады. Некаторыя з іх пачалі звязваць сваю будучыню з адраджэннем былой польскай дзяржавы*

— сцвярджае Барабаш (с. 227) і прыводзіць прыклады ўдзелу беларусаў у АК, прычым як католікаў, так і праваслаўных. Барабаш адзначае, што хоць загад галоўнага камандавання АК дазваляў прымаць у яе шэрагі выключна польскае насельніцтва, напрыклад, на тэрыторыі Навагрудскай акругі ён не выконваўся.

З самага пачатку антыфашысцкай дзейнасці АК на тэрыторыі Беларусі яе падтрымлівалі не толькі палякі, але і беларусы-католікі. Напрыклад, першапачатковы склад атрада АК паручніка А. Бужынскага «Кміціца», які быў сфармаваны ў Ашмянскім раёне Вілейскай вобласці, збольшага быў беларускі, а паводле веравызнання — каталіцкі. Акрамя беларусаў-католікаў у атрадах Арміі Краёвай на тэрыторыі Беларусі было шмат і праваслаўных беларусаў, піша Барабаш (с. 226—227). Ён адзначае, што толькі 1 % ад агульнай колькасці партызанаў Навагрудскай акругі АК складалі асобы немясцовага паходжання. Ягоная праца тычыцца перыяду 1941—1944 гг., і таму, на жаль, нацыянальны і канфесійны склад паваеннага супраціву застаўся па-за межамі яго даследавання.

Найбольш цікавай і адначасова найбольш палемічнай часткай манаграфіі з'яўляецца праца Наталлі Рыбак, прысвечаная паваеннаму супраціву. І рэч нават не ў тэме, якая яшчэ нядаўна была сакрэтам, закрытым нават для партыйных гісторыкаў. Цікавасць гэтай часткі манаграфіі тлумачыцца найперш тым, што Рыбак будуе сваё даследаванне на матэрыялах архіваў КДБ і Упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама. Для звыклага даследчыка яны закрытыя нават сёння, тым часам нейкім цудам Н. Рыбак удалося пазнаёміцца з невялічкай, але вельмі істотнай часткай інфармацыі пра польскі супраціў, якая там знаходзіцца. Большасць звестак аўтарка ўводзіць у навуковае ўжыванне ўпершыню. Несумненна, гэтая частка манаграфіі мае вялікую факталагічную вартасць.

Аўтарка прапанавала перыядызацыю эвалюцыі польскага падполля ў паваенны перыяд. У цэлым яна падобная да прапанаванай раней супрацоўнікам архіва КДБ і даследчыкам паваеннага супраціву Ігарам Валахановічам, аднак мае пэўныя адрозненні. Першы перыяд — ад вызвалення тэрыторыі Беларусі ад немцаў

да рашэння пра роспуск АК (лета 1944 — студзень 1945), які характарызуецца наяўнасцю буйных атрадаў АК. Другі перыяд (студзень 1945 — верасень 1948) — рэарганізацыя падполля, атрады функцыянуць як невялікія групы, а затым ліквідацыя падполля як арганізаванай структуры. Трэці перыяд (верасень 1948 — красавік 1954) — падполле функцыянуе праз асобныя групы і «тэрарыстаў-адзіночак».

Мне падаецца, што лагічным завяршэннем другога перыяду з'яўляецца 12 траўня 1949 г., калі органамі дзяржбяспекі быў забіты камендант злучанай акругі АК Ліда — Шчучын 49/76 падпаручнік Анатоль Радзівонік «Олех». Улічваючы ўвагу і значэнне, якія надавалі ягонай ліквідацыі органы дзяржбяспекі і камуністычныя ўлады (удзельнікаў ліквідацыі каменданта міністар дзяржбяспекі СССР Лаўрэнцій Берыя адзначыў імяннай зброяй, а начальнік Васілішкаўскага МГБ Сітнікаў пайшоў на павышэнне ў Мінск), падаецца правільным залічыць дзейнасць атрада «Олеха» на працягу 1948 і 1949 гг. менавіта да другога перыяду. Дый без ліквідацыі каменданта наўрад ці можна казаць пра поўнае знішчэнне найбуйнейшай антысавецкай арганізацыі, якой несумненна была акруга Ліда — Шчучын.

Лічыць завяршэннем збройнага супраціву ліквідацыю органамі дзяржбяспекі партызана Вацлава Озіма ў красавіку 1954 г. — таксама спрэчна. Адзначым, што ў адрозненне ад Ігара Валахановіча, які на падставе звестак архіваў КДБ сцвярджае, што польскі ўзброены супраціў закончыўся ў 1953 г., Рыбак лічыць, што дзейнасць падполля завяршылася ў красавіку 1954 г. Прычым спасылаецца яна на працу Яўгена Сямашкі «Армія Краёва на Беларусі». У сваю чаргу Сямашка сцвярджае, што з 1953 г. пошукам «тэрарыстаў-адзіночак» займаліся органы МУС. Ці не паспяшалася МГБ заявіць у 1953 г. пра канчатковую ліквідацыю падполля і перакласці такім чынам барацьбу з «тэрарыстамі-адзінкамі» на плечы МУС? Адсюль і выснова пра завяршэнне гісторыі супраціву ў 1953 г., якую на падставе архіваў КДБ зрабіў Валахановіч. Калі не 1953-ці, дык, можа, і не 1954-ты... Напрыклад, польскія даследчыкі прыводзяць прыклад — вясной 1957 г. у Гродзенскі КДБ з аўтаматам у торбе прыйшоў здавацца ўдзельнік Ваўкавыскай акругі К. Станіслаў Моўлік «Елень»[1].

Ці быў ён апошнім польскім партызанам? Не ведаю. Адказу на гэтае пытанне няма. І таму невядома, калі адбылося фактычнае заканчэнне збройнай барацьбы.

Аднак найбольш палемічным з'яўляецца галоўны тэзіс даследчыцы — маўляў, з цягам часу пост-АКоўскія атрады ператвараліся ў звыклыя банды. Прааналізуем адзін з прыкладаў, на якім базуецца гэтае сцвярджэнне.

Своеасаблівая справаздача пра рабаўніцкую дзейнасць атрада «Фалі» захоўваецца ў следчай справе па абвінавачанні Франца Аляксандравіча Талевіча («Ко-

[1] Europa nieprowincjonalna. Przemiany na ziemiach wschodnich dawnej Rzeczpospolitej 1772—1999. Instytut Studiów Politycznych PAN: Warszawa/Londyn, 1999. S. 815

мар»). Запіс быў зроблены на картцы паперы з вучнёўскага сшытка хімічным алоўкам:

*Ліквідацыйна-харчовая і дыверсійная аперацыя ад 24.04.1948 г.: знішчана 2 шпіёны. Вынята:*
*1) паліто — 3;*
*2) мундзіраў — 2;*
*3) нагавіцаў — 1;*
*4) ботаў — 7 параў;*
*5) хлеба — 5 кг;*
*6) сала — 3 кг.*
*У краме:*
*1) 20 соцен папяросаў;*
*2) 8 флаконаў адэкалону;*
*3) 5 штук сталовых нажоў;*
*4) 9 штук жаночых кашуляў;*
*6) 32 ваўняныя жаночыя хусткі…*

Разам у спісе 34 назвы тавараў, сярод якіх большасць матэрыялы і алкагольныя напоі. У гэтай самай следчай справе захоўваецца яшчэ адзін дакумент, які адносіцца да рабаўніцкай дзейнасці атрада «Фалі»:

*Харчовая акцыя 23.04.1948 г. У вёсках В. і Б. вынята:*
*1) 20 кг хлеба;*
*2) 5 кг сала;*
*3) 3 кг крупаў;*
*4) 3 кг гароху;*
*5) 40 штук яек;*
*6) 15 кг бульбы;*
*7) 18 літраў гарэлкі.*
*Нягледзячы на тое, што аперацыі называюцца «харчовая» альбо «ліквідацыйна-харчовая», іх трэба кваліфікаваць як крадзеж дзяржаўнай альбо грамадскай уласнасці... Гэты аспект дзейнасці пост-АКоўскіх атрадаў ставіць іх на адзін узровень з звычайнымі разбойнымі шайкамі, якія займаліся рабункамі і крадзяжамі* (с. 308—309).

Кідаецца ў вочы, што пасля аперацыі праводзіўся дакладны скрупулёзны ўлік. Дакументы захоўваліся для справаздачы кіраўніцтвам супраціву (таму яны і трапілі ў рукі МГБ). Навошта «звычайным рабаўнікам» стварэнне дадатковых доказаў сваёй віны і іх захоўванне? Удзельнікі пост-АКоўскага падполля адзначаюць, што кіраўніцтва імкнулася трымаць пад кантролем як ліквідацыйныя, так і харчовыя акцыі. Адсюль і такая скрупулёзнасць у занатоўванні здабытых рэчаў і захаванні дакументаў. Па-другое, напады на дзяржаўныя ўстановы, у тым

ліку ўстановы гандлю, — гэта натуральная дзейнасць любых партызанскіх атрадаў. Партызаны павінны былі харчавацца, змяняць адзенне, дапамагаць сябрам канспірацыйнай сеткі... Дзе яны маглі здабываць прадукты? Цікава, ці гэтак жа кваліфікуе Н. Рыбак, напрыклад, напад атрада АК на нямецкі банк у Лідзе ў траўні 1944 г., у выніку якога было здабыта 3 мільёны рэйхсмарак, якія перадалі ў касу Навагрудскай акругі АК? Думаю, што згодна з нямецкім заканадаўствам гэта таксама было рабаваннем дзяржаўнай маёмасці, да таго ж у асабліва буйных памерах... Ці так сама яна кваліфікуе дзейнасць савецкіх партызанаў у час вайны? І, нарэшце, ці гэтак жа ацэняць паводзіны шматлікіх аперацыйных групаў і службовых асобаў НКВД, якія ў час вайскова-чэкісцкіх аперацый і выездаў «у раёны» харчаваліся выключна за кошт мясцовага насельніцтва?

У выпадку атрада «Фалі» аўтарцы не ўдалося падаць доказаў пераходу партызанаў да звычайнага бандытызму. Разам з тым надзвычай неспрыяльныя ўмовы дзейнасці, жорсткія рэпрэсіі, выкарыстанне органамі дзяржбяспекі калектыўнай адказнасці ў дачыненні да сем'яў партызанаў і, нарэшце, адсутнасць яснай перспектывы барацьбы, безумоўна, спрыялі зніжэнню дысцыпліны ў пост-АКоўскім падполлі. Аднак кіраўніцтва супраціву рабіла ўсё магчымае, каб супрацьдзейнічаць гэтаму працэсу. Кара за падобныя парушэнні была надзвычай суровая. Напрыклад, у кастрычніку 1948 г. на апошняй нарадзе падпарадкаваных падпаручніку Анатолю Радзівоніку «Олеху» атрадаў, якая адбылася ў Нацкай пушчы, быў выкананы смяротны прысуд для двух партызанаў, якія здзяйснялі рабункі [2].

Падобныя прыклады жорсткіх караў для парушальнікаў дысцыпліны ёсць і ўва ўспамінах удзельнікаў пост-АКоўскага супраціву (Вітальда Мазуркевіча «Сынэка», Вітальда Урублеўскага «Дзенцёла», Баляслава Навагродскага, Юзафа Бярдоўскага «Малога Зюка» і іншых).

Цікава было б даведацца таксама (гэта засталося па-за межамі даследавання) пра формы і метады рэпрэсіўнай дзейнасці падполля. Тут аўтарка абмежавалася выключна апісаннем ліквідацыйных акцыяў і сцвярджэннем, што ў структуру атрадаў уваходзіў ваенна-палявы суд і аддзяленне экзекуцый:

> *На падставе данясенняў разведкі альбо пратаколаў камендантаў «пляцувак» выносіўся прысуд, які выконваўся аддзяленнем экзекуцый. Як сцвярджалася ў загадзе № 2 ад 18.09.1944 г., дадзенае аддзяленне было створана для выканання смяротных прысудаў, за невыкананне загадаў камандзіраў, здраду альбо працу супраць польскага народа альбо польскай дзяржавы* (с. 286).

Згаданы фрагмент датычыць 1944 г. На жаль, працэс рэпрэсіўнай дзейнасці ў пазнейшы перыяд застаўся па-за межамі даследавання. Ад сябе дадам, што ёсць падставы сцвярджаць, што і надалей кіраўніцтва падполля імкнулася захаваць кантроль над вынясеннем смяротных прысудаў, а таксама захаваць хоць бы

[2] Krajewski Kazimierz. Na ziemi nowogródskiej. Instytut wydawniczy PAX. Warszawa, 1997. S. 679.

мінімальныя формы правасуддзя. Вось добры прыклад. Першы сакратар Радуньскага райкама партыі Казілаўка рапартаваў:

*Уначы на 19 студзеня 1948 г. у вёсцы Гудзелі Жырмунскага сельсавета Радуньскага раёна ў кватэру грамадзяніна вёскі Гудзелі Жырмунскага сельсавета Бальцэвіча Івана Іванавіча ўварвалася бандгрупа, якая вывезла грамадзяніна Бальцэвіча І. І. у вёску Нонішкі (?) Жырмунскага сельсавета, дзе над грамадзянінам быў здзейснены суд, сярод бандгрупы быў пракурор і суддзя, пасля чаго грамадзянін Бальцэвіч Іван Іванавіч 1900 г. нараджэння, які нарадзіўся і жыў у вёсцы Гудзелі Жырмунскага сельсавета Радуньскага раёна, па нацыянальнасці паляк, грамадзянін СССР, працаваў на ўласнай гаспадарцы, бандай быў забіты* (Гродзенскі дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў, ф. 11, воп. 1, спр. 55, арк. 23).

На жаль, прычыны вынясення смяротнага пакарання не згадваюцца ў спецданясенні, але, напэўна, ёсць у матэрыялах расследавання, якія захоўваюцца ў архіве КДБ. Зразумела, што не заўжды ва ўмовах падпольнай барацьбы можна было захаваць вяршэнства права, аднак сам факт варты ўвагі.

Маючы доступ да архіва КДБ, недрэнна было б прааналізаваць, у дачыненні да каго і з якіх прычынаў падполле выносіла смяротныя прысуды. Аўтарка адмаўляе нацыянальную ці канфесійную скіраванасць рэпрэсій, сцвярджаючы, што «пад удар пост-АКоўскіх фармаванняў траплялі мірныя жыхары розных нацыянальнасцяў» (с. 302). З маіх папярэдніх спробаў высветліць прычыны рэпрэсій вынікае, што «мірнымі жыхарамі» ў цэлым шэрагу выпадкаў у дакументах называюцца актывісты калгаснага будаўніцтва, а таксама асобы, якіх падазравалі (справядліва ці не) у кантактах з НКВД — МВД ці НКГБ — МГБ. На жаль, без доступу да архіваў КДБ прааналізаваць, наколькі апраўданыя былі гэтыя падазрэнні, немагчыма. Аднак сама колькасць сексотаў, завербаваных дзяржбяспекай на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, уражвае. Так, аўтарка сцвярджае, што за тры гады савецкай улады органы дзяржбяспекі завербавалі 19 881 агента (с. 321).

Вельмі цікавым з'яўляецца прыведзены аўтаркай аналіз формаў і метадаў барацьбы камуністычных спецслужбаў з польскім супрацівам, а таксама іх эвалюцыя ў сувязі з эвалюцыяй падполля. Гэта, па сутнасці, першая спроба падобнага аналізу ў дачыненні да заходніх абласцей БССР. Так, польскія даследчыкі фактычна ўжо адказалі на пытанне, якімі метадамі карысталіся камуністычныя спецслужбы дзеля ліквідацыі нацыянальнага падполля на тэрыторыі Польшчы і Літоўскай ССР, і падрабязна прааналізавалі найбольш важныя спецаперацыі органаў дзяржбяспекі [3].

[3] «Zwyczajny» resort. Studia o aparacie bezpieczeństwa 1944—1956, pod red. Kazimierza Krajewskiego i Tomasza Łabuszewskiego. Warszawa: Instytut Pamięci Narodowej, 2005; Aparat represji a opór społeczeństwa wobec systemu komunistycznego w Polsce i na Litwie w latach 1944—1956, pod red. Piotra Niwińskiego. Warszawa: Instytut Pamięci Narodowej, 2005.

Тым часам дзейнасць камуністычных спецслужбаў на тэрыторыіі БССР і надалей застаецца таямніцай.

Падсумоўваючы, аўтары манаграфіі адзначаюць прычыны, паводле якіх польскае падполле ў заходніх абласцях БССР існавала такі працяглы час: вялікая колькасць польскага насельніцтва і католікаў, высокі ўзровень канспірацыі падполля, наяўнасць хутароў і буйных лясных масіваў, блізкасць мяжы, неакрэсленасць заходняй мяжы БССР і непапулярная ўнутраная палітыка савецкай улады.

Манаграфія «Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939—1954 гг.)» з'яўляецца важным этапам у вывучэнні паваеннага антысавецкага супраціву на тэрыторыі БССР. Разам з тым шэраг важных пытанняў з суб'ектыўных і аб'ектыўных прычынаў застаўся па-за межамі гэтага даследавання. На жаль, працягваць даследаванне гэтай тэмы, а таксама палемізаваць з тэзамі аўтараў цяжка — архівы спецслужбаў закрытыя для незалежных даследчыкаў.

# ПАЛЕМІКА

ІГАР МАРЗАЛЮК

# «Адраджэнская» гістарыяграфія:

## хлусня з дапамогай гістарычных фактаў

Публікацыі, якія згадваюцца ў палеміцы:

Бардах, Юліюш. *Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага.* — Менск: Бібліятэка часопіса «Беларускі гістарычны агляд», 2002.

Смалянчук, Алесь. *Плебейскія нацыі і імперскія перыферыі* // ARCHE. № 11. 2006.

Смалянчук, Алесь. *Дыскусія пра вытокі на фоне «ідэалагічнай рэвалюцыі»* // ARCHE. № 3. 2007.

З беларускіх і польскіх гісторыкаў і літаратуразнаўцаў, знаўцаў айчыннай нацыянальнай праблематыкі XIX ст., якіх пералічвае ў сваім апошнім артыкуле Аляксандр Фёдаравіч Смалянчук, аўтар мае гонар падзяляць блізкія пазіцыі з Уладзімірам Казбяруком, Паўлам Церашковічам, Алегам Латышонкам, Рышардам Радзікам і чамусьці незаслужана забытым Яўгенам Мірановічам. Дарэчы, не магу зразумець, чаму блізкія да маіх поглядаў выказванні і гіпотэзы гісторыкаў з Беластока (Я. Мірановіча і А. Латышонка) ніколі не выклікалі абурэння А. Смаленчука ды не прыводзілі да запісвання апошніх у шэрагі неазаходнярусаў.

***Ігар Марзалюк*** *— доктар гістарычных навук, загадчык катэдры археалёгіі і спэцыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Аркадзя Куляшова. Апошняя кніга — манаграфія «Этнічны і канфесійны свет беларускага горада XVI—XVIII стст. (этнаканфесійны склад насельніцтва, этнічныя і канфесійныя стэрэатыпы беларускіх гараджан)» (МДУ імя А.А. Куляшова, 2007). Назву тэксту дала рэдакцыя.*

«Рэпліка» сведчыць, што ўступаць у дыскусію са мной спадар Смалянчук увогуле не збіраўся:

*Адразу заўважу, што не збіраюся разбіраць усе прыведзеныя «доказы» «беспаваротнай» польскасці літвінаў XIX ст. і «міфалагізаванасці гістарычнай свядомасці часткі беларускай нацыянальнай эліты». Навуковыя даследаванні большасці вышэй названых беларускіх аўтараў самі па сабе з'яўляюцца добрым адказам Ігару Марзалюку.*

Дык навошта тады рэпліку пісаць? Калі і так усё «ясна» пра непрафесіяналізм «магілёўскага археолага» (чыстым гісторыкам мяне А. Смалянчук не лічыць, таму шмат разоў і паўтарае азначэнне «археолаг»).

Насуперак фанабэрлівым вінавачанням у хлусні, перакручванні ды маніпуляваннямі чужымі тэкстамі, я адэкватна перадаў пазіцыю аўтараў твораў, на якіх спасылаюся. У гэтым лёгка пераканацца, калі ўважліва іх перачытаць. Асаблівы клопат у гарадзенскага гісторыка выклікае «зняважаны» мной аўтарытэт Юлюша Бардаха.

*...Знаёмства з тэкстамі Юлюша Бардаха, асабістыя сустрэчы і размовы з вядомым польскім даследчыкам дазваляюць заявіць, што, насуперак сцвярджэнню Марзалюка, ён не лічыць большасць літвінскай шляхты другой паловы XIX ст. «нацыянальнымі палякамі». Дарэчы, менавіта Ю. Бардах адным з першых звярнуў увагу на феномен краёвасці, актыўная прысутнасць якога ў палітычным і культурным жыцці Беларусі пачатку XX ст. сведчыць пра адметнасць і своеасаблівасць нацыянальнай самаідэнтыфікацыі даволі шырокіх колаў каталіцкага грамадства беларускіх земляў.*

З жывым класікам польскай літуаністыкі і я меў шчасце і гонар сустракацца ды ягоныя лекцыі слухаць... Выглядае толькі, што слухалі мы са спадаром Смаленчуком нешта вельмі рознае. А вось наконт высноваў Ю. Бардаха аб нацыянальным лёсе эліты ВКЛ, то тут не варта перакручваць тэкстаў гэтага класіка на ўласны капыл. У сувязі з гэтым вымушаны прывесці колькі высноў Ю. Бардаха з ягоных прац розных гадоў.

«Крэва і Люблін. З праблемаў польска-літоўскае уніі»:

*...культурная асіміляцыя, якая прывяла да польскасці шматлікую ўкраінскую, беларускую і літоўскую шляхту, узбагаціла мноствам талентаў народ, у які яны ўвайшлі паводле свайго вольнага выбару.*

*...Страта ў выніку асіміляцыі вышэйшых грамадскіх слаёў мела несумненна адмоўныя наступствы для народаў Літвы і заходняй Русі, пазбаўляючы іх натуральных у тыя часы правадыроў*[1].

[1] Бардах Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Менск, 2002. С. 73.

«Ад палітычных да этнічных народаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе»:

*Кажучы найбольш агульна, для палітычнага народа істотнаю была палітычная, а не этнічная повязь. Гэта палітычная повязь вяла вышэйшыя пераважна слаі ў кірунку культурнай інтэграцыі, хоць нярэдка пры гэтым захоўвалася і пачуццё рэгіянальнай адметнасці. Усведамленне асобнай тоеснасці магло захоўвацца нават пры страце мовы, як сведчыць прыклад Шатландыі, але магло і страціцца ў выніку культурна-моўнай асіміляцыі, нягледзячы на трывалае пачуццё краёвай адметнасці, як гэта мела месца на землях Вялікага Княства Літоўскага.*

*Факт той, што ў шэрагу шматнацыянальных дзяржаваў слабейшыя народы ў выніку асіміляцыі страцілі свае вышэйшыя слаі. …Паланізацыю зазналі літоўскія і рускія князі, паны і баяры ў Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, мадзьярызацыю — вышэйшыя слаі ў краях Кароны св. Стэфана. Моўную і звычаёва-культурную адметнасць захавалі народныя масы літоўцаў і латышоў, русінаў (продкаў украінцаў і беларусаў), славакаў і харватаў, чэхаў і славенцаў. Гэтыя працэсы сталі падставаю дактрыны, якая адрознівала народы гістарычныя ад народаў негістарычных*[2].

«Літоўскія палякі і іншыя народы гістарычнай Літвы. Спроба сістэмнага аналізу»:

*Наяўнасць «гістарычных слаёў», якія ў часы ancien regime'у складалі палітычны народ, дазваляла раней сфармавацца сучаснаму народу. Гэтыя слаі мелі неабходны палітычны досвед і былі здатныя вылучыць з сябе эліты, здольныя сфармуляваць нацыянальную ідэалогію і палітычныя праграмы, скіраваныя на яе рэалізацыю. Так стаяла справа ў XIX ст. з польскім народам, нягледзячы на страту незалежнасці. У іншай сітуацыі апынуліся беларускі, літоўскі, украінскі народы. Можна іх найагульней назваць сялянскімі народамі. У выніку складаных гістарычных працэсаў яны страцілі свае паноўныя слаі і не стварылі — тут гаворка пра беларусаў і літоўцаў — уласнага мяшчанства і інтэлігенцыі аж да часу скасавання прыгону*[3].

Цяпер наконт Адама Міцкевіча як стваральніка польскага месіянізму. У нашым тэксце ёсць спасылка на працу выбітнага расейскага даследчыка А. Мыльнікава. Для пачатку абвергніце яго аргументацыю.

Што да навуковых канструкцый нашага апанента, то пра іх у свой час вельмі няблага напісалі Яўген Мірановіч, Станіслаў Рудовіч і Дарыюш Тарасюк, да чыіх рэцэнзій я і адсылаю цікаўных чытачоў. Я ж, аказваецца, некарэктна перадаў яго навуковую пазіцыю. Даруйце, калега, хіба прыведзеная мной цытата з ва-

[2] Бардах Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Менск, 2002. С. 319.

[3] Бардах Ю. Тамсама. С. 337.

шай рэцэнзіі перакручаная ды сфальсіфікаваная? Выглядае, што вы, са спасылкай на свае больш раннія працы, самі адмаўляецеся ад уласных цверджанняў, агучаных у «ARCHE» (№ 11. 2006).

Тэрмін «адраджэнская гістарыяграфія» я скарыстоўваю да не менш дырэктыўнай за тэксты Я. Трашчанка прымардыялісцкай часткі нацыянальнага гістарыяпісання, у якой беларусы ёсць ужо ў IX—XIII стст., ВКЛ перадусім «наша» дзяржава, а літоўцы ў ёй нешта другаснае, нязначнае, карацей — «малодшыя» браты. Эліта ВКЛ у эпоху Рэчы Паспалітай для гісторыкаў, якія вызнаюць гэты сімвал веры, працягвае захоўваць уласную нацыянальную тоеснасць і карыстацца пальшчызнай так сама, як расейскае дваранства — французскай мовай. Польскія паўстанні на тэрыторыі Беларусі, ад Касцюшкі да Каліноўскага, для іх паўстанні беларускія. А яшчэ для гэтай традыцыі характэрныя «песні-жальбы» ды імкненне адказнасць за ўсе злыбеды беларускага народа ўскласці на «клятых маскалёў». Чытаючы гэтыя тэксты, міжволі складваецца ўражанне, што беларускі народ пасля падзелаў Рэчы Паспалітай патрапіў у склад Расейскай імперыі не плебейскім этнасам з непаўнавартаснай сацыяльнай структурай, а квітнеючым гістарычным народам з уласнай высокай культурай…

А. Смалянчук абсалютна слушна спасылаецца на Ле Гофа наконт таго, што самы агідны від хлусні — гэта хлусня з дапамогай гістарычных фактаў. Толькі выглядае, што гэты закід яму варта аднесці і да ўласнай творчасці. Ды хіба толькі яму?

**Ад рэдакцыі.** А. Смалянчук адмовіўся ад працягу палемікі, бо яна згубіла навуковае значэньне.

# ГІСТОРЫЯ

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ

## Урады БНР і кабінэт Рамана Скірмунта

У савецкі пэрыяд гісторыкі пасьмейваліся з парадаксальнае сытуацыі. Калі ў БССР усе матэрыялы, датычныя гісторыі Беларускае Сацыялістычнае Грамады і Беларускае Народнае Рэспублікі, захоўваліся ў спэцфондах і для азнаямленьня зь імі патрабаваўся спэцдопуск, дык у Літве яны былі лёгкадаступныя. Акурат дакумэнтамі зь літоўскіх сховішчаў і карысталіся аўтары першых незалежных публікацыяў пра БНР і яе дзеячоў на Бацькаўшчыне на пачатку 1990-х гг. А з тае прычыны, што бээнэраўская тэматыка мела немалую вагу ў працы беларускіх гісторыкаў на эміграцыі, аўтары першых публікацыяў 1990-х выкарыстоўвалі таксама і іхныя напрацоўкі. Ня дзіва і тое, што менавіта беларусы, якія жывуць за мяжою, уклалі на аснове матэрыялаў, што захоўваюцца ў Літве, салідны том у дзьвюх кнігах «Архівы Беларускае Народнае Рэспублікі» («Архівы БНР»). Том уключае дакумэнты, што захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Літвы. Яго ўкладальнік, рэдактар, перакладчык, камэнтатар Сяргей Шупа выпусьціў гэтую працу пад грыфам нью-ёрскага Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ды Таварыства Беларускага Пісьменства.

«Архівы БНР» сталі найважнейшым дасягненьнем 1990-х гг. у крыніцазнаўстве. Роўнай ім працы няма. Зьмешчаныя ў томе крыніцы далі магчымасьць ліквідаваць шмат якія лякуны ў нашых ведах пра БНР 1918—1921 гг., шмат што ўдакладніць. Аднак і гэты звод дакумэнтаў не дае магчымасьці знайсьці адказ на пэўныя пытаньні. Дакумэнты, апублікаваныя ў ім, трэба суадносіць зь іншымі крыніцамі.

---

***Анатоль Сідарэвіч*** *— гісторык, крытык, публіцыст. Апошняя ягоная кніга — «Пра Івана Луцкевіча» (Менск: Кнігазбор, 2007).*

Так, у «Архівах БНР» маецца дакумэнт 0572[1]: тэкст бюлетэню ад 27 чэрвеня 1918 г., які Народны Сакратарыят БНР накіраваў у рэдакцыі газэт. У ім сярод іншых ёсьць кароценькая інфармацыя:

*ФОРМИРОВАНИЕ НОВОГО КАБИНЕТА*

*Формирование нового Кабинета Народнаго Секретариата продолжается и закончится, по всем данным, не ранее 5 июля. Как известно, формирование это начато 14 мая. Все время, т. е. уже пятый месяц функционирует в полном объеме первый состав Народнаго Секретариата.*

Нататка як нататка. Аднак мяне зьбянтэжыў камэнтар С. Шупы. Ён піша: «Новы кабінэт Рамана Скірмунта так і ня быў сфармаваны і ніколі не прыступіў да выкананьня сваіх абавязкаў, нягледзячы на цьверджаньні абсалютнай большасьці дасьледнікаў. Новы кабінэт Янкі Серады быў зацьверджаны 22.07.1918 і пераняў свае паўнамоцтвы непасрэдна ад Народнага Сакратарыяту 1-га складу».

Мне як аўтару артыкулаў «Беларуская Народная Рэспубліка» і «Народны Сакратарыят Беларусі» ў Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі стала непамысна, бо пра гэты Ўрад цьвердзяць ня толькі дасьледнікі (прыкладам, д-р Вітаўт Кіпель і Зора Кіпель у сваёй кнізе «Byelorussian Statehood»), але й сьведкі тых падзеяў. Назавём хоць бы аднаго зь іх — Антона Луцкевіча. У сваіх мэмуарах ён пісаў, што «габінэт Скірмунта не пратрываў, здаецца, і двух тыдняў»[2]. Думаецца, былы прэм'ер-міністар БНР ня мог памыляцца ў пытаньні пра кабінэты.

Камэнтар С. Шупы і цьверджаньне аўтара бюлетэню пра тое, што паводле стану на 27 чэрвеня «пятый месяц функционирует в полном объеме первый состав Народного Секретариата», утвораны 20 лютага 1918 г.[3], вымушае больш пільна падысьці да пытаньня пра два першыя кабінэты БНР і час іх функцыянаваньня.

Зробім істотную папярэднюю заўвагу. У «Byelorussian Statehood» даецца інфармацыя пра некалькі ўрадаў на працягу 1918 г. Так, напрыклад, гэтак званая Рада пяцёх, да якой мы яшчэ вернемся, фігуруе ў гэтай кнізе як другі ўрад БНР. І гэтая памылковая інфармацыя была паўторана мною ў артыкулах бээнэраўскай тэматыкі для ЭГБ.

Сапраўды, наколькі вядома, з 20 лютага па 9 ліпеня Старшынём Народнага Сакратарыяту быў Язэп Варонка. Здавалася б, датычна гэтага часу гаворка павінна ісьці пра кабінэт Варонкі незалежна ад яго колькаснага складу.

Першы Народны Сакратарыят, паўтару, утвораны 20 лютага 1918 г. і прыступіў да выкананьня абавязкаў 21 лютага. У яго складзе было 12 чалавек[4];

[1] Нумарацыя дакумэнтаў у абедзьвюх кнігах I тому «Архіваў БНР» агульная, таму няма патрэбы паказваць, у якой кнізе і на якой старонцы той ці іншы дакумэнт надрукаваны.

[2] Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. С. 169.

[3] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 2, арк. 1. Тамсама. Адз. захав. 16, арк. 56.

[4] Архівы БНР. Дак. 0088.

23 лютага ва Ўрад Беларусі былі ўведзеныя В. Рэдзька (народны сакратар шляхоў) і Тамаш Грыб (народны сакратар земляробства)[5]. Такім чынам, кабінэт налічваў 14 асоб. Аднак гэты склад не канчатковы. У інфармацыйным лістку № 20 ад 9 траўня 1918 г., што распаўсюджваўся Ўрадам БНР для газэт, сьцьвярджаецца, што ўсяго народных сакратароў Рэспублікі было пятнаццаць[6]. Пятнаццатым, трэба думаць, быў сіяніст-сацыяліст Л. Гутман, пра якога невядома, калі ён увайшоў ва Ўрад, і прыблізна вядома, калі пакінуў яго.

Адзначым, што першы Ўрад БНР быў сацыялістычны. Гэта тлумачыцца тым, што ў Выканаўчым Камітэце Рады Ўсебеларускага Зьезду, а потым і ў першапачатковым складзе Рады Рэспублікі *«зусім не было прадстаўнікоў беларускіх буржуазных кірункаў»*[7].

Правыя ў той час гуртаваліся ў Менскім Беларускім Народным Прадстаўніцтве. У гэтае згуртаваньне ўваходзілі і абшарнік Раман Скірмунт, і генэрал Цыпрыян Кандратовіч, і дзеячы хрысьціянскае дэмакратыі — ксяндзы Аляксандар Астрамовіч (Андрэй Зязюля) ды Вінцэнт Гадлеўскі, — і чалавек нявызначанае партыйнасьці Павал Аляксюк. Бадай самае цікавае тое, што з гэтым згуртаваньнем актыўна супрацоўнічалі асобныя сацыялісты. Найперш у якасьці выдаўцоў і публіцыстаў. Гэтак, Аляксандар Уласаў быў пісарам у таварыстве «Заранка», што з 8 сакавіка 1918 г. выдавала орган Менскага Беларускага Прадстаўніцтва газэту «Беларускі Шлях», якую з № 2 падпісваў рэдактар Аляксандар Прушынскі (Алесь Гарун). Уласаў, як і Гарун, быў да таго ж актыўным аўтарам гэтае газэтыдзьвюхпалоскі. Часта друкаваўся ў «Беларускім Шляху» і Зьмітрок Бядуля, што не замінала яму быць аўтарам і «Вольнае Беларусі», але калі ў газэце Язэпа Лёсіка ён выступаў пераважна як бэлетрыст, дык у «Беларускім Шляху» больш як публіцыст.

«Беларускі Шлях» згадваецца тут і дзеля таго, што я буду на яго спасылацца, і дзеля таго, каб зьвярнуць увагу на такі факт: у гэтай газэце правыя ані разу не назвалі сябе правымі — адно цэнтрыстамі.

Мы ведаем, што ў момант абвяшчэньня Акту 25 Сакавіка ў той залі не было ані Скірмунта, ані Астрамовіча, ані Гадлеўскага... Вядома таксама, што браты Луцкевічы выступалі за адзіны нацыянальны фронт. У красавіку 1918 г. Іван Луцкевіч адмыслова прыяжджаў у Менск, вёў перамовы з Я. Варонкам, фракцыяй БСГ у Радзе Рэспублікі і незалежнымі сацыялістамі, а 13 красавіка пакінуў сталіцу БНР[8]. Можна меркаваць, што І. Луцкевіч прыяжджаў у Менск зь лістом Прэзыдыюму Беларускай Рады ў Вільні да Я. Варонкі. Ліст гэты, пісаны рукою А. Луцкевіча і датаваны 7 красавіка 1918 г., ёсьць сэнс хоць бы часткова працытаваць:

[5] Тамсама. Дак. 0089.

[6] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 31.

[7] Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху. С. 168.

[8] Архівы БНР. Дак. 0265.

*З прычыны ўлажыўшыхся варункаў лічым сваей павіннасьцю падзяліцца з Вамі нашымі думкамі і вывадамі ў роўна ўсім нам дарагой справе незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны.*

*Справа вось у чым.*

*Паводлуг нашых ведамасьцей, нямецкія ўласьці стаўляюць пытаньне аб прызнаньні незалежнасьці Беларусі ў залежнасьць ад разьвязкі пытаньня, чы Ліфляндзія і Эстляндзія будуць злучаны зь Нямеччынай. Гэта выплывае з нашага геаграфічнага палажэньня — між прыбалтыцкімі землямі і Украінай. Немцы ў прыпадку жаданай для нас разьвязкі нашае справы гатовы паддзяржаць наша гасударственае будаўніцтва, заяўляючы, што за помач яны будуць вымагаць таможаннага саюза Беларусі з цэнтральнымі дзяржавамі* (г. зн. зь Нямеччынай і Аўстра-Вугоршчынай. — **А. С.**). *Аб мілітарным саюзе гутаркі няма. Аднак немцы ясна кажуць, што яны маглі бы пайсьці толькі на рэч зусім сур'ёзную і пэўную. Яны не давяраюць сілам левых элемэнтаў у гасударственым будаўніцтве і за залог удачы ўважаюць учасьце элемэнтаў больш умеркаваных. Мы маемо вельмі сур'ёзную аснову спадзявацца, што ў найбліжэйшых днях могуць быць зроблены крокі дзеля таго, каб аперціся на элемэнтах, згрупаваных у Прадстаўніцтве. Само сабой разумеецца, што гэта можа адбіцца на самым існаваньні Сакратарыяту, каторы як зачатак першай ЗАКОННАЙ беларускай народнай уласьці трэба ўдзяржаць за ўсялякую цану* (далей ніжні правы ражок аркуша абарваны і адсутнічае як мінімум адна старонка тэксту. — **А. С.**).

*прыйшоў мамэнт, калі ўступленьне да Рады Рэспублікі і эвэнтуальна да Сакратарыяту людзей з Прадстаўніцтва не павінна зацягівацца ні на адну лішнюю мінуту. Прадстаўніцтва трэба зьвязаць перш, чым у стасунку да яго будуць зроблены немцамі першыя крокі.*

*З Вашага апошняга пісьма мы з радасьцю ўбачылі, што работа Ваша ў гэтым кірунку йдзе ўпярод. Мы разумеем, што на перашкодзе злучэньню стаіць Ваша сацыяльная плятформа. Трэба было б Вам пайсьці па сьлядох Украіны, згладзіўшы крыху асабліва вострыя канты. Трэба знайсьці «залатую сярэдзіну» між жаданьнямі народных мас і вымаганьнямі палітычнае кан'юнктуры. Далейшыя яркія сацыяльныя выступленьня могуць Вам прыдбаць папулярнасьць у народных масах, але разам з тым могуць разьбіць наша дзяржаўнае будаўніцтва і вярнуць нас у межы Расейскай дзяржавы.*

*Мы верым, што Вы здалееце ўдачна разьвязаць гэту бясспорна цяжкую задачу і жычым Вам сіл і энэргіі дзеля яе (...)*[9].

Мы ведаем, што правыя былі кааптаваныя ў склад Рады БНР 12 і 14 красавіка 1918 г.[10], але нейк не зьвярнулі ўвагі на інфармацыю, што 12 красавіка Старшы-

[9] БДАМЛМ, ф. 3, воп. 1, адз. захав. 126, арк. 108—109.

[10] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 9.

ня Народнага Сакратарыяту Язэп Варонка падаў у адстаўку[11] і што ў той самы дзень — 12 красавіка — «рада старэйшых»[12] даручыла ўтварэньне новага складу Народнага Сакратарыяту «члену Рады грамадзяніну Раману Скірмунту (цэнтр)»[13].

Тым часам ва ўспамінах А. Луцкевіча сцьвярджаецца, што «быў мамэнт (улетку 1918 году), калі таму ж Скірмунту было даручана ўтварэньне ўраду, маючы наўвеце, што буржуазны ўрад здолее дабіцца ў немцаў прызнаньня Беларускае Народнае Рэспублікі і дапамогі ёй»[14]. Відавочна, што тут факт утварэньня кабінэту Скірмунта зблытаны з фактам даручэньня яму ўтварыць Урад БНР.

Такім чынам, «Беларускі Шлях» інфармуе нас: 12 красавіка, калі першая група правых была кааптаваная ў склад Рады Рэспублікі, Я. Варонка падаў у адстаўку. Ведамы матыў гэтага ўчынку: павінен быць утвораны правы (цэнтрысцкі), урад, да якога, паводле лёгікі, кайзэраўскі ўрад меў бы большы давер і што, магчыма, прывяло б да прызнаньня Нямеччынаю незалежнасьці БНР. Зацеміўшы, што большасьць сацыялістаў у Радзе БНР нацыянальныя інтарэсы паставіла вышэй за клясавыя і партыйныя, зьвернемся да дак. 0213 у «Архівах БНР». Выяўляецца, што 12 красавіка засядала ўсё ж ня «рада старэйшых», а Рада Рэспублікі. Паведамляецца, што паседжаньне Рады было прысьвечана «пытаньню рэканструкцыі Народнага Сакратарыяту». У дакумэнце ня згадваецца пра адстаўку Я. Варонкі, але ў пастанове Рады сказана, што новы Ўрад «для карысьці дзяржаўнасьці Беларусі» павінен быць кааліцыйным. Праўда і тое, што ні ў дакладзе Я. Варонкі, ні ў пастанове Рады пра ўтварэньне новага кабінэту нічога не сказана пра асобу, якой будзе даручана яго ўтварэньне (імя асобы не названа). Апрача таго, у дак. 0213, як і ў «Беларускім Шляху», сказана, што рэканструяваны Народны Сакратарыят будзе створаны паводле кабінэтнага прынцыпу фармаваньня ўраду: адстаўка прэм'ера вядзе да адстаўкі ўсяго кабінэту.

Такім чынам, 12 красавіка 1918 г. Язэп Варонка ў адстаўку не падаваў. Быў толькі зацьверджаны кабінэтны прынцып утварэньня новага Народнага Сакратарыяту і было вырашана, што новы Ўрад павінен быць кааліцыйным. Было прадвырашана таксама (і гэта, мусіць, адбылося на паседжаньні Рады Старэйшын), што Я. Варонка саступіць пасаду Старшыні Народнага Сакратарыяту ка-

[11] Беларускі Шлях. 1918. 17 траўня.

[12] Рада Старэйшых (Рада Старэйшын, Сэньёрэн-Канвэнт) на моцы пастановы Рады Рэспублікі ад 29 сакавіка 1918 г. мусіла складацца з прадстаўнікоў партыйна-палітычных групаў у Радзе БНР: групы да 5 чалавек пасылалі ў Раду Старэйшын па адным прадстаўніку, групы, у склад якіх уваходзілі 5—10 чалавек, — па 2 прадстаўнікі, групы колькасьцю ад 10 да 20 чалавек — па 3 прадстаўнікі, а групы, у якіх налічвалася больш за 20 чалавек, — па 4 прадстаўнікі. (Гл.: НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 6). Раду Старэйшых трэба адрозьніваць ад Прэзыдыюму Рады БНР. Паводле тае самае пастановы Рады БНР, у склад Прэзыдыюму мусілі ўваходзіць 7 чалавек: Старшыня Рады (беларус), 3 яго таварышы (беларус, паляк і жыд), сакратар Рады (беларус), 2 таварышы сакратара (беларус і вялікарос).

[13] Беларускі Шлях. 1918. 17 траўня.

[14] Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху. С. 169.

мусьці іншаму. «Беларускі Шлях» ведаў, што гэтым чалавекам будзе Р. Скірмунт.

А вось і бюлетэнь для друку за 12—20 красавіка 1918 г.[15]. У ім праліваецца дадатковае сьвятло на сутнасьць падзеяў 12 і 14 красавіка, бо маюцца нататкі «Менскае Прадстаўніцтва і Рада», «Дзелавы крызіс Народнага Сакратарыяту» і «Рада і Народны Сакратарыят». У трэцяй з гэтых нататак паведамляецца, што на пасаду Старшыні Рады БНР вылучаюцца кандыдатуры Аляксандра Ўласава, Аркадзя Смоліча, Аляксандра Прушынскага ды Сымона Рак-Міхайлоўскага, а на пасаду Старшыні Народнага Сакратарыяту — кандыдатуры Язэпа Варонкі, Язэпа Лёсіка, Рамана Скірмунта ды Антона Луцкевіча.

Пачынаючы з 25 сакавіка, Урад БНР перажываў пэрманэнтны крызіс. Першым Раду і Народны Сакратарыят пакінуў земец Павал Злобін[16]. Калі параўнаць дак. 0257 з дак. 0089, дык кідаецца ў вочы, што паводле стану на 19 красавіка 1918 г. з Народнага Сакратарыяту выйшлі яшчэ тры народныя сакратары: фінансаў — Г. Белкінд, унутраных спраў — Іван Макрэеў, шляхоў — В. Рэдзька.

Новыя страты Рада і Народны Сакратарыят зазналі пасьля таго, як пад ціскам правых (цэнтрыстаў) была накіраваная тэлеграма кайзэру Вільгельму II. 27 красавіка Я. Варонка ў лісьце да А. Луцкевіча[17] паведаміў, што з Сакратарыяту выйшлі ня толькі вялікарос Іван Макрэеў, ня толькі сіяніст-сацыяліст Л. Гутман (яны падалі ў адстаўку яшчэ раней), але «нават» і Яўхім Бялевіч (народны сакратар юстыцыі). Дарэчы, у тым лісьце занатавана, што на пасаду Старшыні Народнага Сакратарыяту разглядаецца кандыдатура А. Уласава, а на пасаду Старшыні Рады Рэспублікі — Р. Скірмунта.

Празь некалькі дзён Народны Сакратарыят зноў паменшыўся. На паседжаньні Рады 1 траўня аб выхадзе з Ураду заявілі Палута Бадунова (народны сакратар апекі) і Тамаш Грыб (народны сакратар земляробства)[18].

(Для нагляднасьці я прапаную чытачам табліцу «Асабовы склад першага Народнага Сакратарыяту Беларускай Народнай Рэспублікі». Гл. дадатак.)

Такім чынам, цьверджаньне Я. Варонкі, што Народны Сакратарыят «уже пятый месяц функционирует в полном объеме» не зусім карэктнае. (Дарэчы, 2 чэрвеня 1918 г. і «Беларускі Шлях» таксама, як і Я. Варонка, сьцьвярджаў, што першы склад Ураду БНР «функцыянуе і далей у поўным аб'ёме». Гэтае цьверджаньне прымушае задумацца пра сэнс слова «аб'ём»: мусіць, і Я. Варонка, і газэта мелі наўвеце ня колькасны склад, а паўнату функцыяў, аб'ём працы Ўраду. Што гэта так, мы пераканаемся пазьней.)

Наступнае пленарнае паседжаньне Рады Рэспублікі адбылося 14 траўня. У інфармацыйным лістку за 9 траўня 1918 г. паведамлялася, што яно павінна прайсьці ў сераду 15 траўня. На парадак дня паседжаньня выносіліся наступныя пытаньні: выбары Прэзыдыюму Рады БНР, правядзеньне ў жыцьцё кабінэтнай

[15] Архівы БНР. Дак. 0265.

[16] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 18, арк. 8.

[17] Архівы БНР. Дак. 0303.

[18] Архівы БНР. Дак. 0330.

сыстэмы ў арганізацыі Народнага Сакратарыяту, выбары камісіяў Рады БНР[19].

У інфармацыйным лістку № 20 за 12 траўня была зьмешчана нататка «Адстаўка Народнага Сакратарыяту». У ёй паведамлялася, што на бліжэйшым паседжаньні Рады БНР Старшыня Народнага Сакратарыяту заявіць пра адстаўку ўсяго складу Ўраду Рэспублікі з прычыны ўтварэньня новага кабінэту на падставах, прынятых Радай 12—14 красавіка. «Таким образом, — напісана ў лістку, — первый кабинет белорусского правительства слагает свои полномочия, просуществовав три месяца...»[20].

У «Архівах БНР» няма ніякага дакумэнту, датычнага паседжаньня Рады БНР 14 траўня. Затое ў цытаваным ужо дак. 0572 гаворыцца, што ўтварэньне новага кабінэту «как известно, ... начато 14 мая». Больш падрабязная інфармацыя пра гэтае паседжаньне Рады ёсьць у «Беларускім шляху» (№ 44 за 17 траўня). У гэтай інфармацыі ўтрымліваюцца зьвесткі пра рашэньні 12 красавіка. 14 траўня, паведамляе нам газэта, гэтыя рашэньні былі зацьверджаныя. Праект пастановы пра даручэньне Р. Скірмунту ўтварыць новы склад Народнага Сакратарыяту «агалашаў» яшчэ Старшыня Рады Янка Серада, а радны Аркадзь Смоліч «ад імені рады старэйшых» прасіў «зацьвярдзіць пастанову».

Мы маем таксама справаздачу з паседжаньня Рады БНР, якая захоўваецца ў 325-м фондзе Нацыянальнага архіву (воп. 1, адз. захав. 8, арк. 39—40). Гэтая справаздача напісаная ў жанры рэпартажу і падпісаная, як і папярэднія дакумэнты такога кшталту, крыптанімам *А. Са-къ*.

Паседжаньне Рады адкрыў І. Серада заяваю пра тое, што ў Раду Старэйшын паступіў даклад Старшыні Народнага Сакратарыяту Язэпа Варонкі пра адстаўку ўсяго складу Народнага Сакратарыяту (Язэпа Варонкі, Леанарда Зайца, Канстанціна Езавітава, Пётры Крачэўскага, Івана Серады, Аркадзя Смоліча).

Вось копія гэтага дакладу, датаваная 14 траўня і надрукаваная на блянку Ўраду БНР:

*Народны Сэкрэтарыят, згодна з пастановай сваею ад 11 травеня г. г., мае гонар давясьці, што ён у цэласьці выходзіць у адстаўку і будзе яшчэ працаваць толькі да таго часу, пакуль ні створыцца Новы Кабінэт Народных Сэкрэтароў*[21].

Выступіў Варонка. «Судзіце нас за памылкі нашы», — патасна сказаў ён і пачуў у адказ ад Р. Скірмунта: «Вы просіце судзіць вас. Суд над вамі — гэта суд над усімі; нас будзе судзіць гісторыя. Не судзіць, а дзякаваць мы павінны вам, першыя носьбіты і ажыцьцяўляльнікі ідэі Незалежнасьці Беларусі». Васіль Захарка, які выступіў ад сацыялістычнага блёку, нізка пакланіўся Сакратарыяту.

[19] НАРБ, ф. 325, воп.1, адз. захав. 8, арк. 26.

[20] Тамсама. Арк. 30.

[21] Тамсама. Арк. 34.

Пасьля непрацяглых дэбатаў утварэньне новага Народнага Сакратарыяту было даручана сябру Рады БНР Р. Скірмунту.

Адбыліся фракцыйныя нарады, у выніку чаго Рада сфармавала і таемным галасаваньнем абрала Прэзыдыюм Рады БНР.

«Беларускі Шлях» інфармаваў: радны А. Смоліч паведаміў, што Рада Старэйшых пастанавіла часова адступіць ад ранейшай пастановы Рады Рэспублікі (ад 29 сакавіка), паводле якой Прэзыдыюм (газэта называе яго і Старшынаю) складаецца зь сямі чалавек і ў яго ўваходзяць прадстаўнікі меншасьцяў. Рада Старэйшын прапанавала фармаваць Прэзыдыюм зь пяцёх чалавек без прадстаўнікоў меншасьцяў (расейцы і жыды ўжо павыходзілі з Рады). У выніку таемнага галасаваньня кандыдат сацыялістычнага блёку Язэп Лёсік стаў Старшынём Рады, яго таварышамі (намесьнікамі) былі абраныя Аркадзь Смоліч (сацыялістычны блёк) і Аляксандар Уласаў (цэнтар), пісарамі — Пётра Крачэўскі (сацыялістычны блёк) і С. Лянкоўскі[22] (цэнтар).

14 траўня 1918 г. пачалася канкрэтная рэалізацыя пастановаў Рады БНР ад 12 красавіка 1918 г.

Як бачым, левыя, а таксама правыя, якія менавалі сябе цэнтрам, здолелі дамовіцца пра ўтварэньне кааліцыйнага Прэзыдыюму Рады БНР. Цяпер ім належала ўтварыць кааліцыйны Ўрад. «Беларускі Шлях» паведамляў:

*Як мы даведаліся, новы склад Народнага Сакратарыяту ўжо больш-менш намечаны такі: старшыня Народнага Сакратарыяту і народны сакратар міжнародных і ўнутраных спраў гр. Р. Скірмунт, таварыш старшыні — без партфэля — Я. Варонка, сакратар фінансавых спраў — С. Хжонстоўскі[23], сакратар народнай прасьветы — П. Аляксюк, загадчык спраў Народнага Сакратарыяту Аўсянік.*

Аўтар грунтоўнага артыкулу пра Р. Скірмунта Станіслаў Рудовіч піша, што лідэр Менскага Прадстаўніцтва прапаноўваў месца ў кабінэце і Я. Лёсіку[24]. Ня выключана, што гэта мела месца да паседжаньня Рады 14 мая.

22 траўня ў лісьце Дэлегацыі Народнага Сакратарыяту ў справе перамоваў з Украінаю Я. Варонка піша пра зацяжку з утварэньнем новага кабінэту. Амаль праз два тыдні (2 чэрвеня) пра тое, што ўтварэньне кабінэту Скірмунта «зацягіваецца і разрэшыцца не пазьней 10—15 чэрвеня», паведамляе й «Беларускі Шлях». Газэта дае зразумець: пытаньне ўскладнёна тым, што Р. Скірмунт «атрымаў ад Народнага Сакратарыяту спэцыяльнае даручэньне і з надзвычайнымі паўнамоц-

[22] Пра Лянкоўскага вядома, што ён вэтэран БСГ. Студэнт факультэту ўсходніх моваў (адсюль партыйная мянушка Япончык), у 1906 г. быў сябрам Менскага камітэту БСГ. Пазьней працаваў настаўнікам у гімназіі. Іншых зьвестак пра яго няма.

[23] Менскі гарадзкі галава.

[24] Рудовіч, С. Беларускі дзеяч з «вялікіх паноў»: Эпізоды палітычнай біяграфіі Рамана Скірмунта / / Гістарычны альманах. Т. 2. Гродна, 1999. С. 50.

твамі выехаў за межы Беларусі»[25].

12 чэрвеня «Беларускі Шлях» піша: «Арганізацыя новага складу Народнага Сакратарыяту замарудзілася дзеля ад'езду гр. Р. Скірмунта... Стары склад Народнага Сакратарыяту працуе мэханічна». Тым часам адбываецца гадавы сход Менскага таварыства сельскае гаспадаркі. Старшынём зноў абраны пан Эдвард Вайніловіч, а адным зь яго таварышаў — Раман Скірмунт[26]. Нарэшце, 28 чэрвеня «Беларускі Шлях» інфармуе:

*Яг<амосьць> Раман Скірмунт, катораму даручана фармаваньне новага беларускага ўраду, вярнуўся 26 г<этага> м<есяца> у Менск. Пасьля паведамленьня Народнаму Сакратарыяту аб рэзультатах паездкі на Ўкраіну, яг. Р. Скірмунт прыступіць да актыўнай чыннасьці, што да фармаваньня ўраду.*

Тут самы раз вярнуцца да «Архіваў БНР». У бюлетэні для органаў друку (дак. 0583) утрымліваецца інфармацыя пра паседжаньне Рады 28 чэрвеня. Рутынныя пытаньні. Нічога пра новы кабінэт. Праўда, у самым першым матэрыяле паведамляецца, што Р. Скірмунт вярнуўся ў Менск 27 чэрвеня... з Палесься. Магчыма, кандыдат на прэм'ера па дарозе з Кіева заяжджаў у сваё Парэчча. Дак. 0583 датаваны 29 чэрвеня. І да 10 ліпеня мы не сустракаем у «Архівах БНР» ніякіх паведамленьняў пра паседжаньні Рады або кабінэту. Нарэшце ў дак. 0646 (гэта непранумараваны і непадпісаны ліст Народнага Сакратарыяту) паведамляецца, што на паседжаньні кабінэту вырашана ўнесьці ў Раду пытаньне аб «пасылцы дэлегацыі ў Бэрлін у складзе Р. Скірмунта, Я. Воронка, А. Аўсяніка, А. Уласава і А. Луцкевіча».

Чаму на першым месцы ў гэтым пераліку стаіць прозьвішча не прэм'ера Я. Воронкі, а простага сябра Рады Рэспублікі? Адказ мы можам знайсьці ў «Беларускім Шляху». 10 ліпеня ў гэтай газэце надрукаваная нататка «Габінэт Р. Скірмунта», у якой утрымліваецца сэнтэнцыя, што «новаму габінэту даюцца цяжкія заданьні», але нічога не гаворыцца ані пра склад кабінэту, ані пра тое, калі ён зацьверджаны. 11 ліпеня газэта зьмяшчае артыкул А. У. (Аляксандра Ўласава) «Зямля блізка», у якім сказана, што «Рада вялікай большасьцю прыняла дэклярацыю габінэта Скірмунта». І зноў — ніякіх падрабязнасьцяў. І вось 13 ліпеня ў «Беларускім Шляху» чытаем артыкул «Народная дзяржава», у якім згадваецца пара-

[25] Ва Ўкраіне даўно працавала Дэлегацыя Народнага Сакратарыяту на чале з Аляксандрам Цьвікевічам, якой было даручана ўрэгуляваць двухбаковыя адносіны. А тут, у адпаведнасьці зь Берасьцейскаю дамоваю, пачаліся перамовы пра разьмежаваньне паміж Украінаю і РСФСР. Вось Р. Скірмунт і быў камандзіраваны ў Кіеў бараніць беларускія інтарэсы. Як піша С. Шупа ў камэнтары да дак. 0537 у «Архівах БНР», Скірмунт выехаў зь Менску 26 траўня 1918 г. Пра гэта ўскосна сьведчыць і копія мандату, паводле якога на Скірмунта ўскладваліся абавязкі надзвычайнага пасла БНР пры ўрадзе Ўкраіны. Копія гэтага дакумэнту, падпісанага Я. Воронкам і Л. Зайцам 25 чэрвеня 1918 г., захоўваецца ў НАРБ (ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 50).

[26] Беларускі Шлях. 1918. 19 чэрвеня.

граф 2 дэклярацыі «беларускага габінэта Р. Скірмунта». На другой паласе ў тым самым нумары зьмешчаны артыкул «Адносіны беларусаў да суседніх народаў», падпісаны крыптанімам Я-р (Ясакар, Зьмітрок Бядуля), а эпіграфам да гэтага артыкула ўзятыя словы з прамовы Р. Скірмунта на паседжаньні Рады БНР 9 ліпеня. А вось і інфармацыя пра роспуск Беларускае Рады на вакацыі, зь якое мы даведваемся, што засядала яна тры дні запар (9, 10 і 11 ліпеня) і што між іншымі пытаньнямі была разгледжана дэклярацыя «Сакратарыяту Р. Скірмунта» і што пастановаю ад 9 ліпеня «дэклярацыя новага Сакратарыяту ўзята да ведама». Далей чытаем у газэце і пра склад новага кабінэту: «Р. Скірмунт — Старшыня Сакратарыяту і сакратар міжнародных спраў, Кандратовіч — сакратар унутраніх спраў, С. Хржантоўскі — сакратар фінансаў, Р. Астроўскі — сакратар асьветы і П. Аляксюк — загадчык справамі»[27].

Вось цяпер зразумела, чаму ў лісьце Народнага Сакратарыяту за 10 ліпеня сьпярша названы Р. Скірмунт, а потым — Я. Варонка.

Пра тое, што 9 ліпеня былі зацьверджаны і дэклярацыя, і асабовы склад кабінэту, піша й С. Рудовіч, які спасылаецца не на адзін дакумэнт з Нацыянальнага архіву.

Пачытаем і мы гэтыя дакумэнты (ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 82—84; адз. захав. 18, арк. 12—14; адз. захав. 8, арк. 96—97).

А 19-й гадзіне 9 ліпеня, паведамляе ў сваёй справаздачы пра 12-е паседжаньне Рады БНР нехта *Вл. Ф-нъ*, новы будынак Рады Беларускай Народнай Рэспублікі — былы Юбілейны дом[28] — быў перапоўнены. З гэтага тэксту мы даведваемся, што Р. Скірмунт быў адмовіўся ад фармаваньня новага кабінэту, але сваю адмову ўзяў назад. Паседжаньне Рады адкрыў Я. Лёсік, які таксама нібыта хацеў быў падацца ў адстаўку і таксама ўзяў адмову назад. *Вл. Ф-нъ* (аўтар наагул тэндэнцыйны, сымпатызант Варонкі) адзначае, што 9 ліпеня дзеля таго, што не прыехалі ўсе левыя радныя, у Радзе Рэспублікі склалася *нязначная* большасьць правых[29].

Я адмыслова вылучаю слова «нязначная» курсівам, бо з пункту гледжаньня права гэтае слова ня мае значэньня. Значэньне мае, ці сабраўся кворум[30], ці паў-

[27] Яшчэ адно сьведчаньне на карысьць існаваньня кабінэту Скірмунта — «Автобиография работника по Белорусскому движению Ф. М. Верниковского», напісаная ў 1919 г. (Цэнтральная бібліятэка Літоўскай АН, ф. 21, спр. 723, арк. 1—3). Фёдар (Тодар) Вернікоўскі піша, што быў скарбнікам у кабінэце Р. Скірмунта. Не народным сакратаром фінансаў, а скарбнікам (такую пасаду Васіль Захарка займаў у кабінэце Я. Варонкі).

[28] Цяпер гэта Дом мастацтваў на праспэкце Незалежнасьці.

[29] Аўтар тэксту «Последние известия из Минска» піша, што 9—11 ліпеня ў Радзе БНР склалася выпадковая меншыня левых (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8. арк. 99).

[30] 28 чэрвеня 1918 г. Рада прыняла такую пастанову наконт кворуму: раз з Рады выбылі 26 чалавек і ў яе складзе засталося 55 радных, то паседжаньне Рады правамоцнае пры ўдзеле ў ім 18 чалавек (гл.: НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 81). У паседжаньні Рады БНР 9 ліпеня 1918 г. бралі ўдзел 30 яе сяброў, ня лічачы шасьці новакааптаваных (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 84). Як бачым, паседжаньне Рады БНР было цалкам правамоцнае: у ім брала ўдзел не траціна, прадугледжаная пастановаю ад 28 чэрвеня, а абсалютная бальшыня радных.

намоцнае паседжаньне. У такім разе галасы ўсіх прысутных у залі радных маюць вагу, і калі сярод удзельнікаў паседжаньня Рады БНР 9 ліпеня 1918 г. склалася правая большасьць, то гэта праблема дысцыплінаванасьці левых радных, праблема партыйнай і блёкавай згуртаванасьці. Іншая справа — кааптацыя ў Раду новых сяброў, пра што піша *Вл. Ф-нъ*. Калі працэдура прадпісвала гэтае пытаньне перш разгледзець у мандатнай і юрыдычнай камісіях, а потым у Радзе, і калі гэтая працэдура была парушана, то галасы *новых* радных (а яны былі правыя) ня мелі вагі. Аднак *Вл. Ф-нъ* піша, што правых радных было ў залі больш на пачатку паседжаньня і што, карыстаючыся гэтым, яны кааптавалі ў склад Рады сваіх аднадумцаў зь беларускіх радаў у Ратамцы і Радашкавічах (думаецца, што гэтыя людзі былі рэкамэндаваныя А. Уласавым). Раз правых была большасьць да кааптацыі і раз яны дружна галасавалі, то можна сьмела сьцьвярджаць, што з гледзішча права пастанова Рады БНР ад 9 ліпеня 1918 г., датычная складу Народнага Сакратарыяту, была законная, а з палітычнага гледзішча — легітымная, бо, чытаем, «ад імя фракцыі Блёку, якая вылучыла першы Народны Сакратарыят, Л. І. Заяц выказвае задавальненьне дэклярацыяй».

Леанард Заяц выказваў задавальненьне дэклярацыяй новага Народнага Сакратарыяту, зь якой выступіў Р. Скірмунт. Машынапісную копію «Дэклярацыі новаго беларускаго Кабінэту (пана Р. Скірмунта)» можна прачытаць у НАРБ (ф. 325, воп. 1, адз. захав. 10, арк. 77). Праграмная прамова Р. Скірмунта, паведамляе нам *Вл. Ф-нъ,* «выклікае аплядысмэнты правай і часткі [сацыялістычнага] блёку».

А цяпер зноў зьвернемся да «Беларускага Шляху». У нумары за 16 ліпеня чытаем абвестку:

*Народны Сакратарыят новага складу, выпаўняючы волю Рады, уступіў да выкананьня сваіх абавязкаў. Адрас: Захар’еўская вул., Юбілейны дом.*

У нумары за 17 ліпеня:

*Прэзыдыум Рады Беларускай Народнай Рэспублікі апавесьціў цыркулярам ад 12 ліпеня 1918 г. усе ўстановы, беларускія арганізацыі і консульствы аб уступленьні новага Народнага Сакратарыяту ў выкананьне абавязкаў.*

І ў тым самым нумары яшчэ адна інфармацыя:

*Старшыня Народнага Сакратарыяту прымае штодня, апроч сьвят, ад 12 да $1^{1}/_{2}$ гадз. па поўдні. Адрас: Захараўская вул., Юбілейны дом, ІІ паверх (этаж).*

Такім чынам, і А. Луцкевіч, і дасьледнікі мелі рацыю, калі сьцьвярджалі, што кабінэт Рамана Скірмунта існаваў. Менавіта — існаваў.

Наколькі драматычна разьвіваліся падзеі 9—22 ліпеня ў Менску, сьведчыць ужо тое, што 15 ліпеня ў Менск зноў прыехаў І. Луцкевіч. «По слухам, — паве-

дамляе нам «Хроника для газет» за 17 ліпеня, — он ведет переговоры для улаживания создавшегося конфликта» (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 102).

Пра тое, што канфлікт будзе, казала прамова Я. Варонкі 9 ліпеня пры абмеркаваньні дэклярацыі Р. Скірмунта. І прамова Т. Грыба. Варонка перасьцерагаў новы беларускі Ўрад (менавіта гэтак піша *Вл. Ф-нъ*) ад «новых местных элементов, которые так словоохотливо стали заявлять в последнее время о своем признании независимости и государственности Белоруссии». Былы прэм'ер канкрэтызаваў: «Хотел бы я узнать, как они говорили бы о Белорусской Государственности, если бы на улицах Минска вновь появились польские войска»[31]. Варонка папярэджваў таксама пра маскоўскую небясьпеку і заклікаў сяброў новага кабінэту памятаць пра жыдоўскую нацыянальную меншыню. Лідэр эсэраў Т. Грыб ня толькі рэзка крытыкаваў урадавую дэклярацыю Р. Скірмунта, але й выказаў свае падазрэньні наконт палянафільства сяброў новага Народнага Сакратарыяту. (Цікава выходзіла: праваслаўны Я. Варонка папярэджваў пра маскоўскую небясьпеку, а каталік Т. Грыб выступаў супраць палянафільства.) Прамова Т. Грыба была настолькі рэзкая, што Я. Лёсік мусіў некалькі разоў перапыняць яго.

Вельмі вострыя спрэчкі 9—11 ліпеня разгарнуліся ў Радзе вакол пытаньняў пра кааптацыю новых сяброў, утварэньне камісіяў Рады і роспуск Рады на вакацыі да 15 верасьня.

10 ліпеня пры абмеркаваньні пытаньня пра камісіі слова ўзяў Я. Варонка, сацыялістычнасьць якога заўсёды ставіў пад сумнеў такі чалавек левых перакананьняў, як Зьм. Жылуновіч. Былы кіраўнік Ураду БНР сказаў наступнае:

> *...Вы, господа* (обращается к центру — т. е. Представительству)*, придя в Раду для работы — ничего до сих пор не делали и выжидали... чтобы распустить Раду. Довольно. Лето проходит. Вы, паны, отдохнули по своих «ма[ё]нтках» — пора стать к работе. Мы полтора года не отдыхали, работая в голоде и холоде для нашей дорогой родины, и даже теперь, видя вас упитанными и сытыми, не желаем отдыхать, а желаем работать до последних наших сил. Для нас белорусское дело — это наша жизнь. Личной жизни у нас нет. Нам не надо довольства.*

Прамова патасная. Як заўсёды, рэзка, нават эксцэнтрычна паводзіць сябе Т. Грыб. Старшыня Рады Я. Лёсік пераблытвае імёны прамоўцаў. Лідэр эсэраў сам выходзіць на трыбуну. Лёсік не дае яму слова. Радны настойвае на сваім. Старшыня ставіць пытаньне пра выключэньне Т. Грыба на адно паседжаньне. Т. Грыб выключаны, але не пакідае трыбуну. Лёсік абвяшчае перапынак, а пасьля перапынку (бо ўжо і позна) зачыняе паседжаньне.

[31] Польскія войскі мяцежнага корпусу генэрала Доўбар-Мусьніцкага ўварваліся ў Менск 20 лютага 1918 г. — акурат у той дзень, калі Выканаўчы Камітэт Рады Ўсебеларускага зьезду ўтвараў першы Ўрад Беларусі і складаў Першую Ўстаўную Грамату да народаў Беларусі.

Паседжаньне Рады БНР 11 ліпеня, на якім зноў абмяркоўвалася пытаньне пра камісіі і вакацыі, заканчваецца перамогай правых: бальшынёй галасоў вырашана камісій не ўтвараць. *Вл. Ф-нъ* піша:

*Наступает гробовое молчание. Шуршат только складываемые листы бумаги и тихие шаги. Блок, примыкающие к нему эс-эры не против* (проронив? — **А. С.**) *ни одного звука покидают Раду. (...) Радный Верниковский, один из лидеров Минского Представительства, кричит — вслед уходящим: «Собрали манатки и скатертью дорога!»*

Тое, што адбывалася далей, мы можам уявіць, калі прачытаем неаўтарызаваны тэкст «Последние известия из Минска» (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 99—101). Тэкст гэты тэндэнцыйны, таму ацэначныя словы ў ім я пакідаю без увагі.

13 ліпеня, калі Я. Варонка сабраў свой Народны Сакратарыят на паседжаньне, у памяшканьні зьявіліся Старшыня Рады БНР Я. Лёсік, таварыш Старшыні А. Уласаў і новапрызначаныя (аўтар тэксту называе іх будучымі) народны сакратар асьветы Радаслаў Астроўскі ды кіраўнік спраў новага Народнага Сакратарыяту Павал Аляксюк. Язэп Варонка праз свайго намесьніка Канстанціна Езавітава перадаў візытантам, што можа размаўляць зь імі толькі ў сваім кабінэце, куды іх і запрашае. У адказ К. Езавітаву ўручылі «бумагу следующего содержания»:

*Рада Белорусской Народной Республики. Бывшему Народному Секретариату. На основе постановления Рады Белорусской Народной Республики от 9 июля с. г. предлагается вам передать все дела новому Народному Секретариату сегодня 13 июля в 5 часов вечера в помещении бывшей Рады по Захарьевской ул., 43. При сдаче дел присутствие членов Президиума обязательно. Председатель Рады г. Лесик. За Секретаря Рады Товарищ Председателя Власов.*

Ведама, аўтар тэксту «Последние известия из Минска» цытуе адносіну Рады БНР недакладна (напрыклад, замест «в помещении бывшей Рады по Захарьевской ул., 43» трэба было б пісаць «в бывшем помещении Рады...»), але нам цікава, што было далей. А далей Я. Варонка (зноў-такі, праз К. Езавітава) паведамляе, што пастановы Рады БНР яму вядомыя і што ў пытаньні, якое цікавіць візытантаў, ён будзе размаўляць з Р. Скірмунтам. Мала таго, Я. Варонка дэманстрацыйна пачаў паседжаньне былога Народнага Сакратарыяту. У памяшканьне, дзе ішло гэтае паседжаньне, увайшоў Л. Заяц і прадставіў Я. Варонку (аўтар тэксту ўparта называе яго Старшынём) «новую бумагу», напісаную рукою П. Алексюка на блянку Народнага Сакратарыяту, падпісаную Р. Скірмунтам і П. Алексюком і змацаваную пячаткаю Народнага Сакратарыяту. На блянку была напісана: «Удостоверение. Сим поручается принятие дел от бывшего Народного Секретариата Белорусской Народной Республики Товарищу Председателя Народного Секретариата г. Островскому и Управляющему Делами г. Алексюку».

«Оглашение этой бумаги и ея экспертиза поразила (былы. — **А. С.**) Народный Секретариат», — піша аўтар тэксту «Последние известия из Минска». Тут жа быў учынены сапраўдны допыт Л. Зайца: як маглі трапіць да Р. Скірмунта блянкі і пячатка Народнага Сакратарыяту? І высьветлілася, што былы кіраўнік спраў Ураду нікому блянкаў і пячатак Народнага Сакратарыяту не даваў. Затое «сьледчыя» ўстанавілі, што нумар пасьведчаньня, падпісанага Р. Скірмунтам і П. Алексюком, — несапраўдны. «Народный Секретариат постановил экстренно затребовать от будущего Председателя Народного Секретариата объяснения по этому поводу», — піша безыменны аўтар.

Сваё тлумачэньне на гэты конт маю і я. Тут зьвяртаю ўвагу, што аўтар тэксту ўпарта называе былы Народны Сакратарыят актуальным, а новапрызначанага галаву Ўраду БНР — будучым.

14 ліпеня Я. Варонка па-ранейшаму лічыў сябе Старшынём Народнага Сакратарыяту і народным сакратаром замежных (не міжнародных!) спраў, П. Крачэўскі — народным сакратаром фінансаў, К. Езавітаў — таварышам Старшыні Ўраду і народным сакратаром асьветы, а Л. Заяц — кіраўніком спраў Народнага Сакратарыяту.

«Назревший кризис, — дадаваў аўтар «Последних известий из Минска», — должен выясниться на этой же неделе».

Як вядома, 15 ліпеня, каб палагодзіць канфліктную сытуацыю, у Менск прыехаў І. Луцкевіч.

С. Рудовіч тлумачыць нам, што новы Народны Сакратарыят БНР быў зацьверджаны толькі таму, што на паседжаньні Рады БНР 9 ліпеня адсутнічала значная частка левых яе сяброў[32]. Тут, па-мойму, трэба было б удакладніць, якіх левых. Мы бачым, што такія левыя дзеячы, як заслужаныя перад беларускім рухам Алесь Гарун і Аляксандар Уласаў, ужо раней сталі прыхільнікамі Р. Скірмунта. Браты Луцкевічы, якія мелі немалую вагу ў беларускіх справах, таксама былі за памяркоўны Ўрад БНР і спрыялі кааптацыі правых у Раду БНР. За імі пайшлі Я. Лёсік, А. Смоліч ды іншыя вэтэраны руху. Можна сказаць, што сацыял-дэмакратычная частка былой БСГ падтрымала Р. Скірмунта. Сярод тых, хто падтрымаў кіраўніка новага кабінэту, быў і Макар Краўцоў.

Недавер і засьцярогі постаць «вялікага пана» Р. Скірмунта спараджала ў эсэраў і прадстаўнікоў павятовых радаў, паведамляе С. Рудовіч[33]. Наконт павятовых радаў я не сказаў бы гэтак катэгарычна, а што тычыцца эсэраў, дык гэта праўда, што яны ўчынілі новаму прэм'еру БНР абструкцыю. Сапраўды, адбылося амаль тое самае, што і ў 1917 г.: тады сацыялісты дамагліся роспуску Беларускага Нацыянальнага Камітэту на чале з Р. Скірмунтам[34], а цяпер частка левых

[32] Гістарычны альманах. Т. 2. Гродна, 1999. С. 53.

[33] Тамсама. С. 54.

[34] Р. Скірмунт з сацыялістамі, пэўна, не згадзіўся, і вось чытаем (Вольная Беларусь. 1918. 24 сакавіка) тэлеграму «Беларускага Народнага Камітэта ў Мінску» канцлеру і інш. нямецкім уладам, падпісаную Р. Скірмунтам, Р. Зямкевічам і П. Алексюком. Хто, калі і дзе ўтвараў гэты БНК? Ці ня рэшткі гэта Беларускага Нацыянальнага Камітэту, які існаваў у сакавіку—ліпені 1917 г.?

дамагалася адстаўкі ягонага кабінэту. Да эсэраў шчыльна прымыкалі будучыя сацыялісты-фэдэралісты: Я. Варонка, К. Езавітаў, В. Захарка, П. Крачэўскі ды інш. Нагадаю, што менавіта эсэфы і эсэры ўчынілі 13 сьнежня 1919 г. закалот у Радзе БНР і стварылі паралельны Ўраду А. Луцкевіча кабінэт Вацлава Ластоўскага. Эсэрам стане і Л. Заяц, які ад імя сацыялістычнага блёку на паседжаньні Рады БНР 9 ліпеня выказаў задавальненьне дэкларацыяй кабінэту Р. Скірмунта. Не выключаю, што гэта ён, юрыст, даў блянк і паставіў пячатку на пасьведчаньні, пра якое гаворка была вышэй.

Прэтэкстам для канфлікту магла стаць ня толькі постаць «вялікага пана», але й парушэньне пастановы Рады БНР ад 12 красавіка пра кааліцыйны характар 2-га Народнага Сакратарыяту. Аднак у нас няма адказу на пытаньне, ці заставаўся сябар былое БСГ Р. Астроўскі сацыялістам і 9 ліпеня. Па-трэцяе, 9 ліпеня правыя з парушэньнем працэдуры правялі кааптацыю новых сяброў Рады БНР, а таксама надзялілі правамі радных новых народных сакратароў, якія раней не ўваходзілі ў склад Рады. Маючы большасьць, правыя маглі на пленарным паседжаньні ўлічыць ці не ўлічыць меркаваньні мандатнай і юрыдычнай камісіяў, а так, парушыўшы працэдуру, яны далі Я. Варонку зачэпку для распальваньня канфлікту.

Ведаючы зь літаратуры сёе-тое пра характар Я. Варонкі, можна сцьвярджаць: ён пакрыўдзіўся на Р. Скірмунта за тое, што яму не знайшлося месца ў другім Урадзе БНР. А яму, нагадаю, «усьміхалася» месца таварыша Старшыні Народнага Сакратарыяту без партфэля. Наагул, першы Старшыня Ўраду БНР да 9 ліпеня манэўраваў. 14 траўня інфармацыйны лісток № 22 паведамляў, што ён даў згоду на сваё ўваходжаньне ў новы кабінэт, але перад гэтым хацеў адпачыць «для поправления расшатанного непрерывной годовой работой здоровья»[35], а 17 траўня ў інфармацыйным лістку № 23 была зьмешчана нататка пра тое, што Я. Варонка «своего согласия на вхождение в Новый Кабинет не давал впредь до решения этого вопроса во фракции БСГ»[36]. Апынуўшыся па-за кабінэтам, Я. Варонка не палічыў патрэбным падпарадкавацца рашэньню Рады Рэспублікі і перадаць новаму галаве Ўраду справы Народнага Сакратарыяту. Гэтыя справы ён перадаў толькі Я. Серадзе, наступніку Р. Скірмунта[37]. Першы прэм’ер-міністар БНР папросту сабатаваў рашэньні Рады ад 9 ліпеня. Пра тое, што яго кабінэт «никаких дел новому составу [Народнага Сакратарыяту]... не передавал и передавать не намерен», афіцыйна паведамлялася ў «Хронике для газет» за 17 ліпеня 1918 г.[38] — ужо тады, калі ў Менск прыехаў І. Луцкевіч. Бярэ на сябе ўвагу факт, што гэтыя дзеяньні кабінэту Я. Варонкі ніяк не матываваліся.

Нельга ня ўлічваць і такога моманту. У галавы першага Народнага Сакратарыяту склаліся проста варожыя адносіны з адным зь сяброў Ураду Скірмунта —

[35] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 35.
[36] НАРБ, тамсама, арк. 43 адв.
[37] Архівы БНР. Дак. 0742.
[38] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 102.

П. Алексюком (гл., напрыклад, дак. 0537 у «Архівах БНР» і адпаведныя запісы ў дзёньніку А. Луцкевіча). А калі да гэтага дадаць непрыхільнае стаўленьне Я. Варонкі да Ф. Вернікоўскага?..

Вось менавіта з таго часу, як пісаў А. Луцкевіч, Я. Варонка «зьбіўся з старое дарогі на бездарожжа»[39]. Паказальна, што ў брашуры «Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: Кароткі агляд» (Коўна, 1920) Я. Варонка маўчыць пра падзеі ліпеня 1918 г.

Ёсьць яшчэ пытаньне, да якога мы абяцалі вярнуцца: ці была такая форма Ўраду БНР, як Рада пяцёх, пра якую мы чытаем у «Byelorussian Statehood»? Ці ўтваралася «Рада пяцёх» і калі яна існавала?

На падставе тых дакумэнтаў і публікацый, якія вядомыя нам сёньня, можна сьцьвярджаць, што 1-шы Ўрад БНР на чале з Я. Варонкам функцыянаваў з 20 лютага па 14 траўня 1918 г. З 14 траўня Народны Сакратарыят, незалежна ад яго колькаснага складу, функцыянаваў як пераходны Ўрад пад кіраўніцтвам Я. Варонкі і праіснаваў у такім статусе да 9 ліпеня.

«Радаю пяцёх» і, адпаведна, 2-м кабінэтам БНР назвалі той склад 1-га Ўраду БНР, які застаўся пасьля адставак дзевяці народных сакратароў паводле стану на 2 траўня 1918 г. У «Хронике для газет», якая складзена пасьля 1 траўня 1918 г., бо ў ёй паведамляецца пра адстаўку П. Бадуновай і Т. Грыба, гэтак і запісана: «...Народный Секретариат ныне сконструирован в «Совете Пяти»[40]. Далей ідзе пералік сяброў НС. Гэты пералік паўтараецца таксама ў тэксьце «Состав Народного Секретариата Белорусской Народной Республики», складзеным не пазьней як 25 траўня[41]. Пералік паказвае, што ад траўня 1918 г. усе сябры Ўраду БНР сталі «сумяшчальнікамі» і што гэтаю акалічнасьцю і тлумачацца словы пра тое, што кабінэт працуе ў поўным аб'ёме. У склад «Рады пяцёх» уваходзілі: Старшыня Народнага Сакратарыяту, народны сакратар міжнародных і ўнутраных спраў Я. Варонка, народны сакратар асьветы і нацыянальных спраў А. Смоліч, народны сакратар юстыцыі і кіраўнік спраў Народнага Сакратарыяту Л. Заяц, народны сакратар фінансаў і харчаваньня П. Крачэўскі, народны сакратар народнай гаспадаркі і земляробства І. Серада. Аднак да 9 ліпеня канфігурацыя «Рады пяцёх» зьмянілася: зь яе выйшаў А. Смоліч, а з адпачынку ў Менск вярнуўся і вакантную пасаду народнага сакратара асьветы заняў былы народны сакратар унутраных спраў К. Езавітаў.

Падвядзём пэўныя вынікі.

1. У нас ёсьць пэўныя зьвесткі, што пытаньне пра ўтварэньне другога Ўраду БНР абмяркоўвалася ўжо 12 красавіка 1918 г., калі ў склад Рады Рэспублікі была кааптаваная першая група правых (цэнтрыстаў) на чале з Р. Скірмунтам. Меркавалася, што новы Народны Сакратарыят Беларусі будзе кааліцыйны.

[39] Луцкевіч, А. Да гісторыі беларускага руху. С. 166.

[40] НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 119 адв.

[41] Тамсама. Арк. 51.

2. Першы кабінэт БНР існаваў да 14 траўня 1918 г., калі ў адстаўку падалі яго старшыня Я. Варонка і народныя сакратары.

3. З 14 траўня да 9 ліпеня 1918 г. першы Народны Сакратарыят існаваў як пераходны Ўрад БНР да ўтварэньня новага кабінэту.

4. 14 траўня 1918 г. Рада БНР дaручыла Р. Скірмунту ўтварэньне другога Ўраду. У той самы дзень быў створаны кааліцыйны Прэзыдыюм Рады БНР на чале з новым старшынём Рады — Я. Лёсікам.

5. 9 ліпеня 1918 г. асабовы склад другога Ўраду БНР пад кіраўніцтвам Р. Скірмунта быў зацьверджаны.

6. 22 ліпеня 1918 г. быў сфармаваны трэці Ўрад БНР на чале зь Я. Серадой.

Да гэтага дадамо, што ў лістападзе 1918 г. будзе ўтвораны чацьверты Ўрад БНР — Рада Народных Міністраў — на чале з А. Луцкевічам. 13 сьнежня 1919 г. у выніку закалоту ў Радзе Рэспублікі, учыненага эсэрамі і эсэфамі, будзе створаны пяты (паралельны) Урад БНР на чале з В. Ластоўскім. Так здарылася, што пасьля адстаўкі 28 лютага 1920 г. Луцкевіча кабінэт Ластоўскага застаўся адзіным Урадам БНР. 3 траўня 1922 г. прэм'ер Ластоўскі афіцыйна — нотаю — прызнаў права Літвы на Вільню, а 20 траўня мусіў падаць у адстаўку. Пасьля працяглага крызісу 11 кастрычніка 1922 г. замест Рады Міністраў была ўтворана Дзяржаўная калегія на чале з П. Крачэўскім (шосты Ўрад БНР). 20 красавіка 1923 г. Ластоўскі пакінуў Дзяржаўную калегію, і да 23 жніўня 1923 г. зноў меў месца ўрадавы крызіс. На чале новай Рады Народных Міністраў БНР стаў Аляксандар Цьвікевіч[42]. Гэты — сёмы — Урад БНР 15 кастрычніка 1925 г. самараспусьціўся, а Цьвікевіч і яго аднадумцы прызналі Менск цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэньня Беларусі. Праўда, Урад БНР не перадаў, як таго хацелі менскія бальшавікі, сваіх паўнамоцтваў Ураду БССР.

Такім чынам, БНР на працягу 1918—1925 гг. мела сем Урадаў. Восьмы Ўрад БНР будзе створаны пасьля Другое ўсясьветнае вайны.

*2002 г.; студзень—люты 2008 г.*

[42] Мы не абмяркоўваем тут пытаньня пра законнасьць кабінэту А. Цьвікевіча.

# ДАДАТАК

## **Асабовы склад першага Народнага Сакратарыяту Беларускай Народнай Рэспублікі**

| Народны сакратар | 21.02. 1918 | 23.02. 1918 | 25.03. 1918 | 06.04. 1918 | 19.04. 1918 | 27.04. 1918 | 02.05. 1918 | 14.05. 1918 | 25.05. 1918 | 09.07. 1918 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Варонка Я.** | + | + | + | + | + | + | + | + | + | + |
| **Бадунова П.** | + | + | + | + | + | + | | | | |
| **Белкінд Г.** | + | + | + | | | | | | | |
| **Бялевіч Я.** | + | + | + | + | + | | | | | |
| **Грыб Т.** | | + | + | + | + | + | | | | |
| **Езавітаў К.** | + | + | + | + | + | + | | + | | + |
| **Заяц Л.** | + | + | + | + | + | + | + | + | + | + |
| **Злобін П.** | + | + | | | | | | | | |
| **Карач А.** | + | + | + | + | + | + | | | | |
| **Крачэўскі П.** | + | + | + | + | + | + | + | + | + | + |
| **Макрэеў І.** | + | + | + | | | | | | | |
| **Рэдзька В.** | | + | + | | | | | | | |
| **Серада І.** | + | + | + | + | + | + | + | + | + | + |
| **Смоліч А.** | + | + | + | + | + | + | + | + | + | |

Склад НС на 21.02.1918 г. падаецца паводле абвесткі Народнага Сакратарыяту № 2 (Архівы БНР. Дак. 0088).

Склад НС на 23.02.1918 г. падаецца паводле абвесткі Народнага Сакратарыяту № 3 (Архівы БНР. Дак. 0089; НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 15, арк. 61).

Інфармацыя пра тое, што П. Злобін 25.03.1918 г. выйшаў з НС, падаецца паводле справаздачы з паседжаньня Рады БНР 24—25 сакавіка 1918 г. (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 18, арк. 8).

Склад НС на 06.04.1918 г. падаецца паводле абвесткі Народнага Сакратарыяту № 6 (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 15, арк. 48).

Склад НС на 19.04.1918 г. падаецца паводле абвесткі Народнага Сакратарыяту (Архівы БНР. Дак. 0257).

Зьвесткі пра тое, што Я. Бялевіч выйшаў з НС да 27.04.1918 г., падаюцца паводле ліста Я. Варонкі да А. Луцкевіча ад 27 красавіка 1918 г. (Архівы БНР. Дак. 0303; гл. таксама: НАРБ, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 107).

Склад НС на 02.05.1918 г. падаецца паводле справаздачы з паседжаньня Рады БНР 1 траўня 1918 г. (Архівы БНР. Дак. 0330; НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 21). Пра выхад з НС А. Карача паведамляецца ў хроніцы для газэт, якая складзена паміж 1 і 14 траўня 1918 г. (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 119 адв.).

Склад НС на 14.05.1918 г. падаецца паводле справаздачы з паседжаньня Рады БНР 14 траўня 1918 г. (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 39; гл. таксама: ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 119 адв.).

Склад НС на 25.05.1918 г. падаецца паводле: НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 51). Народны сакратар унутраных спраў К. Езавітаў у канцы красавіка пайшоў у адпачынак (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 108). Пасьля гэтага былі чуткі, што бальшавікі расстралялі яго ў Віцебску. У справаздачы з паседжаньня Рады БНР 14 траўня 1918 г. яго прозьвішча падаецца ў сьпісе народных сакратароў, а ў сьпісах, складзеных паміж 1 і 14 траўня і не пазьней як 25 траўня (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 119 адв. і 51), яго прозьвішча адсутнічае. Як вынікае з гэтых матэрыялаў, пасаду народнага сакратара ўнутраных спраў, якая раней належала Езавітаву, заняў (разам з пасадай Старшыні НС і народнага сакратара міжнародных спраў) Я. Воронка.

Склад НС на 09.07.1918 г. падаецца паводле справаздачы з паседжаньня Рады БНР 9 ліпеня 1918 г. (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 8, арк. 82) і тэксту «Последние известия из Минска» (тамсама, арк. 99). У гэтых матэрыялах сярод сяброў НС няма прозьвішча А. Смоліча, а народным сакратаром асьветы замест яго названы К. Езавітаў. Гэта сьведчыць пра выхад А. Смоліча з Народнага Сакратарыяту да 9 ліпеня 1918 г.

## АНАЛІТЫКА

ЭНДРУ УІЛСАН

# Крамлёўская «аперацыя «Пераемнік 2.0»

## Спалучэнне пераемнасці і няпэўнасці

2 сакавіка расіяне выбралі Дзмітрыя Мядзведзева сваім новым прэзідэнтам. Саракадвухгадовы, спрактыкаваны ў англійскай мове і эканамічна падкаваны юрыст, якога часта называюць «ліibералам», экс-старшыня «Газпрома» робіць зусім іншае ўражанне, чым Пуцін і яго палітычныя настаўнікі з КДБ. Ці спрычыніцца абранне Мядзведзева да новага этапу ў дачыненнях Расіі і Еўрапейскага Саюза? Альбо гэта будзе пераважна тое самае — «пуцінізм без Пуціна»? Што ўвасабляе Мядзведзеў — новыя магчымасці ці марныя надзеі?

Гэты палітычны агляд закранае чатыры пытанні, кожнае з якіх абумоўлена той ці іншай характэрнай рысай сістэмы, збудаванай Пуціным у Расіі:

1) ці будзе Мядзведзеў дзейнічаць як дэмакрат;
2) як будзе адбывацца меркаванае супрацоўніцтва з Пуціным;
3) ці станецца Мядзведзеў урэшце зусім самастойным палітыкам;
4) ці прыход да ўлады Мядзведзева пацягне збліжэнне паміж Расіяй і Захадам?

### ЦІ БУДЗЕ МЯДЗВЕДЗЕЎ ДЭМАКРАТАМ?

Мядзведзеў, сын універсітэцкіх выкладчыкаў, мае ў расійскіх колах рэпутацыю ліберала, нягледзячы на тое, што на працягу семнаццаці гадоў ён быў пра-

***Эндру Ўілсан*** *— палітоляг, сталы аўтар «ARCHE», старшы палітычны экспэрт Эўрапейскай рады па міжнародных дачыненьнях, а таксама старшы выкладчык катэдры ўкраіністыкі ў Школе славянскіх і ўсходнеэўрапейскіх дасьледаваньняў Лёнданскага ўнівэрсытэцкага каледжу. Эндру Ўілсан — ганаровы член Каралеўскага інстытуту міжнародных дачыненьняў, аўтар шматлікіх публікацыяў на тэму палітычнага і культурнага жыцьця Ўкраіны, Расеі і Беларусі, а таксама параўнальных палітычных дасьледаваньняў працэсаў дэмакратызацыі ў постсавецкіх дзяржавах.*

тэжэ ў цэлым неліберальнага Пуціна. Сапраўды, колішні афіцэр КДБ і універсітэцкі выкладчык права, які на пачатку сваёй кар'еры, у першай палове 1990-х, супрацоўнічаў з камітэтам па знешніх сувязях мэрыі Санкт-Пецярбурга, маюць паміж сабой няшмат яўнага падабенства. У сваёй першай вялікай прамове падчас перадвыбарнай кампаніі Мядзведзеў раскрытыкаваў расійскі «прававы нігілізм». Ён нават выказаў скепсіс адносна папулярнага азначэння «суверэнная дэмакратыя», назваўшы яго ў 2006 г. «далёка не ідэальным тэрмінам… калькай… [якая] нам не зусім падыходзіць», і адзначыў, што «нашмат больш правільна гаварыць пра сапраўдную дэмакратыю… для мяне «суверэнітэт» — паняцце юрыдычнае»[1]. Паказальна і тое, што колішні паплечнік Мядзведзева Анатоль Чубайс нядаўна перасцярог наконт небяспекі нанесці страты эканамічным інтарэсам Расіі ў выніку яе агрэсіўнай замежнай палітыкі апошняга часу.

Сем гадоў старшынёўства Мядзведзева ў савеце дырэктараў «Газпрома» робяць яго знаёмай фігурай у заходніх дзелавых колах. Ён можа весці перамовы ў Давосе. Ён добра апранаецца. Ён не выглядае тыповым постсавецкім бюракратам ці агентам КДБ. Ён вялікі прыхільнік рок-музыкі 1970-х гг. — у прыватнасці, групы «Deep Purple» (зрэшты, кажуць, што аўтарытарны савецкі лідэр Юрый Андропаў любіў джаз).

Праўда і тое, што самі рускія часта выказваюцца пра Мядзведзева скептычна. Паводле слоў Валерыя Салаўя, палітычнага аналітыка «Гарбачоў-фонду», «магчыма, ён не ліберал у заходнім сэнсе слова… «Ліберал» у расійскім разуменні мае спецыфічнае значэнне. Гэта той, хто супраць сілавікоў і іх умяшання ў расійскую эканоміку». Але нават калі Мядзведзеў кіруецца гэтым урэзаным варыянтам «лібералізму», любы выклік сілавікам з боку грамадзянскай супольнасці ўсё адно будзе добрай навіной для Расіі і Захаду.

Незалежна ад намераў і перакананняў Мядзведзева, яму наўрад ці лёгка будзе парваць з сіламі, якія стварылі яго як палітыка. Хоць сучасную расійскую палітычную сістэму часта параўноўваюць з колішнім царызмам — зыходзячы з дамінавання вярхоўнага лідэра, — аўтарытарныя механізмы, якія склаліся за апошняе дзесяцігоддзе, відаць, захаваюцца, нягледзячы на змены ў кіраўніцтве.

Каб зразумець псіхалогію сённяшніх расійскіх эліт, неабходна прыгадаць абставіны, у якіх Пуцін прыйшоў да ўлады восем гадоў таму, ўратаваўшы здыскрэдытаваны Крэмль ад катастрофы. Да 1999 г. папулярнасць Ельцына беспрэцэдэнтна ўпала на тле моцных апазіцыйных партый і заняпаду федэральнай улады, якая стаяла перад пагрозай хуткай анархіі на перыферыі краіны. Апроч таго, эліта была расколата: абложанаму з усіх бакоў Крамлю процістаяў новы блок «Айчына — уся Расія» (АУР), які падтрымлівалі апазіцыйныя алігархі і тэлеканал НТВ Уладзіміра Гусінскага. Улетку 1999 г. кандыдат АУР Яўген Прымакоў здаваўся найбольш імаверным пераможцам на будучых выбарах прэзідэнта.

Крэмль распрацаваў план выжывання, ахрышчаны «Аперацыя «Пераемнік». Хоць Прымакоў, як і Пуцін, меў кадэбэшнае мінулае, атачэнне Ельцына не лічы-

[1] Для процветания всех надо учитывать интересы каждого // Эксперт. 2006. 24 июля.

ла яго сваім. Асновай плана сталі «палітычныя тэхналогіі» — мясцовы тэрмін для ўсёй індустрыі палітычных маніпуляцый, прызначаных, у простае наследаванне бальшавікам, для «арганізацыі перамогі» любымі сродкамі — пры бачным захоўванні «прыстойных» паводзін. Для дыскрэдытацыі апанентаў «тэхнолагі» збіралі на іх кампрамат, звярталіся да чорнага піяру, паклёпу і метадаў «інфармацыйнай вайны». Так, найлепшы эфірны час папулярных тэлеканалаў аддалі ачарненню Прымакова; пры гэтым акцэнт рабілі на яго ўзросце і стане здароўя. Як толькі генеральны пракурор Юрый Скуратаў наблізіўся да раскрыцця крамлёўскіх махінацый у Швейцарыі і раскрадання Барысам Беразоўскім маёмасці «Аэрафлота», Пуцін распаўсюдзіў відэазапіс, у якім фігураваў чалавек, падобны да Скуратава, у кампаніі з дзвюма прастытуткамі.

Многія з гэтых брудных передвыбарных трукаў практыкуюцца скрозь у свеце, у тым ліку ў такіх дэмакратычных краінах, як ЗША (кампанія в'етнамскіх ветэранаў-маракоў супраць Джона Керы ў час прэзідэнцкіх выбараў 2004 г., інсінуацыі вакол тайных сімпатый Барака Абамы да ісламу), але нідзе яны не носяць такога сістэматычнага характару, як у Расіі. Расійскія тэхнолагі спецыялізуюцца і на стварэнні фальшывых штучных партый, мэта якіх — забраць галасы ў апазіцыі. У 1999 г. створаная перад гэтым Партыя пенсіянераў (з незвычайна маладымі лідэрамі) прэтэндавала на галасы сімпатыкаў камуністаў, тады як «Блок Нікалаева і Фёдарава» быў нацэлены на прыхільнікаў АУР. Яны расчысцілі палітычную прастору для новай прапуцінскай партыі «Адзінства», якая перахапіла ролю апазіцыі ў АУР, пераняўшы яе рыторыку наконт замены некампетэнтнага Ельцына «моцнай рукой», хоць на справе гэтая партыя была выратавальным плытом для старой эліты. Піяршчыкам Пуціна ўдалося падаць яго адначасова як новага Ельцына і «анты-Ельцына». Сам Пуцін зарэкамендаваў сябе майстрам паяднання супярэчнасцяў, публічна пагражаючы «знішчыць алігархаў як клас» і адначасова абяцаючы захаваць, у прыватнасці, «кадравую стабільнасць».

Апошнія заявы Мядзведзева сведчаць пра яго спробы дасягнуць аналагічнага балансу, неабходнага, калі ён хоча стаць прымальным кандыдатам для шырокіх колаў эліт. Адрозна ад Пуціна, які ўзнік амаль што на пустым месцы, Мядзведзеў мае перавагі ў выглядзе пэўнай вядомасці і вялікага адрыву на старце коштам надзвычайнай папулярнасці свайго «апекуна».

Рэйтынг Пуціна зведаў першы ўзлёт, калі той распачаў другую «вайну адплаты» супраць Чэчні пасля падрыву жылых дамоў у Маскве ў верасні 1999 г. Гэты крок быў настолькі паспяховы, што ўсе расійскія выбары цяпер праходзілі паводле стандартнай схемы мабілізацыі электарату супраць «супольнага ворага». У 1996 г. такім ворагам былі камуністы, у 1999-м — чэчэнцы. У 2003—2004 гг. мішэнню Пуціна былі «алігархі»; нарэшце, у 2007—2008 гг. праціўнікам сталі мы — дакладней, пагроза «каляровай рэвалюцыі», інспіраванай варожым Захадам. Рускія маюць нават адмысловае азначэнне для такіх перадвыбарных сцэнараў — *драматургія* (старанна напісаная штучная драма).

Палітычныя тэхналогіі ў 1999—2000 гг. дазволілі стварыць ілюзію змен пры недапушчэнні ніякіх сапраўдных дэмакратычных трансфармацый. Нягледзячы

на гэта, многія заходнія лідэры паспяшаліся вітаць Пуціна як новае аблічча Расіі.

Улічваючы рэйтынгі папулярнасці Мядзведзева, ён цалкам мог бы набраць неабходную большасць галасоў і без цёмнага мастацтва палітычных тэхналогій. Аднак існая расійская сістэма не пакідае месца для сумленных выбараў — прынамсі, у каротка- і сярэднетэрміновай перспектыве. Падчас бягучай выбарчай кампаніі ўлады адмовіліся нават зарэгістраваць кааліцыю апазіцыйных рухаў «Другая Расія», санкцыянавалі перадвыбарны арышт Гары Каспарава і іншых актывістаў, а таксама выключылі з прэзідэнцкай гонкі былога прэм'ер-міністра Міхаіла Касьянава. Былі нават чуткі пра захады супраць Гарбачова. Апроч таго, яны прадоўжылі пашыраць дэзінфармацыю і карыстацца паслугамі так званых медыякілераў, накшталт Аляксея Пушкова, аддаючы ім найлепшы эфірны час расійскіх тэлеканалаў.

На выбарах 2007—2008 гг. засталося менш месца для фальшывых партый, хоць акурат у гэтай кампаніі дэбютавала «Справядлівая Расія» — выразнік мяккага левага пуцінізму. Тым часам перацягванне на сябе пратэстных галасоў прадоўжыла партыя Уладзіміра Жырыноўскага з падманлівай шыльдай «ліберал-дэмакратычная». Менш значную ролю адыгралі Аграрная і Патрыятычная партыі, закліканыя «прыручыць» камуністаў (нагадваючы ім пра рызыкі рэальнай апазіцыі), тады як ліберальныя клоны — «Грамадзянская сіла» і Дэмакратычная партыя — зацянялі празаходні Саюз правых сіл (СПС), падтрымка якога на апошніх парламенцкіх выбарах упала менш як да 1 % і які не атрымаў ніводнага месца ў Думе — гэтак жа, як і левацэнтрысцкі «Яблык». З'явіліся паведамленні, што фальшывыя партыі фінансаваліся праз спецыяльны фонд, створаны на базе «Знешэканамбанка», пад кіраўніцтвам Сяргея Сабяніна і Уладзіслава Суркова — першых асобаў у Адміністрацыі прэзідэнта[2]. Абедзве фальшывыя «ліберальныя» партыі вялі вельмі ўмелую перадвыбарную кампанію, і СПС нават прыйшлося зведаць ганьбу, набраўшы трохі менш галасоў за свайго клона — «Грамадзянскую сілу». На прэзідэнцкіх выбарах малады лідэр Дэмакратычнай партыі Андрэй Багданаў, задачай якога было ўвасабляць максімальны «лібералізм» для заходняй аўдыторыі, надзеў на сябе мантыю фальшывага плюралізму. Перадвыбарны з'езд яго партыі быў нават праведзены ў Бруселі.

Прызначэнне палітычных тэхналогій мяняецца з улікам таго, што Расія робіцца больш магутнай. Паводле слоў аднаго з вядучых паліттэхнолагаў Сяргея Маркава,

*у пуцінскую эпоху мы не спрабуем стварыць нейкі віртуальны свет; мы імкнёмся скарыстаць розныя тэхналогіі, каб правесці змены ў рэальным свеце. У гэтым заключаецца прынцыповае адрозненне. Нам не трэба выбараў, якія б стваралі бачнасць таго, што людзі падтрымліваюць Пуціна, — мы хочам, каб людзі сапраўды падтрымалі Пуціна.*

[2] Морарь Наталья. «Черная касса» Кремля // http://newtimes.ru/magazine/issue_44/article_7.htm. Морар, грамадзянка Малдовы, была выслана з Расіі пасля напісання гэтага артыкула.

Аднак, кажа ён, умовы, якія спараджаюць гэты тып высокаманіпуляцыйнай палітыкі, застаюцца нязменныя,

*характэрныя для так званага постмадэрнага грамадства. Нармальныя інстытуты, якія (некалі) працавалі на дэмакратыю, зведалі заняпад; палітычныя партыі зведалі заняпад. Грамадская думка мяняецца; яна не знікае, але робіцца* [...] *усё больш штучнай*[3].

Паводле слоў Глеба Паўлоўскага, найбольш знакамітага расійскага паліттэхнолага, цяпер менш патрэбы

*для палітычных тэхналогій у сэнсе 1990-х гг. Але мы маем больш прасторы для інфармацыйных тэхналогій, для юрыдычных тэхналогій... Палітыка грунтуецца не на ведах, як гэта, на маю думку, мае быць, а на міфах, якія пашыраюцца праз СМІ.*

«Юрыдычныя тэхналогіі», варта заўважыць, азначаюць выкарыстанне няўстойлівай і часцяком мудрагелістай прававой сістэмы супраць чыіхсьці апанентаў.

Паўлоўскі з'яўляецца таксама вядучым распрацоўшчыкам так званых контррэвалюцыйных тэхналогій, якія апошні час былі задзейнічаны для гарантаванай перадачы ўлады Мядзведзеву. Тэхналогіі кланавання перанеслі з палітычных партый на фальшывыя маладзёжныя групы і няўрадавыя арганізацыі. У 2006 г. у Расіі быў прыняты закон, які ўскладніў дзейнасць няўрадавых арганізацый (НУА), фінансаваных з-за мяжы, а таксама іх нейтральных мясцовых НУА. Затым Крэмль пачаў стварэнне сеткі НУА, лаяльных Пуціну. У час парламенцкіх выбараў у снежні 2007 г. Маскву запаланілі актывісты злавеснага моладзевага руху «Наши». Улады сарвалі дзейнасць місіі назіральнікаў ад Арганізацыі бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе (АБСЕ), выдаўшы яе прадстаўнікам толькі 70 віз замест 450, як гэта было на папярэдніх выбарах. Незалежныя ўнутраныя арганізацыі па назіранні за выбарамі, накшталт «Голаса», не былі дапушчаны на выбарчыя ўчасткі, якія аказаліся закрытыя для ўсіх, апрача прадстаўнікоў палітычных партый. Незалежных арганізатараў апытанняў на выхадзе з выбарчых участкаў замянілі на ўдзельнікаў маладзёжнай праграмы «Нашы выбары» (назва якой намякала на тое, што апытанням, арганізаваным замежнікамі, давяраць не варта) і больш чым залежнымі Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі ды фондам «Грамадская думка». Гэтыя захады дазволілі зрабіць выкарыстанне «адміністрацыйнага рэсурсу» (яшчэ адзін эўфемізм, які азначае выбарчыя фальсіфікацыі і ціск) прыметна больш грубым, чым на папярэдніх выбарах.

На той час у Расіі не існавала ніякіх рэальных перспектыў для нечага падобнага да ўкраінскай «каляровай рэвалюцыі», але рэжым працягваў прымяненне прэ-

[3] Гэтае і далейшыя выказванні паходзяць з асабістых інтэрв'ю Э. Уілсана і яго калег, узятых 16, 17 і 19 снежня 2007 г. у Маскве.

вентыўных захадаў. У Маскве актывісты «Нашых», адзетыя ва уніформу, групамі дваццаць-трыццаць чалавек разгульвалі па метро і цэнтральных праспектах. Яны таксама занялі галоўныя плошчы, хоць большая частка Краснай плошчы засталася закрытая. Блізкая Манежная плошча, улюбёнае месца масавых дэманстрацый, была запоўнена прыхільнікамі «Нашых», якія сабраліся на вулічны канцэрт папулярнай музыкі, арганізаваны на ўзор кіеўскіх канцэртаў часу аранжавай рэвалюцыі, але прафундаваны Крамлём.

Мядзведзеў пакуль не адмовіўся ні ад адной з гэтых тэхналогій — больш за тое, ён сустракаўся з «Нашымі» ў іх штогадовым летніку. Ён можа распусціць «Нашых» пасля выбараў, каб прадэманстраваць свае ліберальныя прыхільнасці, але, з другога боку, у сакавіку яму была патрэбна вялікая перамога, каб даць рады патэнцыйным выклікам з боку іншых эліт — і ў выніку выйсці з ценю Пуціна.

## ЯК БУДЗЕ ПРАХОДЗІЦЬ СУПРАЦОЎНІЦТВА З ПУЦІНЫМ?

У канцы 2007 г. на рэкламных шчытах па ўсёй Расіі з'явіліся плакаты з лозунгам «План Пуціна — перамога Расіі!». Але яны не давалі ніякага тлумачэння, у чым заключаецца гэты план. Прычына — жаданне Пуціна захоўваць элемент сакрэтнасці да самага апошняга моманту, каб пазбегнуць статусу «кульгавай качкі». Другім яго прыярытэтам было захаванне палітычнага і эканамічнага балансу паміж разнастайнымі кланамі, якія складаюць эліту. З аднаго боку, Пуцін хоча зацугляць найбольш магутны клан на чале з Ігарам Сечыным, як паведамляецца, былым супрацоўнікам КДБ, які ўспрымаецца як крамлёўскі «судовы прыстаў» пасля арганізацыі расправы над нафтавай кампаніяй «Юкас» у 2002—2003 гг. і перадачы большасці яе актываў «Раснафце» на чале з самім Сечыным. З другога боку, былы прэзідэнт не хоча шумнага вяртання «старых алігархаў» 1990-х гг., некаторыя з якіх засталіся блізкія да Мядзведзева. Пуцінская сістэма ў значнай ступені грунтуецца на негатыўным успрыманні ўсяго і ўсіх, звязаных з 1990-мі. Паплечнікам Мядзведзева Аляксандру Валошыну і Анатолю Чубайсу, якія абодва адыгрывалі вялікую ролю ў ельцынскай адміністрацыі, а цяпер працуюць у РАТ «АЭС», такім чынам, будзе строга рэкамендавана захаваць свой нізкі статус.

Калі б Пуцін выбраў пераемніка з магутнай групоўкі Сечына, гэта парушыла б палітычную раўнавагу праз канцэнтрацыю надта вялікай улады ў межах аднаго клана. Аднак нават і без прэзідэнцкай пасады сілавікі Сечына дастаткова магутныя для таго, каб процістаяць Мядзведзеву, які з'яўляецца чалавекам Пуціна і пакуль яшчэ не займеў уласнага клана. Галоўным матывам Пуціна пры выбары Мядзведзева было імкненне захаваць баланс сістэмы, а зусім не раптоўнае жаданне змяніць курс Расіі, якога яна трымалася з 2003 г. Апроч таго, гэты выбар можа тлумачыцца імкненнем захаваць такую раўнавагу, якая забяспечвае знаходжанне Пуціна на пасадзе прэм'ер-міністра.

Пуцінскі план з'яўляўся на свет «кавалкамі» не толькі дзеля жадання захаваць

вакол адыходнага прэзідэнта трывалую аўру таямніцы, але і таму, што ён стварайся на ходу. У розны час паралельна разглядалася шмат канкурэнтных сцэнараў. Некаторыя з іх былі заклiканы, відаць, толькі заблытаць публіку (гл. табліцу 1), але канчатковы выбар, хутчэй за ўсё, не быў вызначаны наперад. У лістападзе 2005 г. Пуцін, як уяўляецца, ухваліў правядзенне папярэдняга спаборніцтва паміж «ліберальным» Мядзведзевым і сілавіком, міністрам абароны Сяргеем Івановым. У верасні 2007 г., калі Іваноў, відаць па ўсім, узяў верх над Мядзведзевым, які спачатку быў лідэрам, Пуцін раптоўна прызначыў прэм'ер-міністрам Віктара Зубкова. Тады сілавікі пачалі прасоўваць іншыя варыянты, у прыватнасці спрабуючы падштурхнуць Пуціна пайсці на трэці тэрмін. «План Пуціна» праясніўся толькі тады, калі ён 2 кастрычніка 2007 г. абвясціў пра рашэнне ўзначаліць спіс «Адзінай Расіі» на будучых думскіх выбарах. Пазней гэта сталася зарукай яго наступнага прызначэння прэм'ер-міністрам.

Пасля таго, як план Пуціна быў рэалізаваны, «Адзіная Расія» прадказальна атрымала безумоўную перамогу на выбарах, набраўшы 64 % галасоў выбаршчыкаў і заняўшы 315 месцаў у Думе з 450. Была прынята ідэя будучага прэм'ерства Пуціна. Але ці застанецца гэты план дзейсным у сярэднетэрміновай перспектыве? Людзі Пуціна ўвесь час імкнуцца ўмацаваць дзеянне інстытуцыйных і фінансавых стымулаў, якія яднаюць розныя кланы, што кіруюць Расіяй. Да таго ж цяпер яны маюць магутную страхоўку ў выглядзе канстытуцыйнай большасці ў Думе. Памятаючы, як яны адхілілі ад улады сваіх праціўнікаў з ельцынскай эпохі, яны хочуць гарантаваць, каб іх пераемнікі не абышліся гэтак жа і з імі. Паводле слоў расійскага журналіста Андрэя Золатава, людзям Пуціна

*як паветра былі неабходны дзве траціны ў Думе, паколькі яны ведаюць, якімі пераемнікамі былі яны самі [у дачыненні да Ельцына], таму я ўпэўнены, што яны падбаюць пра самыя разнастайныя стрымванні і процівагі для сваіх пераемнікаў.*

Але па-ранейшаму застаецца шмат праблем з ідэяй будучага супрацоўніцтва прэзідэнта Мядзведзева і прэм'ер-міністра Пуціна. У расійскай палітычнай культуры ўлада, як правіла, знаходзіцца толькі ў адных руках. Канстытуцыя ў пытаннях балансу ўладаў адназначна выказваецца на карысць прэзідэнта; магчыма, такі бок урэшце зоймуць і сродкі масавай інфармацыі. Незразумела таксама, хто ўрэшце захавае ўплыў на спецслужбы і сілавыя міністэрствы. Меркаваная карціна супрацоўніцтва паміж прэзідэнтам і прэм'ер-міністрам не дае адказу на пытанне, хто будзе кантраляваць патранажныя сеткі ў расійскай сістэме. Расійская эліта заўсёды трымае нос па ветры, але пакуль што ня ясна, куды гэты вецер павее. Дылему выразна акрэсліў карэспандэнт выдання «Economist» Аркадзь Астроўскі: «Ці будзе прэм'ер-міністр Пуцін кіравацца традыцыяй і трымаць на сцяне партрэт прэзідэнта Мядзведзева?» На прэс-канферэнцыі ў лютым Пуцін сказаў, што не будзе, і нават не выключыў магчымасці ўрэшце вярнуцца на пасаду прэзідэнта.

Найбольш непрадказальнымі выглядаюць паводзіны клана Сечына, які не мае акрэсленай пазіцыі ў дачыненні да новага дуумвірату. Няясна, што канкрэтна было паабяцана прадстаўнікам гэтага клана, але, ведаючы заклопачанасць Пуціна захаваннем раўнавагі, можна дапусціць, што яны атрымаюць ад змены ўлады тыя ці іншыя выгады. Калі ж гэтага не здарыцца, пазіцыі Мядзведзева апынуцца пад яўнай пагрозай.

## ЦІ СТАНЕ МЯДЗВЕДЗЕЎ САМАСТОЙНЫМ ПАЛІТЫКАМ?

Ацэньваючы магчымыя падзеі, варта памятаць, што гэта не першы выпадак перадачы ўлады з адных рук у другія. Некаторыя прыклады з гісторыі прыходу да ўлады самаго Пуціна могуць даць ключ да адказу на вышэйпастаўленае пытанне.

**Табліца 1.** Аперацыя «Пераемнік 2.0»

| Планы, ад якіх Пуцін адмовіўся | | |
|---|---|---|
| **Альтэрнатывы Мядзведзеву** | **Плюсы для Пуціна** | **Мінусы для Пуціна** |
| **Прэзідэнт Іваноў**<br>Былы міністр абароны Сяргей Іваноў лічыўся галоўным канкурэнтам Мядзведзева падчас выбару пераемніка ў 2005—2007 гг. | Прыхільнасць Іванова да этатысцкага нацыяналізму і жорсткай замежнай палітыкі Пуціна апошніх гадоў. | Прэзідэнт з асяроддзя сілавікоў парушыў бы раўнавагу сістэмы. Іваноў і Сечын не былі блізкія: Сечын аддаваў перавагу трэцяму тэрміну Пуціна, а Іваноў хацеў сам быць прэзідэнтам. Іваноў не мае дачынення да энергетычнай эканомікі. |
| **«Тэхнічны прэзідэнт»**<br>Новы прэм'ер-міністр Віктар Зубкоў меўся заняць прэзідэнцкую пасаду ў якасці «зіц-старшыні» ў чаканні вяртання Пуціна. | Зубкоў выключна лаяльны. Зубкоў старэйшы за Пуціна (нар. у 1941 г.), такім чынам ён у любы момант мог быць вызвалены ад сваіх абавязкаў па стане здароўя. Зубкоў, як былы кіраўнік Федэральнай службы па фінансавым маніторынгу, — ключавая фігура «сістэмы кампрамату». | Зубкоў быў бы яўнай марыянеткай, што занадта падрывала б дух, калі не літару Канстытуцыі. |
| **Трэці тэрмін Пуціна** | Найбольш аптымальны варыянт для сілавікоў у выпадку змяншэння шанцаў Іванова. | Неабходнасць змянення Канстытуцыі. Негатыўная рэакцыя Захаду. Набыццё занадта вялікага ўплыву сілавікамі. |
| **Расійскі Дэн Сяапін**<br>Пуцін сыходзіць з пасады, але пакідае ў сваіх руках рычагі ўлады. | Адсутнасць патрэбы мяняць Канстытуцыю. | Нефармальная ўлада не ў пашане расійскай традыцыі. Неабходнасць звышвысокай падтрымкі пуцінскай партыі на выбарах у снежні 2007 г. Эфектыўнасць «плана Пуціна» на справе была не такая і ашаламляльная: «Адзіная Расія» здабыла толькі 10 % дадатковых галасоў у небездакорных выбарах. |
| **«Справядлівая Расія»**<br>Новая віртуальная партыя, створаная ў кастрычніку 2006 г., за якой стаіць група Сечына. | Стварэнне бачнасці палітычнай канкурэнцыі. | Не выйсце для самаго Пуціна. Рызыка, што віртуальная барацьба за ўладу ператворыцца ў рэальную. |

Працяг табліцы.

| | | |
|---|---|---|
| **«Газпром»: Пуцін мяняецца пасадамі з Мядзведзевым** | Пуцін апынуўся б на чале самай багатай расійскай кампаніі. | Ён надалей ураўнаважваў бы «ліберальнага» прэзідэнта Мядзведзева, паколькі кампанія кантралюецца пераважна тым самым уладным кланам. Замест гэтага ў лютым 2008 г. Мядзведзева ў «Газпроме» замяніў Зубкоў. Большы націск на «Газпром» з мэтай паляпшэння яго іміджу, з гэтай прычыны адмова ад такіх схем, як у выпадку паставак газу ва Украіну праз «РусУкрЭнерга». |
| **Дырэктар ФСБ** | Пуцін сканцэнтраваў бы ў сваіх руках значную ўладу, працуючы на ранейшай рабоце. | Цяжка зноў увайсці ў адну і тую раку. |
| **Сцэнар Мілошавіча**<br>Пуцін робіцца прэзідэнтам лядашчай Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, абвешчанай у 1997 г. | Гэта дазволіла б Пуціну захаваць сваю ўладу падобна да таго, як гэта зрабіў у 1990 г. Мілошавіч, калі памяняў прэзідэнцтва Сербіі на пасаду югаслаўскага лідэра. Меркавалася, што беларускі прэзідэнт Лукашэнка пагодзіцца на такі варыянт, калі паўздзейнічаць на яго пернікам (грошы) і бізуном (кампрамат). | Лукашэнка да гэтага часу паспеў значна ўмацаваць сваю ўладу. Узніклі б канстытуцыйныя праблемы пры далучэнні Беларусі да складу Расіі. Ельцын думаў пра такі самы крок; прымета адчаю. |
| | **І план, які Пуцін выбраў** | |
| **Узначальванне партыйнага спісу «Адзінай Расіі»**<br>Пуцін робіцца прэм’ер-міністрам. | Партыя — магутны магніт, здольны пашыхтаваць патэнцыйна супярэчлівыя часткі палітычнай сістэмы. «План Пуціна» прынёс ёй канстытуцыйную большасць у Дзяржаўнай Думе. Пуцін застаецца ў ролі «памочніка» Мядзведзева. Пуцін можа кантраляваць доступ да ўлады сілавікоў. | Канстытуцыя 1993 г. дае вельмі шырокія паўнамоцтвы прэзідэнту. Два лідэры будуць мець праблемы з кіраваннем СМІ. Улада непазбежна будзе кансалідавацца вакол прэзідэнта Мядзведзева, незалежна ад таго, наколькі ўдзячны ён будзе Пуціну. Зусім няясныя пазіцыі групы Сечына ва ўмовах дуумвірату. |

У 2000 г. палітычныя тэхналогіі дапамаглі замаскаваць адначасовую патрэбу рэжыму ў пераемнасці і ў зменах. Гэты парадокс адлюстраваўся ў заблытанасці працэсу перадачы ўлады. У самы першы дзень пасля заступлення на пасаду Пуцін падпісаў указ аб імунітэце для Ельцына. Большасць галоўных членаў «старой гвардыі» 1990-х заставаліся на сваіх пасадах на працягу года, але самыя магутныя апекуны «Сям’і» пратрымаліся значна даўжэй. (Пад «Сям’ёй» маецца на ўвазе як даслоўна сям’я Ельцына, уключаючы яго дачку і ўплывовага зяця Валянціна Юмашава, так і алігархі, чые інтарэсы яны абаранялі.) Напрыклад, паплечнік Ельцына Аляксандр Валошын заставаўся кіраўніком крамлёўскай адміністрацыі да кастрычніка 2003 г., а Міхаіл Касьянаў працаваў прэм’ер-міністрам да лютага 2004 г. Нават першыя захады Пуціна супраць алігархаў былі абмежаваны канкрэтнымі асобамі — Уладзімірам Гусінскім, які выкарыстоўваў сваю ме-

дыяімперыю супраць новага прэзідэнта, і Барысам Беразоўскім, які выхваляўся, што гэта ён «зрабіў» новага прэзідэнта.

Але, пабыўшы нейкі час на пасадзе, Пуцін змог парваць са старым рэжымам. Сам Пуцін быў асноваи усіх пераўтварэнняў. Ён прадстаўляў як старую «Сям'ю» (для якой у свой час выконваў шэраг жыццёва важных паслуг дзеля абясшкоджвання канкурэнтаў), так і шырокія колы санкт-пецярбургскіх чыноўнікаў ды супрацоўнікаў КДБ, цяпер перайменаванага ў ФСБ (Федэральную службу бяспекі). Паплечнікі Пуціна арганізавалі так званую «справу «Юкаса», каб змяніць правілы гульні і стварыць новы баланс у вярхах расійскага грамадства. Нейтралізаваўшы Міхаіла Хадаркоўскага, уладальніка «Юкаса» (чыё багацце, ацэненае на 8 мільярдаў долараў, рабіла яго тады найбагацейшым чалавекам у Расіі), сілавікі расчысцілі сабе шлях да ўлады, паскорылі перадзел маёмасці і распачалі папулісцкую кампанію помсты ельцынскім багатырам, якая адыграла ключавую ролю ў перавыбранні Пуціна ў 2004 г. За кулісамі, аднак, алігархі былі заменены «сілавархамі», ці «сілагархамі» (гл. пералік кланаў у табліцы 2)[4]. Галоўны арганізатар кампаніі супраць «Юкаса» Ігар Сечын, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта, у ліпені 2004 г. быў назначаны старшынём савета дырэктараў ААТ «Раснафта». У снежні 2004 г. «Раснафта» набыла галоўны актыў «Юкаса» — кампанію «Юкаснафтагаз». Іншымі актывамі, адабранымі ў алігархаў «сілагархамі», былі «Аэрафлот» (ад Беразоўскага перайшоў да Віктара Іванова) і «АўтаВАЗ» (ад Беразоўскага дастаўся Сяргею Чармезаву). Узлёт «сілагархаў» быў таксама абумоўлены падтрыманым Крамлём стварэннем буйных дзяржаўных і напаўдзяржаўных карпарацый, накшталт «Аб'яднаная авіябудаўнічая карпарацыя» і «Аб'яднаная судабудаўнічая карпарацыя». Сам Мядзведзеў быў старшынём савета дырэктараў «Газпрома» — кампаніі, якая ўяўляе з сябе амаль што «дзяржаву ў дзяржаве» і валодае ўласнымі СМІ (холдынг «Газпром-медыя»[5]), прыкладна семнаццацю камерцыйнымі банкамі, а таксама кантрольным пакетам былой кампаніі Рамана Абрамовіча «Сібнафта», пазней перайменаванай у «Газпром-нафта». У ліпені 2007 г. Дзяржаўная Дума нават прыняла закон, які дазволіў «Газпрому» мець уласныя ўзброеныя фармаванні.

Пад канец другога тэрміну Пуціна гэтыя эканамічныя імперыі кантралявалі трацяціну расійскага ВУП. Палітыка пры Пуціну заключалася на справе не ў процістаянні «лібералаў» і «нацыяналістаў», а ў складаным узаемадзеянні паміж рознымі кланамі, якія карміліся з розных бакоў карыта, прычым іх канкрэтная канфігурацыя ўвесь час мянялася. Але да 2007 г. утварылася больш-менш выразная «лінія фронту». Найбольш магутную групу бізнесоўцаў-сілавікоў узначальвае Ігар Сечын. Падобна да першых міністраў ці прыдворных канцлераў XVII стагоддзя, улада Сечына вынікае з яго блізкасці да першай асобы і магчымасці кантраляваць інфармацыю, якую атрымлівае прэзідэнт, а таксама выкананне зробленых ім даручэнняў.

[4] Treisman Daniel. Putin's Silovarchs // Orbis. Vol. 51. No. 1 (Winter 2007). P. 141—153; даступна ў інтэрнэце: www.pacificcouncil.org/pdfs/Silovarchs.pdf.

[5] Некаторыя з гэтых СМІ цяпер кантралюе банк «Расія».

Гэтую ролю пры Пуціну Сечын выконвае з пачатку 1990-х гг., калі Пуцін быў віцэ-мэрам Санкт-Пецярбурга. Другая крыніца ўлады Сечына абумоўлена спалучэннем эканамічнай і палітычнай магутнасці, атрыманай пасля «справы «Юкаса».

Аднак сілавікі не ўтвараюць адзінага клана. Другая групоўка сілавікоў любіць называць сябе «сапраўднымі чэкістамі» і спрабуе ажыццяўляць палітыку праз уплыў на прэзідэнцкую службу бяспекі, пракуратуру, Федэральную службу кантроля за абарачэннем наркотыкаў. Старая «Сям'я» вымушана выжываць; сёй-той у выгнанні, як Беразоўскі, іншыя ж, як Анатоль Чубайс і Аляксандр Валошын, — ва «ўнутранай ссылцы» ў «Адзіных энергетычных сістэмах». Захоўвае ўплывовыя пазіцыі невялікая група пост'юкасаўскіх лібералаў накшталт Аляксея Кудрына на чале Міністэрства фінансаў і Сяргея Ігнацьева — старшыні Цэнтрабанка. Дасведчаныя бізнесмены накшталт Рамана Абрамовіча паспяхова трымаюцца дзякуючы сувязям ва ўсіх лагерах.

У першы перыяд знаходжання на пасадзе над Мядзведзевым таксама будуць дамінаваць кланавыя канфлікты. У свой час ён таксама можа распачаць сваю «справу «Юкаса», але спачатку, як некалі і Пуцін, ён павінен будзе прыстасоўвацца да наймацнейшых груповак адыходнай эліты. У 1999—2000 гг. такой групоўкай была «Сям'я»; у 2007—2008 гг. гэта сечынскія сілавікі, якія, як уяўляецца, выкарыстоўваюць палітычную няпэўнасць вакол спосабу перадачы ўлады для самаўзвышэння пры дапамозе паліттэхналогій і ФСБ. У жніўні 2007 г. яны прад'явілі нафтавай кампаніі «Руснафта» (кошт якой ацэньваецца на 8—9 мільярдаў долараў) драконаўскія падатковыя патрабаванні і паспяхова сканфіскавалі яе ў ранейшага ўладальніка Міхаіла Гуцарыева. Адчуўшы рост свайго ўплыву, сілавікі нават арыштавалі следчага Федэральнай службы кантроля за абарачэннем наркотыкаў, узначаленую Віктарам Чаркесавым, які меў заданне расследаваць іх датычнасць да мытных афер (справа «Трох кітоў»). Гэты эпізод прымусіў Пуціна выступіць з публічным заклікам да адзінства. Нарэшце, групоўка Сечына пачала паглядаць у бок Стабілізацыйнага фонду — сховішча расійскіх энергетычных звышдаходаў, які дасягнуў у лістападзе 2007 г. памеру 147,6 мільярда долараў. Як паведамляецца, Сечын націснуў на новага прэм'ер-міністра Зубкова, каб той у верасні адправіў у адстаўку міністра фінансаў Аляксея Кудрына. Справа дайшла да таго, што вымушаны быў умяшацца сам Пуцін (Кудрын быў першым прызначэнцам Пуціна ў Крамлі і ўвесь час захоўваў лаяльнасць адыходнаму прэзідэнту). Кудрын утрымаў свае пазіцыі, але ў лістападзе абвінавачанні ў карупцыі і спробе раскрадання 43 мільёнаў долараў былі вылучаны супраць яго намесніка Сяргея Старчака. Чакаецца, што Мядзведзеў возьмецца бараніць лібералаў, як толькі стане прэзідэнтам.

Найбольш уражваюць чуткі пра тое, што Сечын стаяў за крокамі, скіраванымі супраць самаго Пуціна. Станіслаў Бялкоўскі, які дапамог распачаць першую справу супраць «Юкаса», 12 лістапада заявіў у газеце «Die Welt», што прэзідэнт патаемна нахапаў асабісты капітал памерам не менш як 41 мільярд долараў[6]. 30 ліста-

[6] Warum Putin gar nicht Präsident bleiben will // Die Welt, 12 November 2007, www.welt.de/politik/article1352592/Warum_Putin_gar_nicht_Praesident_bleiben_will.html.

пада ў інтэрнеце з'явіўся даклад Марыны Салье за 1992 г. пра карупцыйныя замежнагандлёвыя здзелкі Пуціна падчас яго працы ў санкт-пецярбургскай мэрыі. Гэта выглядала своеасаблівым публічным папярэджаннем канкуроўным групоўкам не разгойдваць лодку, і персанальна Пуціну ці, хутчэй, Мядзведзеву, — не прасоўваць ніякага маштабнага «ліберальнага адраджэння». Гэтае папярэджанне таксама азначала, што пуцінская сістэма можа быць скіравана супраць самога Пуціна і што нават прэзідэнт можа быць уразлівым для кампрамату. Беручы пад увагу ступень празрыстасці «Газпрому», якая пакідае жадаць лепшага, можна быць упэўненым, што Мядзведзеў у гэтым сэнсе не менш уразлівы[7]. Паўлоўскі нават загаварыў пра «кіраваную нестабільнасць», калі сілавікам Сечына так і не ўдалося дамагчыся свайго.

**Дзмітры Мядзведзеў па-ранейшаму паслухмяны раб сістэмы, у якой улада грунтуецца на сумнеўных гешэфтах і метадах, што непрымальныя ні для якой сапраўднай дэмакратыі.**

Пуцін наўрад ці можа дазволіць сабе пакінуць такі паклёп без адказу. Калі ўлічыць звычайныя расійскія стандарты амерты, гэта было фактычна абвяшчэннем вайны. Праз некалькі дзён раней невядомы бізнесовец Алег Шварцман заявіў у газеце «Коммерсантъ», што яго «Фінансгруп» валодае супольным венчурным фондам на 3,2 мільярда долараў, прычым гэтыя актывы былі набыты шляхам «аксамітнай рэпрыватызацыі» ад імя «блока сілавікоў» на чале з Сечыным[8]. Іншымі словамі, гэта было абвінавачанне ў тым, што сілавікі выкарыстоўвалі юрыдычны ціск і непамерныя падатковыя патрабаванні для паніжэння рыначнага кошту некалькіх вядомых кампаній, каб затым скупіць іх за паніжаныя цэны.

Не вельмі зразумела, ці меў да ўсяго гэтага дачыненне Мядзведзеў, хоць «Коммерсантъ» з 2006 г. належаў Алішэру Усманаву, які ўзначальвае «Газпромінвестхолдынг». Ці будзе прэзідэнт Мядзведзеў працягваць контратаку альбо пойдзе на замірэнне з сілавікамі? Без падтрымкі Пуціна Мядзведзеў не мае дастатковай вагі для большага ціску на Сечына. Аднак праз некалькі гадоў знаходжання на пасадзе ён можа назапасіць дастатковы палітычны капітал, каб ініцыяваць уласную вырашальную «справу «Юкаса».

## ЦІ БУДЗЕ ЗБЛІЖЭННЕ З ЗАХАДАМ?

Шмат людзей інтэрпрэтавалі выбар пераемнікам Мядзведзева як спробу палепшыць стасункі з Захадам — але ці варта чакаць, што Расія адмовіцца ад сваёй усё больш і больш канфрантацыйнай пазіцыі адносна ЕС?

[7] Блізкі сябар Мядзведзева Канстанцін Чуйчанка ўваходзіць у праўленне сумнеўнай кампаніі «РасУкрЭнерга», якая ў 2006 г. атрымала 800 мільёнаў долараў за пастаўкі газу ва Украіну, хоць яе роля, здаецца, была ненашмат большая, як проста адкрыць кран.

[8] «Партию для нас олицетворяет силовой блок, который возглавляет Игорь Иванович Сечин» // Коммерсантъ. 2007. 30 ноября.

Ёсць некалькі сігналаў на карысць такога сцэнару. Нядаўнія каментарыі Анатоля Чубайса наконт паляпшэння дачыненняў з ЗША і ЕС, магчыма, мелі прамацаць глебу. Павінны адыграць ролю і структурныя фінансавыя фактары. Мядзведзеў узначальвае «Газпром», уся бізнес-мадэль якога грунтуецца на гандлі з Заходняй Еўропай, у той час як «Раснафта», якая належыць сілавікам, паглядае ў бок Усходу.

Але калі зыходзіць з цяперашняга стану рэчаў, любыя чаканні хуткіх істотных змен у расійскай замежнай палітыцы будуць няправільныя. Адной з прычын гэтага з'яўляецца тое, што легітымнасць рэжыму грунтуецца на процістаянні ворагам, і цяперашнім такім ворагам ёсць Захад. Каб давесці, што ён з'яўляецца магутным пераемнікам, Мядзведзеў будзе вымушаны падтрымліваць гэты антаганізм.

Чаму ж Захад? Паводле слоў Фёдара Лук'янава, «ідэя нацыянальнага прэстыжу» вельмі важная для расійскай эліты.

*Увесь час гаворка ідзе пра павагу, пра гонар, пра тое, як нам удалося пераадолець нацыянальную катастрофу і як мы цяпер павінны прадэманстраваць усім, што мы зноў у страі.*

Пасля перамогі над унутранымі ворагамі накшталт алігархаў або чэчэнцаў, прынамсі на ўзроўні прапаганды, Крэмль пераключыўся на знешніх ворагаў. Як сцвярджае Лук'янаў, ён

*справакаваў вельмі моцную істэрыю, якая была накіравана супраць Захаду, а таксама супраць ворагаў унутры Расіі, — і гэта спрацавала.*

Паралельныя ідэі аб тым, што «Расія вяртаецца» і што Расія павінна быць моцнай у непрыхільным свеце, дзе яна аточана ворагамі, былі даведзены да крайнасці падчас другога тэрміну Пуціна. Асобныя спрэчкі з суседзямі былі б досыць нармальнай з'явай, але ў 2005—2007 гг. Расія пасварылася амаль з усімі. Больш за тое, палітычная эліта, здаецца, разглядала канфлікты — як дыпламатычныя, так і ваенныя, — як неабходную ўмову захавання народнай падтрымкі.

Яшчэ адным фактарам сталася тое, што шмат хто ў Крамлі пераканаў сябе ў рэальнасці змены ўлады ў Расіі на ўзор украінскай аранжавай рэвалюцыі 2004 г. Украінскія падзеі былі для расійскай эліты найгоршым з кашмараў. Яны рэзка аслабілі яе ўпэўненасць у тым, што расійская сістэма стабілізавалася пасля «Юкаса», і спалучалі ў сабе тры пагрозы, якіх эліта баялася найбольш: мабілізацыю нізоў, здраду эліт і знешні ўплыў. Шок паглыбіўся, калі неўзабаве пасля аранжавай рэвалюцыі, у студзені-лютым 2005 г., у найбуйнейшых расійскіх гарадах пачаліся дэманстрацыі супраць манетызацыі льгот. Гэта былі пратэсты зусім іншага характару, выкліканыя сацыяльна-эканамічнай незадаволенасцю, а не патрабаваннямі адкрытага грамадства, і ахоплівалі яны пераважна пажылых людзей. Але яны паказалі ўжо напужанаму Крамлю, што ён не мае поўнага кантролю над

вуліцай. Пасля таго як расійскія эліты пераканалі сябе, што «каляровыя рэвалюцыі» — заходняя змова супраць іх, яны пачалі разглядаць унутраную апазіцыю як «пятую калону», якую неабходна трымаць пад кантролем.

З гэтай прычыны ад 2005 г. палітычныя тэхналогіі ператварыліся ў «контррэвалюцыйныя тэхналогіі», закліканыя прадухіліць любую магчымую расійскую «электаральную рэвалюцыю» ў 2007—2008 гг. «Нашы», створаныя ў красавіку 2005 г., яўна мелі на мэце нейтралізаваць масавыя вулічныя дэманстрацыі ў Расіі. Паўлоўскі тлумачыць, што

*пасля падзей ва Украіне і Кіргізстане мы вымушаны былі змагацца за вуліцу. Нам давялося арганізаваць кагосьці на вуліцах, каб гэтая прастора не была запоўнена нашымі праціўнікамі. Для тых, хто захоча выйсці на вуліцы, мусіла быць ясна, што гэтае месца ўжо занятае.*

Нават калі Мядзведзеў сапраўды пажадае палепшыць дачыненні з Захадам, дэмантаж новай псеўдаідэалогіі расійскай веліччы зойме пэўны час; да таго ж гэта будзе звязана з палітычнай рызыкай прадэманстраваць слабасць перад краінамі, якія былі ўцягнуты ў нядаўнія канфлікты.

## ВЫСНОВЫ

Хоць перспектывы прэзідэнцтва Мядзведзева для Еўропы пакуль ня ясныя, ЕС не варта паўтараць сваіх памылак васьмігадовай даўніны, калі да ўлады прыйшоў Пуцін. Магчыма, Мядзведзеў сапраўды будзе дзелавы, дружалюбны і адносна ліберальны для Расіі, але лідэрам краін ЕС не варта ляцець навыперадкі да яго ў абдоймы. Ім варта прыхільна павітаць яго і нагадаць, што ён па-ранейшаму паслухмяны раб сістэмы, у якой улада грунтуецца на сумнеўных гешэфтах і метадах, што непрымальныя ні для якой сапраўднай дэмакратыі.

У першыя гады знаходжання на пасадзе сістэма будзе мець большы кантроль над Мядзведзевым, чым Мядзведзеў над ёй. Як паказана ў гэтым артыкуле, Крэмль дасведчаны ў касметычных зменах, якія ажыццяўляюцца, каб аслабіць крытыку з боку Захаду і, маніпулюючы дэмакратычнымі інстытутамі, умацаваць уладу. Улічваючы абмежаваныя магчымасці новага прэзідэнта, для ЕС было б наіўна і контрпрадукцыйна вітаць «новае аблічча» Расіі, як зрабілі большасць заходніх лідэраў, калі Пуцін замяніў нямоглага і некампетэнтнага Ельцына.

Але абачлівасць не павінна весці да бяздзеяння. Незалежна ад таго, ці будзе Мядзведзеў укараняць новыя мадэлі паводзін для Расіі ці не, ЕС павінен скарыстаць яго выбранне як каталізатар для трансфармацыі сваіх уласных шляхоў узаемадзеяння з Расіяй. Эра Пуціна была пазначана безупыннымі рознагалоссямі ўнутры ЕС у пытанні дачыненняў з Расіяй, якія часам набывалі пагрозлівы характар. Заступленне на пасаду Мядзведзева дае Еўрасаюзу шанец выпрацаваць узгодненую стратэгію і заснаваць новы падмурак для двухбаковых адносін. Каб высветліць, ці мае Мядзведзеў палітычную волю і ўплыў для наладжвання

**Табліца 2.** Галоўныя кланы ў асяроддзі расійскай эліты

| Назва | Прадстаўнікі |
|---|---|
| Група Сечына | Віктар Іваноў, памочнік Пуціна ў кадравых пытаннях, кіраўнік ААТ «Аэрафлот» і вайсковага канцэрну «Алмаз-Антэй»; намеснік прэм'ер-міністра Сяргей Нарышкін; міністр унутраных спраў Рашыд Нургаліеў. Магутны дырэктар ФСБ Мікалай Патрушаў «часам быў саюзнікам групы Сечына, часам не» (Валеры Салавей) |
| «Чэкісты» | Віктар Чаркесаў, старшыня Федэральнай службы кантроля за абарачэннем наркотыкаў; Юрый Чайка, генеральны пракурор |
| Вайскоўцы, хай-тэк | Сяргей Іваноў, Аб'яднаная авіябудаўнічая карпарацыя |
| Чыгунка | Уладзімір Якунін |
| Тэлекамунікацыі | Леанід Рэйман |
| Вайсковы экспарт | Сяргей Чармезаў |
| Старая «Сям'я» | Анатоль Чубайс, Аляксандр Валошын, «Адзіныя энергетычныя сістэмы Расіі» |
| Пост'юкасаўскія лібералы | Аляксей Кудрын, Сяргей Ігнацьеў |
| Лаяльныя «незалежнікі» | Раман Абрамовіч, Алег Дзерыпаска |

лепшых стасункаў, еўрапейскім лідэрам неабходна вылучыць шэраг супольных патрабаванняў. Іх стаўленне да Мядзведзева павінна вызначацца яго пазіцыяй у наступных пытаннях:

— энергазабеспячэнне: лідэрам ЕС варта прапанаваць Расіі адкрыта абмеркаваць з ЕС і ключавымі транзітнымі краінамі (Украінай, Беларуссю і, магчыма, Грузіяй) шэраг пытанняў, якія датычаць дыверсіфікацыі паставак, транзітных пошлін, а таксама несанкцыянаваных адбораў энерганосьбітаў;

— Косава: еўрапейскія лідэры павінны папрасіць Расію прызнаць судова-паліцэйскую місію Еўрасаюза ў якасці міжнароднага правапераемніка Місіі ААН у справах часовай адміністрацыі ў Косаве;

— Іран: лідэры Еўрасаюза павінны заклікаць Расію падтрымаць, а не сабатаваць дзейнасць групы Е 3+3 (Францыя, Германія і Вялікабрытанія плюс Кітай, Расія і ЗША). Яны таксама павінны настойваць на тым, каб МАГАТЭ прадоўжыла кантроль за сітуацыяй у Іране.

Улічваючы варожасць сілавікоў, найбольш магутнага палітычнага і эканамічнага клана ў Расіі, прызначэнне Мядзведзева з'яўляецца моцным выклікам для Пуціна. Першапачаткова паміж Пуціным і Мядзведзевым будзе больш палітыкі

пераемнасці, чым паміж Ельцыным і Пуціным, калі толькі сілавікі не змогуць кардынальна паўплываць на дасягнутыя паміж імі дамоўленасці. Ва ўсякім разе, сілавікі будуць чакаць ад Мядзведзева любых прыкмет слабасці. Еўрапейскія лідэры павінны зразумець гэта і засяродзіцца на тым, што Мядзведзеў робіць, а не на тым, што ён будзе гаварыць. Лідэры Еўрасаюза павінны захаваць разважнасць, але пры гэтым не ўпусціць ніводнага шанцу на рэальнае збліжэнне, каб не даць балаў расійскім прыхільнікам жорсткай лініі.

Для ЕС, як і для расійскіх эліт, крамлёўская «аперацыя «Пераемнік 2.0» стварае спалучэнне пераемнасці і няпэўнасці. Апошняя перадача ўлады, якая адбылася ў 1999 г., была дапоўнена значнымі ўзрушэннямі ў 2003, 2004 і 2005 гг. Пакуль «план Пуціна» знаходзіцца ў працэсе рэалізацыі, мы можам толькі выказваць здагадкі наконт магчымага зместу «плана Мядзведзева». Праз нейкі час новы прэзідэнт можа заявіць пра свае прэтэнзіі на самастойнасць праз новую «справу «Юкаса», хоць Захад спадзяецца на тое, што ён не будзе гэтак паўтарацца. Мядзведзеў юрыст, і еўрапейцам варта лавіць яго на слове, калі ён гаворыць пра важнасць умацавання ў Расіі законнасці. Калі Мядзведзеў зменіць расійскую практыку ажыццяўлення ўлады і пабудовы ўзаемаадносін з астатнім светам, гэта цалкам можа аказацца абумоўлена яго даўнім інтарэсам да права, які дасць пачатак пазітыўным зрухам.

Галоўнай прычынай няўдачы еўрапейскай палітыкі адносна Расіі ў эпоху Пуціна была тэндэнцыя канцэнтравацца на памкненнях і асобе прэзідэнта, а не на яго палітыцы і сістэме, якую ён увасабляе. Гэты падыход нашкодзіў інтарэсам Еўрасаюза. Замест таго, каб публічна абмяркоўваць асобу Мядзведзева, лідэрам ЕС варта было б надаць большую ўвагу яго палітыцы і мерам паляпшэння інстытуцыйных аспектаў двухбаковых адносін. Добрым пачаткам магло б стаць аднаўленне дзеяння Пагаднення аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж ЕС і Расіяй (ППС). Новыя спробы Расіі падзяліць і аслабіць ЕС павінны паслядоўна адпрэчвацца. Запрашэнне Польшчы на трохбаковы саміт з удзелам Расіі, Германіі і Францыі было б выразнай дэманстрацыяй новага калектыўнага падыходу Еўрасаюза. Нарэшце, ЕС павінен спрыяць сяброўству Расіі ў шматбаковых арганізацыях, але і адначасова выкарыстоўваць гэтае сяброўства для напаміну расійскім прадстаўнікам аб неабходнасці выконваць заключаныя дамоўленасці.

На працягу васьмі гадоў прэзідэнцтва Пуціна Еўрапейскаму Саюзу так і не ўдалося акрэсліць і адстаяць супольнай палітыкі ў дачыненні да адроджанай Расіі. Змена Пуціна на Мядзведзева дае еўрапейскім лідэрам новы шанец аб'яднацца вакол сумеснай стратэгіі; яны павінны скарыстаць гэты шанец, інакш зноў рызыкуюць не вытрымаць выпрабавання Расіяй.

*З ангельскай пераклаў Сяргей Петрыкевіч паводле www.ecfr.eu*

АНАЛІТЫКА

ПІРЭТ ЭХІН

# Палітычная падтрымка ў краінах Балтыі (1993—2004)

Часта можна пачуць нараканні на тое, што жыхары балтыйскіх краін расчараваліся ў палітыцы. У 2005 г. у штогадовым звароце да Сейма літоўскі прэзідэнт Валдас Адамкус назваў адчужэнне простых людзей ад палітыкі і «нарастаючы крызіс палітычнага даверу» двума галоўнымі выклікамі, якія стаяць перад нацыяй; латвійскія і эстонскія палітыкі і палітолагі выступаюць з аналагічнымі заявамі. «Палітычнае адчужэнне» стала ўлюбёным выразам, пры дапамозе якога тлумачацца розныя палітычныя феномены. У трох краінах Балтыі яўка на выбарах усіх узроўняў стала зніжаецца. У Эстоніі колькасць выбарцаў, што бяруць удзел у парламенцкіх выбарах, знізілася з 68 % у 1992 да 58 % у 2003 г., у Латвіі — з 90 % у 1993 да 62 % у 2006 г., і ў Літве з 75 % у 1992 г. да 46 % у 2004 г. Хуткаплыннасць выбарчых сімпатый і рэзкі ўздым партыяў, якія абяцаюць людзям «новую палітыку» (напрыклад, «Res Publica» ў Эстоніі, «Jaunais Laiks» («Новая эра») у Латвіі ці «Naujoji Sajunga» («Новы саюз») у Літве) з’яўляецца яшчэ адным сведчаннем грамадскай незадаволенасці існымі палітычнымі элітамі.

Дарма што ў шматлікіх даследаваннях, прысвечаных дэмакратычнай трансфармацыі ў краінах Балтыі, закранаюцца пытанні масавых палітычных прыхільнасцяў, каштоўнасцяў і палітычных паводзінаў, вельмі мала ўвагі надаецца даследаванню палітычнай падтрымкі і, наколькі мне вядома, дадзеныя апытан-

***Пірэт Эхін*** *— палітоляг, старшая дасьледчыца катэдры паліталёгіі ўнівэрсытэту ў Тарту. Нарадзілася ў 1976 у г. Рапла (Эстонія). Доктар філязофіі ўнівэрсытэту Арызоны (2002). У сфэру яе навуковых інтарэсаў уваходзяць грамадзкая думка, падтрымка рэжыму і палітычны давер у новых дэмакратыях Усходняй і Цэнтральнай Эўропы.*

няў у трох балтыйскіх краінах дагэтуль сістэматычна не ўжываліся для вывучэння гэтай праблемы. Ці трывалы давер жыхароў балтыйскіх краін да сваіх палітычных рэжымаў? Наколькі і якім чынам ён змяніўся цягам пятнаццаці гадоў незалежнасці? Ці існуюць паміж трыма балтыйскімі краінамі і этнічнымі групамі, што іх насяляюць, значныя разыходжанні ў сферы палітычнай падтрымкі? Гэтыя пытанні будуць разгледжаныя ў нашым артыкуле.

Дакладней, мэты гэтага артыкула дваякія. Першая — прапанаваць канцэптуальную схему для вывучэння палітычнай падтрымкі і вылучыць шэраг грамадскіх спадзяванняў на дэмакратычную трансфармацыю ў краінах Балтыі. Другая — выявіць адпаведныя аперацыйныя індыкатары для вымярэння кожнага са складнікаў палітычнай падтрымкі і акрэсліць эмпірычныя трэнды сярод гэтых вымярэнняў у трох краінах. Такім чынам, артыкул з'яўляецца канцэптуальным, эмпірычным і метадалагічным падмуркам для далейшых даследаванняў, якія апрабуюць канкрэтныя гіпотэзы наконт дэтэрмінантаў палітычнай падтрымкі пры дапамозе звестак індывідуальных апытанняў з выкарыстаннем шматвымернага аналізу.

Артыкул мае наступную структуру. У першай частцы змешчанае даследаванне літаратуры ў шырэйшым кантэксце параўнальнай палітыкі, а таксама тлумачыцца пяцімерная мадэль палітычнай падтрымкі. У другой частцы разглядаецца дынаміка чатырох з пяці вымярэнняў палітычнай падтрымкі ў балтыйскіх краінах з выкарыстаннем статыстычных звестак «New Baltic Barometer». Таксама будуць закранутыя метадалагічныя пытанні і абмеркаваная прыдатнасць наяўных сацыялагічных апытанняў для вымярэння палітычнай падтрымкі. У трэцяй частцы тлумачацца вынікі даследавання, а таксама робіцца спроба звязаць іх з існай літаратурай па масавых палітычных арыентацыях у Балтыі і Усходняй Еўропе.

## ПАЛІТЫЧНАЯ ПАДТРЫМКА ЯК ШМАТВЫМЕРНЫ ФЕНОМЕН

Цягам апошняга дзесяцігоддзя вывучэнне палітычнай падтрымкі ў сучасных дэмакратычных рэжымах ператварылася ў незалежную і разгалінаваную даследчую праграму. Грунтуючыся на ранейшых тэарэтычных і эмпірычных даследаваннях палітычнай культуры, палітычнага ўдзелу і легітымнасці, новая даследчая праграма засяроджваецца на дынаміцы і дэтэрмінантах масавай палітычнай падтрымкі. Яна імкнецца высветліць, якім чынам сучасныя дэмакратычныя рэжымы атрымліваюць ды захоўваюць легітымнасць і якія крытэры грамадзяне выкарыстоўваюць пры ацэнцы існых палітычных рэжымаў.

Гэты новы інтарэс быў выкліканы шэрагам чыннікаў. У сталых дэмакратыях ва ўсім свеце назіраецца небяспечная тэндэнцыя падзення падтрымкі палітычных рэжымаў і павелічэння скептыцызму да палітычных элітаў. Многія аналітыкі гавораць пра «новы стыль палітычнай актыўнасці грамадзян», які характарызуецца крытычным і ўсё больш патрабавальным стаўленнем да палітычных уладаў. Гэты феномен прыпісваецца павелічэнню «кагнітыўнай мабілізацыі»

простых грамадзян, абумоўленаму значным паляпшэннем іх адукацыйных магчымасцяў і лепшаму доступу да палітычнай інфармацыі. Ідуць таксама дэбаты аб узаемазалежнасці паміж эрозіяй грамадскага даверу да палітычнай улады і т. зв. крызісам звычайных формаў палітычнага ўдзелу ў развітых індустрыяльных дэмакратыях.

Новая хваля дэмакратызацыі таксама выклікала новы інтарэс да палітычнай падтрымкі. Посткамуністычныя рэжымы абралі розныя шляхі развіцця, ад кансалідаваных дэмакратый сярод новых членаў Еўрапейскага Саюза да кансалідаванага аўтарытарызму ў большасці постсавецкіх дзяржаў. Асэнсаванне таго, што дэмакратызацыя не з'яўляецца незваротным працэсам, прывяло да новых спробаў зразумець, якім чынам дэмакратычныя рэжымы заслугоўваюць давер сваіх грамадзянаў, і ажывіла старыя дэбаты аб уплыве масавых палітычных прыхільнасцяў на функцыянаванне дэмакратычных інстытутаў.

Цэнтральным у літаратуры па тэме (якой робіцца ўсё больш) з'яўляецца разуменне таго, што феномен палітычнай падтрымкі з'яўляецца шматвымерным. Больш аргументаў у падмацаванне гэтага цверджання распрацаваў Дэвід Істан, які правёў адрозненне паміж *аб'ектам* падтрымкі (палітычная супольнасць, рэжым, існыя палітычныя ўлады) і *тыпамі* падтрымкі (канкрэтная ці дыфузная). *Палітычная супольнасць* — гэта культурнае ўтварэнне, якое выходзіць за межы асобных фармальных структураў улады. *Рэжым* складаецца з тых фармальных інстытутаў, якія падтрымліваюць і пераўзыходзяць асобных палітычных *лідэраў*. *Дыфузная* падтрымка тычыцца глыбока ўкарэненага набору агульных стаўленняў да палітыкі, а *канкрэтная* падтрымка адлюстроўвае ацэнкі канкрэтных дзеянняў уладаў або вышэйшых службовых асобаў.

Сучасныя даследаванні грунтуюцца збольшага на класіфікацыі Істана, якая падкрэслівае шматвымернасць палітычнай падтрымкі. Піпа Норыс вылучае пяць узроўняў палітычнай падтрымкі (у парадку павелічэння ступені канкрэтнасці): падтрымка палітычнай супольнасці, прынцыпаў рэжыму, яго функцыянавання, палітычных інстытутаў і асобных палітыкаў[1].

Класіфікацыя Норыс грунтуецца на прыпушчэнні, што грамадскасць

*адрознівае розныя ўзроўні палітычнага рэжыму і часта цвёрда верыць у дэмакратычныя каштоўнасці, што выяўляецца, напрыклад, у крытычным стаўленні да канкрэтных палітычных захадаў дэмакратычнай улады.*

Гэтыя адрозненні важныя яшчэ і таму, што палітычныя наступствы грамадскага расчаравання ў палітыцы залежаць ад тыпу падтрымкі. Паводле Істана,

*не ўсе праявы неспрыяльных арыентацый маюць адно і тое самае значэнне для палітычнай сістэмы. Некаторыя з іх могуць не пагражаюць яе стабільнасці; іншыя могуць выклікаць фундаментальныя змены.*

[1] Norris, P. (ed.) Critical Citizens. Oxford University Press, 1999, P. 9.

Звычайна палітычныя наступствы масавага незадавальнення нарастаюць, калі аб’ект незадавальнення стаецца больш агульным. Дарма што непапулярнасць канкрэтнага палітычнага лідэра наўрад ці выкліча сур’ёзны крызіс легітымнасці, нізкія ўзроўні падтрымкі прынцыпаў рэжыму ці палітычнай супольнасці маюць шанцы прывесці да лёсавызначальных зменаў, рэвалюцыі ці грамадзянскай вайны.

Аднак гэтая канцэптуальная мадэль не стала агульнапрынятай. Яе крытыкі выказваюць сумнеў, ці здольныя простыя людзі размяжоўваць розныя вымярэнні палітычнай падтрымкі. Адрозна ад тонкіх градацый, прыдуманых палітолагамі, масавыя ўяўленні могуць быць значна менш выкшталцонымі. Таксама сцвярджаецца, што гэтая мадэль можа быць больш праблематычнай у маладых дэмакратыях, дзе абмежаваны досвед не дазваляе рэспандэнтам размежаваць доўгатэрміновыя характарыстыкі рэжыму ад кароткатэрміновых уплываў асобных урадаў ці палітычных лідэраў. Дарма што ў шэрагу доследаў пры дапамозе звестак «World Values Survey» («Сусветнага даследавання вартасцяў») было эмпірычна даведзена, што гэтыя аналітычныя адрозненні існуюць, тэарэтычныя і метадалагічныя дэбаты застаюцца далёкімі ад завяршэння. Нярэдкія й выпадкі канцэптуальнай блытаніны і спрэчнай аперацыяналізацыі ключавых пераменных. Розныя ўзроўні і тыпы палітычнай падтрымкі звязаныя паміж сабой, і трэба добра папрацаваць, каб вызначыць прыроду гэтай узаемасувязі[2]. Аднак у святле напрацовак, атрыманых у ходзе ранейшых даследаванняў, я разглядаю шматвымерную мадэль як спадзеўны зыходны пункт. Разрозненне асобных вымярэнняў падтрымкі дазволіць нам дыягнаставаць праблему (якая, несумненна, ёсць) больш дакладна і зрабіць значны крок насустрач яе вырашэнню. У наступных частках дадзенай працы будзе абмяркоўвацца ўжыванне гэтай мадэлі ў балтыйскім кантэксце, а таксама мы выведзем шэраг тэарэтычных палажэнняў з літаратуры.

## ПАЛІТЫЧНАЯ ПАДТРЫМКА Ў ЭТНІЧНА НЕАДНАРОДНЫХ КРАІНАХ

Любое ўжыванне мадэлі шматвымернай палітычнай падтрымкі ў балтыйскім кантэксце павінна ўлічваць этнічную неаднароднасць балтыйскіх грамадстваў. Тры пераважна расійскамоўныя этнічныя групы (расійцы, украінцы і беларусы) складаюць 29 % насельніцтва ў Эстоніі і 35 % у Латвіі[3]. Эстонія і Латвія маюць самы высокі ў Еўропе адсотак жыхароў, народжаных у іншай краіне і, нягледзячы на паскарэнне працэсу натуралізацыі напрыканцы 1990-х гадоў, доля негра-

[2] Напрыклад, Ліндэ і Экман (Linde, J., Ekman, J. Satisfaction with Democracy: A Note on a Frequently Used Indicator in Comparative Politics // European Journal of Political Research. № 42. 2003. P. 391—408) даводзяць, што задаволенасць эфектыўнасцю дэмакратычнай сістэмы абумоўленая актыўнай падтрымкай існай улады. Манро (Munro, N. Post-Communist Regime Support in Space and Time Context // Journal of Communist Studies and Transition Politics. № 18. 2002. P. 103—125) сцвярджае, што ацэнка эканамічнай сістэмы значна ўплывае на ўспрыманне палітычнай эфектыўнасці рэжыму.

[3] Звесткі Дэпартаменту статыстыкі Эстоніі (http://www.pub.stat.ee) і Галоўнага статыстычнага бюро Латвіі (прэс-рэліз ад 25 чэрвеня 2005 г., гл.: http://www.csb.lv).

мадзянаў (каля 20 % ад усяго насельніцтва) значна перавышае аналагічны паказнік большасці дзяржаў ЕС.

У прынцыпе, падтрымка палітычнай супольнасці можа не залежаць ад этнічнага чынніка (найлепшыя прыклады — Швейцарыя і ЗША). Аднак у большасці этнічна гетэрагенных грамадстваў сітуацыя выглядае інакш. У літаратуры па грамадскай падтрымцы часцяком ігнаруецца той факт, што ў этнічна неаднародных грамадствах абагульненыя звесткі нацыянальных апытанняў аб розных складніках палітычнай культуры не маюць вялікага сэнсу. Нешматлікія даследаванні, прысвечаныя вывучэнню ўласцівых таму ці іншаму грамадству этнічных адрозненняў у масавых палітычных прыхільнасцях сведчаць пра значныя адрозненні паміж этнічнымі групамі ў ацэнцы дэмакратычных інстытутаў, патрыятызму, палітычнай кампетэнцыі, сацыяльнага капіталу і міжасабовага даверу. Аналіз звестак «World Values Survey» па 16 этнічна гетэрагенных краінах паказвае, што з гледзішча пераменных палітычнай культуры этнічныя адрозненні ў адной краіне значна большыя, чым сукупныя адрозненні паміж краінамі. Той факт, што Эстонія і Латвія абралі мадэль нацыянальнай дзяржавы (nation-state) у якасці асновы выбудовы посткамуністычнай дзяржаўнасці, надае дадатковую імавернасць меркаванню, што там існуе «этнічная прорва» ў лаяльнасці да рэжыму. Іншымі словамі, ёсць паважныя падставы чакаць, што расійскамоўнае насельніцтва будзе ў меншай ступені прывязана да рэжыму, чый *raison d'être*, як запісана ў эстонскай канстытуцыі, «забяспечыць захаванасць эстонскай нацыі і культуры на вякі».

Замест пераказу зводных звестак агульнанацыянальных апытанняў у гэтым аналізе робіцца спроба дэканструяваць іх дзеля сістэматычнага разгляду этнічных адрозненняў унутры балтыйскіх краін. Я зыходжу з таго, што расійскамоўныя жыхары балтыйскіх рэспублік выявяць ніжэйшы ўзровень падтрымкі палітычных рэжымаў краін Балтыі, чым прадстаўнікі тытульных этнасаў. Гэтыя адрозненні павінны быць больш відавочныя ў Эстоніі і Латвіі, чым у Літве, якая мае больш гамагенны склад насельніцтва і прыняла іншую стратэгію нацыятварэння. Больш за тое, памер «этнічнай прорвы» ў падтрымцы рэжыму можна разглядаць як адзін з паказнікаў паспяховасці стратэгіі нацыянальнай інтэграцыі, праводжанай балтыйскімі рэжымамі. Можна чакаць, што розныя этнічныя групы будуць ацэньваць палітычную ўладу зыходзячы з таго, ці жывуць яны «падобным жыццём», абумоўленым рэаліямі пераходнага перыяду, ці падзяляюць асноўныя грамадскія нормы і чаканні, ці ўдзельнічаюць у адным і тым самым сацыяльным і палітычным дыскурсе.

## МАДЭЛІ ПАЛІТЫЧНАЙ ПАДТРЫМКІ Ў ПЕРАХОДНЫХ ГРАМАДСТВАХ

Пэўны шэраг прагнозаў наконт балтыйскіх трэндаў можна вылучыць з літаратуры аб палітычнай падтрымцы ў пераходных грамадствах. Так, ёсць дастатковыя падставы меркаваць, што доўгатэрміновая тэндэнцыя аслаблення палітычнага даверу, відавочная ў сталых дэмакратыях ва ўсім свеце, не павінна на-

зірацца ў грамадствах, якія паспяхова завяршылі пераход ад камунізму да дэмакратыі. Даследаванні, якія прааналізавалі, як новыя рэжымы здабываюць давер грамадзянаў, падкрэсліваюць ролю палітычных і эканамічных дасягненняў як ключавога фактару палітычнай падтрымкі. Ацэнкі рэжыму разглядаюцца як эндагенныя да палітычнай і эканамічнай сістэмаў. Іншымі словамі, лічыцца, што людзі добра паінфармаваныя дзейнічаюць рацыянальна, і што масавая ацэнка рэжыму адпавядае рэальным сумневам у яго эфектыўнасці. Зыходзячы з прыпушчэння пра рацыянальнасць грамадзянаў, задавальненне эканамічным становішчам у пераходных краінах павінна адпавядаць траекторыі літары U, адлюстроўваючы мадэль першапачатковага падзення вытворчасці з наступным паскарэннем [эканамічнага] росту, калі рэформы аказаліся паспяховыя. Кожная краіна дасягне найніжэйшай кропкі крывой у свой час, у залежнасці ад працяглі эканамічнага спаду. З улікам таго, што ўспрыняцце палітычных сістэм вызначаецца палітычнымі і эканамічнымі дасягненнямі, мы павінны назіраць падобную U-крывую ў справе задаволенасці палітычнымі рэжымамі балтыйскіх краін. Больш за тое, калі ацэнкі грунтуюцца на інфармаванасці і рацыянальнасці, можна спадзявацца, што пры ацэнцы дасягненняў нацыянальныя тэндэнцыі будуць суадносіцца з міжнацыянальнымі адрозненнямі. Агульная задаволенасць эфектыўнасцю рэжымам мае быць вышэйшая ў Эстоніі, дзе посткамуністычныя трансфармацыі суправаджалсія параўнальна меншым падзеннем вытворчасці, большымі тэмпамі росту ВУП і меншымі паказнікамі інфляцыі і карупцыі, чым у Латвіі і Літве[4]. Улічваючы гэтыя прыпушчэнні, мы прыступім да разгляду асобных вымярэнняў палітычнай падтрымкі, грунтуючыся на даступных статыстычных звестках з трох балтыйскіх краін.

## ПАЛІТЫЧНАЯ ПАДТРЫМКА Ў КРАІНАХ БАЛТЫІ

Паколькі гэты артыкул — адна з першых спробаў параўнальнага аналізу палітычнай падтрымкі ў краінах Балтыі, пару слоў варта сказаць пра адбор выкарыстаных звестак. Як часта бывае ў такім выпадку, ідэальных звестак не існуе: аніводны з даступных набораў шматнацыянальных звестак не быў прызначаны адмыслова для аналізу вымярэння палітычнай падтрымкі. Апытанні «World Values Survey» (Сусветнага даследавання вартасцяў, СДВ) улучаюць шэраг пытанняў пра стаўленне людзей да палітычных сістэмаў і палітычных элітаў. Сапраўды, звесткі з іх ужываюцца ў большасці даследаванняў шматвымернай мадэлі палітычнай падтрымкі. Аднак на момант напісання артыкула ў балтыйскіх краінах правялі толькі два апытанні СДВ з моманту набыцця імі незалежнасці — у 1996 і 1999 гадах. Такім чынам, звесткі СДВ не дазваляюць нам даследаваць доўгатэрміновыя тэндэнцыі палітычнай падтрымкі ў краінах Балтыі[5].

[4] Параўнанне макраэканамічных паказнікаў можна знайсці, напрыклад, у спавешчаннях Сусветнага Банку (2002) ці Праграмы развіцця ААН, гл.: http://hdr.undp.org/statistics.

[5] Гл.: http://www.worldvaluessurvey.org.

Найлепшай даступнай крыніцай падаецца праект «New Baltic Barometer» (Новы балтыйскі барометр, НББ) пад кіраўніцтвам прафесара Рычарда Роўза з Цэнтра вывучэння грамадскай палітыкі універсітэта Абэрдына (першапачаткова — універсітэта Стратклайд), у межах якога праводзяцца шматнацыянальныя апытанні. НББ — частка бягучай праграмы маніторынгу грамадскай рэакцыі на трансфармацыі ў 15 посткамуністычных грамадствах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і былога Савецкага Саюза. Прадстаўнікам кожнай нацыянальнасці задаюць аднолькавыя пытанні датычна іх палітычных упадабанняў, эканамічных паводзінаў і сацыяльных умоваў, ідэнтычнасцяў і мовы, якой яны карыстаюцца. У апытаннях ўлічваецца этнічная размаітасць балтыйскіх грамадстваў: у іх прадстаўленая значная выбарка расійскамоўных. Рэспандэнты самі выбіралі мову інтэрв'ю. Усяго было праведзена шэсць апытанняў НББ — у 1993, 1995, 1996, 2000, 2001 і 2004 гадах. У кожным з іх удзельнічала ад 1000 да 2000 рэспандэнтаў, апытаных метадам face-to-face у кожнай з краін Балтыі. Падрабязней пра апытанні можна даведацца на сайце http://www.balticvoices.org.

У гэтай частцы разглядаюцца тэндэнцыі палітычнай падтрымкі паводле чатырох з пяці вымярэнняў, прапанаваных Норыс (падтрымка палітычнай супольнасці, асноўных прынцыпаў рэжыму, яго эфектыўнасці і палітычных інстытутаў). Падтрымку асобных кіраўнікоў дзяржаў немагчыма вымяраць без адпаведных звестак апытанняў. Паколькі гэт артыкул з'яўляецца адной з першых спробаў прытарнавання гэтай мадэлі ў балтыйскім кантэксце, у гэтай частцы абгрунтуем выбар аперацыйных паказнікаў для вымярэння кожнага тыпу падтрымкі. Каб абмаляваць балтыйскія тэндэнцыі, я падам асобныя вынікі для тытульнай нацыі і расійскамоўных жыхароў кожнай з трох краін. Далей у тэксце пад «расійскамоўнымі» разумеюцца тыя, хто выкарыстаў расійскую мову пры адказах на пытанні НББ[6]. Азначэнні «эстонцы», «латышы» і «літоўцы» азначаюць прыналежнасць да этнасу, а не грамадзянства[7]. Падобным чынам, гэтыя групы былі акрэсленыя паводле мовы, на якой рэспандэнты адказвалі на пытанні.

[6] Дадзены крытэр — як і большасць іншых паказнікаў этнічнай прыналежнасці — мае патэнцыйныя абмежаванні. Падзел на тытульныя групы і расійскамоўных — гэта спрашчэнне. Відавочна, што «расійскамоўныя» з'яўляюцца разнароднай групай, што складаецца з расійцаў, украінцаў, беларусаў і г. д. Акрамя гэтага, нельга не ўлічваць магчымасць таго, што пры адказе на пытанні анкеты білінгвы маглі выкарыстаць мову, якая не адпавядае іх этнічнай самаідэнтыфікацыі. Тым не менш, было б рацыянальна чакаць, што большасць рэспандэнтаў абярэ родную мову для адказаў на пытанні вялікай і падрабязнай анкеты (асабліва з улікам таго, што расійскамоўныя жыхары Латвіі, Літвы і Эстоніі звычайна слаба валодаюць афіцыйнымі мовамі балтыйскіх дзяржаў).

[7] Такое ўжыванне адпавядае семантыцы гэтых тэрмінаў у мовах тытульных нацый балтыйскіх дзяржаў, напрыклад, слова «eestlane» (эстонскі) азначае этнічных эстонцаў і ніколі не выкарыстоўваецца ў якасці сіноніма праўнай катэгорыі «Eesti kodanik» (грамадзянін Эстоніі).

## ПАДТРЫМКА ПАЛІТЫЧНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

У ранейшых даследаваннях падтрымка палітычнай супольнасці выяўлялася пры дапамозе пытання, якое вымярала ступень нацыянальнага гонару. Ганс-Дытэр Клінгерман, напрыклад, выкарыстаў наступныя два пытанні з «World Values Survey» для вымярэння падтрымкі палітычнай супольнасці:

— *Наколькі вы ганарыцеся сваёй нацыянальнасцю (напрыклад, французскай)? (4) вельмі моцна ганаруся, (3) ганаруся, (2) мала ганаруся, (1) не ганаруся наагул;*
— *Натуральна, мы ўсе спадзяемся, што больш не будзе войнаў, але калі вайна ўсё ж пачнецца, ці будзеце вы змагацца са зброяй у руках за сваю краіну? (1) так, (0) не.*

Далейшы аналіз сведчыць пра тое, што балтыйскія дзяржавы маюць найніжэйшыя паказнікі даверу да палітычных супольнасцяў сваіх дзяржаў сярод 39 прааналізаваных краін, за выключэннем Германіі і Японіі. Аднак абодва гэтыя паказнікі з’яўляюцца праблематычнымі. Другое пытанне не ўлічвае гендэрных і ўзроставых стэрэатыпаў, а таксама адбівае (мілітарысцкае) уяўленне, што любоў да сваёй краіны прадугледжвае жаданне змагацца за яе са зброяй у руках. Першы, больш шырокаўжываны індыкатар нацыянальнага гонару таксама можа ўводзіць у зман. У шэрагу даследаванняў была адзначана праблематычнасць выкарыстання агульных замераў нацыянальнага гонару ў дзяржавах з нявырашанымі праблемамі дзяржава- і нацыябудавання, зыркімі прыкладамі чаго выступаюць Эстонія і Латвія. Выкарыстоўваючы звесткі СДВ ад 1990 да 1993 гг., Браян Д. Сільвэр і Кэтлін М. Доўлі давялі, што тытульныя нацыі ў краінах Балтыі дэманструюць высокі ўзровень гонару за сваю краіну, тым часам як іх расійскамоўныя жыхары займаюць у гэтым пытанні пазіцыю ад стрымана негатыўнай да непрыхавана варожай. Гэтак абодва аўтары прыйшлі да высновы, што ў большасці шматэтнічных грамадстваў агрэгатныя звесткі могуць аказацца бескарыснымі, бо яны выводзяць сярэднюю велічыню з выразна супрацьлеглых адказаў прадстаўнікоў асноўных этнічных групаў.

Тым не менш, праблема не толькі ў агрэгатных звестках, але ў больш фундаментальным пытанні важкасці аперацыйных індыкатараў. У краінах Балтыі, як і ва ўсёй Усходняй Еўропе, нацыянальнасць працягвае быць найперш этнічна абумоўленай культурнай катэгорыяй, а не грамадзянскай катэгорыяй, што грунтуецца на грамадзянстве і супольных інстытутах.

Так, расійскамоўны жыхар Латвіі, напрыклад, можа атрымаць латвійскае грамадзянства, але не будзе атаясамліваць сябе ці ўспрымацца іншымі як «латвіец», пакуль моўна і культурна не асімілюецца. Таму вымяраць ягоны гонар «латвійца» не мае сэнсу. Хоць паводле правілаў апытання СДВ адказы кшталту «я не латвіец/латвійка» дазваляліся, гэтыя «неадпаведныя» вартасці, як правіла, не ўлічваліся ў справаздачах пра вынікі апытання. Тым самым недарэчнае ўяўлен-

не аб этнічнай гамагеннасці і універсальным грамадзянстве зніжае каштоўнасць звестак, атрыманых у асобным апытанні СДВ.

Апытанне НББ прапануе альтэрнатыўныя крытэры вымярэння падтрымкі палітычнай супольнасці. Ад 1993 г. рэспандэнтам задавалі пытанне пра іх першасную і другасную калектыўную ідэнтычнасць. Аднак пасля апытання 1996 г. змянялася яго фармулёўка. Так, у першых трох апытаннях яно датычыла ідэнтыфікацыі з этнічнай групай (эстонцамі ці рускімі) ці жыхарамі пэўнага рэгіёну. Гэтае пытанне не з’яўляецца добрым вымяральнікам падтрымкі палітычнай супольнасці, бо тычыцца хутчэй этнічнай самаідэнтыфікацыі, а не падтрымкі канкрэтнай палітычнай структуры, напрыклад, літоўскай дзяржавы. Але ў пазнейшых апытаннях (2001 і 2004 гг.) выкарыстоўвалася іншая фармулёўка пытання. Замест таго, каб пытаць пра атаясамліванне чалавека з пэўнай групай, рэспандэнтаў прасілі адказаць пра іх стаўленне да пэўнай палітычнай ці геаграфічнай структуры — такой, як краіна ці рэгіён. У 2001 і 2004 гг. пытанне гучала наступным чынам:

*З чым вы найбольш атаясамліваеце сябе? З чым вы атаясамліваеце сябе ў другую чаргу (мясцовая грамада/горад, рэгіён, гэтая краіна, Еўропа, Расія, іншая краіна СНД, іншае)?*

Я мяркую, што ў балтыйскім кантэксце гэтае пытанне спрыяе адэкватнаму вымярэнню падтрымкі палітычнай супольнасці. Людзі, якія не атаясамліваюць сябе з краінай, дзе жывуць (ані ў першую, ані ў другую чаргу) дэманструюць ніжэйшы ўзровень нацыянальнай палітычнай супольнасці, чым тыя, хто атаясамлівае сябе. Брак згадкі балтыйскай дзяржавы як аб’екта самаідэнтыфікацыі не значыць непрыняцця гэтай дзяржавы — гэта можа проста паказваць меншае значэнне дзяржавы для індывіда ў параўнанні з іншымі аб’ектамі ідэнтыфікацыі. У кожным разе, гэтае пытанне закранае канцэпт, у цэлым падобны да эмацыйнай падтрымкі палітычнай супольнасці, апісаны Істанам, Норыс і інш.

Схема 1 ілюструе працэнт рэспандэнтаў паводле краіны і этнічнай групы, якая ідэнтыфікуе сябе з нацыянальнай палітычнай супольнасцю. Дзеля спрашчэння ўспрыняцця звестак вынікі апытання пададзены ў адным графіку. Пры вытлумачэнні вынікаў чытач, аднак, павінен улічваць дробнае (але патэнцыйна вельмі значнае) змяненне ў фармулёўцы пытання пасля 1996 г., пра што была гаворка вышэй. Не дзіва, што выніковая мадэль збольшага вызначаецца этнічнай прыналежнасцю. Амаль усе эстонцы, латышы і літоўцы пазначаюць сваю адпаведную балтыйскую нацыянальнасць як першасную ці другасную ідэнтычнасць, у той час, калі сярод расійскамоўных жыхароў гэтых краін назіраецца адваротная тэндэнцыя. Нязначнае зніжэнне ўзроўню нацыянальнай ідэнтыфікацыі тытульных груп у 2001 і 2004 гг. у параўнанні з ранейшымі перыядамі можна вытлумачыць зменай фармулёўкі пытання (ідэнтыфікацыя з «Эстоніяй», а не з «эстонцамі»). Неабходна адзначыць амаль поўную адсутнасць самаідэнтыфікацыі расійскамоўных жыхароў Эстоніі, Латвіі і Літвы са сваёй адпаведнай краінай. Цікавым фактам

стаюцца радыкальныя змены ў ідэнтыфікацыі сябе з літоўскай дзяржавай сярод расійскамоўных жыхароў Літвы паміж 2001 і 2004 гг. (у 2004 г. 53 % расійскамоўных літоўцаў абралі Літву першасным ці другасным аб'ектам самаідэнтыфікацыі пры асноўным выбары на карысць мясцовасці, рэгіёну ці іншай катэгорыі)[8].

**Схема 1.** Ідэнтыфікацыя з нацыянальнай палітычнай супольнасцю, 1993—2004 гг. Звесткі за 1993—1996 гг. паказваюць колькасць насельніцтва, што ідэнтыфікуе сябе найперш са сваёй балтыйскай нацыянальнасцю, а пасля з горадам, мясцовасцю, рэгіёнам ці тым, што падпадае пад катэгорыю «іншае». Пытанне гучала так: «Які з гэтых двух варыянтаў больш адпавядае таму, з чым вы сябе атаясамліваеце? Ці адчуваеце вы сябе часам членам любой іншай групы?» Звесткі за 2001 і 2004 гг. выяўляюць долю насельніцтва, якая атаясамлівае сябе з краінай у першую *або* другую чаргу — і пазначае тады як другі выбар пасля мясцовасці, рэгіёну ці «іншага». Пытанне было сфармуляванае наступным чынам: «З якім з ніжэйпералічаных варыянтаў вы сябе найбольш атаясамліваеце? Якім будзе ваш другі выбар? (мясцовая грамада/горад, гэтая краіна, Еўропа, Расія, іншая краіна СНД, іншае)».




Крыніца: «New Baltic Barometer», 1993—2004.

[8] Гэты вынік заслугоўвае большай увагі пры будучых даследаваннях. Дакладнасць гэтай лічбы неабходна праверыць пры дапамозе іншых параўнальных доследаў. Так, у выбарцы 2004 г. колькасць расійскамоўных рэспандэнтаў у Літве склала (не без падстаў) усяго толькі 222 чалавекі (у параўнанні з 891 этнічным літоўцам).

Калі расійскамоўнае насельніцтва балтыйскіх краін не атаясамлівае сябе з нацыянальнай дзяржавай, то з чым яны ідэнтыфікуюць сябе? Табліца 1 змяшчае вынікі апытання 2004 г. паводле ўсіх катэгорыяў адказаў. Расійскамоўныя жыхары Эстоніі і Латвіі падзяліліся амаль напалову паводле крытэру атаясамлівання сябе з мясцовай грамадой ці горадам (і, у меншай ступені, з рэгіёнам) і Расіяй (ці іншай краінай СНД). 66 % расійскамоўных эстонцаў атаясамліваюць сябе з мясцовасцю ў першую ці другую чаргу, для 72 % аб'ектам самаідэнтыфікацыі з'яўляецца Расія. Для расійскамоўных жыхароў Латвіі аналагічныя паказнікі складаюць адпаведна 81 % і 61 %. Толькі 3 % расійскамоўных жыхароў Эстоніі і 7 % расійскамоўных латвійцаў ідэнтыфікуюць сябе адпаведна з «Эстоніяй» і «Латвіяй». Іншая сітуацыя ў Літве, дзе расклад адказаў у 2004 г. быў амаль аднолькавы для прадстаўнікоў тытульнай нацыі і расійскамоўнай меншасці.

## ПАДТРЫМКА ПРЫНЦЫПАЎ РЭЖЫМУ

Для вымярэння падтрымкі асноваў дэмакратычнага рэжыму быў выкарыстаны шырокаўжываны індыкатар, які акрэслівае падтрымку дэмакратыі як непрыняцце аўтарытарнай альтэрнатывы[9]. Апытанне НББ вызначае падтрымку трох альтэрнатываў дэмакратыі — камуністычнай сістэмы, вайсковай хунты ці аўтарытарнай дыктатуры.

Пытанне было сфармуляванае так:

*Акрамя цяперашняга палітычнага рэжыму, у гісторыі нашай краіны былі й іншыя. Некаторыя людзі кажуць, што пры іншым дзяржаўным ладзе мы будзем жыць лепей. Як вы думаеце, ці трэба вярнуцца да камуністычнай сістэмы? Як вы думаеце, ці павінна краінай кіраваць войска? Як вы думаеце, ці не лепей будзе скасаваць парламент і выбары і займець моцнага лідэра, які б мог хутка прымаць рашэнні? (Цалкам згодны, хутчэй згодны, хутчэй ня згодны, абсалютна не згодны.)*

Вынікі, пададзеныя ў табліцы 2, сведчаць, што агульная сітуацыя падобная ва ўсіх трох краінах. Давер да вайсковай хунты быў мізэрны (ад 1 да 6 %) у трох дзяржавах і ўсіх этнічных групах ва ўсе гады, калі праводзіліся апытанні. Вяртанне да камунізму больш даспадобы расійскамоўным — прычым, этнічны дысбаланс найлепш відаць у Эстоніі, дзе камуністычная перспектыва вабіла ўсяго 5 % эстонцаў і ад 9 да 25 % не-эстонцаў у залежнасці ад года апытання. Кіраванне моцнага аўтарытарнага лідэра з'яўляецца прывабнай альтэрнатывай ва

[9] Вымярэнне дэмакратычнай падтрымкі праз адкіданне яе альтэрнатываў мае шэраг перавагаў. Гэта дазваляе пазбегнуць праблемы складанага фармулявання дэмакратыі для рэспандэнта і лепш за большасць іншых варыянтаў адасабляе падтрымку дэмакратычных прынцыпаў ад ацэнак таго, як дэмакратыя працуе на самай справе.

**Табліца 1.** Ідэнтычнасці паводле краіны і этнічнай групы, 2004

| | Эстонія | | Латвія | | Літва | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | эстонцы | расійска-моўныя | латышы | расійска-моўныя | літоўцы | расійска-моўныя |
| Мясцовая супольнасць | 26 (39) | 38 (30) | 29 (44) | 42 (39) | 51 (26) | 47 (18) |
| Рэгіён | 6 (24) | 7 (17) | 6 (18) | 7 (18) | 5 (20) | 6 (12) |
| Гэтая краіна | 63 (24) | 2 (1) | 60 (26) | 5 (8) | 39 (43) | 32 (43) |
| Еўропа | 2 (9) | 6 (13) | 1 (8) | 2 (5) | 3 (9) | 3 (13) |
| Расія | 0 (0) | 41 (31) | 2 (1) | 36 (25) | 0 (1) | 6 (8) |
| Іншыя краіны СНД | 0 (0) | 2 (5) | 0 (0) | 4 (2) | 0 (0) | 5 (6) |
| Іншае | 1 (2) | 3 (3) | 1 (1) | 3 (2) | 0 (0) | 0 (0) |
| Не ведаю[10] | 1 | 0 | 1 | 2 | 1 | 3 |

Звесткі адлюстроўваюць колькасць рэспандэнтаў, што абралі кожную з катэгорыяў у якасці першаснай ідэнтычнасці (у дужках пададзеная колькасць другасных выбараў). Пытанне задавалі наступным чынам: «З якім з наступных варыянтаў вы атаясамліваеце сябе ў першую чаргу? У другую чаргу (мясцовая супольнасць/горад, рэгіён, гэтая краіна, Еўропа, Расія, іншая краіна СНД, іншае)»?

Крыніца: «New Baltic Barometer», 2004

ўсіх трох краінах, дарма што вынікі розняцца ў залежнасці ад краіны, этнічнай групы і часу. Літоўцы больш схільныя падтрымаць аўтарытарнага лідэра, чым эстонцы і латышы. Расійскамоўныя ў кожнай з трох дзяржаў выяўлялі большае жаданне, чым тытульная нацыя, бачыць на чале дзяржавы моцнага лідэра, акрамя выпадку Літвы ад 1995 да 2001 гг. У той час, калі жаданне бачыць аўтарытарнага лідэра меншае сярод эстонцаў (з 35 да 25 %), латышоў (з 40 да 30 %) і літоўцаў (з 66 да 27 %) ад 1995 да 2004 гг., гэтага нельга сказаць пра расійскамоўныя меншыні.

Факт, што расійскамоўныя жыхары балтыйскіх краін менш адданыя дэмакратыі, пацвярджаецца дадатковым індыкатарам з апытання 2004 г. (гл. табліцу 3). Расійскамоўныя звычайна менш схільныя падтрымліваць дэмакратыю і аддаюць перавагу іншым формам кіравання, асабліва яны палюбляюць аўтарыта-

[10] Колькасць тых, хто не мае ані першаснай, ані другаснай ідэнтычнасці.

**Табліца 2.** Папулярнасць аўтарытарных альтэрнатываў дэмакратыі, 1995—2004.

| | **Камунізм** | **Вайсковая дыктатура** | **Аўтарытарызм** |
|---|---|---|---|
| **Эстонія** | | | |
| Эстонцы | | | |
| 1995 | 1 | 1 | 35 |
| 1996 | 1 | 2 | 39 |
| 2000 | 4 | Няма звестак (н/з) | н/з |
| 2001 | 3 | 1 | 36 |
| 2004 | 4 | 1 | 25 |
| расійскамоўныя эстонцы | | | |
| 1995 | 9 | 5 | 44 |
| 1996 | 14 | 2 | 51 |
| 2000 | 25 | н/з | н/з |
| 2001 | 17 | 4 | 49 |
| 2004 | 11 | 1 | 36 |
| **Латвія** | | | |
| латвійцы | | | |
| 1995 | 4 | 3 | 40 |
| 1996 | 3 | 3 | 45 |
| 2000 | 1 | 4 | 35 |
| 2001 | 5 | 6 | 35 |
| 2004 | 5 | 3 | 30 |
| расійскамоўныя латышы | | | |
| 1995 | 9 | 5 | 48 |
| 1996 | 9 | 4 | 52 |
| 2000 | 4 | 4 | 46 |
| 2001 | 11 | 2 | 43 |
| 2004 | 19 | 3 | 44 |
| Літва | | | |
| літоўцы | | | |
| 1995 | 7 | 7 | 66 |
| 1996 | 7 | 6 | 62 |
| 2000 | 9 | 4 | 58 |
| 2001 | 12 | 6 | 40 |
| 2004 | 7 | 4 | 27 |
| расійскамоўныя літоўцы | | | |
| 1995 | 10 | 6 | 47 |
| 1996 | 8 | 3 | 49 |
| 2000 | 14 | 5 | 56 |
| 2001 | 21 | 5 | 40 |
| 2004 | 14 | 6 | 46 |

Звесткі адлюстроўваюць колькасць рэспандэнтаў, якія цалкам пагаджаюцца ці схільныя пагадзіцца з пэўнай альтэрнатывай. Дакладную фармулёўку пытання гл. у тэксце.

Крыніца: «New Baltic Barometer», 1995—2004.

рызм. Найбольшыя разбежкі ў межах адной краіны назіраюцца ў Літве. Іншы цікавы факт: у параўнанні з латышамі і літоўцамі эстонцы менш паслядоўныя ў падтрымцы дэмакратыі.

## ЗАДАВОЛЕНАСЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЮ РЭЖЫМУ

У ранейшых даследаваннях была даведзена цесная сувязь паміж ацэнкай рэжыму і яго палітычнымі і эканамічнымі дасягненнямі. Таму мэтазгодна выкарыстоўваць пытанні, якія закранаюць як эканамічны, так і палітычны кампанент падтрымкі рэжыму. Наступныя пытанні з НББ і «Барометра новых дэмакратый» (New Democracies Barometer, БНД) звычайна выкарыстоўваюцца для вымярэння задаволенасці функцыянаваннем палітычнай сістэмы:

**Расійскамоўныя звычайна менш схільныя падтрымліваць дэмакратыю і аддаюць перавагу іншым формам кіравання, асабліва аўтарытарызму.**

*Ужываючы шкалу адзнак для таго, каб ацаніць, як працуе сістэма кіравання (ад 100 (ідэальна) да 0 (цалкам непрымальна), якую б адзнаку вы далі вашай цяперашняй сістэме кіравання з вольнымі выбарамі і шматлікімі партыямі? Ужываючы шкалу адзнак для таго, каб ацаніць, як працуе эканамічная сістэ-*

**Табліца 3.**

| | Эстонія | | Латвія | | Літва | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | эстонцы | расійскамоўныя | латышы | расійскамоўныя | літоўцы | расійскамоўныя |
| Дэмакратыя заўжды лепшая | 46 | 39 | 60 | 47 | 69 | 42 |
| Часам лепшы аўтарытарызм | 18 | 29 | 22 | 28 | 10 | 20 |
| Без розніцы | 24 | 24 | 14 | 21 | 15 | 22 |
| Не ведаю | 12 | 9 | 5 | 4 | 6 | 15 |

Лічбы выяўляюць працэнт рэспандэнтаў, якія абралі кожны з адказаў на наступнае пытанне: «З якім з наступных цверджанняў вы больш згодныя? (а) дэмакратыя лепшая за іншыя формы кіравання; (б) у пэўных умовах аўтарытарны рэжым лепшы за дэмакратычны; (в) для такіх людзей, як я, не важна, ёсць у нас дэмакратыя ці не.

Крыніца: «New Baltic Barometer», 2004.

**Схема 2.** Ацэнка цяперашніх палітычных сістэмаў. Слупкі адбіваюць сярэднія значэнні. Пытанне: «Ацаніце цяперашнюю шматпартыйную палітычную сістэму з вольнымі выбарамі па шкале ад 100 (ідэальна) да 0 (цалкам непрымальна)».




Крыніца: «New Baltic Barometer», 1993—2004.

*ма (ад 100 (ідэальна) да 0 (цалкам непрымальна), якую адзнаку вы далі б вашай цяперашняй эканамічнай сістэме?*

У краінах Балтыі назіраецца падобная дынаміка ў плане задаволенасці рэжымам. Задаволенасць эканамічнымі паказнікамі (гл. схему 3) павольна, але стала падвышалася сярод усіх шасці этнічных груп, і сярэдні ўзровень ацэнак эканамічнай сістэмы ў Эстоніі і Літве сёння трывала пазітыўны. Тым не менш, паміж трыма краінамі назіраюцца значныя адрозненні: жыхары Эстоніі, незалежна ад этнічнай прыналежнасці, ацэньваюць эканамічную сітуацыю значна лепш за рэспандэнтаў з Літвы ці Латвіі, дзе на працягу ўсяго пераходнага перыяду назіралася больш негатыўнае стаўленне да эканамічнага эфекту рэформаў. Пры гэтым няма этнічнай прорвы ў ацэнцы эканамічнай трансфармацыі ў Літве.

У Эстоніі і Латвіі расійскамоўныя ставяцца да сытуацыі ў эканоміцы больш крытычна, прычым гэтая тэндэнцыя больш заўважная з 1996 г. Тым не менш, адрозненні паміж трыма дзяржавамі больш значныя, чым адрозненні паміж этнічнымі групамі ў межах адной краіны.

**Схема 3.** Ацэнка існай эканамічнай сістэмы. Слупкі азначаюць сярэднія значэнні. Пытанне: «Ацаніце існую эканамічную сістэму з вольнымі выбарамі па шкале ад 100 (ідэальна) да 0 (цалкам непрымальна)».




Крыніца: «New Baltic Barometer», 1993—2004.

Задаволенасць *эфектыўнасцю палітычных сістэм* (гл. схему 2) пагоршылася ва ўсіх групах ад 1995—1996 гг., але з 2000 г. паўсюль назіраецца рост. Аднак і гэтым разам жыхары Эстоніі, незалежна ад этнічнай прыналежнасці, аказаліся больш задаволенымі функцыянаваннем сваёй палітычнай сістэмы, чым латышы і літоўцы. Няма этнічнай размежаванасці ў ацэнцы эфектыўнасці палітычнай сістэмы сярод рэспандэнтаў Літвы: бадай, расійскамоўныя ацэньваюць яе больш пазітыўна, чым літоўцы. У Эстоніі і Латвіі этнічная прорва існуе: задаволенасць палітычным рэжымам сярод расійскамоўных у сярэднім на 10—20 % меншая, чым сярод латышоў і эстонцаў. Але і тут адрозненні ўнутры краін меншыя, чым паміж імі, а аднолькавая дынаміка зменаў азначае, што прадстаўнікі абедзвюх этнічных груп успрымаюць змены прыблізна аднолькава. Апошняй значнай тэндэнцыяй з'яўляецца выразны рост задаволенасці эканамічным і палітычным становішчам у Літве ў перыяд ад 2001 да 2004 гг.[11].

[11] Гэтую кардынальную змену цяжка вытлумачыць. Магчыма, яна звязаная з хуткім эканамічным ростам ад 2001 г. ці ўсеагульным энтузіязмам што да ўступлення краіны ў НАТО ці ЕС. Дзіўна, але на ацэнкі не паўплываў скандал вакол прэзідэнта Паксаса, які лічыўся найцяжэйшым ударам па дэмакратыі ў Літве ад часу набыцця незалежнасці.

## ДАВЕР ДА ПАЛІТЫЧНЫХ ІНСТЫТУТАЎ

Чатыры апытанні НББ (у 1993, 1996, 2001 і 2004 гг.) вымяралі давер да палітычных інстытутаў у балтыйскіх краінах. Дарма што спіс інстытутаў змяняўся, у кожным з апытанняў прысутнічалі палітычныя партыі, парламент, прэзідэнт, суды, войска і паліцыя. Нязначна змянялася й фармулёўка пытання. Так, у 1993 г. яно гучала наступным чынам: «Наколькі вы давяраеце наступным інстытутам ці групам? (Моцна давяраю, маю пэўны давер, слаба давяраю, не давяраю)». У 1996 г. рэспандэнты адказвалі на пытанне: «У якой меры вы давяраеце наступным грамадскім інстытутам? (Цалкам давяраю, збольшага давяраю, цалкам не давяраю)». У 2001 і 2004 гг. пытанне было такое: «Наколькі вы давяраеце наступным інстытутам у плане абароны вашых інтарэсаў? Калі ласка, ацаніце паводле шкалы ад 1 (цалкам не давяраю) да 7 (цалкам давяраю)». Вынікі апытання адлюстраваныя ў табліцы 4.

Давер да грамадскіх інстытутаў трымаецца падобнай траекторыі ва ўсіх трох краінах і этнічных групах. У 2001 г. быў зафіксаваны найменшы давер да інстытутаў, але ў 2004 г. паказнікі зноў палепшыліся.

Ва ўсіх трох дзяржавах парламенты і палітычныя партыі маюць найніжэйшыя рэйтынгі даверу. Пры тым, што падтрымка партыяў была нізкая ўжо ў 1993 г. (каля 10—15 %), наступнае дзесяцігоддзе прынесла масавае расчараванне парламентам. У 1993 г. палова балтаў давярала сваім парламентам. У 2004 г. гэты паказнік апусціўся да 15—19 % сярод тытульных нацыяў і 13 % сярод расійскамоўнай меншыні ў Эстоніі і Латвіі і 26 % сярод расійскамоўных літоўцаў.

Найбольшым даверам сярод эстонцаў, латышоў і літоўцаў, а таксама расійскамоўных жыхароў Літвы карыстаюцца інстытут прэзідэнцтва і войска. Расійскамоўныя ў Эстоніі і Латвіі таксама давяраюць прэзідэнту больш, чым іншым грамадскім інстытутам, на другім месцы ідуць суды і паліцыя. У Латвіі і Эстоніі назіраецца этнічны распадзел: давер да большасці інстытутаў значна меншы сярод расійскамоўных, чым сярод прадстаўнікоў тытульнай нацыі. Аднак у Літве расійскамоўная меншасць давярае большай колькасці грамадскіх інстытутаў (менавіта паліцыі і парламенту), чым літоўцы.

## ВЫСНОВЫ

У гэтым даследаванні была выкарыстана шматвымерная мадэль палітычнай падтрымкі, каб выявіць стаўленне да цяперашніх рэжымаў у Эстоніі, Латвіі і Літве на аснове звестак апытанняў з 1993 да 2004 гг. У гэтай частцы падводзяцца вынікі аналізу чатырох вымярэнняў палітычнай падтрымкі і абмяркоўваюцца іх патэнцыйныя імплікацыі. Падтрымка *палітычнай супольнасці* ў Латвіі і Эстоніі залежыць ад этнічнай прыналежнасці. Выснова, што расійскамоўныя жыхары Латвіі і Эстоніі спалучаюць лакальныя ідэнтычнасці з сантыментам да Расіі, пацвярджаецца даследаваннямі, якія апісваюць дамінантную калектыўную ідэнтыч-

Табліца 4. **Давер да палітычных інстытутаў**

| | суды | паліцыя | войска | парламент | партыі | прэзідэнт | сярэдняе |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Эстонія** | | | | | | | |
| Эстонцы | | | | | | | |
| 1993 | 58 | 46 | 69 | 55 | 14 | 67 | 52 |
| 1996 | 63 | 57 | 72 | 54 | 16 | 78 | 57 |
| 2001 | 27 | 20 | 47 | 10 | 9 | 63 | 29 |
| 2004 | 50 | 49 | 66 | 19 | 7 | 76 | 45 |
| расійскамоўныя эстонцы | | | | | | | |
| 1993 | 52 | 38 | 41 | 41 | 13 | 57 | 40 |
| 1996 | 44 | 38 | 32 | 35 | 13 | 49 | 35 |
| 2001 | 25 | 18 | 22 | 11 | 7 | 49 | 22 |
| 2004 | 36 | 38 | 37 | 13 | 5 | 56 | 31 |
| **Латвія** | | | | | | | |
| латышы | | | | | | | |
| 1993 | 54 | 38 | 63 | 44 | 15 | 77 | 49 |
| 1996 | 50 | 41 | 41 | 32 | 14 | 67 | 41 |
| 2001 | 23 | 26 | 36 | 7 | 6 | 78 | 29 |
| 2004 | 34 | 36 | 45 | 15 | 10 | 64 | 34 |
| расійскамоўныя латышы | | | | | | | |
| 1993 | 47 | 37 | 39 | 40 | 13 | 61 | 40 |
| 1996 | 53 | 45 | 52 | 32 | 15 | 56 | 42 |
| 2001 | 27 | 30 | 32 | 10 | 9 | 36 | 24 |
| 2004 | 37 | 37 | 22 | 13 | 10 | 31 | 25 |
| **Літва** | | | | | | | |
| літоўцы | | | | | | | |
| 1993 | 45 | 44 | 53 | 46 | 21 | 72 | 47 |
| 1996 | 31 | 32 | 46 | 33 | 27 | 54 | 37 |
| 2001 | 16 | 26 | 36 | 9 | 7 | 62 | 26 |
| 2004 | 25 | 32 | 63 | 16 | 10 | 66 | 35 |
| расійскамоўныя літоўцы | | | | | | | |
| 1993 | 52 | 49 | 50 | 57 | 22 | 79 | 52 |
| 1996 | 41 | 33 | 44 | 37 | 16 | 55 | 38 |
| 2001 | 18 | 25 | 29 | 11 | 11 | 35 | 22 |
| 2004 | 33 | 37 | 54 | 26 | 13 | 49 | 35 |

Крыніца: «New Baltic Barometer», 1993—2004.

насць расійскамоўных у Балтыі як тэрытарыяльна-этнічную. Той факт, што расійскамоўныя ў краінах Балтыі ідэнтыфікуюць сябе з Расіяй, а не Эстоніяй, Латвіяй ці Літвой, не трэба апрыёры разглядаць як палітычна небяспечны феномен, асабліва паколькі гэтае атаясамліванне з'яўляецца збольшага культурна-этнічным. Тым не менш, гэты факт таксама сведчыць пра тое, што стаўленне да рэжыму расійскамоўных у Балтыі ў вялікай ступені залежыць ад здольнасці балтыйскіх рэжымаў эфектыўна працаваць і забяспечваць матэрыяльны дабрабыт: на іх культурна-этнічную лаяльнасць можна не разлічваць, калі надыдзе цяжкі час.

Вынікі таксама сведчаць пра тое, што, нягледзячы на рух у бок мультыкультурнай дэмакратыі, якая характарызуе другі этап палітыкі адносна меншасцяў у Эстоніі і Латвіі, працэс нацыятварэння ў гэтых дзвюх дзяржавах пакуль не скончаны. Натуралізацыя як такая яшчэ не вядзе да эмацыйнай падтрымкі дзяржавы. Эстонскае і латвійскае грамадзянства не вядзе да росту адпаведнай нацыянальнай ідэнтычнасці сярод расійскамоўных — прынамсі, у блізкай перспектыве.

Эвалюцыя калектыўнай ідэнтычнасці расійскамоўных жыхароў балтыйскіх краін можа пайсці паводле некалькіх сцэнараў — прычым, у розных падгрупах могуць адначасова рэалізоўвацца розныя сцэнары. Разуменне патэнцыйна складанай канфігурацыі этнічных і палітычных лаяльнасцяў расійскамоўных застаецца ключом для разумення іх стаўлення да балтыйскіх рэжымаў.

Тэндэнцыі ў Літве даюць цікавы матэрыял для параўнання і сьведчаць пра больш паспяховае нацыятварэнне ў гэтай краіне. Адрозна ад расійскамоўных жыхароў Латвіі і Эстоніі, больш за палову расійскамоўных літоўцаў адчувае сябе часткай нацыянальнай палітычнай супольнасці. Гэты факт можна ў значнай ступені вытлумачыць больш аднародным этнічным складам Літвы і іншай стратэгіяй нацыятварэння, што прыняла гэтая балтыйская дзяржава. Тым не менш, выразны рост колькасці расійскамоўных, што ідэнтыфікуюць сябе з літоўскай дзяржавай, супадае з відавочным паляпшэннем ацэнкі эфектыўнасці рэжыму паміж 2001 і 2004 гг. Гэта дазваляе меркаваць, што рост эфектыўнасці рэжыму будзе адлюстроўвацца не толькі ў павелічэнні рацыянальнай падтрымкі грамадзянамі сістэмы кіравання, але і спрычыніцца да большага пачуццёвага атаясамлівання з дзяржавай і адпаведнай палітычнай супольнасцю.

Тэндэнцыі ў падтрымцы *прынцыпаў рэжыму* паказваюць, што хоць дэмакратычную форму кіравання падтрымлівае большасць жыхароў краіны Балтыі, дэмакратыя яшчэ не стала «адной гульнёй у горадзе». Каля трацiны рэспандэнтаў у кожнай з трох дзяржаў падтрымалі б моцнага аўтарытарнага лідэра. Расійскамоўныя ў меншай ступені падтрымліваюць дэмакратыю як форму кіравання, але адрозненні паміж імі і прадстаўнікамі тытульных нацый у гэтым пытанні нязначныя. Ёсць два магчымыя тлумачэнні іх аўтарытарных прыхільнасцяў. Выглядае, што сімпатыя да аўтарытарнага рэжыму вынікае з расчараванасці тым, як насамрэч працуе дэмакратыя. Наш аналіз пацвярджае, што пераважная большасць жыхароў балтыйскіх краін расчаравалася ў партыйнай сістэме і парламенце. У святле гэтага факту не дзіва, што перспектыва «пазбавіцца ад парла-

мента і выбараў» выглядае прывабна. Па-другое, прага моцнага, эфектыўнага лідэрства можа выяўляць культурныя ўстаноўкі датычна палітычнай улады, сфармаваныя палітычнымі рэаліямі савецкага часу або аўтарытарных рэжымаў 1930-х гг. Культурныя змены ідуць павольна, і змена ўстановак, мабыць, ёсць найцяжэйшай часткай дэмакратычнай кансалідацыі.

Цягам апошніх гадоў задаволенасць *эфектыўнасцю рэжыму* павялічылася ва ўсіх трох краінах. Прыпушчэнне, што тэндэнцыі ацэнкі рэжыму ў пераходных краінах павінны трымацца крывой U ў выпадку поспеху рэформаў, пацвердзілася. Тэндэнцыі ў задаволенасці эканамічнымі сістэмамі могуць адпавядаць прадказанай U-траекторыі, калі мы пагодзімся з пераканаўчым аргументам, што незадаволенасць ужо мінула найніжэйшую кропку крывой да 1993 г., калі праводзілася першае апытанне НББ. Аднак ацэнкі палітычнай сістэмы, выглядае, маюць дакладную U-падобную форму. «Запозненая» эрозія падтрымкі палітычных рэжымаў адпавядае чаканням таго, што грамадскасць застанецца цярплівай і абачлівай падчас перыяду «неардынарнай палітыкі» (Л. Бальцаровіч). Як толькі гэты «мілы» перыяд мінае — падтрымка падае, калі эфектыўнасць не адпавядае спадзяванням. Форма крывой надзіва супадае з глыбінёй эканамічнай рэцэсіі ў кожнай з краін: так, напрыклад, агульны спад вытворчасці ў Эстоніі быў нашмат меншы, чым у Латвіі ці Літве. Той факт, што ў Эстоніі задаволенасць рэжымам была значна вышэйшая на ранняй фазе пераходнага перыяду, падкрэслівае значнасць пачатковых умоваў, а таксама першых поспехаў больш радыкальных рэформаў, праведзеных эстонскім урадам. Узаемасувязь паміж ацэнкай палітычнай і эканамічнай эфектыўнасці неабходна разгледзець больш дэталёва ў будучых даследаваннях.

Цягам пераходнага перыяду давер да грамадскіх інстытутаў таксама трымаўся траекторыі U. Той факт, што ключавыя для дэмакратычнага працэсу інстытуты — палітычныя партыі і парламент — карыстаюцца найменшым даверам грамадзянаў, дапамагае вытлумачыць падзенне выбарчай яўкі ва ўсіх трох краінах. Звесткі пра давер да грамадскіх інстытутаў пацвярджаюць вынікі, атрыманыя ў ходзе даследавання іншых вымярэнняў палітычнай падтрымкі: так, эстонцы больш задаволеныя палітычнымі інстытутамі сваёй краіны, чым іншыя групы. Мы бачым этнічны распадзел у Эстоніі і Латвіі, якога няма ў Літве. Аднак дакладна невядомыя прычыны — расійскамоўныя ў Эстоніі і Латвіі менш давяраюць інстытутам таму, што з імі абыходзяцца іначай, ці ім перападае менш ад працы гэтых структур. А можа, адсутнасць эмацыйнай падтрымкі дзяржавы адмоўна ўплывае на іх успрыманне эфектыўнасці грамадскіх інстытутаў як такіх, ці яны маюць іншыя чаканні адносна функцый і ролі дзяржавы.

Нарэшце, карціна, якая паўстае па выніках аналізу гэтых чатырох вымярэнняў палітычнай падтрымкі, з'яўляецца неадназначнай. З аднаго боку, задаволенасць эканамічным, палітычным і інстытуцыйным развіццём краіны падвышаецца ва ўсіх трох краінах — як сярод тытульных нацыянальнасцяў, гэтак і расійскамоўных меншасцяў. З іншага — занепакоенасць выклікае незавершанасць працэсу нацыятварэння і значны этнічны распадзел пры ацэнцы палітычнага,

эканамічнага і інстытуцыйнага развіцця. Да таго ж дэмакратычная кансалідацыя яшчэ не адбылася на ўзроўні каштоўнасцяў і ўстановак. Аўтарытарныя прыхільнасці значнай часткі насельніцтва, разам са значным незадавальненнем партыямі і парламентам, сведчаць, што спаўзання да аўтарытарызму дагэтуль нельга выключаць, калі надарыцца нечаканая дэстабілізацыя палітычнай сітуацыі.

Напрыканцы неабходна заўважыць, што рост даверу да палітычных рэжымаў не прывядзе як такі да выбарчай яўкі. Крызіс традыцыйных формаў масавага палітычнага ўдзелу з'яўляецца глабальнай тэндэнцыяй. Формы, стылі і арэны для ўдзелу ў палітыцы перажываюць радыкальную трансфармацыю. Сацыяльная база палітычных партый размываецца, на іх месцы з'яўляюцца дэцэнтралізаваныя сеткі і грамадскія арганізацыі, якія замяняюць традыцыйныя арганізацыйныя структуры як каналы прыцягнення грамадзянаў у палітыку. Асэнсаванне таго, як дэмакратычная сістэма можа працаваць у гэтым новым кантэксце, — вельмі важная задача, якая заслугоўвае большай увагі і ў краінах Балтыі.

*Пераклаў з ангельскай Алесь Мартынаў паводле «Journal of Baltic Studies». 38:1, 2007. P. 1—20.*

# ЛІТАРАТУРА

**ЛЮБКО ДЭРЭШ**

# Культ

***зярнову***

*Не рэкамэндуецца дзецям, цяжарным*
*і людзям з сардэчна-судзінкавымі захворваньнямі.*
Надпіс на кружэлцы «The Rolling Stones»

## Частка першая

## Амальгама

### Разьдзел 1

**1.**

Шмат хто пытаўся ў яго, ці ён, выпадкам, ня *той* Юрко Банзай. Не, адказваў Юрко Банзай, пасьміхаючыся. Мы нават не сваякі, — адразу ж апярэджваў ён наступнае пытаньне.

Банзай вучыўся на пятым курсе біяфаку. Як аднаго з найлепшых студэнтаў яго накіравалі на практыку ў адзін каледж, філію ўнівэру, выкладаць біялёгію ў старэйшых клясах. Шчыра кажучы, пакуль Банзаю не сказалі назвы гэтага гораду, ён нават не падазраваў пра яго існаваньне. *Медныя Букі.*

---

***Любко Дэрэш*** *(нар. 3 ліпеня 1984) — украінскі пісьменьнік. Студэнт эканамічнага факультэту Львоўскага ўнівэрсытэту. Аўтар раманаў «Культ» (2001), «Пакланеньне яшчарцы» (2002), «Архэ» (2005), «Намер!» (2006), «Крыху цемры» (2007).*

Гэта вельмі далёка, ехаць дзьве з паловай гадзіны, яшчэ й цягніком, які спыняецца пад кожным слупам, нібы кокер-спаніель.

Банзай пераехаў у Медныя Букі ў канцы жніўня. Ён зьняў аднапакаёвую кватэру ў старэзным трохпавярховым будынку. Страшная, нібы атамная вайна, бабулька-баптыстка прымусіла яго падпісацца на іхні баптысцкі весьнік, а заадно і на мясцовую газэту «Патрыёт», дзе працаваў рэдактарам яе сын. Газэта не карысталася шалёнай папулярнасьцю, але хто-ніхто яе купляў. Часопіс пісаў пра найноўшыя пастановы райсавету, гарадзкія навіны. Не цураўся і вечных тэмаў: згвалтаваньні, забойствы, выпадкі разбэшчваньня непаўнагадовых і іншыя салёныя штучкі, якія так падабаюцца пэнсіянэрам.

Вось ужо тыдзень як ён працаваў у каледжы. Навучаньне пачалося 28-га, што само па сабе было кепскім знакам. (Вечна ўсё ня як у людзей, ужо каторы раз паўтаралі сабе пад нос вучні.)

Разумныя людзі калолі дровы і скупалі сьвечкі да таго, як яны рэзка падаражэюць зь першым адключэньнем сьвятла. Зіма абяцала быць халоднай, цёмнай і безнадзейнай. «Прынамсі, — думалася яму, — у Медных Буках ваду даюць круглыя суткі, у адрозьненьні ад Львова».

Штодня, апроч нядзелі, Банзай выходзіў з дому зь вялікім горным заплечнікам за сьпінай. Хоць у «ермаку» ляжала ўсяго некалькі кніжак, пара агульных сшыткаў і канапка з двума яблыкамі, ён ніколі не прамяняў бы яго на звычайную сумку, а тым больш на пакецік. Юрко Банзай верыў у праўдзівасьць словаў Карляса Кастанэды, а дон Хуан, незабыўны настаўнік Карляса, раіў насіць усё толькі за плячыма.

Дарэчы, пра яблыкі. Банзай прачытаў, што паддосьледныя студэнты, якія зьядалі два яблыкі штодня, адчувалі сябе значна лепшымі і інтэлектуальна вышэйшымі за тых, якія яблыкаў ня елі. Гэты факт надзвычай натхніў Банзая, бо ён трымаўся самых рафінаваных думак пра свой інтэлект, старанна песьцячы і ўзрошчваючы яго ў спрыяльным асяродзьдзі. Але ў цэлым ён быў сьціплым хлопцам, і ніхто (за выняткам хіба адной-дзьвюх асобаў) не здагадваўся пра глыбінны сымбалізм акту паяданьня папяровак.

**2.**

Яго бацька хацеў, каб ён пайшоў па ягоных сьлядах і стаў праўнікам. Сын, то бок Юрко Банзай, гэтага ну ніяк не хацеў і яшчэ ў восьмай клясе ўпотай вырашыў, што *значна* лепей быць вясковым настаўнікам біялёгіі, чым натарыюсам ці яшчэ якой жабаю. Паступленьне на біяфак стала першай сапраўднай расколінай у іх і без таго нацягнутых стасунках. Усе наступныя зьявіліся падчас навучаньня, і цяпер Банзай зьбіраўся прыязджаць да бацькі і бабулі толькі па рэшту сваіх рэчаў. І не паказвацца ў Львове да Калядаў. А яшчэ лепей — да Вербніцы.

### 3.

За час навучаньня на біялягічным факультэце Банзай тройчы трапляў у рэанімацыю.

Першы раз гэта здарылася ўвесну на першым курсе. Ён спрабаваў сынтэзаваць LSD-25 з пэўнага віду спарынца — плесьневага грыбка. Калі ён праглынуў грыбок, у яго пачалася моцная запамарока. Найлепшы кораш Банзая — Сяргій Макоша, які прадстаўляўся ўсім як Дождж, — знайшоў непрытомнага Юрка ў кватэры на кухні. Банзаю халерна пашанцавала, ён забыў зачыніць дзьверы.

У наступны раз, на другім курсе, ён вырошчваў у сябе дома сьвятарныя мэксыканскія грыбы роду страфарыя, якія нібыта зьмяшчаюць псыхатропнае рэчыва псылацыбін. Экспэрымэнт праваліўся, таму што замест чароўных страфарыяў у Банзая прарасьлі бледныя паганкі. Пасьля таго, як яго адкачалі другі раз, Банзай вельмі доўга ў думках (і вельмі часта — уголас) праклінаў нядбайнасьць усяго аддзяленьня мікалёгіі, усіх пэдантаў-асьпірантаў і ўсю катэдру з прыбіральніцамі разам узятымі.

Трэці раз ледзь ня стаў для яго фатальным. Гэта было акурат пасьля дня гораду Львова на чацьвертым курсе, калі ад яго сышла яго каханая Саламія. Ён зьеў тры цудоўныя экзэмплярчыкі мухамора чырвонага, які, зноў жа, вырасьціў у хатніх умовах са спораў, скрадзеных на катэдры мікалёгіі. Ён узяў на веру словы сужэнцаў Ўосан, якія сьцьвярджалі, што мухамор — гэта слаўнавядомая індуіская сома, і што грыб можа падарыць незабыўныя псыхадэлічныя перажываньні. Але, да ўласнага расчараваньня, апроч дзівосных каляровых плямаў, ніякіх іншых галюцынагенных перажываньняў ён не атрымаў. Калі рэзь у страўніку стала пякельна-невыноснаю, ён выклікаў хуткую. Пік інтаксыкацыі быў, відаць, найпаскуднейшым адчуваньнем у яго жыцьці. Галава нястрымна круцілася, суставы выломвала дзікім болем, страўнік палаў таксычным агнём, і ўсё, што не было замацавана ў яго кішэчніку, выплюхвалася з абодвух выхадаў. Ніхто з мэдпэрсаналу ці крэўных (а іх было ўсяго двое — бацька і бабуля) так і не сказаў яму, наколькі блізка яму ўдалося падысьці да краю.

### 4.

Яго найлепшы прыяцель Дождж вывучаў межы рэальнасьці з дапамогай алькаголю, што не перашкаджала яму быць даволі такі пасьпяховым студэнтам. Разам з Банзаем яны вучыліся на біяхіміі і абодва схілялі галовы ў пашане перад веліччу цыклю Крэбса. Яны нават плянавалі выдаць некалькі страшэнна разумных і глыбокіх кніжак на гэтую тэму. Банзай у думках ужо бачыў, як разгортвае адну вельмі вучоную кнігу і чытае:

Выдавецтва «Навуковая думка» рыхтуе да друку:

Банзай, Ю., Макоша, С. Ілюстраваны пуцяводнік па цыклі Крэбса ў алегорыях;

Банзай, Ю., Макоша, С. Цыкль Крэбса для «чайнікаў»;

Макоша, С., Банзай, Ю. Цыкль Крэбса ў прыказках і прымаўках. Выданьне другое, перапрацаванае і дапоўненае.

Яшчэ няблага было б напісаць стэрэаграфію (то бок навуковую працу, выкананую двума людзьмі) на тэму: «Слова ў абарону фэкалатэрапіі». Няхай ведаюць, што не мачою адзінай жывы чалавек.

## 5.

Банзай стаяў, абапёршыся на падваконьне, насупраць кабінэту дырэктара. Ён зьбіраўся высьветліць, каго, дзе і колькі ён будзе вучыць. Дырэктар у гэты момант бакланіў па тэлефоне. Мяркуючы па падхалімскім тоне, гэта была жонка. Юрко палічыў тактоўнейшым пачакаць за дзьвярыма.

На супрацьлеглым канцы падваконьня сядзела нейкая малая, ці то дзесяці-, ці то адзінаццаціклясьніца, не прыгажуня, але ўсё-ткі даволі сымпатычная. Яна стомлена пазяхала, слухаючы тарахценьні нейкага хлопца, які віўся ля ейных ног. Хлопец дурнавата пасьміхаўся і апавядаў сваёй пасіі нейкае вельмі нецікавае здарэньне:

— Гэта, і мы з Андрыем уключылі тую штуку ў ейнай хаце, прыкінь? Ну, там такія бурбалкі мяняюцца?.. — хлопец ажно ўпіваўся, амаль захлынаючыся, уласнай гісторыяй. Увесь ягоны выгляд паказваў, што, з аднаго боку, ён саромеўся гэтага выпадку, а зь іншага — ганарыўся сваёй зухаватасьцю, што ён, маўляў, здолее расказаць пра гэта *дзяўчыне*.

— Глядзім мы, значыць, на гэтыя бурбалкі, *і тут заходзіць яе мама*! — хлапчына літаральна сачыўся сьлінаю, так яго цешыла і расьпірала. — А бурбалка акурат прыняла форму... ну, ты ведаеш чаго, а мама... Ну, форму вядомай рэчы...

— Што, чэлеса? — абыякава адгукнулася дзяўчо.

Тут зь дзьвярэй высірнуў спадар Андрый, і Банзаю не давялося пабачыць рэакцыі хлопца. Зваліўся нежывы ад апаплексычнага ўдару, не іначай. А малая, відаць, абыякава зірнула на цела і апатычна папляласа па калідоры.

Дырэктара звалі Андрый Яраслававіч. У яго было нібыта габрэйскае прозьвішча — Вайсгот, хоць выглядаў мужчына вельмі нават па-ўкраінску. У сваім дарагім фатэлі ён сядзеў чынна і паважна, з высока паднятым падбародзьдзем, нібыта хецкі цар Супілуліума I. Яны парукаліся (Юрко заўважыў, што рабілася гэта з такой мінай, нібыта спадар Андрый жартам здароўкаўся зь пяцігадовым хлопчыкам — «О, малады чалавек хоча выглядаць як дарослы? Дай дзядзьку ручку! Пакажы дзядзьку на пальчыках, колькі табе гадкоў!»); спадар Андрый прапанаваў спадару Юр'ю («Ці, можа, проста *Юра*?» — спытаўся ён, хітра мружачыся ў каціныя вусы) сесьці на крэсьліца патаньней.

Спадар Андрый вытрымаў доўгую паўзу, прымусіўшы Банзая пачувацца непамысна. Спадар Андрый незадаволена чмокнуў губамі, нібы яму было западло расказваць нейкаму там *Юрасіку* пра сур'ёзныя справы каледжу. Нарэшце спадар Андрый пазяхнуў і пачаў аповед. Ён вырушыў у доўгую вандроўку па часе, закрануўшы момант заснаваньня, згадаўшы пра статут каледжу, пра тое, што яго пісалі, раўняючыся на статуты розных дапатопных гімназіяў, уключна з той, дзе вучыўся Пушкін; закрануў нетрадыцыйны падыход да дзяцей, нетрадыцый-

ны спосаб выкладаньня, сказаў, што яго, *Юры*, *не*-традыцыйны выгляд будзе спрыяць нетрадыцыйна высокаму ўзроўню пасьпяховасьці і цалкам спалучыцца зь нетрадыцыйнымі традыцыямі іх каледжу. Закрануў з ноткай горычы трагічную сьмерць папярэдняга дырэктара, але адразу ж заліўся легкаважным сьмехам, паведаміўшы, чыста паміж імі, што, зь іншага боку, яно й добра, бо папярэдні дырэктар быў алькаголікам і хварэў на сатырыяз. Яшчэ спадар Андрый выказаў спадзяваньне, што *Юра* паразумеецца як з вучнямі, так і з пэдагагічным калектывам. Пасьля таго, як яны патрэсьлі на разьвітаньне рукі (спадар Андрый зноў пасьміхаўся ў вусы), дырэктар прапанаваў яму часам забягаць да яго на перапынках на каву з каньяком. Банзай дыпляматычна-неакрэсьлена кіўнуў і сказаў: «Магчыма, магчыма, вельмі нават магчыма». Ён пайшоў зірнуць на свой кабінэт.

**6.**

Кабінэт быў на чацьвертым паверсе. Побач зь ім былі норкі псыхоляга і хіміка, спадара Яраслава. Дырэктар так патэтычна і з такім трапяткім піетэтам гаварыў пра пакой Банзая, што той пачаў думаць пра яго ўжо не іначай, як пра *Кабінэт* з трыма вэнтылятарамі з чырвонага дрэва, пісьмовым сталом з эбэну і звышсучасным антыгемараідальным крэслам з падлакотнікамі і ўшытым у сядзеньне масажнікам «Задніца-1». Ды ў дадатак з панарамным люстраным акном на ўсю сьцяну.

Адчыніўшы замкнёныя на ключ дзьверы, Банзай амаль адразу ж зачыніў іх і пайшоў далей па калідоры, гадаючы, якім гэта цудам ён патрапіў у сьценную шафу...

І толькі калі ён прайшоў увесь чацьверты паверх шосты раз, сэрца падказала яму, што гэтая вось сьценная шафа і БЫЛА яго *Кабінэтам* з вэнтылятарамі, эбэнавым бюро і панарамным зацемненым акном.

**7.**

У норцы было акно, вельмі шчыльна застаўленае ўсялякімі табліцамі і графікамі. Яшчэ там быў малюпасенькі пісьмовы столік зь лякаванай вагонкі і маленькая кніжная шафа, якая ў параўнаньні з усім іншым выглядала проста гіганцкаю. Банзай адчыніў шыбу, упускаючы вострае горнае паветра. Акно выходзіла проста на лес. Калі высунуцца зь яго па пояс і паглядзець направа, можна пабачыць дзяўчатаў у інтэрнаце.

Цягам наступных трох гадзінаў Банзай прыбіраўся ў сваім *кабінэце*.

## Разьдзел 2

### 1.

Суседзямі па норках былі псыхоляг і хімік. Абодва выявіліся надзвычай адыёзнымі і неардынарнымі тыпамі.

Псыхоляг быў лысы стары мужчынка з малочнай куцай бародкай (ён да сьмеху нагадваў Банзаю вярхоўнага татулю-смэрфа). Яго поўнае імя было Дзьмітро Дзьмітравіч Хорса, але ён прасіў усіх зваць яго проста Дзіма. Нават вучні мусілі так яго называць, бо на любы іншы зварот ён проста не рэагаваў. За сьпінай Дзіму абзывалі «псы-*хо-хо*лягам», бо ён сьмяяўся высока і звонка, так што было выразна чуваць кожнае «*хо-хо-хо*». У Дзімавай норцы вісеў чорна-белы плякат Бітлоў, якія пераходзяць вуліцу па «зэбры», прычым Джон Ленан — босы. «Новы год, Марыська, «Мішэль» і мастурбацыі ў ваннай», — здаралася, мармытаў ён, настальгічна ўперыўшыся ў плякат. Кожны раз, калі Банзай прыходзіў да яго на каву (што ні кажыце, а кавярнічаць зь Дзімам і хімікам прыемней, чым з дырэктарам), падчас размовы Дзіма, трымаючы ў руцэ філіжанку, падыходзіў да плякату і барабаніў пазногцямі двух пальцаў па голых ступаках Ленана, прыгаворваючы: *«Гэта знак. Вельмі важны знак, дружа. Вер мне на слова, Банзаю, гэта знак»*. Дзіма адзіны з дарослых называў Юрка Банзаем. Яшчэ ён (псы-хо-холяг то бок) увесь час пытаўся, калі Банзай нарэшце зробіць сабе *сэпуку*, ніколі, праўда, не тлумачачы, што гэта такое.

Яшчэ ў Дзімавым кабінэце стаяў лёгкі гостры водар травы. Яму было вельмі забаўна назіраць за вучнямі, якія заходзілі ў кабінэт і пачыналі неўсьвядомлена прынюхвацца, водзячы носам і скаланаючыся ад знаёмага паху, нібы сабакі. Асабліва яго весяліла рэакцыя Банзая — яшчэ ніводнага разу таму не ўдалося схаваць нэрвовых дрыжыкаў па ўсім целе. У такія моманты Дзіма падскокваў да яго і, прытанцоўваючы навокал, выкрыкваў: «Ага!.. Ага!..»

Спадар Яраслаў, якога Банзай зваў проста Славікам, таксама быў вельмі загорнутым чуваком. Хударлявы, з доўгімі смалянымі валасамі і чорнай барадой, у пінжаку са скуранымі латкамі на локцях, падчас «фортак» ён фактычна не вылазіў з-за кампутара, хіба што зрэдку прыходзіў пасядзець пад Полам Макартні. На яго твары панаваў асаблівы, блакітна-шэры кампутарны загар, а акуляры, нібы жывыя дрэвы, штогод нарасталі дадатковымі кольцамі-лінзамі.

Пад шыльдачкай з надпісам «Кабінет БІЯЛОГІІ» Юрко чорным Дзімавым маркерам вялікімі літарамі напісаў:

**БANZАЙ**

Хай ведаюць.

## 2.

Паступова, зь цягам часу і навучаньня, Банзай знаёміўся з усім гэтым так званым «пэдагагічным калектывам».

Ён запрыязьніўся з настаўнікам украінскай мовы і літаратуры, спадаром Лесавіком, які меў выгляд стопудовага гоміка, і яго жонкаю, настаўніцай мовы і літаратуры, спадарыняй Лесавіхай, якая выглядала як стопудовая лесьбіянка. Нейкім дзіўным чынам яны складалі досыць неблагую пару.

Ён пазнаёміўся зь Дзяржыславай Чаравухай, маленькай, засушанай, нібы мёртвы верабей на страсе, старушэнцыяй, настаўніцай усясьветнай мастацкай культуры. Яна была сівая, але фарбавалася фіялетавым, каб быць падобнай да Мальвіны. У яе клясе на сьцяне вісела вялікая рэпрадукцыя, прыгожая, калі не сказаць болей — чароўная. Пад рэпрадукцыяй быў надпіс:

### САБАКІ Ў Ф'ЁРДЗЕ КАНДЭРДЛУАРСУК

І сапраўды, дзьве псіны, разваліўшыся на сьнезе, лена пазіралі на гэты самы засьнежаны ф'ёрд Кандэрдлуарсук. Спадарыня Слава вельмі любіла сваіх сабачак і казала, што зьлева — гэта Эрых, а справа — Марыя. Неяк Банзай меў неасьцярожнасьць пахваліць яе калекцыю паштовак розных клясыкаў і імпрэсіяністаў. Спадарыня Дзяржыслава ўвайшла ў экзальтацыю, уласьцівую адно вельмі адданым калекцыянэрам, і сказала, што ў яе дома роўна 3427 паштовак, ніводнай ня менш, і яна ні за што не панясе іх на продаж, нават калі ў хаце ня будзе ні скарынкі хлеба і ніводнага тома Эрыха Марыі Рэмарка. Амаль штодня яна прыносіла яму тэчкі паштовак і кожнага разу нагадвала, каб ён прыходзіў і *заўтра*, бо тады яна прынясе ЯШЧЭ БОЛЬШ новых, *сапраўды рарытэтных* картак, якія ва ўсім каледжы належным чынам могуць ацаніць толькі яны двое. Банзай сапраўды прыходзіў на наступны дзень, праглядаў чарговую пульхную ад паштовак тэчку, зь якой ва ўсе бакі тырчэлі Манэ, Тулюз-Лятрэкі, Дэга ды Ван Гогі. Узамен ён атрымліваў розныя цікавыя кніжачкі для чытаньня ў вольную хвіліну. У спадарыні Дзяржыславы быў вельмі файны кот — чорны, худы, як шкілет, вулічны валацуга, які, кажуць, жыў у каледжы яшчэ да прыходу вялікіх людзей з-за гор. Старэнькая настаўніца на поўным сур'ёзе сьцьвярджала, што часам, знаходзячыся ў гуморы, кот размаўляе. Звалі ката Васілём.

Дарэчы, спадарыня Дзяржыслава яшчэ запрашала Юрка на гарбату зь печывам (ня каву — у яе ціск). Банзай каторы раз зьдзіўляўся: усе так запрашаюць адно аднаго, а самі застаюцца на месцы і п'юць свой келіх кола ў адзіноце.

Яшчэ каледж меў уласнага пісьменьніка, паводле прафэсіі — настаўніка геаграфіі. Усе свае графаманскія опусы (сярод якіх «Яе роту вароты, вачанят яе бляск...», «Я іду ад цябе, мая мілая...», гіт графаманскага сэзону «Ў пошуках цнатліўкі» і рэакцыйны памфлет, які прынёс яму папулярнасьць, — «Буржуа зь пячоры Кро-Маньён») гэты імпазантны спадар («*Вогнішча*»: «Мабыць, найперспектыўнейшы аўтар, даступны ўспрыманню не толькі старэйшага, узбагачанага

духоўна пакалення, але і моладзі»; *«Рудымэнты»*: «Кічмэн № 1 на абсягах Галіцыі, ад Львова да Лембэргу») падпісваў амаль уласным іменем: Заір Ханыгін-Тычында. Ён гаварыў, картавячы, нібы дзядзька з Канады, так, што ўсе літары «Р» у ягонай мове самі па сабе ператвараліся ў «R».

І ўвогуле ён, напэўна, уяўляў сваю балбатню запісанай лацінкаю, як старыя ўкраінскія часопісы, якія выходзілі за часамі Польшчы. Калі раней уласная картавасьць засмучала яго, то з прыходам пісьменьніцкай славы яна нават набыла ў вачах спадара Заіра пэўны дыяспарны шарм. Ён заўсёды гаварыў вельмі пышна і пошла, як і належыць тым, хто дэманстратыўна носіць вышыванкі і друкуецца ў часопісе «Вогнішча».

— Дабrыдзень, спадаrу Юrыю, як маецеся, спадаrу Юrыю? Чы добrа Вашаці спалося, спадаrу Юrыю?

З кожным новым пытаньнем Ханыгіна-Тычынды Банзаю карцела адказаць яму: «Ня Вашаці сабачая спrава, спадаrу Захару».

Увогуле, вельмі жывапісны «калектыў». Але гэта было яшчэ нічога ў параўнаньні зь няшчаснымі, абражанымі на ўвесь сьвет ахвярамі абортаў, якіх чамусьці прызвычаіліся называць ласкавым словам «вучні».

### 3.

Перад сваім першым урокам Банзай вельмі хваляваўся. Як не хваляваўся ўжо з часоў сэсіі на трэцім курсе, пасьля якой, здавалася, усе эндакрынныя залозы, зьвязаныя з эмоцыямі, раптоўна атрафіраваліся.

Выкладчык біялёгіі — Інакенці Ярылаў, у міру Кеша, — які падзяліўся часткай паствы (бо ня меў ужо сілы асемяніць кожнага вучня сваім сьвятым біясловам), сядзеў там, у аўдыторыі, пасьміхаючыся ў чаканьні слаўнай забавы. Банзай увайшоў у клясу.

Усе ўперыліся ў яго. Сярэдняга росту, кароткая акуратная стрыжка, невялікія бакенбарды, цёмныя, як і валасы. Бакі, як у Траволты ў «Брыяліні». Вялікая белая футболка з каляровым словам

**YES**

расфарбаваным у стылі «мама, я малюю!». Добры, спакойны твар флегматыка. Пад словам «YES» напісана «the new art-rock generation». Вялікія шэрыя балахоністыя нагавіцы з глыбачэзнымі кішэнямі і дадатковымі кішэнькамі на каленях.

— Ну што, — выдыхнуў ён, пераводзячы позірк з аднаго бязьлітаснага твару на іншы. — Мяне завуць Юрко Банзай, зьвяртацца проста — Юрко.

Нейкую жахлівую хвілю Банзай усьвядомліваў, што яму больш няма чаго сказаць. Нібыта ўнутраныя галасы нарэшце захлынуліся пустэчаю.

Тут у яго галаве шчоўкнула ідыёцкая думка. Калісьці маладая псыхалягічка, якая прыйшла знаёміцца, зрабіла зь ягонай клясай такую самую штуку:

— Давайце зараз па чарзе ўставайце, называйцеся і кажыце, чым вы ганарыцеся ў сваім жыцьці... ну, так, чым ганарыцеся...

Банзай мімаволі касавурыўся на скептычны твар біёляга, ад чаго ў жываце рабілася пуста, нібы ў вакуўмнай камэры. У клясе распухала, быццам «Тампакс» ва ўнітазе, задушлівая цішыня. «Ні халеры ня выйшла», — прамільгнула ў галаве, як раптам ён пачуў чыйсьці прыемны голас; ён зірнуў на сваю збавіцельку. Гэта была тая дзяўчына, якую ён бачыў сёньня ў такім апатычным стане:

— Мяне завуць Дарця Борхес, я ганаруся тым, што прачытала ўсяго Кінга і Вонэгута. І маю поўную калекцыю альбомаў Джымі Гэндрыкса.

У клясе нехта цяжка ўздыхнуў, а нехта прабуркатаў: «Апяць эта дура».

**4.**

Потым вучні ажылі і нават разварушыліся. І ўжо ўсе хацелі сказаць, як іх ахрысьцілі і чым яны любяць займацца. Банзай стараўся запомніць кожнага, хоць бы па імені. Быў адзін чувак, які назваўся Андрыем Сэмпляваным і сказаў, што ён кайфуе ад электроннай музыкі і гурту «KMFDM». Яшчэ адзін сказаў, што ён ганарыцца тым, што ўжо меў страсеньне мозгу, пералом рабрыны, нагі, пальца на правай руцэ, і ўсё гэта пасьля адной аварыі на мапэдзе, і цяпер ён ні фіга не баіцца. Яшчэ нейкая дзяўчына, падліза да цыбулінаў лабковага валосься, сказала, што яна ганарыцца тым, што вучыцца ў «Алянячай Скуры» (так яны называлі свой каледж), і шчасьлівая, што ў яе будзе такі выкладчык біялёгіі. Яшчэ адзін, Ромка Малаялам, сказаў, што ён сябра «РУН-Віры»[1] і ўмее граць на трубе. Малаялам быў самым патлатым хлопцам у клясе. Былі такія, якія ганарыліся тым, што яны пацаны, былі такія, што ганарыліся сваёй кляснай кіраўніцай або сваім уменьнем граць на «вясьле». Банзай, здаецца, стаў на правільны шлях.

Пасьля ўроку да яго падышлі некалькі дзяўчатак-падлізаў спытацца, да чаго ім рыхтавацца на заўтра, але Банзай ня мог адарваць погляду ад Дарці Борхес, якая сядзела адна на задняй парце і сумна пазірала ў акно. Ужо каторы раз за сёньня Банзай абвінаваціў сябе ў пэдафіліі.

Калі натоўп падлізаў пакрысе рассмактаўся, Юрко пабачыў Сэмпляванага, які круціўся каля дошкі, спачатку пэцкаючы рукі крэйдай, а потым аблізваючы белыя пальцы. У яго была кароткая стрыжка зь вішнёвай мэліроўкаю і ўжо знаёмы Банзаю кампутарна-падвальны загар.

— Слухай, Сэмпляваны...

Сэмпляваны задзёр галаву, яўна ўсьцешаны, што яго заўважылі.

— А як расшыфроўваецца гэты твой «KMFDM»?

[1] «Родная Ўкраінская Нацыянальная Вера» — філязофска-рэлігійны рух, што адраджае паганства, якое лічыць спрадвечнай рэлігіяй украінцаў. Быў заснаваны ў 1965 г. канадзкім эмігрантам Лявом Сыленкам, які сфармуляваў догмы сваёй царквы ў сьвятой кнізе ўкраінскіх нэапаганцаў «Мага Віра» («Магутная Вера»).

— «Kill Mother Fuckin' Depeche Mode», — сказаў Сэмпляваны і пайшоў есьці булачку ў ядальню.

## Разьдзел 3

### 1.

ДарагІ Рамане,

Шчыра дзякую за твой Падарунак, мы яго атрымалІ зусІм нядаўна. Ня буду расказваць пра Здароўе саваё І Брата. Здагадваюся, ты Ведаеш, як Яно.

Мяне ўстрывожыла дзІўная Рэч. ЛялякІ зноў гняздуюць каля дому. Здагадваюся, І тут ты Ведаеш, у чым Справа. Прадбачаю, што з надыходам зІмы ты будзеш праводзІць Рытуал. ЦІ Ўпэўнены ты ў сваІх СІлах? На дадзены момант Спроба ў Медных Буках — найпэрспэктыўнейшая з часоў Прыгодаў у ДанвІчы. За выняткам Увэа І Рыфу Д'ябла, канечне ж. Але ж гэта адбывалася Там! Нават Інсмут НІшто ў параўнаньнІ з тваІм Горадам. Мяне й надалей захоплІвае Думка пра АсаблІвасьць Медных Букаў. Цалкам Разумею, што мае Словы ПерасьцярогІ не выклІкаюць у цябе Сур'ёзных Ваганьняў, але ўсё-ткІ...

Рэчы, якІя ты Атрымаў Бандэрольлю, — падарунак ад Ф. Выкарыстоўвай Іх РазважлІва І Працягвай Абдумваць І АналІзаваць папярэднІя Разы. Беражы сябе.

Твой У.

МІскатонІк,

штат Масачусэтс

8-14-2000

ЗША

P.S. ПаведамІ мне, цІ ты, выпадкам, не заўважыў якІх-небудзь Знакаў.

### 2.

У сьнежні 1995 году ў адной са львоўскіх школаў была зьдзейсьненая дывэрсія. Менавіта ў гэтай школе вучыўся Банзай, які быў тады ў адзінаццатай клясе.

Пад сьцяну школы нехта насыпаў вялікую кучу капсулак, у якіх былі нейкія пігулкі. Прэпарат пад назвай тарэн. А раз дывэрсія прыпала на сьвятога Міколу[2], ня выключана, што капсулы падкінуў менавіта ён.

[2] 19 сьнежня.

Банзай даведаўся, што тарэн кладуць у вайсковую аптэчку. У выпадку, калі жаўнеру, скажам, адарвала руку, ён можа выпіць адну таблетку, паправіць пілётку і адважна рушыць у бой, не адчуваючы ніякага дыскамфорту. Так, прынамсі, тлумачыў яму Дождж, вялікі спэцыяліст у сфэры «калёсаў». Тарэн быў надзвычай моцным абязбольвальным.

Нейкі фармаколяг-самавук беспамылкова ідэнтыфікаваў прэпарат і сам у першую чаргу нарабіў сабе запасаў, набіваючы імі рот, кішэні і ранец. Тарэн павольна, але няспынна пашыраўся сярод вучняў, і ўжо праз паўтара дня ў школе практычна не было чалавека ў здаровым розуме, які б не пакаштаваў дзівосных пігулак. Вучні елі яго проста так, запіваючы вадой з крану, кідалі ў кампот выдатніцам, якія пасьля гэтага лёгка аддаваліся проста ў клясе на парце, назапашвалі ў таемных месцах і зноў глыталі, глыталі, глыталі... Нават настаўнікі (употай, канечне ж) каўталі «калёсікі» тарэну. У невялікіх дозах ён выклікаў падвышаны настрой, трываласьць цела (нібы цябе нацерлі кацінай мятай) і спэцыфічную хаду: здаецца, што ў цябе на нагах спружыны, і ты ня йдзеш, а плаўна скачаш. Вучні, закінутыя тарэнам, сікаліся ад сьмеху, гледзячы, якімі плаўнымі, зацяжнымі скачкамі ішоў да іх на ўрок гісторык альбо географ. Праўда, на трэці дзень дывэрсіі тарэн кудысьці падзеўся (ці ня ў тумбачку гісторыка альбо географа?), але ўсё ж кішэні шмат у каго расьпірала ад чагосьці цьвёрдага і прадаўгаватага. Можна сказаць, ад нейкіх капсул.

Банзай ня быў ані сквапным, ані разьвіў у сабе рэфлекс Плюшкіна, ён паклаў у кішэню ўсяго адну капсулу з «хіміяй». Дзьве таблеткі ён ужыў у школе, запіўшы на перапынку вадой з-пад крану.

Банзай ня памятаў, як дайшоў да спартзалі, патрапіўшы акурат на баскетбольны матч. У той час, калі на пляцоўцы, нібы варыва ў рэторце, бурлілі жарсьці, у спартзалю зайшоў ЁН. Не зважаючы на гульцоў, ён лёгкім, спружынным крокам паскакаў праз залю і ўсеўся на лаўцы проста каля настаўніка фізкультуры. У таго ад афігеньня з роту выпаў сьлінявы сьвісток і адняло мову. Таму ён не сказаў Банзаю ні слова.

Усё яшчэ пачуваючыся цудоўна, Банзай пачаў разглядаць цэнтральнае кола, намаляванае ядавіта-чырвонаю фарбаю (такога, ведаеце, адценьня «вырві-вока»). Празь нейкі час кола пачало круціцца, да чырвонага дадалося яшчэ некалькі колераў, якія то згасалі, то ўспыхвалі. Банзай ня мог адарваць вачэй ад гэтага відовішча. Раптам ён зразумеў, што гэта звычайная лятучая талерка. І сапраўды: лятучая талерка з барвавымі агнямі паднялася ў паветра, ціха гудучы, нібы вэнтылятар. З крыкамі: *«Ну і яно! НЛА ў спортзалі — хто б мог падумаць?»* Банзай выбег з памяшканьня. Больш яго ў той дзень ніхто ня бачыў.

### 3.

Наступныя некалькі гадзінаў былі чорнай дзіркаю ў ягонай памяці. Ён апамятаўся ў сваім пад'езьдзе. Банзай ішоў дадому.

Тата, як заўсёды, быў на працы. Бабуля сядзела дома.

— Мый рукі, будзеш есьці, — так яна, здаецца, сказала.

Але Юрко ня быў упэўнены. Мыючы рукі, ён каўтануў трэці тарэн.

З ваннай у люстра было відаць вешалку, на якой вісеў татаў хатні халат. Банзай памыў твар вадою і спытаўся ў бацькі, якога пабачыў у люстры, чаму ён ужо дома. Тата сказаў, што ад каго-каго, а ад свайго сына ён не чакаў такіх глупстваў, якіх Юрко нарабіў сёньня ў школе. Банзай штосьці адказаў яму (штосьці такое выключна дасьціпнае, але што? — ён ня мог згадаць), і тут прычыкільгала бабуля і спыталася, з кім гэта ён тут зюзюкае.

Банзай сядзеў на кухні і еў боршч. Бабка зваліла да адной са сваіх сябровак-перастарак. У яго акурат завязалася цікавая дыскусія з імбрыкам. Здаецца, нешта на тэму белых гарошкаў на імбрыкавым пузе.

Бабка вярнулася, і Банзай вельмі ціха сказаў імбрыку, што ня выдасьць старой ані слова зь іхнай размовы.

Імбрык, здаецца, ухвальна паставіўся да гэткага рашэньня.

### 4.

З наступнага дня Банзай запомніў толькі невялічкія, як цыдулачкі, урыўкі. Зранку ён пракаўтнуў рэшту тарэну — тры пігулкі. Зусім не арыентуючыся ў часе, ён прапусьціў першы ўрок, альгебру. Сеў на прыступкі перад школаю, дзівячыся, чаму ніхто не ідзе на ўрокі.

Нарэшце на даляглядзе зьявіўся завуч. Ён зьдзіўлена спытаўся ў Юрка:

— Чаго гэта ты, Банзаю, не на ўроку?

— Ды во, бляць, чакаю гэтую ёбаную альгебру.

У завуча адвісла сківіца. Ад каго-каго, але ад Юрка пачуць такія словы ён чакаў менш за ўсё. Далей былі выдзертыя старонкі.

Вярнуўся (апрытомнеў) Банзай каля нейкага кабінэту. Ён сьмела, падскокамі, уваліўся ў сярэдзіну, патрапіўшы на альгебру ў паралельнай клясе. Ішоў ужо трэці ўрок.

Юрко, весела пасьміхаючыся, сеў за заднюю парту. Настаўніца спрабавала апамятацца; усе вучні радасна зіркалі на тарэнамана.

Настаўніца ўжо вярнулася ў норму і працягвала ўрок. Хлопец побач з Банзаем небясьпечна разгойдваўся на крэсьле. Раптам зэдаль з трухлявага дрэва з трэскам разваліўся, і каржакаваты малец гучна ляпнуўся на зямлю.

Банзай дзіка зарагатаў, падарваўся зь месца і выбег з клясы. Потым знаёмыя пераказвалі, што гэты шалёны сьмех было чуваць аж на трэцім паверсе.

Далей зноў ідуць выдзертыя старонкі.

### 5.

На трэцім тыдні навучаньня Банзай абвясьціў сваім падшыванцам, што па аўторках, калі ў іх няма першага ўроку, будзе факультатыў. І кожны, чыйму сэрцу не абыякавы чароўны сьвет біялёгіі, няхай прыходзіць, ласкава запрашаем.

Увогуле, у Банзая былі тры падшэфныя клясы, але *гэтая*

(Дарця Борхес)
зь невядомай прычыны падабалася яму найбольш. У думках ён называў яе «сваёй».

Перад першым урокам, у панядзелак, была гучная буча, дзень народзінаў нашага ўлюбёнага дырэктара — дзядзькі Андрыя. Усе вучні (а дзяўчаты-падлізы асабліва) ад усяго сэрца віталі імяніньніка з урачыстым саракоўнікам. А Заір Ханыгін-Тычында нават напісаў мадрыгал у ягоны гонар. Мадрыгал начапілі на дошку аб'яваў, але перад гэтым ён быў прачытаны Аўтарам на імпрэзе як Тост Дня (Аўтар няцьвёрда стаяў, хаваючы лёгкую адрыжку выпячваньнем вуснаў, і ня зводзіў падчас дэклямацыі зь юбіляра пачырванелых масьляных вачэй). Вось гэты цудоўны мадрыгал:

*Ад сэрца ўсяго з юбілеем віншуем,*
*Мы вас паважаем і вельмі шануем.*
*Мы дзякуем вам за адданую працу,*
*Жадаем вяселля і многа багацця,*
*Не знайце праблем вы, душой не старэйце,*
*І, канешна, ніколі ў жыцці не хварэйце.*
*Хай лёс ваш складаецца толькі шчасліва,*
*Гучаць хай прыемныя толькі матывы.*
*Высока трымайце працоўную планку.*
*Хай срэбныя росы абудзяць уранку.*
*ЗЯМНЫ ВАМ ПАКЛОН!*

Юрка насьцярожыла адно: навошта «росы абудзяць уранку»? І чаму росы, а ня угры ці фіны? І ўранку, а не нэптунку, плютонку ці, скажам, сатурніянку?

Тым часам непрызнаныя дзіцячыя таленты таксама прыклалі сваю шкадлівую ручаньку да цёплых вітаньняў. Нехта дапісаў гелевай асадкаю, імітуючы шрыфт віншаваньня:

*Солнце, воздух и вода*
*Не помогут никогда,*
*Лишь активный онанизм*
*Укрепляет организм.*
*ЦАЛУЕМ!*

**6.**

26 верасьня, у аўторак, адбыўся чарговы факультатыў. На ўрок прыходзілі розныя людзі, у пошуках ведаў ці проста з падхалімскіх меркаваньняў.

Асноўным генэратарам падхалімажу была Іра Каркуша. Банзаю яна вельмі нагадвала Рыбу-Сонца з мульціка пра Умку. Ад яе ішлі няспынныя флюіды пад-

лабуньваньня. Яна стала своеасаблівым гуру, ідэолягам гэтага тонкага і вельмі няпростага занятку. Каля яе згуртавалася яшчэ чатыры дзяўчыны такога ж веравызнаньня.

Банзай зайшоў у клясу. Там сядзела ўжо трое хлопцаў, Ігарок Лель, як яго ўсе называлі, — сярод іх. Яго Банзай бачыў падчас няўдалых спробаў падкаціцца да Дарці. Ну і, канечне, Каралева Падхалімажу са сваім картэжам. Яна села за другую парту... Ня надта блізка, каб ня выдаць адразу сваіх плянаў, але й ня надта далёка, каб страціць уплыў на Юрка.

Банзай ужо меркаваў пачынаць урок. Ён стаяў пасярод клясы, зьбіраючыся распавесьці пра цыкль трыкарбонавых кісьляў, калі ў клясу ўвайшла Дарця Борхес. Яна павіталася, скінула лёгкую восеньскую куртку, шпурнула на крэсла скураны заплечнік і села ў пустым шэрагу, дзе нікога не было (далей ад усіх, мабыць). Яна зьлёгку пасьміхалася, чакаючы, чаго гэткага выдасьць сёньня Банзай.

Раптам азвалася Рыба-Сонца.

— Слушай, Дарця, ты чыво сюда прыпёрлась?

Дарця павярнула да яе галаву і нешта праартыкулявала вуснамі. Што менавіта, відаць не было, бо на твар з аднаго боку насунуліся валасы.

— Сама туда ідзі. Валі адсюль, паняла? — гучна працяўкала Рыба-Сонца.

— Да! Валі! — гекнула адна зь ейных сяброўак. — Меньшэ народу, большэ кіслароду!

Банзай пабачыў, як здрыгануўся твар Дарці. Ён быў хацеў сказаць, што на ўрок можа прыходзіць кожны, хто хоча, але Дарця ўжо ўзьнялася і павольна пайшла да выхаду. Яе чорныя, зьвілістыя на кончыках валасы зноў закрывалі твар, але яна адкінула іх адной рукой. Ён заўважыў, што яна да таго ж закусіла ад крыўды вусны. Перад выхадам Дарця люта пнула парту і зьнікла за дзьвярыма. Юрка зьдзіўлена падумаў, што яна зусім не рабіла супраціву. Проста капітулявала. Відаць, на яе тут не па-дзіцячы ціснуць.

Рыба-Сонца і яе пасьлядоўніцы задаволена пасьміхаліся.

«Атлічна, дзевачкі, — падумаў ён. — Шчас я вам устрою ўрок».

— Тэма сёньняшняга ўроку... — Банзай адчуваў, як яго абмацваюць дзявочыя позіркі, — тэма ўроку... Спэрма!

Дзяўчаты ўмомант прыпухлі. Магчыма, усё праз шматабяцальную інтанацыю... Гэта добра.

— Спэрма... — Юрко расьцягваў слова, адчуваючы яго клейкасьць і мінэральны пах. — Як вядома, спэрма — вельмі каштоўны касмэтычны прадукт. Цяпер ВЕЛЬМІ шмат крэмаў вырабляюць на аснове семеневай вадкасьці. Гэтымі крэмамі вы мажаце сабе пыскі... э-э-э... тварыкі. АЛЕ... Так-так, у кожнага каштоўнага касмэтычнага прадукту ёсьць *плойма* сваіх *АЛЕ*. І чым каштоўнейшы касмэтычны прадукт, тым гэтых АЛЕ болей, і тым яны больш небясьпечныя. Вось, у прыватнасьці... якія вы, скажам, ведаеце плоцевыя гармоны, што зьмяшчае спэрма?

— Ну... тэстастэрон, андрастэрон, — адразу знайшлася Рыба-Сонца.

— Абсалютна слушна, Іра, — дзяўчына ажно зазьзяла. Ён працягнуў: — І гэтыя гармоны адказваюць за другасныя плоцевыя прыкметы. Абваласеньне цела, напрыклад. І таму...

У гэтым месцы Банзай засьцярожліва падняў палец. Яго погляд пераходзіў ад аднаго хлопца да іншага, абіраючы мішэнь для ўдару.

— ...А таму ў мастурбантаў, то бок тых, хто займаецца мастурбацыяй, на руках, як наступства трапляньня на далоні спэрмы, могуць расьці — *і, што самае непрыемнае, растуць* — ВАЛАСЫ.

Ігарок, зусім забыўшы, дзе ён, паднёс далонь да вачэй і павярнуў яе да сьвятла, каб лепей было відаць; тое самае, толькі крадком, зрабілі і іншыя алені.

— Але гэта яшчэ ня ўсё! — задаволены, Банзай перавёў погляд на «дзевачак». — Вельмі істотным ёсьць тое, што ў спэрме ёсьць што? — спэрматазаоны, або спэрматазоіды, ці спэрміі, каму як падабаецца. Як вы ўжо ведаеце, у галоўках спэрміяў зьмяшчаецца так званая гіялюронідаза, фэрмэнт, што распускае рэчыва, якім абароненая заплодкавая вуза: гіялюронавую кісьлю. Але ці ведаеце вы, што гэтая гіялюронавая кісьля ў той жа час ёсьць асновай сеткавіцы вока. У мэдыцынскай практыцы неаднаразова зафіксаваныя выпадкі страты зроку праз трапляньне спэрмы ў вока! — Банзай задаволена ўсьміхнуўся. З Рыбы-Сонца зьляцелі ўсе фарбы, яна пабялела, як сьцяна. — Задумайцеся: гіялюронідаза распускае сеткавіцу! І вярнуць зрок можна толькі перасадзіўшы новае вока. Так што... — яго голас тут жа перайшоў на інтымны шэпт, — будзьце асьцярожныя, мае мілыя.

— А... а сьлепата поўная? — спыталася Рыба-Сонца стурбаваным голасам.

— Абсалютная.

— А якімі... якімі сродкамі можна зьнерухоміць спэрміі? І ці гэта неяк лекуецца? — яе голас рабіўся ўсё слабейшы.

— Ну-у-у... — працягнуў Банзай. — Як табе, Ірына, вядома, спэрміі зьнерухомліваюцца ў кісьлінным асяродзьдзі. Так што, калі табе на вока трапіць кропля спэрмы, ты можаш прамыць яго сярністаю кісьляй. А лекаваньне... Тут, на жаль, толькі адно. Выразаньне пашкоджаных тканак.

Банзая несла ўсё мацней і мацней; ён ужо хацеў расказаць сваім пераляканым вучням, што прадбачлівыя эўрапейскія сэксолягі рэкамэндуюць спэцыяльныя *акуляры*, асабліва надзейныя — гэта маркі *Sex-O-Vision*™, а таксама *Oral-Eye*™, але ў апошні момант стрымаўся.

Калі адведзеныя салодкія сорак пяць хвілінаў мінулі, Банзай шырока пасьміхнуўся сваім даверлівым слухачам і сказаў:

— Ну, усё, да трэцяга ўроку, пакуль, — і выйшаў з клясы.

Як казала Папялушка Курта Вонэгута: «Б’е гадзіньнік, курва маць, трэба з балю ўжо ўцякаць!»

**7.**

Шаноўны спадару Рамане Корый!

Мы атрымалі Вашую замову на кнігу «Cultus Vermi». На вялікі

жаль, мы ня можам даслаць Вам арыгіналу, а таму абмяжоўваемся толькі дублікатам, перавыдадзеным у 1879 г. пад арыгінальнай рэдакцыяй В. І. Эванса-Вэнтца. Пайшоўшы Вам насустрач, мы памяншаем кошт з $ 21 000 да $ 4995 за дублікат.

Запоўніце пададзены купон і дашліце не пазьней за кастрычнік 18 г.г. Шчыра дзякуем за замову, Кампанія «Sator, Arepo, Tenet, Opera & Rotas Libromania Limited»,

Міскатонік,

Штат Масачусэтс,

9-3-2000 ЗША

**8.**

У той жа дзень, калі адбылася векапомная лекцыя па тэхніцы бясьпекі ў галіне сэксу, праз тыдзень пасьля пачатку праблем са снамі і за два месяцы да сапраўднага кашмару, Банзаю нанесьлі два візыты. Абодва адбыліся пасьля трэцяга ўроку, на вялікім перапынку.

Першай да яго зайшла Рыба-Сонца, Кафка падхалімажу, Дзюма-бацька па колькасьці скораных настаўнікаў, Яе Асьвечанасьць і Пышнагрудасьць Іра Каркуша. Яна была дзеўка ў целе: моцна зьбітая, мякенькая, як бабульчыны аладкі, з магутнымі пругкімі грудзямі і галоднай усьмешкай спраглай да ведаў дзяўчынкі. У яе была нездаровая цяга да тлустай цёмнай касмэтыкі, і яна пастаянна падводзіла губы тушавым алоўкам, каб контуры былі выразьнейшыя. Яшчэ яна была вельмі кідкая на ўсялякага роду біжутэрыю, збольшага цяжкую і масіўную.

— Прывет, — пачала яна.

— Прывітаньне, — адказаў ён, пасьміхаючыся. Чаго ён не любіў у дзяўчатах, дык гэта калі яны казалі «прывет» і «дзыскацека».

— А эта... эта ўсё праўда, што вы... што ты расказваў на факультатыве?

— На поўным сур'ёзе. Хочаш — магу нават табе даць кніжку пачытаць. Там пра гэта шмат напісана.

Банзай нахіліўся наперад і выбраў з шэрагу іншых фаліянтаў цяжкі том, абгорнуты белай паперай. На карэньчыку Банзаевым почыркам было напісана.

## СЭКСАПАТАЛЁГІЯ:

## траўмы, вычварэньні і іншыя цікавыя выпадкі

Насамрэч гэта была ягоная ўлюбёная «Астралёгія для лохаў» Стаха Пэрфэцкага[3].

[3] Пэрсанаж раману Ю. Андруховіча «Пэрвэрзія».

— Ды не-е-е, спасіба... — Іра спалохана скрывілася на кнігу.

— Ну, не дык не... А ты нешта хацела спытаць? — лена пацікавіўся Юрко, задаволена ставячы «СЭКСАПАТАЛЁГІЮ» на месца. Чытаць між радкоў Іра, відаць, не магла, таму працягвала вярзьці розную лухту.

— А вы... ты... Йура, ты не ідзёш на дзыскацеку? У пятніцу будзе, ну і... мы бы...

Банзаю нібы даў у жывот адзін з братоў Клычко. Ён уявіў сабе, як вялікія, нібы калядныя сьняжынкі, шматкі кашуты на паралёнавых плечыках яе блюзкі будуць загадкава сьвяціцца ў ультрафіялеце дыскатэкі, а рот, у тры слаі затынкаваны памадай, будзе пажадліва праглынаць яго, Юрка, язык. Твар адразу ж скінуў зь сябе маску шчаснага спакою. «*Damn fuckin shit-ass!* — чамусьці адразу прыгадаліся ўрокі ангельскай з рэпэтытаркай: — *Cocksucker-mother-fucker!!!*» (гэта быў улюбёны выраз яго выкладчыцы). «Толькі ня гэта, толькі ня гэта!!!» — у думках запанікаваў ён.

— Ух-х-х-х... Гм-м-м-м... Ой-й-й-й-й... Н-н-н-у-у-у... Ты ведаеш, Ірынка, ты ж сама бачыш, гара працы, вашыя кантрольныя трэба праверыць... с-с-с-с... Не... Не-не-е-е-е... баюся, не прыйду... Не-е-е-е... Ды тым больш, я ўжо ня ў тым веку...

Ірынка, яна ж Рыба-Сонца, пайшла ні з чым. Яна зласьліва бразнула дзьвярыма, зусім як Дарця, якую яна выгнала адным сваім уладным словам.

Думкі Банзая папаўзьлі да яе. Як яна лёгка паддалася! Села ў шэраг, дзе нікога не было. Заўсёды адна. Банзаю стала шкада, сапраўды шкада. Такая сымпатычная

(сымпатычнейшая ад рэшты, сымпатычнейшая з кожным днём)

дзяўчына, як правіла, ніколі не бывае адна,

(медныя букі)

хаця ў Медных Буках усялякае бывае... (ён яшчэ ня мог вызначыцца ў сваім стаўленьні да гэтага гораду, але быў перакананы, што, у адрозьненьне ад Дарці Борхес, ён яму падабаўся ўсё менш і менш. А Дарця...)

Нечакана ў дзьверы пастукалі — і ўвайшла яна. Дарця Борхес.

Банзай разгубіў усе свае думкі і звыклыя словы. Яго нібы засьпелі голым.

— Прывітаньне, — прамовіла яна, ледзь пасьміхаючыся. Абедзьве яго наведніцы мелі чорныя валасы, але ў першай яны ўжо былы парадкам траўмаваныя living рознымі пэрманэнтамі ды завіўкамі. У Дарці яны былі яскрава чорныя, прамыя і завіваліся на кончыках навонкі. Прыблізна такой даўжыні, як у яго на трэцім курсе: на пяць пальцаў ніжэй за вушы. Яна адкінула валасы з вачэй, так што стала відаць ейны твар. Банзай ціха млеў.

— Ты цяпер вельмі заняты? — спыталася яна пасьля прывітаньня. У Банзая зашчыміла сэрца: няўжо і яна зараз запросіць яго на «дзыскацеку»? А такая, здавалася, клёвая была дзяўчына...

— Ну, крыху ёсьць, а што?

— А ты мог бы мне патлумачыць... ну, расказаць, што ты ім сёньня тлумачыў на факультатыве? — відаць, ёй было няёмка ад таго, што Банзай стаў сьведкам яе выгнаньня. А можа, гэта не было выгнаньне........ Га, Юрасю?

### 9.

Ён радасна (але не занадта, каб не напужаць яе) сказаў, што так, няма пытаньняў, прыходзь пасьля шостага сюды, як паясі ў сталоўцы, і ўвогуле, можаш казаць мне проста — «Банзай».

— Добра, Банзаю, — сказала яна і выйшла, махнуўшы дзьвярыма, якія паволі зачыняліся. Ён ня мог адарваць позірку ад прасторы, што скарачалася ад руху дзьвярэй. Перад тым, як яны цалкам зачыніліся, ён пабачыў, што Дарця павярнулася да яго тварам і памахала яму пальцамі на па-па. Нарэшце дзьверы зачыніліся.

*Ты пэдафіл, Банзай, запомні раз і назаўсёды, ты пэдафіл.*

Ён адмахнуўся ад паскуднага голасу і сеў перакусіць яблыкам і пачытаць «Замак» Кафкі. Пасьля перапынку ў яго «фортка», і ён пойдзе да Дзяржыславы Чаравухі глядзець на Рэнуара.

### 10.

Дарця і сапраўды прыйшла пасьля шостага ўроку, з сшыткам і асадкаю. А Банзай амаль не хваляваўся.

— А пра што ты ім сёньня расказваў? Бо гэтыя ссс... — Дарця ўчасна, хоць і неахвотна замкнула рот.

— Сукі? — па-простаму спытаўся ён.

— Так. Яны. Не хацелі ніхто гаварыць, якая была тэма. Казалі, што я яшчэ маленькая.

Банзай гучна зайшоўся сьмехам і рагатаў да курчаў у жываце. Ён папрасіў яе нікому (а гэтым дзевачкам асабліва) не расказваць *гэта* і пераказаў свой каронны выступ. Пад канец Дарця ўжо па-змоўніцку і шырока ўсьміхалася.

А потым, калі звычайная напружанасьць паміж незнаёмымі людзьмі зьнікла дзякуючы гісторыі, ён расказаў шмат цікавостак, рысуючы ў ейным сшытку цыклі, выпісваючы даўжэзныя назвы фэрмэнтаў (Дарця прызналася, што мае таемную жарсьць да такіх доўгіх назваў), паказваў вучоныя кніжкі па біяхіміі, уцягваючыся ў аповед усё глыбей і глыбей. Зусім адарваўшыся ад рэчаіснасьці, Банзай анігадкі ня меў, што яе цёмныя вочы бегалі па яго твары, заўважаючы ўсе рыскі, кожная зь якіх, на яе думку, была там, дзе ёй і варта быць.

## Разьдзел 4

### 1.

Мінаюць дні, мінаюць ночы...

Так было і з Банзаем. Проста адзін дзень незаўважна зьмяняўся вечарам, і тады Юрко ляжаў у кватэры на канапе, слухаў «Van Der Graaf Generator» або «King Crimson», чытаў кніжкі, рыхтаваўся да заўтрашніх урокаў, думаў пра адну пакінутую ўсімі асобу — пра Дарцю Борхес, калі казаць канкрэтней, еў, піў, спаў,

паліў, думаў пра Дарцю, паліў, чытаў, слухаў «Van Der Graaf Generator» або «King Crimson» (у залежнасьці ад настрою — а ён быў глыбока пэсымістычны, дэпрэсіўны і максымальна філязофскі, так што музыка была якраз тое, што трэба), глядзеў на сонца, што заходзіла, думаў, што сёньняшні дзень — гэта ўжо *даклад-на* апошні пагодны дзень восені, думаў таксама пра Дарцю, паліў, еў яблыкі, разважаў, ці не выкарыстаць яму свой схаваны пад ложкам, у драўляным паглыбленьні рамы, н/з, паліў і думаў пра Дарцю.

Ад гэтага ўсяго на душы ў яго рабілася вельмі тужліва, самотна і вусьцішна. На вуліцах гораду — ні душы. Толькі вечаровае сьвятло сонца ды яшчэ пах дыму, настальгіі і холаду. Пахла зімой. І пустэча на вуліцах. І поўна-паўнютка жоўтага лісьця. Банзай узяў сваю зялёную куртку. Запхаў у кішэню сьвежыя выпускі «Патрыёта» і «Веры, Надзеі, Любові» і пайшоў, каб знайсьці недзе лаўку, пачытаць іхныя бздуры. Калі доўга сядзець у кватэры, нават у пакоі, абклееным нотнымі аркушамі, і паліць, паліць, паліць, то ўрэшце пакой пачынае душыць цябе.

Знадворку было халодна. Холад і дым адразу нагадалі яму пра Солю. Яны гулялі па Кайзэрвальдзе[4], калі была восень.

Ён пайшоў у нейкі парк. Увесь жоўты, за выняткам некалькіх хвояў. За лаўкаю, на якую сеў Банзай, цямнеў ворах пажоўклага лісьця.

Газэта крыху яго разьвесяліла. Ён прачытаў артыкулы пра камэрсанта, якога ўкакошыў ягоны ж бухгальтар, пра згвалтаваную бабулю, сыстэматычна мардаваную сваім суседам-п'яніцам, даведаўся, што ў Самэрсэта Моэма было больш за тысячу дзьвесьце каханак і што ён памёр ад апярэзвальнага лішая, які падчапіў ад наймаладзейшай, той было ўсяго трынаццаць. Газэта пісала, што пад канец свайго разгульнага жыцьця Моэм выглядаў, як цэйлёнскі рыбазьмей, увесь пакрыты лускай лішая. Банзай параўнаў тое, што ведаў ён, з тым, што пісала газэта: выходзіла, што «Месяц і грош», як і рэшту твораў, аўтар ствараў непасрэдна падчас інтымных зносінаў з чарговай путанай.

**«12.30 — прыгоды Супермэна**
**ў фант. серыяле «Прыгоды Супермэна»**

значылася ў праграме.

Потым ішла старонка абуджэньня нацыі, дзе пісалася, што Буда і Заратустра, як, безумоўна, і Госпад наш Ісус Хрыстос, — выхадцы з Галіцыі. Гаварылася і пра тое, што Атыла працяглы час быў выдатным палкаводцам пры галіцкім князю Яраславу. Аўтар прыводзіў нават бясспрэчныя доказы сваёй рацыі: вось жа, назва племені, якое ачольваў магутны Атыла, — гуны — паходзіць ад украінскага слова «гунька», што азначае верхнюю цёплую вопратку з авечае воўны. Ад таго ж аўтара, дарэчы, Банзай даведаўся, што факты, прыведзеныя вышэй, прызнаныя гісторыкамі з усяго сьвету, а сам аўтар атрымаў блаславеньне ад леген-

[4] Царскі лес (*ням.*) — у часы Аўстра-Вугоршчыны — назва аднаго з паркаў у Львове. Цяпер парк вядомы як Шаўчэнкаўскі гай — музэй традыцыйнай архітэктуры і быту.

дарнага Лява Гумілёва.

Такія вось справы.

Фатаздымку «Акт разбэшчваньня непаўналетняй гр. Кліо Аўтарам. Фота Аўтара» ён так і не знайшоў. Цалкам верагодна, фота было надрукаванае ў папярэдніх нумарах часопісу.

Інтэрвію зь мясцовымі жыхарамі, якія бачылі іншаплянэтнікаў, Банзай вырашыў не чытаць і выкінуў газэту ў сьметніцу. Пах зімы. Думкі пра дым. Памяць пра Дарцю, згадкі пра Солю. Пах дыму, думкі пра Дарцю, памяць пра зіму, згадкі пра Солю. Згадкі пра Солю.

Соля.

**2.**

На трэцім курсе, адразу пасьля «мэдыюму», ён ледзь ня зьдзейсьніў найдурнейшы ўчынак у сваім жыцьці. Ад гэтага яго ўратаваў усяго толькі адзін ківок галавы, якога яна так і не зрабіла пасьля пытаньня: «Ці не хацела б ты стаць маёй жонкай?» Пытаньне тычылася яго каханай, Саламіі Ліхаманкі.

Соля вучылася на адным зь ім курсе. Спачатку яна выклікала ў яго нейкую незразумелую агіду сваім сьветапоглядам, потым прыйшло прымірэньне, а потым ён да сьмерці ў яе ўтрэскаўся. А яна, як здавалася Юрку, у яго. Прынамсі, так гэта выглядала.

Але Соля была ня проста разумная, прыгожая, усебакова разьвітая дзяўчына. Факультатыўна ёй яшчэ ўдавалася быць лярвай, курвай, сьцервай і проста сукай. Але ён, Юрко Банзай (*ён, Юрко Банзай!*) з малазразумелай прычыны ўмудрыўся яе пакахаць.

Соля была сапраўдная прыгажуня, з ідэальнымі рысамі твару, тонкай шыяй, даўгімі нагамі і далікатнымі манерамі. Вось, мабыць, што прычароўвала яго так безнадзейна і жалезабэтонна-моцна.

На раньніх (апэрабэльных) стадыях хваробы яго пачало захапляць тое, як Соля бачыць сьвет (а згадайма таго *Юрка Банзая*, якога нястрымна вараціла ад яе поглядаў яшчэ нейкі год таму!). Потым ён пачаў лавіць кайф ад яе ўрокаў французскае.

І, вядома ж, зь ёй было проста неймаверна трахацца.

Тое, што паводле жыцьцёвага пакліканьня Соля была сукай, ён пачаў заўважаць пасьля яе гарбуза. Яна папрасіла крыху пачакаць. Скажам, да канца году. Рашэньне па ўсіх парамэтрах узважанае, аднак Банзай яго не прыняў. Ён хацеў яе *już i teraz*. Таму адмова аддаліла яго і часткова ацьверазіла. Ён задумаўся, ці сапраўды Соля такая ідэальная, як гэта яму здавалася.

Банзай слухаў яе балбатню і пастаянна ківаў. Ад яе прамоваў яму рабілася сумна, што вось гэтая дзяўчына стане яго жонкаю (на той факт, што жонкай яна можа і ня стаць, Банзай ніколі не зважаў). Соля шматкроць паўтарала, што Банзай вельмі абмежаваны. Што яго кругагляд занадта вузкі. Што ён зануда. Так-так, што Юрко Банзай зануда. Ён адно моўчкі ківаў галавою.

Соля хацела перарабіць яго на свой капыл. Хацела прымусіць яго хадзіць на дыскатэкі («Ну ты і зануда, *Юра*, толькі і слухаеш гэтую сваю ідыёцкую музыку, ні на якія дыскатэкі ня ходзіш! Але ж ты і зану-да!»). Неяк яна сказала, што ненавідзіць гурт «Мертвий півень»[5] за тое, што ён спаскудзіў песьню «Франсуа» Ірыны Білык[6]. Банзай стрымана ўцягнуў носам паветра і не сказаў нічога. Бо, на яго думку, за такія словы трэба было адразу біць у морду.

Яшчэ яна абажала карыстацца абаротам «не хачу... але»...

«Не хачу цябе абразіць, Юра, але ў цябе кепскі густ».

«Не хачу крытыкаваць твой выгляд, Юра, але табе доўгія валасы *ну зусім* не пасуюць».

«Не хачу цябе зачапіць, Юра, але гэты твой Пітэр Гэміл — музыка для дэбілаў, поўная безгустоўшчына».

Во як. Яна заўсёды казала «не хачу... але» і заўсёды *хацела*. Заўсёды мела на мэце пакрыўдзіць яго. І чым больш Банзай бегаў за ёй, тым больш яна пранікалася жаданьнем яго *зачапіць*. А Банзай усё бегаў і бегаў, бо проста ня мог безь яе. І толькі пасьля ратаўнічай адтэрміноўкі на «мэдыюме» ён, нібы Сава па дарозе ў Дамаск, раптоўна празерыў.

З набліжэньнем лета Соля ўсё больш і больш аддалялася ад яго і ўюном вілася каля Дажджу Макошы. Тады Банзай і вырашыў спраўдзіць тэорыю сужэнства Ўосан наконт мухаморчыкаў. Губляць не было чаго — ён або атрымае прасьвятленьне, або памрэ, што ў дадзеных абставінах было б вельмі да месца.

Дзякаваць Богу, Банзая адкачалі, а Дождж шчыра пасьмяяўся зь беднай Саламійкі. Потым ён пераказваў Юрку, як яна плакала ў яго на плячы, прасіла, каб Дождж яе хоць бы пацалаваў, бо яна кахала яго, а не зануду Банзая, а ён-такі сапраўды зануда, зь ім няма пра што гаварыць... што яна яго, Дажджа, вельмі-вельмі кахае, што яна яго *хоча*... Дождж на ўсё гэта заліўся гучным сьмехам проста ёй у фэйс. Трахнуць цябе? Няма праблемы. Але калі табе мой найлепшы карэфан Банзай падаўся занудам, сказаў ён скрозь сьмех, са мной ты памрэш ад нуды яшчэ да заходу сонца. Ад нуды.

Пасьля вяртаньня з рэанімацыі ў яго была апошняя спатканка з Саламіяй. Яна коратка сказала: усё, што паміж імі — гэта кепскі жарт, што яна сустракалася толькі са шкадаваньня і да т. п. Хутка і ціха гэта ўсё сказаўшы, Соля павярнулася і пайшла не разьвітаўшыся. Выглядала яна так, нібы ня спала ўжо тыдзень. А яшчэ яна выглядала, як сука, якую згвалціла зграя разьятраных дзікіх сабакаў дынга.

[5] Культавы львоўскі гурт, заснаваны ў 1989 г., легенда ўкраінскага року, сьпявае песьні на вершы клясыкаў украінскага постмадэрнізму.

[6] Украінская поп-сьпявачка, сэксапільная зорка шоў-бізу.

### 3.

Банзай выцягнуў другі часопіс. Баптысцкі весьнік «Вера, Надзея, Любоў». У ім нават не было артыкулаў пра згвалтаваньні. Яго позірк затрымаўся толькі на адным загалоўку: «Аляксій Аляксіевіч: раптоўная сьмерць у няроўным баі на роўным месцы. Белыя плямы і чорныя дзіры шахматнай дошкі аўтабіяграфіі». Мяркуючы па загалоўку, у артыкуле вялося пра асобу, ня менш харызматычную за самога Эндзі Ўоргала, хоць чагосьці канкрэтнага гэтыя радкі ня тычыліся. У сувязі з прысутнасьцю адсутнасьці наяўнасьці хоць якога зьместу Банзай зразумеў, што нічога не зразумеў. Весьнік далучыўся да «Патрыёта» на дне сьметніцы.

Вечарэла і халаднела. Далоні зрабіліся сухімі і халоднымі, толькі твар яшчэ цяплiўся ў промнях заходзячага сонца. Пах палёнага лісьця.

Банзай выйшаў зь бязьлюднага парку, кіруючыся ў пусты цэнтар. Там, пад белай фігурай, мяркуючы па ўсім, — сьвятой Ганны, ён заўважыў нешта цікавенькае. Некалькі старых людзей (па тры бабулькі на кожную сьценку) штосьці гучна выкрыквалі сіплымі галасамі. Банзай сеў на лаўку побач зь мітынгам. Што гэта быў за пікет, ён скеміў толькі па адной шыльдзе, то бок, транспаранце. «МАСКАЛІ, ГЭЦЬ ДАДОМУ!» — было напісана на белай стужцы, склеенай з аркушаў ватману. А пад гэтым гучны надпіс: «Раённае таварыства ўкраінскай мовы імя Тараса Шаўчэнкі».

Ён прыслухаўся да выкрыкаў:

— Да как вы сьмееце? Как вы можэце быць такімі? *Вы не можэце запраціць нам разгаварываць на ўкраінскай мове!* — выгуквала адна з дэманстрантак зь ценю ад транспаранту.

— Да? Ні можэм? А как вы сьмееце называць рускую нацыю на Ўкраіне нацыанальнай меньшасьцью? Га? *Как ваапшчэ а русскай нацыі можна гаварыць такім тонам?* Да велікій рускій народ *нікагда* не был і *нікагда* не будзет нацыанальнай меньшасьцью! Нікагда! Ні ў какой стране! Нікагда!

Банзай зразумеў, што за пяць гадоў, цягам якіх ён не цікавіўся палітыкай, у краіне адбыліся сур’ёзныя зьмены. Ён адразу ж вырашыў не цікавіцца ёй наступныя год так яшчэ пяць. А то і ўсе дзесяць.

Каля дэманстрантаў сумна стаяла жанчына з Закарпацьця. Зь вялікім клункам за сьпінай і ў лахманах. Яна манатонным голасам па чарзе зьвярталася то да адных, то да іншых:

— Прябачце, што вас пряшу, я сама ня месная, дайце нескалька капеек, рябёнак бальной, саўсім хвbooранькі, дайце хто што можа... Прябачце, што вас пряшу, я сама ня месная...

Юрко ўзьняўся і пайшоў прэчкі. Падалей ад гэтай квінтэсэнцыі тэатру абсурду, дзе ніколі ня зьявіцца Гадо.

**4.**

Ён туляўся жоўтымі, аранжавымі вулкамі, дзівячыся чысьціні алей Пашы Ангелінай і Саксаганьскага, Фрунзэ, Дзяржынскага і Шчорса. Што яны там (тут) згубілі? Рэчы выходзяць са строю. Гэта вельмі адчуваецца ў Медных Буках. У горадзе практычна няма людзей у веку дваццаці-трыццаці гадоў. Старэньне і выраджэньне нацыі тут бачнае, як пад мікраскопам.

*Рэчы ламаюцца, выходзяць са строю і танчаць. Напэўна, таму, што паўсюль гучыць музыка. І голыя пары бегаюць пад ціхім месяцам.*

Ён разважаў, чаму тут усё старэе. Была нейкая прычына, нейкі староньні чыньнік, які прымушаў усё рабіцца няспраўным, штосьці напаўняла вуліцы паражнечай, якая ў сваім разьвіцьці пераходзіла спачатку ў халодны адчай, а потым у прыхаваны страх.

(Страх: раней ці пазьней ты пачынаеш адчуваць яго ў гэтым горадзе. Магчыма, гэта ў пахах зь лясоў і гор або ў туманах рэчкі. З вогкіх падвалаў і пустых вуліц. З паху самоты і адчаю. Вось адкуль прыйшоў і прыходзіць, і яшчэ прыйдзе страх.

З далёкіх чужых месцаў, якія ў Медных Буках выявіліся надта блізкімі.)

Страх прасякаў Медныя Букі праз сітавіны рэальнасьці, нібы міязмы з балотаў, дзе варушыцца мул.

Вось так! Раней ці пазьней кожны пачынае адчуваць гэтую размытую трывогу.

**5.**

Знакі, яны пачалі зьяўляцца тут і там, у самых неспадзяваных месцах.

У хату Рамана Корыя, марака далёкага плаваньня на пэнсіі, заляцела вялікая сава. Гэта здарылася ўночы, калі ён паліў ля адчыненага акна, згасіўшы сьвятло. Сава заляцела і лётала па хаце, вухкала, наклікаючы бяду. Корый затушыў цыгарэту, выгнаў саву і хуценька спусьціўся ў падвал, дзе ў яго быў кабінэт-бібліятэка. (Пра гэты кабінэт ня ведаў ніхто, а як бы і даведаўся, то вельмі зьдзівіўся б, што *такі* выпівоха, як Корый, мае *такую* бібліятэку; калі б гэты хтосьці прачытаў назвы хоць бы некалькіх кніжак — а большасьць зь іх была на лаціне ці пагрэцку, хоць траплялiся і ангельскія зь нямецкімі, — то спачатку вельмі зьдзівіўся б, а потым спытаўся б, адкуль у Корыя грошыкі на такія рэдкасныя інкунабулы, месца якім — у найлепшых бібліятэках сьвету. У тых аддзелах, куды не пускаюць практычна нікога. Корый узяў са стэляжу таўшчэзны гросбух і пачаў штосьці ліхаманкава запісваць.)

Калі б Банзай разгарнуў чацьвярговы выпуск газэты «Поступ», у рубрыцы «Ў ДВУХ СЛОВАХ» ён мог бы натрапіць на паведамленьне пад такім загалоўкам: «Ледзяная пустыня забірае 15 жыцьцяў. Экспэдыцыя гіне пад гарой Кадаф». У ёй у двух словах гаварылася пра тое, як адна групка вучоных знайшла рыштунак іншай, акурат зьніклай пры нявысьветленых абставінах экспэдыцыі каля паднożжа гары Кадаф у Антарктыдзе. Падазраюць, што вучоных-палярнікаў накрыла сьнегавой лявінай, калі яны акурат натрапілі на

нейкую пячору. Сьмерць экспэдыцыі была па-за сумневамі: рыштунак знайшлі накрытым коркай намерзлага сьнегу зь лёдам, а правізію — зьедзенай толькі напалову.

У Еўкі Навіі ў Медных Буках карова ацялілася двухгаловым цялём. Цяля памерла на трэці дзень.

Совы, якіх мала хто бачыў у меднабукаўскіх лясах, сталі кішэць насупраць каледжу. Часам поначы яны дзіка крычалі і вухкалі. У ноч першых адзімкаў, а палове на трэцюю ночы, калі ўжо ўсе інтэрнаты спалі, Дарця Борхес вызірнула скрозь шыбу на вуліцу. Мост праз рэчку быў вымазаны бледным, халодным мёдам месяцовага сьвятла. На кожным дрэве яна пабачыла дзьве-тры савы, што круцілі галовамі і надзімаліся ад уласнага дыханьня, нібы шэрыя пульсуючыя плады. Месяц паблісквае у іхнім мяккім, бясшумным пер'і.

Вось так! Знакі былі паўсюль. Галоўнае ведаць, куды глядзець.

І ведаць, што яны прадказваюць.

## Разьдзел 5

### 1.

У дзень, калі Банзай гуляў з Дарцяй, было сонечна і страшна халодна як на кастрычнік. Усе сышліся на думцы, што гэты дзень павінен быць апошнім пагодным днём восені. Тады ж пачалі выключаць сьвятло — ва ўсіх раёнах, апроч больніцы і міліцыі, з шостай па дзявятую вечара.

На трэцім перапынку ў калідоры яго вылавіла *яна*, і тэмпэратура цела Банзая, калі ён пазнаў, *хто* яго агукнуў, рэактыўна рванула ўгору. Гэта, вядома ж, была Дарця Борхес. У зацёртым джынсавым камбінэзоне на шлейках і ў белай футболцы, ледзьве ўсьміхаючыся. Зь невядомай прычыны Банзай бачыў яе выразна і востра, нібы аб'еўся сьвятарных грыбоў, бачыў яе так, нібы яна была зьлепкам з асобных, выразных, дробных дэталяў. Яна павіталася і спытала, ці ня мог бы Банзайчык патлумачыць ёй сёе-тое з цыклю Кальвіна, магчыма, *расказаць паглыблена*. Цудоўна! Прыўкрасна! Без праблем, адразу пасьля шостага ўроку, як паясі. Па-па!

Пакуль яны так размаўлялі, паўз іх праплыў, нібы параплаў «Вялікая Місуры», псы-хо-холяг Дзіма. Праплываючы поруч, ён ціхенька падміргнуў Банзаю і выдаў ціхенькае «хо-хо-хо» ў іх за сьпінамі. Зусім таго не жадаючы, Банзай пачырванеў.

Карацей кажучы, Дарця, зрабіўшы яму на разьвітаньне ручкай, пайшла, а Юрко, зьдзіўлена-ўражана лыпаючы вачыма, залез у свой кабінэт.

### 2.

Пасьля шостага ўроку ўсе нармальныя людзі пайшлі ў сталоўку. Банзай сеў за крайні стол, дзе нікога не было, і пачаў трушчыць, а калі папраўдзе, то даволі

млява хлябаць прэсную юшку. Адарваўшы вочы ад супу, ён пабачыў, што каля яго ўжо ставіць талерку і кладзе лустачку хлеба Ірынка Рыба-Сонца. «Бач ты», — уражана падумаў Юрко. А ён ужо думаў, яна нарэшце ад яго адвязалася.

— Прывет! — сказала яна, запіхваючы ў пашчу лыжку з грэчкай.

— Прывітаньне, — адказаў Банзай. Што ён ненавідзеў у дзяўчатах, дык гэта калі яны кажуць... зрэшты, ня буду паўтарацца. Праблемы са снамі не канчаліся, як ён спадзяваўся, наадварот, прырасталі. Дарці ўдалося нівэляваць гэтыя думкі і нават пацешыць яго, Рыба-Сонца якраз ураўнаважыць чашы шаляў.

Ірачка яўна імкнулася наладзіць кантакт.

— Йура, а ў цібя есьць брацья ілі сёстры?

— Так, сястра Морфій, — ляпнуў ён першае, што прыйшло да галавы. — А братоў няма.

Рыбіна недаверліва зморшчыла лоб.

«Цяжкі выпадак, доктар. Можа, ампутацыя? Га? Маленечкая ампутацыйка перад трапезай, для апэтыту... Ампутацыя яшчэ ж нікому не зашкодзіла, давайце ампутуем! Ну калі ла-а-а-аска!»

Але Банзай зьлітаваўся зь яе, цяжка ўздыхнуў (тым самым кажучы садыстувычварэнцу ў галаве, што ніякай ампутацыі з тэхнічных прычынаў ня будзе) і спытаўся ў адказ:

— А чым ты цікавісься?

— Ну-у-у... — Ірчык склала губы банцікам. — Да ўсім цікаўлюся, а ты?

— Ясна, а музыку якую слухаеш? — зноў не зусім ветліва не адказаў ён.

— Ну-у-у, «Атпетыя машэньнікі»... можэт, слышаў «Запрышчонныя барабаншчыкі»? А так — там ціпа Ірыну Білык, «Рукі Ўверх», а ты шо?

Банзай у думках усплёснуў рукамі ў драматычнай вусьцішы: ну выка(ка/па)ная Соля!

— Ну-у-у... — завёў ён, насьледуючы яе інтанацыю і захоўваючы на твары блажэннасьць юродзівага. — Для душы — «King Crimson», Пітэра Гэміла, а так — там усялякія ціпа сёстры Байко[7], «Льомі-Льом»[8], Алсу, «Рукі Ўверх» там... «Запрышчонныя барабаншчыкі»... ну, ты паняла...

Рыбіна, не адчуўшы ніякай дысгармоніі паміж назвамі, спыталася:

— А эта как, цяжолая музыка, да? Ты любіш цяжолую музыку? Патаму шта... таму шта ты выглядзіш так, бутта ты слушаеш цяжолую музыку...

— Цяжолая музыка??? — Банзай удаў, што не разумее. — Да не, да шо ты! «Льомі-Льом» — гэта не цяжолая музыка.

Яны б яшчэ доўга спрачаліся, што ёсьць «цяжолым», а што проста «для душы»... Банзай пачуваўся Марка Пола, які расказвае лапавухім аднавяскоўцам пра дзіўных марскіх зьмеяў, пра трох кітоў, якіх ён *сапраўды* бачыў, пра прыўкрасных сырэнаў і г. д., абцяжарваючы іх даверлівыя вушы ўсялякай макаронай: «ра-

[7] Даніїла, Марыя, Ніна Байко — сямейнае фольк-трыё, якое грымела на ўкраінскай савецкай эстрадзе ў 1950—1980-я гг.

[8] Адэскі расейскамоўны бойз-гурт, шалёна папулярны ва Ўкраіне ў 1997—2000 гг.

кушкамі», «зорачкамі», «ражкамі», «спагеці» ды й проста вэрмішэльлю першы гатунак «экстра». Іх дыскусія, а хутчэй споведзь Марка Пола, трывала б яшчэ хто ведае колькі, але ўсе гэтыя спрэчкі, нягледзячы на іх поўную бязглуздзіцу, усялялі ў Рыбу-Сонца нічым не апраўданую ўпэўненасьць, што яна прыйшлася студэнціку да густу.

Таму Банзай вырашыў скарыстаць аргумэнты, вагомейшыя за музычныя густы.

— Паслухай, Іра, а ты ніколі не тапіла шчанюкоў? Маленькіх, яшчэ сьляпых, такіх бездапаможных?

Іра гідліва падабрала вусны.

— Не, а шо?

— Ды так, думаю, пытаюся, магчыма, натраплю на аднадумцаў. Ведаеш, калі я быў маленькім, я жыў у Станіславе[9]. І ў бабулі быў сабака, Дзінка, сучка, вельмі сымпатычная. І яна два разы на год давала нам вывадак шчанючкоў. Але ты сама разумееш, выгадаваць сабаку — гэта да фіга грошай... ну, амаль. Шчанюкоў кожнага разу было восем, дзевяць... бывала і пятнаццаць. Такія маленькія, мілenькія ўсе такія, з такімі вушкамі, так бы іх і буськаў, і трымаў на руках!

Іра зачаравана слухала яго нявыдуманую гісторыю.

— І тады бабка закрывала Дзінку ў будцы, падклікала мяне малога і казала, каб я іх усіх патапіў. За гэта яна мне давала цукерку. І ведаеш што? Я тапіў іх! Кожнага разу! Двойчы ў год! Як іспыты ў вас у каледжы. Летам і зімой. Ведаеш, як? Бярэш старое вядро, наліваеш вады, але толькі да паловы, каб яна потым ня выплюхнулася... І бярэш яшчэ адно вядро. І бярэш *сабачак*. Кідаеш іх у ваду... Яны тады, між іншым, ня брэшуць, бо яшчэ ня ўмеюць, а хутчэй скуголяць. І тады прыціскаеш зьверху другім вядром. І адразу ж разумееш — зашмат ты набраў у вядро вады, ці ў самы раз... а потым яны пачынаюць пускаць носам бурбалкі... пад вадой. Ты б як пабачыла гэтую камэдыю, цэлы дзень рагатала б. Такая забава! — Банзай экстатычна закатваў вочы, усім сваім выглядам паказваючы, як яму тады было здарава.

Яго ружовыя ўспаміны пра дзяцінства, гэтыя салодкія гады задоўга да плоцевага высьпяваньня і вульгарных падлеткавых прышчоў, маглі б цягнуцца цэлую вечнасьць, калі б каля Банзая ня села Дарця. У руках яна трымала два кубкі кампоту: для сябе і для Юрка. Ён мякка ёй пасьміхнуўся, дзякуючы за пітво. Рыба-Сонца пабачыла гэтую ўсьмешку і ціха скрыгатнула зубамі.

Дарця села вельмі блізка ад яго, можна сказаць, цесна, так, што ён чуў цеплыню яе рукі.

— Дарця! Валі адсюда. Шо ты сюда прыпёрлась?! — загаўкала скрозь зубы Ірачка. Яе барвова нафарбаваныя вусны люта скрывіліся. На іх тлуста блішчэлі кроплі лою ад жылістага мяса ў грэчцы. Дарця не сказала нічога, роўна як і не кранулася зь месца. Яна паднесла да роту кубак, закрываючы ўвесь твар, апроч

[9] Назва Івана-Франкоўску да 1962 г. Цяпер — неафіцыйная назва гораду.

вачэй, трымаючы яго абедзьвюма рукамі, нібы дзіця, і пачала гучна сёрбаць кампот. Яна ня зводзіла зь Ірачкі позірку.

— Ты шо, аглохла? — Рыба-Сонца заводзілася ўсё больш ад таго, што *Дарця* (так-так, Дарця) наважылася не паслухацца. Раптам Ірчык зразумела, што на яе цісьне ня толькі позірк дзяўчынкі. Банзай адклаў лыжку ўбок і падпёр падбародзьдзе запясьцямі, так, каб не была відаць усьмешка. Ён глядзеў на яе вельмі ўважліва, нібы на рэліктавы від лятымэрыі, вылаўлены ў дзядулевым стаўку каля хаты.

— Нублядзьфсё! — працадзіла яна.

Рыба-Сонца бразнула лыжкай (тут ніхто відэльцамі ня еў, бо іх проста не было), з грукатам узьнялася на ўвесь свой рост валькірыі і панесла талерку да стойкі, дзе складалі брудны посуд.

Юрко моўчкі даеў суп. Дарця моўчкі, хоць і вельмі гучна, дасёрбала кампот. З-за кубка быў відаць край усьмешкі.

**3.**

На вуліцы стала сапраўды халодна, як на кастрычнік. Ходнікі былі сухія і белыя ад замерзлай вільгаці. Калюжы сьцягнула марозам. Лісьце на холадзе зьмерзлася ў хрусткія пласты, што рыпелі пад нагамі. Банзаю было халодна, бо ён апрануў толькі свабодную зялёную мяккую футболку з даўгімі рукавамі і лёгкую зялёную вятроўку. Было халодна нават вушам і пальцам на нагах: пад чаравікамі былі тонкія шкарпэткі, а шапку ён не напяў прынцыпова: у свае дваццаць два ён усё яшчэ меркаваў, што сапраўдныя мужчыны шапак ня носяць. (У яго шафе ўсё-ткі *была* адна, але Банзай яе вельмі саромеўся.)

Дарця, таксама бяз шапкі, але з шалікам на шыі і ў пальчатках, спачатку схапіла яго за далонь, хукаючы на пабялелую скуру (зь яе роту выплывалі хмаркі малочнай пары), а пабачыўшы, што Юрко і далей мімаволі цокае зубамі, залезла яму пад руку, так, каб ён абдымаў яе за плечы. Дарця была ніжэйшая на галаву, а з гораў дзьмуў ледзяны вецер, таму Банзай асабліва не пярэчыў. А недзе глыбока ў душы ён нават употай радаваўся гэтаму.

Хаця, праўду кажучы, ён пачуваўся пэдафілам. Банзаю здавалася, што тыя нешматлікія мінакі, якіх яны сустракалі, азіраліся назад, лыпалі вачыма і пераконваліся, што гэта ня сон; яны глядзелі наўздагон маладому чалавеку, які ішоў па вуліцы, абдымаючы за плечы нейкую непаўналетнюю дзяўчыну, «малалетку», як кажуць у Кіеве. Чарговы пэдафіл, падумаюць яны, пацепаўшы плячыма, чарговая рэінкарнацыя Міколкі-Ружовай-Футболкі, вядомага пэдафіла, якому ў 1973 годзе ўдалося згвалціць 59 дзяцей ва ўзросьце ад пяці да дзевяці год, зь іх — 34 хлопчыкі. Кажуць, яго злавілі на спробе гвалту шасьцідзясятага, юбілейнага дзіцяці.

І яшчэ ён думаў пра ўрок, што дала яму Саламія. Пра тое, што ня варта надта прывязвацца да людзей, асабліва — да «малалетак», як кажуць у Кіеве. А яшчэ ён згадаў розныя цікавыя факты са свайго сямейнага жыцьця: пра бабулю, што пабралася зь дзедам у дзевятнаццаць, калі старому было ўжо дваццаць сем, пра сям'ю свайго кораша Дажджа — яго старэйшую сястру, Віку, яго мама нарадзіла

ў сямнаццаць. А замуж выйшла ўвогуле ў шаснаццаць. Тату Дажджу тады, было, дарэчы, дваццаць шэсьць. Таксама чамусьці лезьлі думкі пра тых, якія заляталі дачасна і ня мелі грошай на спарончыкі. Як, напрыклад, яго знаёмы, які кінуў унівэр пасьля зімовай сэсіі. Самі разумееце, чаму.

Ад гэтага насланьня Банзай адбіўся адным махам думкі, адкінуўшы іхнія целы прэч. Дарця ішла побач, выдыхаючы носам сівую пару.

Пасьля абеду яны пайшлі да яго ў каморку. Банзай тлумачыў ёй тонкасьці фатасынтэзу, цёмную фазу. Маляваў графікі, схемы, яна глядзела, расказваў, яна слухала. Калі ён давёў свой аповед да лягічнага канца, інкрустуючы яго цытатамі зь «Біяхіміі» Альбэртса і «Так гаварыў Заратустра» Ніцшэ, Дарця, замест таго, каб падзякаваць і пайсьці ў інтэрнат, спыталася, ці не пайшоў бы ён зь ёй на шпацыр. Гм-м, шаноўнае спадарства... Дарця была цікавай дзяўчынкай. Яна не ўкладалася ні ў якія звычныя фарматы, як альбомы «Мэталікі», і гэта яго вельмі цешыла.

Яна спыталася, ці Банзайчык ня хоча, каб яна паказала яму адно файнае месца. Банзаю было ўжо ўсё адно (пальцы на нагах анямелі), таму ён пагадзіўся.

Яны прайшлі праз увесь горад (паверхня возера на ўскраіне была засланая жоўтым, пажухлым лісьцем; паверхня была люстраная, і ў ёй адбівалася халоднае неба), выйшлі на нейкую замерзлую дарогу каля гары і пайшлі ў кірунку каледжу. За горадам яны сустрэлі толькі адно поўненькае дзяўчо, раскормленае бульбаю. Дзяўчынка выгульвала сабаку рэдкай і вельмі эксцэнтрычнай пароды ***joe-cock***sucker***-спаніель***.

Дарця Борхес расказвала яму пра сябе: пра дэбільных аднаклясьнікаў з Новаяваравску[10], пра яе любоў да Гэндрыкса, Джоплін і Морысана, пра плойму цікавых і проста рэчаў зь яе жыцьця. Яны павярнулі ў горы, знаходзячыся акурат насупраць каледжу, узьнімаючыся дарогай, вычасанай з боку гор. Зьверху былі хвоі зь зялёнымі каронамі і чырвонымі камлямі, унізе бруіўся ручай. Потым яны павярнулі на невялічкую сьцяжынку, мінулі высокі мурашнік і заглыбіліся ў лес. За чарговай хвояй былі непралазныя зарасьці папараці (яна ўжо зьвяла і выглядала нежывой) і выварачанае дрэва. Кроны шчыльна змыкаліся над імі.

— Я прыходжу сюды, калі мне асабліва кепска. Зь імі… — Дарця неакрэсьлена кіўнула ў бок гораду.

— З усімі гэтымі дзевачкамі? — Банзай азірнуўся навокал і сеў на паваленае дрэва. Дарця прытулілася да яго, каб Юрку было цёпла. Яна глядзела кудысьці ў лес. Сумна кіўнула ў адказ. Яна апатычна апісвала розныя здарэньні, зьвязаныя зь ёю і інтэрнацкай супольнасьцю. Банзай даведаўся, што Дарця двойчы на поўным сур'ёзе прасіла камэнданта перавесьці яе ў хлапечае крыло. Тамтэйшыя чувакі яе, прынамсі, паважалі. Але, вядома ж, усе ўпрошваньні засталіся бяз скутку. А клясная абмежавалася толькі настаўніцкай размовай на выхаваўчай гадзіне. Нібы выхаваўчая гадзіна хоць раз камусьці дапамагла.

[10] Горна-прамысловы гарадок у Львоўскай вобласьці на мяжы з Польшчай, сатэліт Яварава.

Таму Дарці заставалася проста іх ігнараваць.

Банзай уважліва выглядаў на яе твары першыя прыкметы сьлёзаў, але іх не было. Вельмі дзіўна. Ці не ўпершыню яму расказваюць штосьці т а к о е не для таго, каб павыхваляцца сваёй драўлянай нагой (як сказаў бы дзядзька Фройд). Яна расказвала не для таго, каб яе пашкадавалі.

Можа, яна адчула, што Банзай не такі чалавек, каб сьмяяцца зь ейных словаў?

**4.**

Дарця яшчэ глыбей залезла яму пад руку. Ён выдыхаў цёплае паветра ёй на шчаку і вуха.

Праз нейкую хвіліну Банзай вельмі асьцярожна сказаў, што лепей бы ім вяртацца, а то яго задніца пасьпела прымерзнуць да кары. Яны спусьціліся ўніз

(пахіігліцы на холадзе, туманная вогкасьць, што асядзе ўначы шэранью, шум ручая ўнізе — сьвядомасьць лясоў?)

да паласатага слупка з намаляванымі на ім перакрыжаванымі дубовымі лісткамі. Дарця папрасіла, каб Банзай яшчэ паказаў, дзе ён жыве. З настырнасьцю, разважаў Банзай, дзіцяці-старшакляснiцы. Яшчэ яму прыйшло да галавы, што ён навучыцца казаць дзяўчатам «не» толькі пасьля сямідзесяці дзевяці.

Ён папярэдзіў, што да каледжу яе не правядзе, і завёў на вузенькую вулку Лысенкі з зачыненай музычнай школай у канцы. Ён нават, ня вытрымаўшы, пахваліўся, якая ў яго кватэра, і прапанаваў гарбаты, але Дарця сказала, што ў інтэрнаце вось-вось будуць даваць вячэру, і таму яна не завітае. Па-па, дадала яна і памахала на разьвітаньне рукой.

Яна заўсёды разьвітвалася такім чынам.

## Разьдзел 6

**1.**

Са снамі рабілася ўсё горш і горш. Але Банзай супакойваў сябе, што міне дзеньдругі — і ўсё вернецца на свае месцы.

Штоночы ён зноў і зноў бачыў усьвядомленыя *сьненьні*. Якія зь невядомых прычынаў выйшлі з-пад кантролю. Штоночы ён зноў і зноў трапляў у Бабілёнскую Бібліятэку.

**2.**

Выкладаньне ў каледжы ішло досыць гладка: рэгулярны заробак, адносна нармальныя дзеці.

На тым самым тыдні, калі ўдарылі першыя маразы (што праўда, наступнага дня пад вечар прыйшла адліга, і ўсё пацякло балотам), да яго ў кабінэт зазірнулі два чувакі.

Гэта былі ягоныя вучні, Малаялам і Сэмпляваны. Зь імі Юрко меў досыць неблагія стасункі, і мальцы бязь лішніх цырымоніяў называлі яго «Банзай».

Сэмпляваны быў у лахманах на два-тры памеры большых, чым яму патрэбна. Каб уся гэтая амуніцыя на ім трымалася, Сэмпляваны скарыстоўваў розныя шлейкі, падцяжкі й дадатковыя гузікі. Вішнёвую мэліроўку ён зьмяніў на жоўтую з салатавымі пералівамі. «На зьмену надвор'я», — падумаў Юрко. Вопратка Сэмпляванага была пакрытая безьліччу глыбачэзных кішэняў. Пасьля Банзай даведаўся, што Сэмпляваны належыць да субкультуры т. зв. «сынтэтыкаў», якія слухаюць адно электронную сынтэтычную музыку, вызнаюць культ катаньня на ролікавых каньках і харчуюцца ў макдонах. Сынтэтыкі вылучаюцца асаблівай інэртнасьцю да вонкавага асяродзьдзя. Іх непакоіць толькі пытаньне іхняга паходжаньня.

Малаялам меў даўжэзныя, ніжэй за плечы, валасы, т. зв. *«хаер»*, як кажуць у пэўных колах прасунутай моладзі. Малаялам сьцягваў свой *хаер* у хвост. Ён меў звычку насіць вязаныя пацёртыя швэдры з індыйскімі арнамэнтамі й неакрэсьленага колеру джынсы. За сьпінаю ён цягаў лёгкі заплечнік, у якім ляжала тытанічных памераў «Мага Віра» Лява Сыленкі, біблія ваяўнічых адэптаў нэапаганства, хто быў, ёсьць, будзе ва Ўкраіне і не ва Ўкраіне (то бок у Канадзе). Ромка Малаялам, ён жа Павук Малаялам, заўжды й паўсюль насіў яе з сабой, каб у патрэбны момант працытаваць залатыя словы ці адшукаць адказ на жыцьцёва важнае пытаньне.

І цяпер гэтыя два чувакі паўсталі перад Юрком, нерашуча пераступаючы з нагі на нагу. Пачаў Сэмпляваны:

— Слухай, Банзаю, у нас праблемы...

— Ага-а-а-а, — падтакваючы, уздыхнуў Павук. — З пацанамі.

Банзай навастрыў вуха.

— Адным словам, стары, нам забілі стралу. І ня хто-небудзь, а сам Кабак.

— Ён жа Кабачок — Лёха Сівер. Аёй-аёй, — ізноў уздыхнуў Павук. Леў Сыленка, мусіць, у такіх выпадках раіў знайсьці колькі дужых мжысаў (для недасьведчаных — **м**сьціўцаў **ж**ыцьця й **с**ьмерці) і разабрацца з пацыкамі, у сэнсе, натаўчы ім рылы. Але дзе ж узяць тых мжысаў? На кірмашы іх ня купіш, дома ў маркіздэсадзе ня вырасьціш.

— А… страла... — крыху разгублена пачаў Юрка. — Калі? І чаго?

Хлопцы па чарзе ўздыхнулі.

— Скажам так... заўтра а пятай гадзіне. У парку.

— ...нам будуць біць морды.

І Сэмпляваны апавёў гісторыю, як усё пачалося. Аказваецца, Малаялам, праз сваю раскамплексаванасьць, паслаў адну дзевачку. Дзевачка тая вельмі доўгі час яго даставала, сьцебучы Павуковыя даўгія валасы. Павук, канечне ж, ведаў, што яна належыць да сэкты пацаноў (дакладней, пацанак), але, як вядома, слова не верабей, тым больш, такое вульгарнае. Дзевачка ўзьняла страшэнны вэрхал, адразу набегла хеўра пацаноў, голеных «пад нуль», расейскамоўных і з мабілкамі. Пачалася тузаніна, Сэмпляванаму далі ў вуха, Павуку — у шнобель і абодвум

забілі «стралу» — складаны сацыяльны фэномэн, падчас якога вырашаюцца праблемы пацаноў, як на вэрбальным (уласна «страла»), так і на невэрбальным (т. зв. «качэлі») узроўнях.

Увогуле вучні каледжу мелі строгую каставую прыналежнасьць. Самымі ўплывовымі былі чувакі ды пацаны (тут дарэчная паралель з сэктамі сунітаў ды шыітаў у ісламе). І, калі раней «чувак» ці «пацан» было простым зваротам (напр.: «Гэй, *чувак*, асьцярожней са словамі» (*Шлак.*) альбо «дык ён жа зусім *пацан*, куды яму» (*Рэлян.*)), то цяперака гэта ўказвала на лад жыцьця, калі не на сьветапогляд. Некаторыя выдатныя сьветачы сацыялёгіі прысьвяцілі гады вывучэньню гэтай зьявы (як тое Урбан Хмар са згаданым «Маніфэстомъ Крымсонѣтаў» ці Костусь Жыжка-Рафаловіч і ягоныя «Саторы ў Ільвове. Падражаніе Керуаку» ды багата іншых, якіх прызнаньне ды слава проста абмінулі); усе яны сыходзяцца на думцы, што «пацан» і «чувак» ёсьць, адпаведна, эўфэмізмамі словаў «фармал» і «нефармал». І, незалежна ад усяго разнарыб'я пацаноў ды чувакоў, дасьледчыкі здолелі вылучыць пэўныя крытэры, паводле якіх адносна лёгка вызначыць прыналежнасьць (ці нэўтральнасьць) асобіны. Ня будзем апісваць складаную пабудову тэстаў (аналітычная сыстэма Клейбарн-Івановай) ці гіпнатычны мэтад «Manic Nirvana», распрацаваны Эсаленскім унівэрсытэтам на Біг-Суры, што ў Каліфорніі, ЗША. Спынімся на чыста эмпірычным падыходзе.

Раз «нефармалы» (нават пры ўсім сваім разнаптушшы) ёсьць усяго толькі апазыцыяй (усяму: грамадзтву, школе, фармалам, бацькам і г. д.), мы будзем адштурхоўвацца не ад *іх*, а ад іхніх апанэнтаў — фармалаў. Тут дзейнічае т. зв. «эфэкт люстра», паводле якога прыгнечаная меншасьць зьбіраецца разам, называе сябе нефармаламі й робіць тое самае, што й фармалы, толькі з дакладнасьцю да наадварот (гл.: *Жыжка-Рафаловіч, К.* Ігарыч, Нямірыч, Нірваныч і Дабэрманыч: 101 дзень у Панк-клюбе. Львоў: «МіМ», 1997). (Заўвага: калі б фармалы былі ў меншасьці, ды яшчэ й прыгнечанай, тады б яны сталі называць сябе нефармаламі.)

Такім чынам:

Фармалы (сынонімы: «гопы», «гопнікі», саманазва: «пацаны») звычайна носяць кароткія прычоскі «вожык», джынсы, падпярэзаныя рэменем на два язычкі (вельмі характэрна!), красоўкі й запраўленыя за пояс кратчастыя кашулі (NB: фармалы-тубыльцы — аўтахтонныя жыхары Медных Букаў — вонкава трохі адрозныя, што тлумачыцца нячыстай крывёю. Дадзены арэал заселены гібрыднымі відамі: гопнік-жлоб, гоп «Прыкарпацкі», гопнікабык. Нават можна натрапіць на рэдкага гоп-лох-штрых-быка — ваісьціну вартае жалю відовішча! Аўтахтонныя гопнікі аддаюць перавагу спартовым строям. Гопаў выраджанай крыві можна адрозьніць па швэдры, неахайна запраўленым у спартовыя нагавіцы. Заўвага: аўтар гэтых радкоў не падзяляе пазыцыі Стэфка Шанкра, высунутай ім у сатырычнай травэстыі «IV пасланьне да салаедаў»: у ёй Шанкр называе гопаў «прышчавымі гоблінамі». Аўтару дадзеных радкоў асабіста даводзілася сустракаць прышчавых гоблінаў і сярод хіпаблудаў, такім чынам, прышчавасьць крытэрам прыналежнасьці быць ня можа). Аднак шляхі гопаў усярэдзіне каледжу й

гопаў знадворку рэдка калі перакрыжоўваюцца.

Гопнікі аддаюць перавагу чорным танам зь мізэрнымі, так бы мовіць мінімалістычнымі, украпленьнямі белага — белая пасмачка на кепцы ці белы рубчык на красоўках. Але з чорным колерам варта быць асьцярожным; ён ёсьць таксама прыярытэтным для т. зв. блэкераў — адэптаў death- і black-metal, абсалютна чужаснай гопнікам нонканфармісцкай субкультуры.

Асабліва важныя пціцы ў каледжы маюць уласныя мабільныя тэлефоны, якія пераважна прышпільваюцца на бачным месцы, як правіла, у раёне геніталій («Эй, пацан! // Ты зноў Анечку пабачыў, // Ці, можа, цяпер мабілку // Носіш у кішэні?» — цыт. пав.: *Рэлянію*м, *У.* Акт вандалізму на высьпе Вялікадня. Анталёгія й касмагонія львоўскай жлабярні. Львоў: «МіМ», 1995). Насіць тэлефон ім не замінае нават тое, што Медныя Букі з трох бакоў аточаныя гарамі ды яшчэ ляжаць у прыроднай упадзіне, ад чаго ўсе сотавыя тэлефоны тут не працуюць.

Аднак часам фармалы могуць досыць удала мімікраваць пад пэўныя плыні андэграўнду. У такіх выпадках уласна вонкавага сканаваньня недастаткова. Патрэбнае ж ы в о е к а н т а к т а в а н ь н е.

Мэтадам ж ы в о г а к а н т а к т а в а н ь н я — нягледзячы на ўсю яго небясьпечнасьць — беспамылкова выкрываецца ісьціннае аблічча пацана.

«Гопнікі распрацавалі ўласны маральны кодэкс гонару, — піша Жыжка-Рафаловіч, — які грунтуецца на поўнай зьнявазе гонару й на адсутнасьці кодэксу гонару як такога. [...] Гэты кодэкс перадаецца вусна [...] з пакаленьня ў пакаленьне, ператварыўшыся ў выраджаную форму фальклёру. *Сапраўдны* пацан павінен умець у любую хвіліну *абаснаваць* (абгрунтаваць) тое, што ён *пацан*, а ня *лох*. [...] Хто гэтага ня ўмее — адпаведна, ніякі не пацан. Сапраўдны пацан павінен т р у д з і ц ц а — што на слэнгу значыць «забіраць у *лохаў* грошы»; гопаў лёгка адрозьніць па іхнім арго, а яшчэ прасьцей — па іх нахабным тупым выразе твару, які нібы прамаўляе: «*Хто* пахан на гэтай зямлі?» Гопы ёсьць першымі парасткамі падлеткавай злачыннасьці, і мара кожнага зь іх — «стаць варом у законе». [...] Іхняя канцавая мэта — надглябальны, усясьветны канфармізм. Яны ненавідзяць усё, што адрозьніваецца ад ШЭРАСЬЦІ, гэтай пыльнай млявай ШЭРАСЬЦІ, якой яны, уласна, і зьяўляюцца». (Цыт. пав. кнігі: *Жыжка-Рафаловіч, К.* Ігарыч, Нямірыч, Нірваныч і Дабэрманыч: 101 дзень у Панк-клюбе. Львоў: «МіМ», 1997.)

Пацаны паўсюль (а ў каледжы асабліва) зьневажалі й дужа не любілі нефармалаў. Нефармалы, у сваю чаргу, не любілі іх. І калі апошнія ў бальшыні сваёй былі лібэральнымі пацыфістамі й не зьвярталі на пацыкаў аніякай увагі, то гопы ўспрымалі кожнага кудлатага чувака як пэрсанальную абразу ўласнай годнасьці. Таму й былі вынайдзеныя такія геніяльныя рэчы, як «страла», «качэлі» і да т. п.

Банзай сказаў, што, вядома ж, зможа, вельмі нават зможа ім дапамагчы, калі яны гатовыя накрыць паляну адной асобе.

### 3.

Чалавек, для якога мелася быць паляна, — гэта Росьцік Стрыба. Ён вучыўся на трэцім курсе юрыдычнага факультэту, быў добрым Юркавым знаёмым і добрым спэцыялістам у дадзенай сфэры.

У той самы дзень Банзай пазваніў яму з тэлефона, што быў на першым паверсе.

— Ну дык як, Роню? Праства плюс аплата за праезд. І дзьве гадзіны ў гэтым горадзе.

— А як ты яго назваў? Букі-Бякі? Знайшліся мне, фанаты Конан Дойля. Добра, Банзаю, калі для цябе — праставы можа ня быць. Толькі квіточак туды й назад. А ці доўга ехаць?

— Дзьве з паловай гадзіны.

— О-о-х... — уздыхнуў Роня ў слухаўцы. — Ну, добра, Юрку. Для цябе.

Банзай павесіў слухаўку. Росьцік Стрыба рос вельмі інтэлігентным й выхаваным юрыстам. «Стрэлы» былі ягоным хобі.

### 4.

Каля тэлефоннага апарата сядзеў нейкі стары з выглядам алкаша. Банзай ведаў, што гэта Ромка Корый, новы вартаўнік. Функцыя вартаўніка палягала ў тым, каб пільнаваць уваход і не даваць усялякай поскудзі знадворку швэндацца па каледжы. У Корыя былі малочна-сівыя, нібы дым ад сырога лісьця, валасы, караценькія й прыхаваныя пад чорным бэрэтам дэсантніка. У Корыя, напэўна, была алергія на дым, таму што бялкі вачэй зацяклі крывёю. Выглядаў ён гадоў на пяцьдзясят, ня болей.

Пакуль Банзай размаўляў па тэлефоне, мужчына ўважліва чытаў кніжку. Яшчэ адна кніга і нататнічак з простым алоўкам ляжалі каля яго. Нехта чужы падышоў да дзьвярэй, і Корый, паклаўшы кніжку старонкамі ўніз, пасьпяшаўся да ўваходу. Юрка павесіў слухаўку й сьлізгануў вокам па назьве.

Адна кніжка была па-ўкраінску, другая — па-расейску... Разгорнутая — выдавецтва Інстытуту трансперсанальнай псыхалёгіі. «Пнакотические песнопения и изменения состояния сознания. Тексты Р’лайх», аўтар Юрген Фон Юнцт.

Іншая кніжка — «Палінэзійскія вераваньні й паўночныя аналёгіі ў дакалюмбавай Амэрыцы», аўтарская дысэртацыя Алексы Карны, год 1987-мы.

На нейкае жахлівае імгненьне Банзай адчуў у сэрцы вострае ледзяное джала.

Імя.

Яно, бясспрэчна, было яму знаёмае. У *сьненьні* ён чытаў кніжку барона Юнцта «Неверагодныя культы». Ён ня мог згадаць зьместу, але назва ды імя аўтара захаваліся. Ён чытаў яе ў Бабілёнскай Бібліятэцы.

Банзай уваліўся ў прыбіральню. Яго пачало ванітаваць. Ён уварваўся ў адну з кабінак і схіліўся над унітазам. Спрабаваў штосьці адхаркнуць, але выліў зь сябе толькі некалькі згусткаў едкай кіслай макраты. На сьцяне ў кабінцы нехта сінім маркерам нарысаваў дэталёвае крэсьліва мэханізму, які нагадваў мяса-

рубку. Крэсьліва было ў трох праекцыях, вельмі падрабязнае — з выкарыстаньнем тоўстых, тонкіх і пункцірных лініяў. Было відаць, што аўтар працаваў цягам не аднаго ўроку фізыкі. Падпісана: «НАСТАЎНІКАРУБКА БЫТАВАЯ СТАТЫЧНАЯ».

Банзай рэзка ўзьняў галаву й выйшаў з кабінкі. Перад вачыма ўспырхнула сотня матылькоў, таму на нейкую хвілю Банзаю падалося, што ён бачыць на сьцяне цёмна-чырвоныя літары. Ён некалькі разоў міргнуў — і літары зьніклі.

## 5.

Сэмпляваны й Малаялам вельмі хваляваліся. Яны хадзілі бледныя й пералякаsuccessныя, як самнамбулы зь сівых сьненьняў. Была ўжо бяз чвэрці чацьвертая, а Росьціка Стрыбы — ні духу. І Юрко быў тут бясьсільны.

А чацьвертай дваццаць у каледж спрабаваў зайсьці невысокі акуратны трэцякурсьнік з ахайнай стрыжкай, удала падабранымі акулярамі, чысьцютка апрануты. Ён расьсейваў вакол сябе ўпэўненасьць ды водар «Олд Спайсу». Канечне, Корый не зьбіраўся яго ўпускаць, таму паслаў нейкую дзяўчынку па Юрка Банзая, якога госьць, уласна кажучы, і хацеў бачыць. Гаварыў студэнт мякка, выразна, нягучна й вельмі пераканаўча.

Калі Банзай разам з двума перапужанымі вучнямі спусьціліся на першы паверх і выйшлі на халаднечу, якая была звонку, то ўзрадавана пабачылі Росьціка Стрыбу.

Ён парукаўся з усімі й сказаў:

— Давайце, даражэнькія, хадзема ў гэты ваш парк. Па дарозе апавядзеце, што тут у вас за траблы.

Дарогаю Росьцік зірнуў на гадзіньнік і зьдзіўлена прысьвіснуў. (Сэмпл ды Павук падумалі, што цяпер гэты Росьцік пабачыць, як яны спазьняюцца, і прысьпешыць хаду.) Замест гэтага Роня радасна сказаў, што ў запасе плойма часу, можна пайсьці ў рэстарацыю паабедаць. Сэмпляваны паспрабаваў далікатна намякнуць, што рэстарацыя ў Медных Буках была толькі да Першай усясьветнай і што яны трохі спазьняюцца, але Роня яшчэ раз прысьвіснуў — гэтым разам радасна — яго вочы акурат натрапілі на кавярню «Опір»[11].

У кавярні Роня спакайненька высмактаў тры філіжанкі кавы — ён адразу ж замовіў чатыры порцыі, але Павук і Сэмпл адмовіліся. У іх і так сэрцы біліся, як ашалелыя.

Сэмпляваны й Павук на поўным сур’ёзе лічылі сябе апошнімі рамантыкамі ў загніваючай кодле гопнікаў ды прагматызму. Употайкі яны стварылі сабе куміра — вядомага забойцу паліцыянтаў Кроўлі-Два-Наганы. З братам па духу Кроўлі яны сыходзіліся ў адным: у іхніх грудзях біліся стомленыя, але вельмі добрыя сэрцы.

[11] У адрозьненьні ад гораду Медныя Букі, рака Опір (правы прыток р. Стрый, басэйн Днястра), у гонар якой, відаць, і названая кавярня, існуе. Украінскае слова «опір» азначае «супраціў».

Павук і Сэмпляваны былі сапраўднымі летуценьнікамі. Яны верылі, што міліцыя і насамрэч беражэ іх, і калі злы гопнік адбярэ ў цябе грошы на марозіва, а ты скажаш пра гэта Міліцыянту, злыдня пакараюць, а грошы вернуць... і ніхто ня будзе рабіць табе ў пастарунку «слоніка» ў адгазьніку ці «ластаўку» з выкручваньнем суставаў; яны верылі, што Міліцыя ДОБРАЯ, яна абароніць іх ад злых старэйшых дзядзькоў, а калі й зловіць іх на вуліцы з кішэнямі, напханымі прабітым «планам», то не забярэ, ня выпаліць сама, і ня спляжыць змайстраваны дома з плястыкавай пляшкі кішэнны бульбулятар, і не пасадзіць у абязьяньнік на неакрэсьлены тэрмін, а проста пагрозіць пальцам.

І ўвогуле, як на тое, Сэмпляваны марыў пра жыцьцё пасярод блаславёных Альпаў, у катэджы з гаўбцом на возера ды мансардаю зь відам на лясы, марыў пра чатырнаццацігадовых дзяўчатак-малочніц, бялявенькіх, у белых вышываначках ды чырвона-чорных андарачках, дзяўчатак, спраглых да цялесных любошчаў ды якаснага траху на кіліме паміж палаючым камінам і збанамі сырадою, якія гэтыя бляндыначкі, уласна, і прынесьлі...

Павуку ж уяўляліся жорсткія расправы над сваімі крыўднікамі — тысяча й адна ноч даўгіх нажоў у гопаўскім гета, падпарадкаваныя яму атрады чорных СС «Правіцы праўды» для зьнішчэньня пацаноў... марылася, што аднойчы, калі гопы прыйдуць зьбіраць даніну, ён зробіць у паветры дасканалую «блыху» — сьмертаносны прыём баявога гапака[12] — і праломіць нагамі стрыжанаму мярзотніку грудную клетку, а хтосьці з бандзюгаў раптам панічна выгукне: *«Шухер, пацаны, он на баевой гапак ходзіт!»*... Паўставала перад ім, як ён будзе насіць за пазухай велічэзны цясак-мачэтэ для чвартаваньня, загорнуты ў баваўняную хусьцінку для выціраньня крыві, будзе арудаваць ім у гета направа і налева... мроіліся рэкі крыві ды горы мяса, мяхі касьцяной мукі ды вігвамы скальпаў, скрыні, поўныя караляў зь іхных чэлесаў, калы з насаджанымі на іх галовамі крыўднікаў, шэраг трохлітровых слоікаў, у якіх у фармаліне плаваюць зьдзіўленыя гопаўскія вочы, іхнія цырозныя пячонкі ды атрафаваныя сяменьнікі. Во гэта была вышка для Павука!

Калі Банзаеў электронны гадзіньнік паказаў 16:53, Росьцік супакойліва папляскаў хлопцаў па плячы й замовіў крохкія піражкі-круасаны. Дзякуй Богу, ён перадумаў пакаштаваць гарачыя флячкі.

— Не перaймайцеся, людцы! Гэта ж звычайныя вясковыя быкі. Мы шчэ змусім іх... гм-м... як гэта кажуць у народзе, забашляць нам і вам бабкі.

На шчасьце, Росьцік ня стаў есьці круасаны ў кавярні. Ён надкусіў адзін, яшчэ адзін аддаў Банзаю, а рэшту паклаў у папяровы пакецік і павольна жаваў па дарозе (ён увогуле зь вялікім трымценьнем ставіўся да салодкай выпечкі, а таму ў глыбіні душы цешыўся, што так шмат круасанаў засталося яму).

[12] Украінскі від баявога мастацтва, распрацаваны ў 1985 г. Уладзімірам Пілатам, які высунуў тэорыю, што элемэнты танца гапак — рудымэнт старажытнага віду барацьбы.

Калі яны прыйшлі на прызначанае месца — цяністую прысаду парку, дзе вельмі зручна рабіць аблавы на хіпаблудаў, — там ужо цясьнілася чалавек так прыблізна дваццаць. Банзай убачыў, як Павук спрабуе аблізаць сухія губы перасохлым языком. А Сэмпляваны раз-пораз выцягвае руку, мусіць, каб націснуць на кляўішу «Escape» і выйсьці з гэтага ідыёцкага сайту. Росьцік прыпыніўся, працягваючы насьвістваць настальгічную мэлёдыю з «Хроснага бацькі». Палез у кішэню, разгарнуў пакецік і даеў круасаны (вішнёвая мармэлядавая начынка яшчэ давала пару). Узьняўшы вочы, ён пабачыў, што хлопцы глядзяць на яго зь нямой мальбою ў вачах.

— Хочаце крыху?.. — запытаўся ён з напханым ротам. Сэмпляваны зачаравана паглядзеў на яго й адно павольна пакачаў галавой у нямым пярэчаньні. Падавалася, ён увайшоў у транс. Павук нават галавой не качаў, адно роспачна рыў нагой кучу лісьця.

— Вось гэта яны? — расчаравана запытаўся празь якую хвіліну жаваньня Роня, усё яшчэ ротанапхана. Галавой ён кіўнуў у бок гапатні, якая агрэсіўна (і досыцьтакі разгублена) паглядала ў іхні бок. Час ад часу які-небудзь гоп выкрыкваў што-небудзь абразьлівае, ад чаго рэшта гопаў пачынала рагатаць.

Пражаваўшы, выцершы рот хусьцінкаю ад наліплай цукровай пудры, Роня падхапіў перарваную мэлёдыю й сказаў усім набліжацца.

Росьцік павітаўся ўголас, але рукі нікому не пацісьнуў: так пачаліся траблы.

Спачатку гопы выклалі ім сваё гледзішча адносна праблемы. Яны апэравалі такімі прагрэсіўнымі паняткамі, як «он міня напрагае», «мы вас усех захіпаблудзім», «будзеце нам усем башляць бабкі» і так далей.

— Я падобны да хіпаблуда? — мякка запытаўся Росьцік у галоўнага гопа.

— Нет.

— Тады давай выйдзем, я табе сёе-тое растлумачу.

Такога павароту падзеяў гоп чакаў менш за ўсё. Гэта ЁН прыйшоў тлумачыць, ЁН прыйшоў *качаць сваі права*, і ЁН абсалютна не зьбіраўся выслухоўваць павучаньні нейкага гоміка-пэданта.

Аднак ён пайшоў. Яны адышліся на пяць мэтраў убок, Росьцік — з паднятым падбародзьдзем, са складзенымі за сьпінай рукамі, гоп — з рукамі ў кішэнях, са сьвятой перакананасьцю ва ўласнай перавазе над апанэнтам.

Спачатку была цішыня. Росьцік гаварыў вельмі ціха, толькі для дзьвюх параў вушэй. Потым у прыцемках пачуўся выгук:

— А чаго он маю малую пасылает?

А потым:

— Да? Ты уверан? Да в жызьні этава ні будзіт! Якім-та хіпаблудам! Да пашол ты!..

Мамэнтальна пасьля гэтых словаў кулак Росьціка заехаў таму зьнізу ў пашчэнку. Гоп упаў на калені, прыціскаючы рукі да падбародзьдзя. Ён сплюнуў ружовым. Росьцік падняў яго за локаць і працягнуў сваю адукацыйную працу такім самым сугестыўным голасам. Цяпер гоп, якога трымалі за локаць, толькі бязгучна ківаў. Празь нейкія сем хвілінаў яны вярнуліся. Гоп падышоў да сваіх сяброў

і ціха пераказаў усё ў некалькіх словах. «Пяцьдзясят грыўнаў?» — ня верачы ўласным вушам, выгукнуў хтосьці з таўпені.

— Ну дык як? — пасьля кароткай паўзы голасна запытаўся Росьцік, які ўжо стаў зьлева ад Банзая.

— Харашо, — ціха прамовіў важак.

— Перадасьцё чынш вось гэтаму хлопцу, — Росьцік кіўнуў галавой на Банзая. Той моўчкі пускаў ротам колцы пары, думаючы ў гэты момант пра Дарцю.

— І памятай, што я табе казаў.

Гоп неахвотна кіўнуў галавой і пайшоў. Кампанія, якая прыйшла сюды натаўчы зяпы хіпаблудам, расчаравана папярдоліла сьледам за ім.

Праз два дні да ягонага кабінэту запоўз вярхоўны гоп. Ні слова не прамовіўшы, ён даў Банзаю дзесяць купюр намінальнай вартасьцю пяць грыўнаў кожная. З усіх паперак да Юркі пільна прыглядаўся бацька Хмель[13].

Трыццаць пяць ён адаслаў Росьціку паштовай карткай з надпісам «ДЗЯКУЕМ». Пятнаццаць — па пяць на душу — засталося ім на марозіва.

## Разьдзел 7

### 1.

Сонька-дрымка: што я сьню.
19.09.2000

Цэлы дзень думаў пра Дарцю, у надзеі, што прысьню яе. Выканаў усе парады, дадзеныя К. Г., распрацаваў сцэнар і пастаянна пракручваў у галаве. Запомніў тры сны: 1 — гл. Дадатак; 2 — задуманы сон пра Дарцю (гл. тамсама). Найбольш мяне ўразіў трэці, апошні з тых, што я запомніў. Ён быў Надзвычай Яскравы, нават як на ўсьвядомленае сьненьне.

Скончыўся сон пра Дарцю, і тут я зразумеў, што гэта і ёсьць замоўлены сон. То бок уцяміў, што я ў целе сьненьня. Ад узбуджэньня я адчуў, што прачынаюся, таму вык. прыём К. Г. на падобны выпадак. Гэта так клясна! Я пабачыў, як сьцены пакою пачынаюць растуманьвацца і зьнікаць. Я апынуўся ў вялікім памяшканьні з высачэзнай стольлю. Вельмі высокаю. Памяшканьне ўтульнае. Пры сьценах стаяла безьліч стэляжоў з кнігамі. Нагадваю: я цалкам кантраляваў свае дзеяньні і быў абсалютна ўпэўнены ў тым, што гэта НЯ сон. Усё рыхтык як у рэальнасьці: зрок, слых,

[13] Гетман Багдан Хмяльніцкі.

(Толькі што згадаў, што не было ніякага адчуваньня дотыку і смаку. Можа, я забыў?)

Да мяне падышоў нейкі чалавек у простай някідкай вопратцы і сказаў, каб я сядаў і пачынаў чытаць. Я спрабаваў прымусіць яго зьнікнуць (бо адчуваў, што ён мае нейкую ўладу нада мною), як гэта бывае пры сьненьні, але той чалавек сказаў: «нічога ня выйдзе, не круці мяне, Юра, не стругай дурня, сядай і чытай».

???????????????????

Тады я паспрабаваў ператварыць яго ў штосьці іншае (напр., котку). Мужчына раптоўна выпаў з фокусу, здалося, між намі цячэ магутны струмень гарачага паветра. Калі я зноўку паспрабаваў сфакусавацца, перада мной было ШТОСЬЦІ.

~~(Дзіўна, як я не прачнуўся ад жаху. Можа, мяне наўмысна трымалі там?)~~ маразм!

ШТОСЬЦІ выглядала як выс. (каля 5 м.?) ружовы мясісты конус. Шырокім канцом конус стаяў на падлозе і перасоўваўся, як сьлімак. На верхалінцы конуса на тонкіх нітках нэрваў зьвісала некалькі вачэй (3? 4?), таксама там былі невялічкія, бліскучыя клюшні, як у краба.

~~Я НЯ ВЕРУ Ў ТОЕ, ШТО СА МН~~

ШТОСЬЦІ сказала, што я для зручнасьці магу стаць такім самым, але калі гэта мяне дэзарыентуе, лепей заставацца ва ўласным целе (???). Я дагэтуль не магу паверыць, што сьненьне выйшла з-пад майго кантролю.

Наколькі я зразумеў, конус быў чымсьці сярэднім паміж назіральнікам, куратарам і настаўнікам. Ён паказаў мне клюшняй на стол і паўтарыў, каб я сядаў чытаць. На стале былі высокія стосы кніжак. Калі я гэта прачытаю, сказаў конус, ён са мной пагаворыць. Спраўдзіць, ці я засвоіў (?!), дадаў ён. І што са мной значна прасьцей, чым зь іншымі.

Я сеў за стол на лаўку і азірнуўся. Наколькі я мог бачыць, чытальня цягнулася бясконца доўга. У самым канцы чытальня зьбіралася ў адну кропку, бясконца-недасяжную. Можаш сьмяяцца, але склалася ўражаньне, што яна зьнікае за даляглядам. Такім жа чынам цягнуліся і стэляжы, сталы і чытачы. Вельмі шмат хто рабіў нейкія канспэкты (?) або проста пісаў. Шмат хто, як мне здалося, ня быў чалавекам увогуле.

Я адкрыў першую кніжку. Літары, як ні дзіўна, не расплываліся (а як жа сон лобных доляў?). Нейкі момант я проста нямеў, спрабуючы зразумець, што за трасца са старонкамі.

Яны былі нібыта белыя паралелепіпэды, якія зануруюцца ў глыб уласнай плоскасьці. І словы нагадвалі субмарыны, якія плывуць насустрач чытачу. Кожнае слова было аб'ёмным герогліфам нейкай невядомай мовы. АЛЕ Я ЗРАЗУМЕЎ КОЖНЫ ЗНАК. Называлася кніжка «Культ багоў гары Кадаф і іншыя містэрыі Гіпэрбарэі». Я заўважыў, што з часам тут вельмі цікава: я змог прачытаць усю кніжку за нейкія паўгадзіны, хоць падчас чытаньня гэта здалося некалькімі соднямі (параўн. дзеяньне Cannabis Indica). У кніжцы расказвалася пра краіну Гіпэрбарэю на далёкай поўначы (Скандынавія? Антарктыда?) і пра яе веравызнаньні. Ведаеш, Банзай, яно мяне ўразіла. Тое, што гіпэрбарэйцы пакланяліся ледзяной гары Кадаф, у якой нібы быў увязьнены бог С'ннгха (?). Штогод яму прыносілі ў ахвяру васьмёх дзяцей. Калі даваць веры кніжцы, дзеці-такі кудысьці дзяваліся. Гучыць надта дзіка, каб быць праўдай.

Я ўжо зьбіраўся браць наступную порцыю літаратуры, калі пачуў пранізьлівае піпканьне радыё, а сьледам — арыю з «Запарожца за Дунаем».

Мяне імгненна перакінула ў сон, у якім я быў з Дарцяй (?). Усё зацямнілася, і я зразумеў, што гляджу на ўласныя самкнутыя павекі.

Не магу сабе месца знайсьці. Мяне проста плюшчыць.

Дык гэта быў сон?

**2.**

Адна кніжка, купленая на вэрнісажы ў Львове за паўтары грыўны, адкрыла Юрку Банзаю новыя сусьветы. Кніжка «Шаманскія сьненьні» Кэтрын Губэр. У ёй расказвалася, як у хатніх умовах навучыцца замаўляць сьненьні з патрэбным вам сюжэтам, як у сьненьнях шукаць адказы на пытаньні, а таксама навучыцца бачыць і кантраляваць усьвядомленыя сьненьні. Нават калі тры чвэрці інфармацыі ў кніжцы было поўнай лажай, то ўсё адно — яна зачапіла Банзая за найжывейшыя нэрвы і выкруціла навыварат.

Акурат ад яе (кніжкі) прарасьлі карэньчыкі яго інтарэсаў: ён шукаў літаратуру па мэдытацыі і выхаду з уласнага цела; чытаў працы сужэнства Ўосан па энтамікалёгіі; параўноўваў уласны досьвед з пэрлінамі ў дасьледаваньні сну — кніга Лябэржа, ацэньваў рэфлексіі братоў Макена датычна ўплыву псыхатропных грыбоў на разьвіцьцё чалавецтва; прачытаў усе працы Грофа ў галіне ЛСД-тэрапіі і галятропнага дыханьня. І, вядома ж, пераспрабаваў на сабе ўсё, што толькі можна было паспрабаваць дома на канапе ці ў кухні. Што, уласна, і прыводзіла яго тройчы ў рэанімацыю.

Але ўсё ж найбольш яго зачапіла ўсьвядомленае сьненьне. Нават сам Карляс Кастанэда прысьвяціў яму асобную кніжку... і менавіта тут Банзай прыкладаў неадступную цьвёрдасьць, якой яму бракавала для мэдытацый.

Але *сны*! Спачатку ў яго ні халеры не выходзіла. Прыблізна чатыры месяцы. Пакуль, нарэшце, не прысьніўся рыхтык такі сон, які ён замаўляў. І калі Соля ўва сьне аддалася яму, ён зь ціхім стогнам прачнуўся. Спачатку ён вёў сур'ёзны журнал сноў, вялікі чорны гросбух, на карэньчыку якога было напісана: «Мае сьненьні. Рэфлексіі». Але з часам назва пачала гучаць занадта прэтэнцыёзна. Банзай перайменаваў гэта ў звышсакрэтны спэцпраект «Сонька-Дрымка». Такая назва яму падабалася значна больш.

Навука давалася скачкападобна. З замаўленьнем паўставала ўсё менш і менш праблем. Неяк (гэта было акурат у той пэрыяд, калі Соля пайшла ад яго) ён задумаў пабачыць сон, у якім ён сякерай раскройвае здрадніцы галаву. Сон прысьніўся... да жаху рэчаісны. Зь вяртаньнем сьвядомасьці Банзай доўга дзякаваў Богу, што гэта быў *толькі* сон. З таго часу ён практыкаваўся толькі ва ўсьвядомленых сьненьнях.

За ўвесь час практыкі — ад канца трэцяга курсу да гэтага часу — Банзай бачыў дзевятнаццаць *сьненьняў*. Зь пераездам у Медныя Букі яны сталі сьніцца яму практычна штоночы. Гэта нагадвала размыты страх і трывогу.

Здавалася, ён паволі да чагосьці набліжаўся.

**3.**

Банзай вырашыў пайсьці да Дзімы. Той павінен быў ведаць хоць бы штосьці пра Інстытут трансьпэрсанальнай псыхалёгіі. А калі ён і сапраўды штосьці ведаў, то, можа, падказаў бы, пра што тая кніжка, якую чытаў Корый.

У псыхоляга сядзеў спадар Заір Тычында. Ён піў каву і расказваў пра штосьці яўна нецікавае. Калі ў дзьверы зазірнуў Банзай, твар Дзімы набыў пакутніцкі выраз, маўляў, «ратуй, дружа!».

— Віця, у мяне кліент, — зьвярнуўся ён да спадара Заіра. Той працягваў нахабна сёрбаць каву.

— А-а-а-а-а-а, заходзьце, спадаrу Юrыю. Сядайце тут на кrэсла. Мы зь Дзьмітrом акуrат rазмаўляем пrа ПАЭЗІЮ. Дык от... Сасюrа Rаньні і Сасюrа Позьні — гэта вельмі rозныя rэчы... Даrэчы, вы чыталі мой апошні збоrнічак? «Дзеля каханьня»? У асноўным вэRлібэRы... *Так-так, досыць неблагія вэРлібэРы!!!* — рэзка перайшоў ён на правільную ўкраінскую, пабачыўшы, што страчвае публіку (Банзай акурат хацеў незаўважна высьлізнуць).

Банзай скрушліва пакруціў галавой, паказваючы, што, не, яшчэ не чытаў новага збоrнічка: праца, жонка, дзеці — усё няма калі!

Дзіма сумна разглядаў сумны твар Рынга Стара і босыя ступакі Ленана.

— Гэта *знак*, — такі не ўтрымаўся ён. Пабарабаніў пазногцямі на голых нагах. — *Знак*. Усім нам.

Дзіма выразна зірнуў на спадара Заіра. Здавалася, яго позірк прамаўляў: «Джон

гэтым самым хацеў перадаць чалавецтву, што кавярнічаць пад чорна-белымі плякатамі — гэта ня цацкі і што кабінэты псыхолягаў — ня месца для такіх крэтынаў. Даруйце, для такіх кгэтынаў».

Спадар Заір, здавалася, нечакана празерыў і асэнсаваў усю сымбалічнасьць басаты Джона. Ён хуценька дасёрбаў каву (мармычучы пры гэтым: «А то ж! У Чэхава ўсё-ўсё-ўсё пга гэта напісана! *Slova w SLOVA!*» і выпарыўся.

— Слухай, Дзіма, — азваўся Банзай, калі дзьверы за паэтам зачыніліся, — ты чытаў нейкія кніжкі Інстытуту трансперсанальнай псыхалёгіі? Ну, Гроф, Макена...

— Гроф. А шо?

— Што, на тваю думку, азначае выраз «пнакоптические песнопения»?

Дзіма пацепаў плячыма. Не мам паеньця, — гаварыла гэтае пацісканьне.

— А хто такі фон Юнцт? — вядома ж, цяпер ён прыгадваў кніжку, але слова Дзімы яго таксама цікавіла.

Той зноў пацепаў плячыма.

Банзаю карцела задаць яшчэ адно пытаньне: як зьвязаць тэксты трансперсанальнай псыхалёгіі з культамі Палінэзіі і іхнімі аналягамі ў дакалюмбавай Амэрыцы?

Але і гэтага Дзіма ня ведаў. Таму Банзай не пытаўся больш нічога.

Ён баяўся, што хутка сам даведаецца, у чым рэч. У Бібліятэцы.

Толькі да чаго тут яшчэ і Корый?

### 4.

7.10.2000

Я зноў быў там. Гэта можна назваць Бабілёнскай Бібліятэкай, як выславіўся адзін гішпанец. Там я ўмею чытаць практычна на ўсіх мовах. ~~**(цяпер усе мовы здаюцца адною і тою ж моваю)**~~

Я спытаў у свайго назіральніка, ці гэта сон.

Ён спрабаваў растлумачыць мне, што сьвядомасьць бесьперапынная, і сон — не адпачынак для мозгу. І ўвогуле, мозг да сну (да сну ці **сьненьня** — вось што важна!) ня мае ніякага дачыненьня. Назіральнік сказаў, што мы самі сабе шкодзім, намагаючыся інтэрпрэтаваць усё запар. Важны **працэс**, а ня **форма**. Калі б ня нашая прымха інтэрпрэтаваць, мы б зразумелі, што няма розьніцы паміж энэргіяй і матэрыяй. Мы ўспрымаем рэчы палярна — жыцьцё або сьмерць, энэргія або матэрыя, прысутнасьць або адсутнасьць, ФОРМА або ПУСТАТА (???). На іншым узроўні, сказаў назіральнік мне, ён зможа патлумачыць гэта вельмі наглядна, — **мог бы так і не выпендрывацца. Я ў яго зусім не пра гэта пытаўся! Ці, можа, я няўважліва слухаў? Ён сказаў: «Пустата — гэта** самая

дасканалая **форма».**

Я чытаў пра дзіўныя рэчы. У асноўным, кніжкі розных забароненых аўтараў, якія былі або ерасіярхамі, або прыхільнікамі розных забытых культаў. Я цяпер бачу пэўную сувязь паміж усёй той літаратурай, якую мяне прымушаюць вывучаць. У асобных кніжках вельмі асьцярожна згадваюцца нейкія даўно забытыя багі, але так незнарок і паўшэптам, нібы аўтары баяцца аднаго толькі напісаньня іх імёнаў. Я не магу зразумець, як зьвязаныя ЎСЕ факты. Перада мной гіганцкая мазаіка. І тыя багі, якіх усе так баяцца, — утвараюць яе цэнтар. Гэта як пра сэкс: усе ведаюць, але ніхто не гаворыць. Баяцца, ці як?

**5.**

11.10.2000

Ня ведаю, дзе я быў, АЛЕ ГЭТА НЯ СОН.

Ведаеш, што я прачытаў цяпер?

Пайшла самая што ні ёсьць «чарнуха». Яны мяркуюць, што я ўжо дасьпеў.

Чытаў «Дэманалёгію», «Культы гулаў», «Прарэлігіі Шамбалы і Му». У асноўным — апісаньне догмаў розных вераваньняў. Практычна ўсе — стоадсоткавая лажа, але ўжо праглядаецца АГУЛЬНАЯ РЫСА: яны ўсе згадваюць пра НАЙСТАРАЖЫТНЕЙШЫЯ КУЛЬТЫ. Усе сыходзяцца на адным: прадаўнія цывілізацыі пакланяліся нейкім дзікім багам, якія прыйшлі з зорак, імёны якіх праклятыя і забытыя, і таму, хто вымаўляе іх, яны спапяляюць вусны і пакрываюць гнойнымі верадамі рот. Культы іхнія былі крывавыя і страшныя. І ўсе як адзін баяцца напісаць, што гэта былі за рэлігіі (рэлігія?)

(пазьней)

я толькі што прачытаў кніжку, якую бачыла чалавек пяцьсот, ня болей

(чамусьці дрыжаць рукі)

З тых, што бачылі,чытала толькі траціна

усё зусім ня так, як мы думаем

~~Сугуба ня так.~~

запомніць

БАГІ СІВОЙ ДАЎНІНЫ / ВЯЛІКІЯ ПРАКАВЕТНЫЯ

Напэўна, я больш ня буду класьціся спаць

## Разьдзел 8

### 1.

Усё заставалася такім самым. Вучні, выкладаньне. Дні рабіліся халаднейшыя й карацейшыя. У кватэры быў дубар, бо адключылі яшчэ й ацяпленьне. Не было сьвятла, вуліцы пусьцелі.

Львоўскі паэт-дэкадэнт Уладзь Рэлянію м (у некаторых іншых колах больш вядомы як Данка Эленіюм) пісаў: «Настала пара, калі надта халодна, каб было цёпла, але ўсё яшчэ надта цёпла, каб было насамрэч халодна».

Горы, як заўсёды, прамянілі вечнасьць.

Зьмяняўся толькі горад. Зь цягам часу вуліцы брынялі невымоўным страхам. Так, напэўна, ГЭТА прыходзіла зь вятрамі з гораў ды з галоднымі пахамі з далёкіх цёмных зорак.

### 2.

Калі Банзаю прысьнілася апошняе ўсьвядомленае *сьненьне* пра Бібліятэку (а гэта было ў сераду, 19 кастрычніка), ён нечакана прачнуўся сярод ночы. Банзай скінуў зь сябе коўдру і тонкую капу й вызірнуў на двор. Вулку затапіла эфірным холадам і крохкім месяцовым сьвятлом. Наўкола месяца ўтварылася бледнае, з водблікам, сяйва, якое прарочыла бязладзьдзе.

Банзай зірнуў уніз. Сэрца рэзка кальнула й борзьдзенька затахкала. На пакрытым шэраньню ходзішчы стаяў Корый і, задраўшы галаву, глядзеў у неба. Раптоўна позірк мужчыны перамясьціўся з зорак на шыбу, дзе бялеў твар Юрка. Ягоныя вочы амаль фізычна ўчапіліся ў хлопца кручкаватымі кіпцюркамі. Банзай аблізаў губы. Пад сонечным спляценьнем палаў агонь.

Корый павольна адарваўся ад асфальту й паплыў угару па паветры наўпрост да Банзаевага акна. Навокал мужчыны, здавалася, гусьцела цемрыва, ахутваючы Корыя чорнай сутанай. Вусны штохвілі варушыліся, прамаўляючы нячутныя словы. Ён параўняўся зь Юрком і хіжа зазірнуў яму ў вочы. Банзай адчуў, як яго цягліцы ператвараюцца ў вільготнае драўлянае валакно. Яго паралізавала.

Корый усьміхнуўся. Бялкі яго вачэй былі чорныя ад крыві. Сьвежая чорная бруйка зьбягала з вушэй па шыі за каўнер кашулі.

— *Вар'гар Ёг-Сатот!* СІЛА! Нарэшце ў мяне! *Гій'я Ёг-Сатот! Гій'я вагх'лах! Вагх'лах Ёг-Сатот!* Яшчэ ўсё наперадзе! — выкрыкнуў ён. Цемра канчаткова агарнула яго, нібы павуціньне. Корый за ёй ужо зусім ня быў відаць. Цёмная каўшанка імкліва сiганула ў вышыню, нібы чорная камэта.

Банзай сядзеў на падлозе, прыціскаючыся сьпінаю да сьцяны. Ён цяжка дыхаў, не адводзячы позірку ад акна. Рыпнуў паркет, і Банзай нягромка ўскрыкнуў. Яго цела целяпалася на ўсе бакі.

## 3.

Апошні тыдзень быў вельмі напружаны, але пазытыўна. Таму што апошняя субота месяца — гэта дзень каледжу, ды яшчэ плюс угодкі, пяць год. Адразу пасьля ўгодкаў — Гэлаўін, які тут быў у пашане. Невядома хто й невядома якімі мэтадамі выпрасіў у спадара Андрыя дазвол аж на 3 (тры) вечарынкі: гапатэка, рок-сэйшн ды электронная трансавая вечарынка для габэраў ды сынтэтыкаў накшталт Сэмпляванага.

Сама імпрэза — дзень каледжу як такі — складалася з размаітых сцэнак, усялякіх дэклямаваньняў вершыкаў ды іншых мілых бздураў. Кляса Банзая рыхтавала ўласны выступ. Сэмпл ды Павук скаапэраваліся й рыхтавалі асобны праект.

Дарця ва ўсім гэтым удзелу ня брала.

Вось жа, апошняя субота адкрывала канцэртам усю цырымонію: у той самы вечар — грандыёзнае *дзыска*-паці для гопаў, вечар панядзелку — tylko rock, аўторак — Гэлаўін ды электронная альтэрнатыва. Банзаю вельмі карцела даведацца, што гэта там за нумар рыхтуюць Гэтыя Двое, ён таксама вырашыў пайсьці. Юрко й сам быў ня супраць шакаваць *чымсьці такім* публіку, нават ужо выношваў пэўныя думкі, аднак пакуль што гэта былі ўсяго толькі думкі.

## 4.

Пятніца заўсёды была клёвым днём. Асабліва калі ўсё акей, заўтра заняткаў няма, а ўрокі скончыліся паўгадзіны таму. Банзай быў шчасьлівы — для яго шчасьцем было ўсё тое, што ня тычылася няшчасьцяў. А пакуль што ўсё й сапраўды было акей: сны пра Бібліятэку скончыліся (хоць апошні сон пра Корыя быў *ну проста жахлівы*), усё, што ён спасьціг ТАМ, пасьпяхова забылася, звонку халодна, усярэдзіне цёпла, еж кекс, май сэкс, як казаў адзін мудрэц, — і ўсё складзецца само сабою.

Банзай навучыўся цешыцца момантам.

Ён вырашыў троху прагуляцца перад тым, як вярнуцца ў кватэру. Юрко папраставаў да плошчы ў старым горадзе, мінаючы нейкую каменную кабеціну, якая сядзела ў ёгаўскай позе Ваджрасана й сымбалізавала смутак маці па сыну, які загінуў на Другой усясьветнай (сьпіс прыкладаецца). Аджна-чакра кабеціны была неахайна затуленая невядомай пароды кветкаю, мяркуючы па ўсім, цьветам бэлядонны. Банзай накіраваўся ў жоўты смутак парку.

Было поўна халоднага балота, над паркам шарэла хмурае неба, якое, здавалася, прамяніла дэпрэсію, мэлянхолію й тугу. Ён ужо каторы раз думаў пра Дарцю, пра тое, што яна прыходзіла да яго з таго часу толькі аднойчы... Ён сеў на цьвёрдую лаўку й закінуў нагу на нагу. Усё было амаль як у «Jethro Tull»: шэрае неба, дзяўчаткі (якіх тут не было... тут увогуле нікога не было), якія граюць у бадмінтон, аквалянг, мой дружа, ці памятаеш ты туманны мароз сьнежня?

«Так, я памятаю», — адказаў сабе Юрко.

Пачаў накрапваць дробны дождж. Ён устаў і пасунуўся дамоў.

## 5.

У суботу «Алянячая Скура» віравала ад узбуджэньня. Банзай прапхнуўся скрозь натоўп дзецюкоў у белых кашулях (чорных скураных «касухах»), напрасаваных нагавіцах (падраных джынсах), якія насіліся з букетамі кветак у руках і насілі ў спартзалю, дзе мела адбывацца дзея, парты й крэслы, казаў знаёмым «Дабрыдзень» ці «Прывітаньне», альбо проста трос невядома чые працягнутыя клюшні. Ягоны погляд натрапіў на Дарцю, якая хмурна стаяла побач зь іншымі дзяўчатамі. Дарця пабачыла яго й памахала пальчыкамі, радасна пасьміхаючыся. Так, нібы ў іх цяпер была агульная таямніца — як гэта, уласна, і было насамрэч. Дарця была апранутая ў тое самае, што ўчора: запраны джынсавы камбінэзон на лямках ды мяккую футболку з даўгім рукавом. Банзай ведаў па сабе, што ў такім строі было акурат супэр: не халодна, ня душна й свабодна рукам.

Пры акне каля спартовай залі тусіла група ягоных амаль аднагодкаў, якія рабілі тут невядома што. Можа, прыйшлі сустрэць старых знаёмых ды адчуць настальгію па старых часах. Банзай падышоў да хеўры й павітаўся з кожным асобна. Ён добра ведаў усіх — Гадэн, які не паленаваўся прыехаць з утапічнаняіснага містычнага Бадэн-Гадэна — гораду паэтаў, дармовых гетэраў ды антыкварыяту. Шкраб (ён жа д'Армаед), які забаўляў публіку нэабітніцкай лірыкай, Флойд Марфінскі, Каспар, Нэсквік, Ржэпа, Дзімачкінс ды Скід. Дзімачкінс, прадстаўляючыся, заўсёды казаў: «Прывітаньне, мяне зваць Дзімачкінс, я напісаў «ВОРС», і я лабаю «Каноплі».

Зрэшты, кожны з вас ведае, хто такі Дзімачкінс. Дзімачкінса ведаюць усе.

Хтосьці пусьціў чутку, што на выступ мусіць зьявіцца сам Уладзь Рэлянію (ака Данка Эленіюм). На ўсялякі выпадак шанавальнікі захапілі з сабой па зборнічку ягоных вершаў у прозе для аўтографу.

Крыху патусаваўшыся са старымі сябрамі, Банзай зайшоў у спартзалю. Адразу каля ўваходу стаяла зграйка гопнікаў — пацаноў ды пацанак. Сярод іх была і Рыба-Сонца. Пакуль Банзай стаяў каля дзьвярэй, выцукваючы вачыма вольнае месца, ён пачуў, як легендарная Іра Каркуша прамаўляе:

— А эці будут? — Рыба крыху адхілілася назад і зрабіла жэст, які мусіў імітаваць рухі ды-джэя на вечарынцы, калі ён круціць вінілавую кружэлку. У Іры гэта вельмі нагадвала дзявочую мастурбацыю. Банзай зайшоў, яго заўважылі, і балбатня ўмомант сьціхла. За сьпінаю ён пачуў голас Рыбы-Сонца:

— Фу, ненавіжу ево. Как наркаман.

Юрку памахаў Дзіма, тым самым паказваючы, што заняў яму месьцейка. Хоцькі-няхоцькі прыйшлося сядаць у адзін зь пярэдніх шэрагаў, зарэзэрваваных для выкладчыцкай эліты ды вядоўцаў.

Усе павольна засмакталіся ў залю. На сцэну выйшаў спадар Андрый; адкашляўшыся, ён красамоўна замаўчаў.

Спадар Андрый маўчаў так доўга, што, здавалася, вырашыў паўтарыць слаў-

назнаную п’есу «4.33» (гэта калі піяніст нерухома сядзіць перад фартэпіяна і выконвае ЦІШЫНЮ; ЦІШЫНЯ, у сваю чаргу, выконваецца гледачамі, іхнім мармытаньнем, шэптам, чвяканьнем, скрыгатам, рыпеньнем крэслаў і г. д.); аказалася, ён проста хацеў, каб усе заткнуліся.

Нарэшце сьціхла ўсё, толькі было чуваць, як Дзімачкінс ціхутка завывае свае «Каноплі» дзесьці ў задніх плебэйскіх шэрагах.

Пачалася доўгая, занудная, патэтычная, эклектычная і абсалютна бессэнсоўная прамова, якая месцамі дзякуючы няўдала-вострай сатыры нагадвала выкрывальную філіпіку (настаўніцы ангельскай мовы, якіх філіпіка выкрывала адну за адною, зрываліся зь месцаў і выбягалі са спартзалі; спадар Андрый адно паціскаў плячыма, нібы кажучы: «Ох ужо гэтыя жанчыны!»).

Прызэрам алімпіядаў уручылі па капэрціку з бацькамі Хмялямі ўсярэдзіне, харошых пагладзілі па галоўцы, а нехарошым, як той казаў, добра надавалі па срацы.

Пасьля пачаліся занудныя і ня вельмі выступы розных клясаў, якія ўзрушылі Банзая толькі двойчы.

Першага разу — тады, калі на сцэну выйшлі трое хлопцаў (добра знаны ўсім Юрка Ржэпецкі, аўтар словаў — сярод іх) і засьпявалі добрую касінерскую песьню:

*Не віхор над Львоўскім замкам*
*Дуб стары хістае —*
*Нефармал пад тым дубочкам*
*Ляжыць-памірае.*

*Ўсё старонку ўспамінае…*
*Мог бы жыці й жыці…*
*Вачаняты й кудзеры —*
*Бы валошкі ў жыце.*

*Покуль маці ля калыскі*
*Выцірала соплі,*
*Бацька-хіпі ў драных джынсах*
*Гойсаў у каноплі.*

*Хіпаваў ягоны бацька*
*Й пра сыноў ня ведаў:*
*Першы ў гопнікі пайшоў,*
*Другі — да скінгэдаў…*[14]

[14] Пераклад Андрэя Хадановіча паводле: Студэнцкая думка. 2002. № 11—12.

Другая неспадзяванка была хутчэй ідыятычная, чым алегарычная. Невялічкі хор хлопчыкаў перагукаўся зь невялічкім хорам дзяўчатак па-расейску: «Падаждзём маю маму?» — пыталіся дзеўкі. «Падаждзём. *Твою мать*»… — адказвалі хлапцы. Банзаю страшна закарцела кінуцца на сцэну і пакусаць як мага больш сьпевакоў. Ды так файна пакусаць, каб потым швы накладалі.

Каб ведалі.

Пакуль імпрэза цякла млява, Банзай прыгадваў учорашні вечар. Робячы выгляд, нібыта штосьці кусае яго ў шыю, Юрко ўвесь час круціў галавою, шукаючы вачыма Дарцю.

Нарэшце пачалося Я Н О . Вядоўца-старшаклясьніца з 11 «В» абвясьціла, што зараз выступяць Раман Малаялам і Андрый Сэмпляваны. Дзяўчына нахмурыла лоб, пасьля троху прымружыла вочы, разьбіраючы назву нумару:

— Экспэрымэнтальны, альтэрнатыўны танец-балет «Лясная песьня». Пасьля гэтага будзе чытаць свой верш Андрый Сэмпляваны.

Банзай адразу перастаў круціцца і выпрастаўся ў крэсьле. Ён увесь ператварыўся ў слых і зрок.

З дынамікаў зафырчэла злавесная музыка. Гэта нагадвала гучаньне сотні ўключаных дрылек, якімі граюць на электрагітары. Юрко нутром адчуў, што гэта — мілая вуху Сэмпляванага «KMFDM».

З-за кулісаў на сцэну выплылі Павук ды Сэмпл, абодва пераапранутыя мітычнымі постпанкавымі індустрыяльнымі стварэньнямі — Здыхлікам Няўмiручыкам ды Вужыкам Агняпалікам. Сэмпляваны, які выконваў ролю Вужыка, меў на сабе адгазьнік бязь фільтравай камэры. Ён люта круціў сваім хобатам, вытанцоўваючы складаныя піруэты. Павук, у даўгой чорнай накідцы на голае цела, пачаргова накладаў на розныя выступаючыя часткі цела гумавы жгут і рабіў выгляд, нібы коле сябе брудным шматразовым шпрыцам. Потым ён пачаў набіраць з кубка Пэтры разьведзены вадою кетчуп і пырскаць імітацыяй крыві ў Вужыка, цэлячы ў шкляныя вочы адгазьніка. Яны кружлялі адзін вакол аднаго ў экспэрымэнтальным танцы, а калі музыка дасягнула апагею, перакулілі сталы са шпрыцамі й кубкамі Пэтры і зьніклі за кулісамі.

У залі стаяла каменная цішыня. З задняга шэрагу пачуўся голас Дзімачкінса:

— Скідзе, маеш чаго папаліць?

Паступова фарбы вярнуліся на твары гледачоў, і сэрцы зноў забіліся ў тахікардычным рытме. Але на сцэне ў другі раз зьявіўся Сэмпляваны, праўда, ужо без адгазьніка ды шпрыцаў.

— Вершык называецца… — ён нясьмела мяў паперку ў руках, — ммм…. «Мантра порту Гоа. Ода апошняму бітніку». Гм-м-м…

Сэмпляваны набраў поўныя грудзі паветра й пачаў цягуча чытаць:

— *Весяліся ў падзяку, як чмель у баку, альбо нож у сраку, радуйся паху смаку й маркоце маку, маліся морфіем, каліся торыем, сіняю маннаю й дзікаю Ганнаю, што на сьвітаньні ў голым убраньні адкрыла ўздыханьні мастурбаваньня ды падгляданьня, варажба на бляваньні, аб дзіўных тарэнах і празрыстых тэрпэнах, ні ў якім разе ў вузенечкім пазе, эрэкцыя сільная, рэфлексія пільная*

*ў цяжкім у полі, на Галгофе ў стадоле, цешыцца спэрме на сьвінафэрме, што зьядае дзяцей, дзе грыбы прарастаюць, уздыхаюць, лятаюць, блукаюць, канчаюць сівымі саплямі сонных сычоў. Стары, ёсьць такі разнавід і падвід мудакоў, казакоў, і лахоў, што пацеюць, лахаюць, блукаюць, лятаюць і лаюць, і ліжуць, глынаюць сок салодкіх сунічак похваў дзяўчат.*

*Цешся днём, едзь канём, лютым шолахам, сыпся порахам, скокам-бокам-прыпёкам безнадзеі (ёю поўная шафка № 2 у канцы калідора). Кааксіл, мастадонт, імбэцыл, правы фронт. Валакно рудых сьвітанкаў ад жоўтае брамы і Бармы і кепскае кармы, ад раптоўнае сьмерці й паскуднага жэрця, ад халоднага сэксу і пракіслага кексу (ня еж кексы; крэм — застылая бычыная спэрма, яна гарчыць і вельмі сьмярдзіць); з рашэньнем цьвярдзець, запрашэньнем сядзець і сядаць, і стаяць, і лавіць, і хапаць, любіць ванітаваць, ліць ваніты любоўю й застылаю кроўю застарэлых унутраных крывацёкаў і ўцёкаў: уцякаеш наўзбоч ты. І наўзбач ты. Ого, бач ты, яны кахаюцца ў ваньне ў халодным сьцяканьні крыві паміж яе кахлевых ног.*

*Порт Гоа, уратуй мяне ад параноі.*

*Вы ўсе — Анты-Ноі, толькі я Гіпэр-Каін.*

*Порт Гоа, вазьмі мяне да сябе. Ад дзікіх пігулак гаркавых вулак, ад ласых азадкаў ды лысых аладкаў. Там сходзяцца яе кахлевыя ногі, як нажніцы ў паясьніцы аднаклясьніцы, над прорваю, і соннаю выдраю з мокраю гідраю, з гідрамі сноў у гірах дажджоў, начных багатых плашчоў, што цкуюць за мною.*

*Порт Гоа, уратуй мяне ад іх. І ад тых, і ад сіх, хто цішэйшы за ўсіх, хто прыціх і распух, як атрутны пампух:*

*цябе праглыне лысы пастух, што пратух, як еўнух, як сертак (не, ня так!). Валапас, гідрапонік ды проста мудак*

*(аднак такі-так!)*

*Порт Гоа! Вазьмі мяне да сябе!*

Дзімачкінс пачаў пляскаць толькі трэцім. Яго апярэдзіў Банзай. Ведаеце, хто пачаў пляскаць першым?

Генік Браўноў з 11 «В».

**6.**

У пятніцу, калі пачаўся дождждык, на Банзая ізноў навалілася мэлянхолія. Ён адчуваў, як колер настрою перарастае з шыза-шэрага ў цёмна-шэры, а там

(Корый так менавіта Корый)

ужо згушчаецца ў чорны. Банзай павольна цягнуўся пустымі, нібы пасьля чумы, вуліцамі і ў думках дзякаваў, што цяпер яго ніхто не штурхае і не чапае. Заўтра будзе канцэрт, заўтра ён пабачыць малую Дарцю… Але не раней, чым заўтра. Да заўтра яшчэ можна некалькі разоў памерці.

Дождж нібыта спыніўся ў часе. Замест яго ў паветры павіс ліпкі ад сырасьці туман. Туману нейкім чынам удавалася згушчацца сынхронна з мэлянхоліяй Банзая.

Зьнянацку Юрка спыніўся і азірнуўся навокал. У сырой эмульсіі танулі нават сьцены будынкаў. Туман, як і час, размывае межы. Банзай зірнуў цераз плячо. Нейкі заблукалы цень далёка ад яго прапароў мокрую сырасьць. Наперадзе, здаецца, таксама мільганула штосьці цёмнае. Тратуары пасьпелі пакрыцца тонкай сетачкаю аселай вільгаці.

Такога, вядома ж, не бывае, але Банзаю здалося, што з вокнаў гмахаў за ім пільна сочаць. Ён павольна ішоў далей, прыслухоўваючыся, як расьце трывога. Навокал яго было толькі водгульле ад абцасаў чаравікаў.

(азірніся)

Ён азірнуўся. *Ззаду* нікога не было, але Юрку здалося, што менавіта ў гэты момант штосьці прашмыгнула *наперадзе*. Банзай павярнуўся вакол сваёй восі, і ў нейкую з сэкундаў сэрца ягонае скочыла яму ў галаву і пачало біць зь сярэдзіны па барабанных перапонках. Бо менавіта ў гэтую сэкунду ён ня змог пазнаць вуліцы, на якой знаходзіўся. Банзая праглынула поўная дэзарыентацыя, нібыта ён толькі што вынырнуў са сну ў незнаёмым месцы. Не было зразумела, збочвае вуліца, ці ўсё-ткі вядзе наўпрост. Асфальтавы тратуар падаваўся не пляскатым, а пакрытым рознапамернымі зморшчынамі ды выпуклымі хвалямі. Але міраж адразу зьнік, і Юрко пазнаў вуліцу Шчорса. Туман прыносіў невядома адкуль надзвычай нізкія, а таму й малазаўважныя вібрацыі, ад якіх сьвярбела ў носе й сьлязіліся вочы.

Ён ізноў азірнуўся.

Банзай прысьпешыў крокі і паспрабаваў заглыбіцца ў сябе,

(тады ня так страшна)

каб наладзіцца на папярэднюю прастрацыю, але адчуваньне

(Прысутнасьці)

вонкавай абсэрвацыі не праходзіла.

Юрко зірнуў цераз плячо і тут жа зноў наперад. Надзвычай лёгкія цені праплывалі ўглыб туманнае завесы. У мораку сутоньня прапоўз лягуткі эфэмэрны шэпт. Хоць, бясспрэчна, гэта ўсё здавалася. Банзай пайшоў яшчэ шпарчэй (цяпер ён амаль бег) і рыўком адчыніў дзьверы будынку. «Рэха! — падумаў ён, — Водгульле маіх крокаў у тумане пераламалася і ператварылася ў шэпт… у грукат… праўда? Ну праўда ж?»

Ён уварваўся ў сьцюдзёны калідор, асьветлены адзінаю круглаю лямпаю, якая зьвісала з высачэзнае столі, і пабег па крутых драўляных сходах, гучна тупаючы па дубовых дошках. Спыніўся каля гатычнага вітража, які цягнуўся вузкаю каляроваю стужкаю да самага гарышча, і зірнуў скрозь празрыстае шкельца вонкі.

Туман.

## 7.

Банзай зайшоў у кватэру, кінуў пад сьцяну вітальні заплечнік. Адна са сьценаў у пакоі, якому ўдавалася адначасова быць для Юрка кабінэтам, спальняю, чытальняю, бібліятэкаю ды вітальняю, ішла наўскос — трэці паверх гэтага дому

быў ужо мансардны. Гэтая нахіленая сьцяна была абшытая сьветлымі лякаванымі сасновымі дошкамі. Рэштку сьценаў ён абклеіў нотамі з партытураю «Лятучага галяндца» Вагнэра: калі Банзай упэўніўся, што пакой усё-ткі патрабуе пабелкі, а грошай на шпалеры няма, ён скарыстаў аркушы з нотамі для аркестру. У нахіленай сьцяне, ды яшчэ ў сьцяне побач, былі невялічкія вокны (калі глядзець на будынак звонку, то гэтыя вокны можна знайсьці недзе пасярэдзіне даху). Пад навіслай сьцяною стаяў ягоны ложак, пад іншым акном — працоўны стол. Пад трэцяю стаяла кніжная шафа.

Банзай пайшоў на кухню, запарыў сабе кавы і закурыў. Ён задумаўся, а ці не раскурыць кальян? Перадумаў і паставіў кружэлку з «Крыдэнсамі» (то бок, «Creedence Clearwater Revival»), купленую на вэрнісажы ў старога зьнядоленага мэлямана. Мяккі плед псыхадэлу шасьцідзясятых ды пракаветны ракэнролец — гэта сама тое, што й патрэбна ў такое надвор’е, калі прыходзіцца грэцца на кухні каля запаленых фаерак газавай пліты.

Ён выпіў кавы з малаком, зьеў канапку і сядзеў. Слухаў музыку.

## 8.

У чвэрць на восьмую хтосьці пагрукаў у ягоныя дзьверы. Ад неспадзяванага гуку Банзай скалануўся. Апошнім часам ён стаў на дзіва пужлівы.

Знадворку цяпер вісеў прыцемкавы туман. Ізноў пагрукалі: у будынку, дзе Банзай здымаў памяшканьне, увогуле не было званкоў, хіба што ахвочы мог зладзіць нешта такое сабе сам.

Ён падышоў да дзьвярэй. За імі стаяла Дарця Борхес. Юрко зьдзіўлена міргаў. Дарця глядзела на яго з-пад мокрых валасоў сумнымі вачыма, зь яе цяклі драбнюткія кропелькі вады. Ад сырасьці валасы завіліся больш, чым звычайна. Дарця нагадала яму нейкага бяздомнага цуцыка.

— Давай заходзь, — прамовіў Банзай.

Дарця разулася, кінула свой заплечнік у калідорчыку і ўвайшла ў ягоны кабінэт.

— Ух ты! Ну ў цябе і пакой!.. — захоплена сказала яна і зрабіла тое, што зьдзівіла і парадкам напужала Банзая. Яна ня стала разглядаць мэблю і ксёнжкі; гэта Дарця зрабіла пасьля. Першаю справаю яна падышла да акна ў нахіленай сьцяне і вызірнула ў зусім ужо цёмную й напоўненую туманам вуліцу. Банзай заўважыў, як напружваўся ейны твар, калі яна спрабавала там штосьці разгледзець.

— Ты бачыла штосьці на вуліцы? Штосьці... м-м-м… не такое? — запытаўся ён, стоячы ў дзьвярах.

— Не-а, проста ўжо бярэцца на цемру. Нічога не відно за туманам. Страшна было ісьці да цябе.

## 9.

Кухня ў Банзая таксама была маленькая. Там былі газавая плітка, ракавіна для мыцьця посуду, лядоўня (такая, ведаеце, маленькая, круглаватая, старой канструкцыі), стол ды кухонная лаўка зь вішнёваю абшыўкаю. І адна шафа для посуду, мукі й крупаў.

Малая села за стол, ён даў ёй кубачак гарбаты. Гарбата была моцная, колеру кары эбэнавага дрэва. Гарбата пахла бэргамотам, была гарачая і салодкая; кубачак быў вялікі, спэцыяльна, каб можна было выпіць паўлітра гарбаты, не даліваючы вады ці заваркі. Гэты кубак Банзаю зрабілі на замову: ён меў форму чалавечага чэрапа, які люта пасьміхаецца, зь вялікім гліняным вухам на патыліцы. Шторанку ён піў з гэтага кубачка каву з малаком. Пакуль што Дарця адно зь цікаўнасьцю разглядала судзіну і грэла аб яе далоні.

— Ты будзеш яечню? — пацікавіўся ён.

Дарця нічога не расказвала, яна проста піла гарбату, падносячы чэрап да вуснаў абедзьвюма рукамі, і распытвала Банзая пра ўсялякія дробязі. Тым часам ён смажыў шасьцівокую яечню «Кольт», падсыпаючы туды ўсялякія траўкі ды жмені цёртага цьвёрдага сыру.

Малая сама падала талеркі і сядзела далей у чаканьні.

— Ты можаш заначаваць у мяне, — сказаў Юрко асьцярожна, думаючы пра яе заплечнік ды шмоткі ў ім.

Яна шырока ўсьміхнулася.

— А ты думаеш, чаго я сюды прыйшла?

## 10.

Дзесьці пасярэдзіне іхняй трапэзы адключылі сьвятло. Дарця апавядала, якія нягоды прывялі яе да Юрка. «Задралі, блядзі», — вельмі б хацелася сказаць ёй у двух словах, каротка і ясна, без прыкрасаў, *калі б не*.

— Задралі. З а к у м а р ы л і , — падсумавала яна.

Вядома ж, гаворка ішла пра інтэрнацкі соцыюм.

— Я ў цябе заначую да заўтра, добра? — лісьліва запыталася яна, гледзячы на Банзая, які сядзеў побач на вішнёвай лаўцы; «Быццам бы я магу цябе выгнаць», — падумаў ён. Усярэдзіне ўсё гарэла. Дарця штурхнула яго пад бок локцем, вымагаючы адказу.

— Угу, — заківаў ён галавою, паколькі рот у яго быў напханы яйкамі і плаўленым сырам.

Потым Дарця ўзяла ў рукі сьвечку і пайшла разам зь Юркам разглядаць ягоную вітальню. Яна глядзела на касэты ды кружэлкі, падыходзіла да шафы з кніжкамі. Кафка, Іздрык, Бэроўз (праўда, Ўільям, а ня Эдгар Райз) і Керуак, Макена і Скаварада, Гроф, Ўосаны, Пэрфэцкі, Бах, Маркес, Вонэгут і Андруховіч, і Бэкет, і Пакальчук, і куча іншых.

Дарця села за ягоны стол і заявіла, што зьбіраецца зрабіць зараз усе ўрокі. Банзай пацепаў плячыма. Ён лёг на ложак і любаваўся ейным тварам у сьвятле

сьвечкі. А потым ён паступіў скрайне непэдагагічна, прапанаваўшы:

— Хочаш, пакурым кальян?

Дарця павярнулася на крэсьле тварам да яго. Ейныя вочы загарэліся.

— К-а-аль-ян? — перапытала яна. Тут жа ўскочыўшы з крэсла, яна кінулася да яго на ложак.

— Давай! Банзайка, давай пакурым… — яна прапхнула рукі між ягонай сьпінаю ды ложкам, прыціскаючыся ў слабым сьвятле да ягоных грудзей.

— Ну, давай, Банзайка, давай… Гашыш? Анаша? Давай, чуеш?

Банзай абняў яе, і плынь словаў вокамгненна спынілася. Дарця цёпла дыхала ў ягоныя вусны. Ён зазірнуў у ейныя цёмныя вочы, вочы лані, вогкія, бліскучыя вочы, вочы бяз дна, у якіх вельмі лёгка патануць, вочы без усялякіх пытаньняў ці пярэчаньняў. У ейных вачах ён пабачыў штосьці, чаго не было ў позірку Солі: ня просьбу вытрахаць яе так, каб пасьля было цяжка хадзіць, а толькі жаданьне быць побач з тым, хто ня будзе кпіць, крычаць, абражаць яе і ня будзе спрабаваць крыўдзіць яе і чапляць за жывое. Дарця прапаўзла па ім вышэй, цягнучыся вуснамі да вуха.

— Ну, давай гашыш, анашу ці што там у цябе ё. Хадзі, ну?.. — усё гэтак жа ўпёрта нашэптвала яна, дыхаючы яму проста ў вуха.

З тэатральным стогнам пазяхнуўшы (ён проста кайфаваў ад малой) і ўзьняўшыся, ён палез у шафу па кальян. Дарця, узбуджаная, пайшла за ім.

— Гэта *ён*? — спыталася яна з пашанаю.

Звонку кальян вельмі нагадваў лямпу-таршэр. Прыблізна мэтар ад зямлі, тонкі і дыхтоўна высокі, нібы хлопчык-катаміт у гарэме старога пэдафіла, з драўлянай разьбою на корпусе. На самым версе была маленькая місачка для тытуню ды вугольля. Унізе была вялікая шкляная пасудзіна, якая формай нагадвала хімічную колбу. У колбе (з тоўстым шклом) была вада, у якую з драўлянай верхняй часткі заходзіла мэталічная трубка. Колба напалову была запоўненая паветрам, і да гэтай паветранай праслойкі вяла мэталёвая трубчастая адтуліна; у гэтую адтуліну ўстаўляўся доўгі паласаты шлянг (паводле фактуры ён нагадваў пакрыцьцё электрашнура для праса савецкага ўзору). На канцы шлянга быў даўгі залачоны, аздоблены разьбою муштук.

Дарця села на пяткі і разглядала кальян, водзячы па ім пальцам.

— Ідзі на кухню, — сказаў Юрка. — Трэба напаліць вугельчыкі.

Ён выцягнуў з папяровага мяшэчка кавалак каменнага вугалю, з палатнянага — серабрыстыя шчыпцы. На кухні ён над полымем нагрэў кавалачак, трымаючы шчыпцамі над фаеркаю, ажно пакуль той ня стаў вішнёвы ў некалькіх месцах.

— Трымай, — сказаў Банзай, калі яны ўжо зноўку былі перад кальянам. Дарця слухмяна ўзяла жарынку і стала зьлёгку дзьмуць на яе, падтрымліваючы чырвань. Банзай гэтым часам нацягнуў на верхнюю міску фольгу ад шакаляду. У фользе было шмат прабітых голкаю дзірак; з унутранага боку на ёй быў згустак нейкага смалістага ліпкага рэчыва.

Калі фольга была шчыльна прымацаваная згусткам да сярэдзіны, Банзай прамовіў:

— Кладзі вугельчык на фольгу, гарачым данізу. Будзем раскурваць.

Дарця паклала вугельчык, як Банзай і прасіў; ён тым часам сеў на падлогу, засланую шорсткім цьвёрдым кілімам, і пачаў што было моцы ўцягваць у сябе паветра цераз цыбук. Калі ў яго пачалася запамарока, ён перадаў цыбук Дарці.

— Цягні.

Урэшце ў цемры разьнёсься пах турэцкага тытуню зь яблыкамі. З вугельчыка завіўся стойкі дымок. Пакуль малая яшчэ цягнула, ён адчыніў акно.

Кальян перанесьлі да ложка, каб можна было курыць, седзячы на падлозе і абапіраючыся сьпінамі аб ягоны край. Банзай узяў з ложка коўдру — апроч таго, што з адкрытага акна цягнула горнаю золкай сырасьцю, у кватэры было халодна праз адключанае ацяпленьне. Банзай накрыў іх абоіх коўдраю і, трымаючы аднею рукою муштук, тлумачыў:

— Проста так перадаваць цыбук нельга. Трэба скруціць шлянг у колца, — ён паказаў як. — І я мушу двойчы пастукаць табе па далоні. Вось так.

— Гэта *чэсна* такі звычай ё, ці ты сам прыдумаў? — спытала яна, з хітрым выразам твару.

— Чэссс слова.

Дарця прыціснула кончык муштука да вуснаў і зацягнулася. Разьліўся пах тытунёвых яблыкаў. Яна выпусьціла дым праз рот і перадала шлянг Юрку.

— А дзе ты яго ўзяў, Банзайка?

— Ва ўнівэры ў мяне быў адзін знаёмы. З Дамаску. Підар, разумееш? Да мяне падкотваўся. А калі яму трэ' было ехаць дадому, ён падараваў мне кальян. Казаў, што будзе кахаць вечна…

Дарця наморшчыла нос. Ён наморшчыў нос у адказ і даў ёй зацягнуцца зь ягоных рук. Такое, паводле словаў Фаэза, дамаскага підара, традыцыя цалкам дазваляе.

— А яно саўсім ні кропелькі не ўстаўляе?

— Абсалютна. Максымум, што ты адчуеш, — прыемную слабасьць у руках і нагах. Гэта ж, блін, не гашыш.

Гэтак яны курылі, размаўлялі, прасоўваючыся скрозь час.

Банзай апавёў Дарці, што мае на мэце зладзіць у каледжы невялічкі пэрформанс. Ён спытаў, ці не хацела б яна ўзяць у ім удзел. Вельмі б нават хацела, адказала яна.

Дарця легла, сьцягнуўшы на сябе большую частку коўдры, але Банзай не пратэставаў. Яна паклала галаву яму на калені і глядзела на зашклёны плякат Робэрта Фрыпа на абклеенай нотамі сьцяне. Банзай гладзіў яе цёмныя валасы, прапускаючы іх скрозь пальцы. (Яны завіваліся на канцах.)

Сэрца яе — як лютня: кранеш ледзь — і адгукнецца.

## 11.

Сэрца яе — як лютня: кранеш ледзь — і адгукнецца.

Па гудзеньні лядоўні Банзай зразумеў, што зьявілася сьвятло. Было безь пяці

хвілін поўнач. Яны курылі і размаўлялі чатыры гадзіны.

Дарця паглядзела на яго.

— Табе сумна?

Ён пацепаў плячыма. Прыйшла абыякавасьць. Ён лёг каля яе на разасланую коўдру. Зьняў зь ейных плячэй лейкі камбінэзону, гледзячы ў вочы. Цёмныя вочы, вочы лані, вочы бяз дна, без усялякіх пытаньняў у іх. Банзай мог чуць, як гучна тахкае яе сэрца. Яна глядзела на Юрка, і Юрко бачыў у ёй дзіця; бачыў у ёй сваю дачку, якую хацелася

*(нахіліць і вытрахаць*

*[нават ня сьмей думаць нават ня сьмей]*

*нахіліць і вытрахаць)*

пасадзіць на калені і гладзіць па валасах, якія завіваюцца на кончыках. Юрко расшпіліў гузікі футболкі (ці то блюзкі) з даўгім рукавом, зялёнай, нібы вочы велічнага бога Пана. Дарця шумна ўцягвала паветра за кожным з расшпіленых гузікаў. Цёмныя (чорныя) валасы, якія завіваліся на кончыках, рассыпаліся вакол ейнай галавы па квадратнай коўдры. Банзай адчуваў, як яе цела пад коўдрай усё цяплее, з кожным расшпіленым гузікам. Ён адкрыў блюзку, за якой была пара невялічкіх грудак пад чорнаю тканінаю станіка. Дарця ляжала нерухома, толькі неадрыўна глядзела на ягоны твар, а Банзай асьцярожна пацалаваў яе ў голыя плечы. Скідаючы зь іх лейкі станіка, расшпільваючы яго ў Дарці за сьпінаю, агольваючы малочныя персі. Усё ейнае цела было колеру малака, матава-белае й цёплае, адно цямнелі невялічкія смочкі, яшчэ ня здольныя цьвярдзець, як у Солі. Ён гэтак жа асьцярожна пацалаваў яе ў ямінку пад шыяй і прытуліўся губамі да грудак. Ён

*(сэрца яе як лютня)*

хацеў яе, хацеў мацней, чым калі-небудзь прагнуў цела Солі, таму што Соля ніколі ня мела таго, што было ў вачах Дарці.

*(як лютня)*

Ён удыхаў ейны пах, пах сьпелага вінаграду і суніцаў, пах дыму з кальяну,

*(сэрца яе як лютня)*

ён мог працягваць цалаваць яе, скінуць зь яе камбінэзон і цалаваць ейнае цела, пакуль яно не запалае ў яго пад вуснамі, ён мог бы знайсьці губамі яе салодкую сунічку і цалаваць яе сто вечнасьцяў да ста сьмерцяў ад выбліскаў у галаве і целе.

*(сэрца яе як лютня кранеш ледзь і адгукнецца)*

І Дарця слухмяна ляжала б, слухмяна даверыўшыся яму.

Але

*(сэрца яе як лютня кранеш ледзь і адгукнецца)*

яна прыйшла да яго ня як да каханка, а як да сябра, які ніколі ня будзе кпіць, крычаць, абражаць яе і ня будзе спрабаваць крыўдзіць яе і чапляць за жывое. І ён увераваў, што ў ёй і напраўду ёсьць лютня, зь якою трэба быць пяшчотным і асьцярожным. Асьцярожным, каб не парваць струнаў. Ён захутаў ейнае цела ў мяккую зялёную блюзку (колеру вачэй велічнага бога Пана) і лягутка пацалаваў

у вусны. Дарця абняла яго за шыю і прытуліла да сябе. Вельмі ціха, так ціха, што Банзай сам ледзьве пачуў, яна прашаптала: «Дзякуй».

**12.**

Банзай даў Дарці адну са сваіх наўмысна балахоністых саколак. Саколка была бялюткая і хрумсткая ад сьвежасьці. Дарця панюхала яе: саколка мела пах Банзая і той лёгкі водар, які яна зьвязвала зь летам, пахам чыстых маек ды выпраных джынсаў. Банзаева саколка мусіла служыць ёй начнушкаю. Пакуль Дарця скідала джынсавы камбінэзон, блюзку ды станік, Банзай стаяў да яе сьпінаю (хоць яна і сказала, што гэта лішняе, але чарговая актыўнасьць у пахвіне яму ні да чаго). Яна акуратна павесіла ўсё адзеньне на адзінае крэсла ва ўсёй кватэры і вымыкнула сьвятло.

Банзай, які ўжо ляжаў у ложку, адчуў, як ейнае цёплае цела коўзнула па прасьціне і ўладкавалася ў выгіне ягонага ўласнага цела. Потым Дарця павярнулася да яго тварам і папрасіла абняць яе. Было і напраўду халодна, на вуліцы і ў кватэры, таму Банзай утульна абняў яе, саграваючы. А пасьля ён заснуў, таксама ў ейных абдоймах, валадарачы целам адной маленькай дзяўчынкі, якая прыйшла да яго як да сябра і якая насіла ў сэрцы далікатную лютню.

## Разьдзел 9

**1.**

У суботу гопы павесяліліся на славу. Каледж скаланаўся ад мілых вуху «Рукі Ўверх» і надрываў малюткі Брытні Спэрмз.

У панядзелак сьвята прыйшло і на рок-вуліцу. Увесь навучальны дзень быў кату пад хвост, бо ўсе нефармалы ўзбуджана гудзелі: «Рокатэка! Рокатэка!»

Банзай, вядома ж, *такога* прапусьціць ня мог.

**2.**

Прыйшла рокатэка, грозна пабразгваючы мэталёвымі латамі.

Дзесьці а палове на пятую ў яго кабінэт зазірнула Дарця і сказала, што ўжо *час*. Добра, час, значыць, час. І ён пайшоў зрываць сабе дах і дапамагаць зрываць яго бліжнім.

На рокатэцы было страшэнна шумна і людна, і ўсе валасатыя таварышы махалі патламі так, што зямля дрыжала. Народ адрываўся па-чорнаму, музыка галасна пагражала вырваць вантробы і размазаць іх прыгожымі альтэрнатыўнаавангардавымі плямамі па сьценах спартзалі. На шчасьце, у цемры ніхто ня бачыў, што ён быў з малой.

## 3.

Пасьля гадзіны бесьперапыннага кілбашаньня Банзай адчуў, што было б вельмі няблага перавесьці дух і адпачыць. Яны абодва выйшлі са спартзалі і папраставалі па калідоры да выйсьця. На дварэ ўжо была глухая ноч, а калідоры асьвятляліся нешматлікімі лямпамі са слабенькімі лямпачкамі. Калідор на першым паверсе быў проста-такі даўжэзны і асьветлены быў акурат так, як, на думку Банзая, трэба асьвятляць турэмныя калідоры ў чорна-белых фільмах пра даваенныя гады: лямпы, падзеленыя дзесяцьцю мэтрамі цемры, у якой панурыя ахоўнікі прадаюць вязьням пшанічную баланду і танныя папяросы з махоркай. Лямпы мелі вузкія мэталічныя пляфоны і кідалі на падлогу па скупым снапку сьвятла, так што ўсё асьвятленьне калідору зводзілася да гэтых жаўтаватых турэмных выспачак, якія ні пры якіх умовах не зьліваліся ў адну паласу. Па-за межамі чорна-белага (жаўтаватага) бяльма была непранікальная цемра.

Нагадвае тунэлі для электрычак. Цікава, ці ходзіць тут мэтро? Падчас завірухі ці, скажам, вераб'інай ночы... Перавозячы самотных звар'яцелых прывідаў зь ніадкуль у нікуды.

— Глядзі, — Дарця паторгала яго за руку. — Хто гэта?

Яна паказвала на постаць, што варушылася ў канцы тунэлю. Юркава сэрца ціха ёкнула. Постаць ішла ў іхні бок. Нарэшце яна мінула адну з выспачак сьвятла, і на кароткае імгненьне сьвятло выкрыла твар Корыя. Той спыніўся ў цемры.

Банзаю стала моташна. Нечакана здарылася тое, чаго ён потым ну ніяк ня мог сьпісаць на сон ці насланьнё. Юрку здалося, што прастора паміж ім і мужчынам рэзка скарацілася, і ў наступны момант Корый ужо быў у яго пад носам. Банзай разгледзеў яго шалёную ўсьмешку і адразу ж пабачыў, як блснулі ў цемры рукі Корыя, моцна штурхаючы, выштурхваючы ў

## 4.

*Банзай/Азатот*

*[ты думаеш, ты зможаш цягацца са мной? Ты малы і дурны]*

*[што адбываецца? дзе я?]*

*[хо-хо-хо! І ты яшчэ хочаш цягацца са мною? Ты думаеш, яны табе хоць чымсьці дапамогуць? Ты, напэўна, думаеш, што тыя кніжкі, якія ты прачытваў за адну ноч, табе неяк дапамогуць? Хоць штосьці патлумачаць? Я дзесяць год вывучаў іх, я вывучыў на памяць такія тэксты, што табе й ня сьнілася]*

*[ты Корый, праўда?]*

*[ха! Корый! Усе кажуць: «Корый — стары алкаш». Ніхто ня ведае, хто такі Корый насамрэч. Ніхто ў жыцьці не пабываў там, дзе быў я. Ніхто нават у сьне не пабачыць таго, што бачыў я]*

*[вярні мяне назад]*

*[ха! Ты клічаш на дапамогу ў Азатоце, пры браме ў Азатот, а што будзе, калі я пакажу табе яго сэрца, калі ты ўцяміш, чым ёсьць Азатот? А што будзе, калі ты апынесься ў ЯГО дома? Я нават не хачу згадваць, што будзе, калі ты пабачыш ЯГО. Ты проста памрэш, бо твой мозг патоне ў крыві з тысячы папоканых судзінаў]*

*[вярні назад!!! Хто такі ЁН?]*

*[ты яшчэ пытаеш? І ты хочаш цягацца са мной?]*

*[ён — гэта Азатот?]*

*[Азатот! Ха! Азатот — Вока Хаосу. Азатот — пясчынка ў параўнаньні зь вялікім Ёг-Сатотам! Цяпер Ёг-Сатот наймацнейшы, апошні зь вялікіх. Цяпер, калі Ктулху замкнулі ў падводным горадзе Р'льех, я стаў вярхоўным жрацом Ёг-Сатота. Я магу зрабіць такое, што ты нават не здагадваесься. СІЛА, яна распусьцілася ўва мне]*

*[наза-а-ад!!! Вярні мяне назад!!!]*

*[Сур'ёзна, хлопча, я ня той, з кім варта распачынаць дурныя дзіцячыя гульні. Не станавіся на маім шляху! Я не жартую, і ты не жартуй]*

**5.**

— Банзаю, ты жывы? — Дарця ўстрывожана пляскала яго па шчаках. Юрко расплюшчыў вочы.

— Як гэта выглядала? — першаю справаю запытаўся ён. Банзай азірнуўся. Нідзе нікога не было, толькі пякельна голасна ракатала рокатэка.

Дарця зьдзіўлена зазірнула яму ў вочы.

— Мы ідзём, а тут ты *бах*! — спыняесься!.. І ўсё. Твар мёртвы, я цябе клічу, пляскаю па твары, а ты — нуль рэакцыі...

— А дзе Корый?

Дарця мімаволі здрыганулася. Яна зірнула туды, дзе некалькі вечнасьцяў таму стаяла постаць. Яе бровы зьдзіўлена папаўзьлі ўверх.

— Няма, — сказала яна, выказваючы тым самым поўнае неразуменьне таго, што адбылося.

Банзай сеў на падваконьне. Зь нічога-ніякага Дарця спыталася проста ў лоб:

— Ты *выходзіў*, праўда? *Як табе здалося*?

— Я нікуды не выходзіў. Я ўвогуле не разумею, што адбылося.

— Ты *выходзіў*, — упарта паўтарыла яна. — Скажы, што ты бачыў? Ну скажы, Банзайчык, давай.

— Адкуль ты ведаеш? Чаму ты так думаеш, што я кудысьці выходзіў? — добра, што яны стаялі ў цемры, і не было відаць дзікага перапалоху на Юркавым твары.

Дарця адразу пасур'ёзьнела. У некалькіх словах яна паспрабавала пераказаць яму свой досьвед.

## 6.

У Новаявараўску, дзе, уласна, і вучылася Дарця, матэматыку выкладала маладая настаўніца, нядаўняя студэнтка Рэната Сьцяпанаўна, яна ж спадарыня Рэня. Калі б спадарыня Рэня нейкім цудам сустрэлася з Банзаем, яны, безумоўна, маглі б прагаварыць не адну гадзіну. І выявіць пры гэтым не абы-якую агульнасьць інтарэсаў.

Неяк пасьля чацьвертага ўроку спадарыня Рэня выклікала Дарцю да сябе і спыталася, ці ўмее яна кантраляваць ГЭТА. Вядома ж, Дарця адчувала, нібы яе стукнулі па галаве мяшком, але... Чамусьці (чаму?) яна адказала, што так, ясная рэч, умею, хто ня ўмее, ясная рэч, умею, а што?

Спадарыня Рэня ў адказ папрасіла Дарцю на імгненьне абстрагавацца і спытала, ці яна, спадарыня Рэня, ёй, выпадкам, не падабаецца як жанчына. Таму што на ўроку Дарця — кантралявана ці некантралявана — умудралася фізычна ўзбуджаць яе на адлегласьці.

Дарці хацелася ўцячы з клясы падалей ад хворай настаўніцы, але тая апярэдзіла, схапіла за руку і сказала:

— Я не лесьбіянка, я проста кажу, што было. У цябе ёсьць здольнасьці, сонейка. Скажы шчыра: ты с а п р а ў д ы ўмееш *гэта* кантраляваць?

Дарця была змушаная сказаць, што не, нічога такога яна на мэце ня мела і ўвогуле не разумее, пра што гаворка.

Тады спадарыня Рэня ўзялася праясьніць ёй некалькі аспэктаў справы. Вядома ж, усё выявілася абсалютнай лухтой, пра што сьведчаць далейшыя прыкрыя здарэньні з самой спадарыняй Рэняй.

Спадарыня Рэня, праз сваю псыхічную хваробу (інакш усю яе балбатню патлумачыць проста немагчыма... дый ня варта) пачала расказваць пра розныя дзіўныя рэчы. Пра практыку выхаду з уласнага цела; пра трансцэндэнтальную мэдытацыю і пра цудоўны катарсіс, які яна нібыта даруе; пра магчымасьць перасоўвацца па-за межамі ўласнага цела і астральныя палёты; пра небясьпеку, якая пільнуе такіх неасьцярожных летуноў падчас мэдытацыі ці ўсьвядомленага сьненьня.

Спадарыня Рэня сказала, што гэта вельмі незвычайна — сустрэць у такой маленькай дзяўчыне такі дар (*які яшчэ дар?* — ніяк не магла ўцяміць Дарця), такія магчымасьці, такі патэнцыял...

Спадарыня Рэня давала ёй чытаць стосы літаратуры, але строга забараніла спрабаваць х о ц ь н е ш т а. Асабліва ў адзіноце. Спадарыня Рэня часта паўтарала, што Дарця павінна разумець, што адбываецца зь ёй і навокал яе (і зноў жа доказы на карысьць зьнясіленасьці яе псыхікі, ці — што горай, але верагодней — поўнай звар'яцеласьці: сама Дарця нічога т а к о г а, што б адбывалася навокал яе, не прыкмеціла).

Іх дыялёгі вяліся прыблізна паўтара месяца ў восьмай клясе. Пасьля зімовых вакацый спадарыня Рэня не прыйшла ў школу. Яе замяняў дзядзечка пэнсійнага веку з хіжай усьмешкай на завялых вуснах, якому глыбока да сракі былі ўсялякія мэтафізычныя блуканьні ў пошуках сябе. Ён пастаянна паўтараў, што праз іх,

абрыдлых бесталковых ёлупаў, у Рэнаты Сьцяпанаўны цяпер праблемы з сэрцам. «Ага! Ведаем мы вашы праблемы з сэрцам...» — думала тады Дарця. Яна ня ведала, што адбылося насамрэч, але ў дваццаць сем гадоў праблемаў з сэрцам у такой жанчыны, як спадарыня Рэня, варта было чакаць у апошні момант.

Праз тры тыдні спадарыня Рэня зноў зьявілася на працы. Праўда, там яна пабыла ўсяго адзін дзень. Яна расказала Дарці, што ўвесь гэты час была ў Львове ў псыхдыспансэры, які на вуліцы Кульпаркаўскай, 95.

Прыблізна месяц яе трымалі ў дурцы. Вярнуўшыся адтуль, спадарыня Рэната выглядала, мякка кажучы, крыху не ў сабе. Яе твар асунуўся ад стомы; яна заўважна пастарэла.

Спадарыня Рэня расказала, што перад Новым годам спрабавала выйсьці са свайго цела, і акурат тады ёй гэта ўдалося. Яна вельмі па-майстэрску перавяла размову, калі Дарця спрабавала высьветліць, як гэта выглядала. Спадарыня Рэната толькі сказала, што цяпер палова яе цела як бы не належыць ёй: усе сэнсарныя адчуваньні — вада, якую яна п'е, ежа, што праходзіць па страваводзе, дотык, боль — адчуваюцца недзе зьлева, за чвэрць мэтра ад цела. І поўная дыскаардынацыя рухаў.

Потым Рэната ўзяла Дарцю за руку і прымусіла яе паабяцаць ніколі, НІКОЛІ такога не спрабаваць. Асабліва ў адзіноце. Дарця ўглядалася ў твар настаўніцы і бачыла ў ім толькі страх. Пераляк маленькага дзіцёнка, які нашкодзіў.

Спадарыні Рэні было ўсяго дваццаць сем.

На наступны дзень яе зноў ніхто ня бачыў. Не зьявілася яна і яшчэ празь дзень. Дарця хадзіла пераляканая і не на жарт устрывожаная здароўем сваёй настаўніцы. Спадарыня Рэня паўтарала, што Дарця адрозьніваецца ад іншых дзяцей, яна проста *іншая*. І па ёй гэта вельмі бачна. Таму ў яе так мала сяброў: дзеці скурай адчуваюць яе чужаснасьць, таму й трымаюцца ад яе падалей. Дарці варта прыглядацца да звычайных людзей, пераймаць іх, каб гэтая іншасьць так моцна ня кідалася ў вочы. Гэтыя словы былі яе апошнім наказам, дадзеным у апошні дзень.

На трэці дзень адсутнасьці папаўзьлі чуткі, што спадарыня Рэня перарэзала сабе жылы ў цёплай вадзе ванны.

Як ужо казалася, спадарыні Рэні было ўсяго дваццаць сем.

Наступныя некалькі месяцаў Дарця перабывала ў крытычнай дэпрэсіі. Без спадарыні Рэні вокамгненна прыйшло разуменьне, што абарвалася апошняя сувязь са сьветам людзей. Дарця ператваралася ў цалкам антысацыяльны тып, якому было напляваць *абсалютна* на ўсіх. Усе бяз выняткаў яе знаёмствы і стасункі (з бацькамі ў тым ліку) выявіліся абсалютна фармальнымі, банальнай звычкай усьміхацца і адказваць, калі да цябе зьвяртаюцца. Са сьмерцю спадарыні Рэні яна адгарадзілася ад усіх. Сьвет стаў кардонны і на фіг не патрэбны.

Для Дарці сьвет перастаў мець значэньне. Ня ў тым сэнсе, што настаў час піць пэргідроль ці рэзацца. Проста яе перасталі цікавіць іншыя. Цёплай вясной (амаль кожны пагодны дзень!) Дарця вярталася са школы дамоў (хата заставалася пустая да сёмай вечара), скідала ўсю вопратку і сядала голая на падваконьне, нагрэ-

тае сонцам. Абедзьве нагі яна клала на шырокую драўляную паверхню. Яна спрабавала паліць, або чытала, або проста сядзела і грэлася голая на сонцы. Блізка акна расла яблынька. Дрэва квітнела ўсю вясну, у пакоі стаяў дзівосны водар. Цягам усяго жыцьця Дарця будзе зьвязваць пах квецені са сваёй галізной.

З так званымі бацькамі сытуацыя не была лепшая — эвалюцыю іх стасункаў можна было назіраць па зьменах замка на ейных дзьвярах. Да дванаццаці гадоў замок быў такі, як і ва ўсіх: ключом усярэдзіну пакою, «няхай у малой будзе трохі месца для асабістых справаў», — казалі продкі. Трынаццаць-чатырнаццаць гадоў — замок мяняюць і ўстаўляюць іншы, ужо без ключа; ніякага права на асабістае жыцьцё ўсярэдзіне пакою. Ад пятнаццаці гадоў бацька паставіў замок з ключом *навонкі* — каб можна было зачыніць малую, калі тая ня будзе слухацца. Асабліва тады, калі яна колькі дзён не прыходзіла дадому, туляючыся немаведама дзе.

Прыблізна ў той жа пэрыяд, калі Дарця была ўжо ўпэўненая, што паступіла ў каледж, ёй таксама ўдалося. Да гэтага моманту ёй удавалася толькі гранічна расслабляць уласнае цела і спыняць плынь думак. *У той раз* ёй амаль удалося *выйсьці*. Дарця ляжала, расслабіўшыся, на ложку; яна прыслухоўвалася да гукаў у галаве. Дарця ўпусьціла іх у сьвядомасьць — гучнае, рытмічнае і выразнае клацаньне, трэск, гукі, пазбаўленыя прысутнасьці жыцьця. Раптам яна адчула, як правая рука самавольна паднялася ў паветра. Хваля моцнага страху магла б, здавалася, вярнуць яе ў нармальны стан, але кантакт зь целам зьнік. Дарця не адчувала яго; проста вісела ў паветры. Яна паплыла нагамі да столі, і адзінае, што прыкоўвала яе да цела, — гэта дыханьне. Было чуваць, як яно зь цяжкім хрыпам пралазіць праз трахеі — апошняе *жывое*, што ў ёй заставалася. Гранічна выразна, нібы ў крышталі, яна адчувала, што паднялася нагамі да столі. Здавалася, над ёй навісае нехта неймаверна жахлівы, ад чаго расплюшчыць вочы стала яшчэ страшней. Дарця не наважвалася (у адрозьненьне ад свайго мэнтара, спадарыні Рэні) зірнуць на прысутнага. Менавіта так і было: ня гукі чужога дыханьня ці шолах эрытрацытаў у чужых артэрыях, а адчуваньне *прысутнасьці* чагосьці староньняга. Вар'яцкі страх скуў яе, а *прысутнасьць* размывала сьвядомасьць. Дарця спрабавала намацаць тоненькі пярсьцёнак на мезенцы, але марна. Яна страціла ўсе сувязі зь целам. Страх ахутаў яе, ад чаго рабілася нясьцерпна халодна — ня ў сэнсе мэтафары; гэта быў люты, ледзяны і нямы холад. Дарця падумала, што за акном травеньскае сонца, яно пранікае ў пакой праз апошнюю квецень яблыняў, павінна быць і сапраўды цёпла і сонечна, а ня так сьмяротна халодна. Нарэшце яна адчула штосьці на мезенцы — далёкі, страчаны дотык мэталу да скуры. Дарця сканцэнтравалася на дотыку, напружыўшы сьвядомасьць. Раптам імгненнае пачуцьце — нібы машына зьехала з хрыбта — Дарця ляжала на ложку. Адчуваньне прысутнасьці спрэс зьнікла. Толькі цела біла халоднай дрыготкаю. Ёй было пякельна халодна.

## 7.

Яна зноў запытальна зірнула на Банзая:

— Дык што ты бачыў?

— Мне здалося, што Корый вельмі хутка падбег да мяне і кудысьці выштурхнуў. Ён назваў гэта *Азатотам*. Там была найглябальнейшая дэзарыентацыя, якую ты толькі можаш сабе ўявіць. Я проста не разумеў, што адбываецца.

— А на што гэта было падобна?

— Ні на што. Гэта ўвогуле ні з чым нельга параўнаць. Толькі спрабуеш разгледзець штосьці, як адразу страчваеш апошнія арыенціры. Гэта была ня форма, хутчэй — працэс. Там не было абсалютна ніякіх арыенціраў — ні часавых, ні фізычных. Там нават сябе губляеш — я сябе злавіў на тым, што адчуваў сябе ў сотнях кропакадначасова. Забываесься, хто ты. Гэты хаос навокал цябе зацякае ўсярэдзіну, — Банзай правёў рукой ад ілбу да патыліцы, нібы намагаючыся зьняць з галавы нябачны шалом, і аблізаў перасохлыя вусны. Ён намагаўся схаваць дрыготку ў каленях.

Дарця ўважліва выслухала зьмест размовы з Корыем. Даведалася і пра сны зь Бібліятэкай.

— Што гэта ўсё дае ў суме?

— Корый думае, што я нешта ведаю. А я насамрэч не разумею, якія тут расклады, нават не ўяўляю, да чаго ўсё ідзе. Я абсалютна нічога не разумею.

## 8.

А яшчэ праз дзень мела месца гэлаўінская вечарынка электроннай музыкі. Перад тым, як ісьці адрывацца на goa-trance party, Банзай на пару з Дарцяй выкурылі яго легендарны недатыкальны запас.

Запас выявіўся неачышчанай смолкаю, сабранаю зь лісьця канапель жданаўскага пасеву, з палёў пад Марыупалем. Прасьцей кажучы, ганджа, або гашыш.

Банзай выцягнуў з-пад ложка цэляфанавы пакецік, у якім н/з зьберагаўся, здабыў з пакеціка ліпкую цёмную масу памерам з два грэцкія арэхі. Смалу ён паклаў на месца араматычнага тытуню, а паўзьверх накрыў сьвежай фольгай з густой сеткаю дзірачак.

— А дзе ты яе ўзяў? — пацікавілася Дарця. Яна ўжо ўладкавалася каля кальяна, ля яе каленяў стаялі два кубкі зь недапітай гарбатай. У куце пакоя, дзе сьцяна нахілялася, ляжаў яе заплечнік. Гадзіньнік паказваў палову на шостую. Ужо было амаль цёмна.

— Месцы трэба ведаць... У аднаго свайго таварыша з поўдня. Для яго гэта нібы хобі, але вельмі важнае.

— Ты пра гоміка Фаеза?

— Не. Са Жданава, Данецкая вобласьць. Надарыцца нагода, раскажу.

Нарэшце кальян раскурыўся. Зь яго віўся сіваваты дымок: пах тытуню перакрываўся іншым, мацнейшым, гаркавейшым і прывабнейшым. Дарця ўцягнула дымок носам; у яе адразу засьлязіліся вочы і павільгатнела сьлізьніца. І яна ад-

разу ж адчула рэдкае аморфнае цяпло ў суставах. Яна нахілілася над вугольчыкам, каб лепей адчуць водар травы.

— Давай, ты першы паспрабуй, — сказала яна. — А мы выкурым увесь адразу?

— Нам тады дарога не ў каледж, а ў рэанімацыю. Сэрца спыніцца...

— А колькі будзем?

— Хапанём зараз пару-тройку цягаў, а як захочам — можна і пасьля вечара.

— Хапанём?

— Гэта азначае «зацягнемся».

Дарця з разуменьнем кіўнула. Яе пачало весьці ад аднаго дыму.

Яны зацягнуліся тройчы. Банзай зьдзіўлена гмыкнуў, пабачыўшы, якія тытанічныя цягі робіць Дарця. Яна патлумачыла, што калісьці хадзіла на клярнэт. На трэцяй цязе Дарця закашлялася аж да сьлёз так, што высоўвалася ў прыадчыненае акно глынуць сьвежага паветра. Кашаль паступова перайшоў у няспынны рогат. Банзай вырашыў, што хопіць. Пагасіўшы вугельчык на пэўны час, яны пайшлі на забаву.

Дарогай да каледжу яны ішлі трымаючыся за рукі і дзіка рагаталі.

## 9.

Вечарынка была прысьвечаная электроннай музыцы. З хуткімі пульсоўнымі рытмамі, якія зачароўваюць і зацягваюць. Калідоры былі ледзьве асьветленыя, як і ў мінулы раз. У цемрыве нейкі патлаты дзяцюк раскошна цалаваўся з забойчага выгляду дзевяцікляснiцай. «Ці не Павук раптам?» — падумаў Юрко, калі валасаты дзяцюк абярнуўся. Банзай, ні кропелькі не зьдзівіўшыся, пазнаў у тым, хто цалаваў дзяўчыну, адну з вучаніц 11 «В».

Дарця спрабавала весьці яго, трымаючы за руку, скрозь цела ўзбуджаных сынтэтыкаў, якія шалелі пад жорсткі начны goa-trance. Нарэшце Дарця знайшла два вольныя месцы ля сьценкі. У спартзалі было вельмі вільготна ад дыханьня людзей, ад чаго непрыемна сьціскала грудзі. Банзай цяжка апусьціўся на падваконьне і неразборліва прамовіў:

— Ну, Кобра, ну ты, стары, і даў!

Дарця прытулілася да яго, каб ня страціць адчуваньня прысутнасьці Юрка. Здавалася, мозг не ўспрымае бесьперапыннай плыні часу, а таму з успрыманьня выпадаюць лішнія слайды. На іх месцы застаюцца нанасэкунды прагалаў у памяці. Дзея адчувалася ў цёплай руцэ, што прытулілася да скуры на патыліцы і не давала чэрапу надта круціцца.

Банзай гладзіў яе па валасах. Дарця сядзела проста, размыта гледзячы на залю, а ў наступнае імгненьне асела наперад. Гэта выглядала, нібы сілы вылецелі зь яе адным выдыхам. Малая глядзела на выблiскі сьвятла абсалютна нерухома, безь якіх-небудзь адзнакаў жыцьця.

Банзай адчуў: штосьці ня так.

— Дарця?

Яна нерухома працягвала глядзець, Юрко пахаладнеў і моцна, доўга не раздумваючы, урэзаў ёй па сьпіне далонньню. Дарця рэзка задзерла галаву ўверх.

— Ні фіга сабе... Ні фіга сабе... Ні фіга... — яна глыбока ўцягвала паветра, паўтараючы адно і тое ж.

— Што з табой было?

Яна пацепала плячыма.

— Сяджу, слухаю музыку — і тут *бах*! — усё спынілася. А потым зноў набрала хуткасьць.

Банзай таксама пацепаў плячыма. Ён прытуліў яе мацней да сябе і глядзеў, як рухаюцца постаці ў сінім сьвятле. У нейкі момант яму здалося, што чарапная каробка раскрылася, і музыка грала ўсярэдзіне яго галавы, да запамарокі выразная, яна зачароўвала. Нечакана гукі запаволіліся і неўзабаве цалкам згасьлі. Рухі паставаў таксама запаволіліся і спыніліся ў тую ж сэкунду, што і музыка. Са зьдзіўленьнем Юрко зразумеў, што бачыць *усю* прастору вакол сябе, уключаючы тую, што за сьпінай. Нават ня трэба было вадзіць вачыма — усё было відаць АДНАЧАСОВА.

Але постаці зноў, вельмі павольна, набралі тэмп, як і музыка. Усё вярнулася на месца. Скура сьпіны на ўзроўні сэрца пякла ад удару Дарці. Тая перапужана зазірала яму ў твар:

— З табой *таксама*?

Ён кіўнуў. Што такое, д'ябал, здарылася?

— Хадзем да цябе. Пакурым яшчэ?

Ён ізноў кіўнуў. Больш вар'яцкай думкі яму чуць яшчэ не прыходзілася.

Вярталіся яны ўжо бязь сьмеху. Банзаю было страшна. Прычым ня проста так ад накуру, а ўсур'ёз. Страх быў на вуліцах, ён уеўся ў муры камяніцаў, уеўся ў саму *рэальнасьць*, як пах канапель мае ўласьцівасьць уядацца ў рэчы. Страх ня быў усярэдзіне. Ён быў звонку, ён паколваў скуру холадам, і аспрэчыць яго прысутнасьць было проста немагчыма.

Ён быў гэткі ж рэальны, як і вэртыкальныя цені, што гусьцелі навокал іх тае ночы, як і тое, што сэрцы ў абаіх сёньня спыніліся.

Або ім усё гэта здавалася.

**10.**

Дома яны зрабілі тое, што і дзьве гадзіны таму. Дарця запарыла гарбаты (сьліна ў роце загусьцела ў ледзь вільготную, ліпкую склізь), а Банзай раскурыў кальян. Граў (прычым *гучна* так граў) Пітэр Гэміл з «Van der Graaf Generator». Што б там Соля ні казала, а гэта-такі супэрская музыка. Музыка, якая належыць яму аднаму, пра якую ніхто ня ведае. Пітэр Гэміл — гэта была сіла.

Яны зноў сядзелі каля кальяна, курылі і слухалі музыку.

— Ведаеш, Дарця, вось тут... — Банзай няпэўна крутнуў галавою. Яны ляжалі на падлозе, бо сядзець не было сілы. — Вось тут... ясна адчуваецца ўплыў нарко-

тыкаў... на музыку...

Разьвіць думку неяк не атрымалася, бо надта ўжо цяжка і вусьцішна было варушыць языком і вуснамі. Некалькі каляровых выбліскаў — і Банзай апынуўся ў трансцэндэнцыі.

**11.**

*Банзай у трансцэндэнцыі.*

*[хто ты?]*

*[а ты хто?]*

*[я банзай]*

*[банзай застаўся там; вельмі сумняюся, што ты банзай]*

*[а хто ты?]*

*[я нішто. Я проста так. Паражнеча. Можна сказаць, твой далёкі сваяк]*

*[чаго ты хочаш?]*

*[пытаньняў]*

*[хто такі Ёг-Сатот?]*

*[Вялікі Чарвяк]*

*[хто такі Ёг-Сатот?]*

*[Творца Ценяў. Той, Хто Пляце Бясконцасьць, Ткач. Дастаткова?]*

*[што такое Ёг-Сатот?]*

*[Вялікі Пракаветны, апошні Вялікі Пракаветны]*

*[гавары ясьней]*

*[слухай уважлівей]*

*[Ёг-Сатот — гэта бог?]*

*[так]*

*[ён Д'ябал?]*

*[не. На тваім узроўні Д'ябал і Ёг-Сатот ня маюць нічога супольнага]*

*[але ён зло, так?]*

*[зла не існуе, як і дабра. Ёсьць супрацьлеглыя энэргіі. Але на тваім узроўні ён зло]*

*[Азатот — таксама бог?]*

*[калісьці быў, цяпер ён асобная, паралельная твайму сьвету рэальнасьць]*

*[не разумею]*

*[Азатот, як і сёй-той зь іншых Вялікіх Пракаветных, калісьці быў богам, але праз уласную недакемлівасьць дэградаваў. Як вусень — спачатку поўзае, потым зьвіваецца ў каўшанку, потым робіцца мятлікам. Азатот ператварыўся ў асобную прастору, замкнёную ў сабе рэальнасьць. Гэта называецца мэтамарфозай. Гэта надзвычай глябальная рэч. Ня форма — працэс. Яна прысутная на ўсіх узроўнях, магчыма — і на найвышэйшых. Азатот ператварыўся ў рэальнасьць тонкай матэрыі, але на дзіва прымітыўную, у такую сабе прастораву плерому. Яна дастаткова разьвітая, каб валодаць бясконцась-*

*цю, але надта простая, каб зьмясьціць у сабе час, вымярэньні і памеры.]*

*[гэта лёс кожнага бога?]*

*[невядома, Азатот быў самым старажытным, існаваў вельмі доўга, надта доўга, нават для бога]*

*[як доўга?]*

*[для твайго ўзроўню — вечнасьць]*

*[а фактычна?]*

*[фактычна? Няма фактаў, няма аб'ектыўнасьці, ёсьць толькі ўзровень успрыманьня; табе можа падацца аб'ектыўным мой узровень, але ўсё ілюзія]*

*[як доўга?]*

*[ён існаваў задоўга да Вялікага Выбуху, неймаверна доўга. Ён ужо быў нават тады, калі прыйшлі Ёг-Сатот, Дагон і Ктулху. Цяпер застаўся адзін Ёг-Сатот. Але павер мне на слова — ніводзін з багоў не існуе ў часе лінейна. На тваім узроўні ўсьвядоміць гэта — азначае пераскочыць адразу праз некалькі прыступак. Але не хвалюйся. Табе ня сьвеціць]*

*[а ўсе гэтыя багі сталі асобнымі рэальнасьцямі?]*

*[не, яны не існавалі столькі. Магчыма, Азатот сапраўды быў тупы, таму і дэградаваў. Магчыма, гэта доля кожнага бога]*

*[тады чаму застаўся толькі Ёг-Сатот?]*

*[Дагона зьнішчылі Багі Сівой Даўніны, хоць ён быў адным з наймагутнейшых, Ктулху навекі закаркаваны ў падводным горадзе Р'льех, іншыя Вялікія Пракаветныя жывуць у выгнаньні на далёкіх закінутых і забытых плянэтах. Але некаторыя ўсё яшчэ маюць выхады ў ваш сьвет]*

*[выхады?]*

*[яны зьяўляюцца пры старэньні матэрыі ў пэўных месцах. Месцах тонкай рэальнасьці. Гэта таксама мэтамарфоза. Людзі адчуваюць такія месцы і ў большасьці выпадкаў унікаюць іх: пакінутыя будынкі, апаганеныя і неасьвечаныя зноў храмы... што заўгодна, адвольны лапік прасторы — нават аддаленая алея ў парку можа выявіцца нядобрым месцам для людзей. Там зьнікаюць бязь весткі. Рыф Д'ябла, дзе ледзь ня зьнішчылі выхад Дагона вы, простыя людзі, — адно з такіх месцаў. Вельмі часта гэтыя аддаленыя куточкі плянэты: пустыні, горы, падземныя азёры... або як у вас — падвалы]*

*[дзе «ў нас»]*

*[у каледжы, у падвалах, там ёсьць вельмі цікавае месца... яно вядзе наўпрост на балоты Гтха'ата, дзе існуе ў выгнаньні Ёг-Сатот]*

*[чаму гэтыя месцы апынуліся блізкімі? Дзе гэтае балота?]*

*[прастора ў Сусьвеце складкавая. Але між вамі і Ёг-Сатотам — Азатот, вір хаосу]*

*[якая прырода Ёг-Сатота?]*

*[ён ня мае прыроды, ён вечнасьць, энэргія ў часе]*

*[не разумею]*

*[ты жывеш у сваім сьвеце, думаеш: «Сьвядомасьць прывязаная да цела —*

*танчэйшая матэрыя да таўсьцейшай, цела да часапрасторы». Насамрэч усё ня так — сьвядомасьць на вашым узроўні прывязаная не да цела, яна мае падвойныя ўласьцівасьці: яна поле і карпускула адначасна, карпускула — усяго толькі максымальна згушчанае поле сьвядомасьці, тое, што вы называеце энэргетычным целам, астральнай праекцыяй; цела складаецца з матэрыі, часткі матэрыі — згушчэньне поля рэальнасьці. Поле — гэта энэргія. Ёг-Сатот не прывязаны практычна ні да аднаго з палёў, ён на вельмі высокім узроўні. Ён — вечнасьць у сабе.]*

*[якая тут роля Корыя?]*

*[Корый апантаны думкай, што Ёг-Сатот надзеліць яго нечуванаю ўладай і сілай, калі прыйдзе ў твой сьвет. Драбочак сілы ён ужо мае, але тое, што ў яго ёсьць, — гэта пырскі хваляў ад акіяну сілы. Ёг-Сатот прыйдзе, каб усталяваць свае парадкі і законы. Ён абсалютна чужы чалавеку, чужы ня толькі вашым уяўленьням пра жыцьцё, але й пра прыроду рэальнасьці, пра час і прастору. Ён іншы нагэтулькі, наколькі гэта толькі магчыма ўявіць сабе]*

*[што станецца з нашым сьветам?]*

*[ты ведаеш, што]*

*[чаму ты ў такім разе не ўратуеш сябе і нас?]*

*[рэч не пра нейкую занюханую галяктыку ці нават адзін Сусьвет. Цана — панаваньне ў вашай рэальнасьці. Ва ўсіх сусьветах, што ляжаць у вашым макракосьме]*

*[тады чаму ты не ўратуеш нас?]*

*[на тваім узроўні табе гэтага не зразумець, усё падпарадкоўваецца пэўнаму мэханізму]*

*[бо так задумаў Бог?]*

*[ты кажаш «Бог» проста так; у вас ёсьць паршывая звычка ўсё апранаць у словы. Вы ня можаце жыць без інтэрпрэтацый. Бог значна большы, чым ты можаш сабе ўявіць]*

*[ён як Азатот? Ён — наш Сусьвет? Макракосм?]*

*[на тваім узроўні ўвогуле лепей пра такое ня думаць... але я скажу — у бясконцую колькасьць разоў большы, чым усё быцьцё, што зьмяшчае макракосмы]*

*[ты хочаш, каб я не дапусьціў выхаду Ёг-Сатота ў наш сьвет?]*

*[так ці інačай, да гэтага зводзіцца ўсё і заўсёды. Гэта вечнасьць: ня форма, а працэс. Гэта як мэтамарфоза. Заўсёды ёсьць Тыя, што адмыкаюць, і Тыя, што замыкаюць. Гэта апора макракосму. Запомні: Тыя, што адмыкаюць, і Тыя, што замыкаюць. Яны ёсьць заўсёды; магчыма, у розных формах; магчыма, не заўжды ўсьведамляюць гэта. Але так ёсьць і так будзе. Гэта працэс, а ня форма. Форма мінае, працэс — вечны]*

*[чаму менавіта я? Чаму з а ў с ё д ы я ? ]*

*[таму што ты даў абяцаньне]*

*[я нікому нічога не абяцаў, я не хачу гэтага рабіць! І ня буду! Чаму заўжды я?!!]*

*[твае жаданьні нікога не цікавяць. Ты гэта зробіш. Ты ведаеш, як. Ты абяцаў, і цяпер самы час выконваць абяцаньні]*

*[Я НЕ АБЯЦАЎ НІЧОГА І НІКОМУ!!! Тым больш, я не ўяўляю, як павінен гэта зрабіць! Ня ведаю, ня ведаю, ня ведаю, абсалютна ня ведаю, нават не здагадваюся!!!]*

*[ты быў у бібліятэцы. Ты мусіш ведаць. Мы больш не маглі цябе туды зацягваць, бо сіла Корыя стала адчувальная і заўважная на тваім узроўні. Насамрэч жа ніхто нічога ня ведае наперад. Чакай, і ты зразумееш]*

*[калі я ўведаю гэта?]*

*[чакай, і ты зразумееш]*

*[я не хачу, чаму менавіта я?!! Патлумач!!!]*

*[чакай]*

**12.**

Банзай ляжаў у сваім пакоі нерухома, сэрца ледзьве білася, а вусны пашарэлі. Дарця ляжала каля яго, паклаўшы галаву Юрку на грудзі. Калі яны абое вярнуліся (дзеяньне гашышу аслабла), Дарця апрытомнела і пачала расштурхоўваць Банзая. Яго шэрыя вусны пужалі, сэрца не праслухоўвалася, Юрко ня рухаўся. Дарця біла яго па твары далоньню, адчуваючы, як сьлёзы бягуць па шчоках; яна не пераставала біць па ім, пакуль вочы Банзая не пачалі варушыцца пад павекамі. Празь нейкія тры хвіліны да яго вярнулася прытомнасьць.

У тую ноч Банзай вырашыў ня спаць. Дарця сказала, што складзе яму кампанію. Яны слухалі Пітэра Гэміла, пакуль не разьвіднела, намагаючыся пераадолець страх. Некалькі разоў Дарця была гатовая расказаць, што бачыла *яна*, але не адважвалася. Банзай чытаў ёй свой дзёньнік са *сьненьнямі*, тыя моманты, калі ён быў у Бібліятэцы. Яны зусім не разумелі, што адбываецца.

Апошнім запісам пра Бібліятэку было апісаньне найглябальнейшай кнігі — «Кнігі Мёртвых», або «Нэкранамікону», якая нібыта была напісаная звар'яцелым арабам Абдулам аль-Хазрэдам. У кнізе расказвалася пра відзежы араба: пра вар'яцкія сусьветы, якія нібыта паўсталі перад ім; кніга падсумоўвала веды Банзая, здабытыя *там*. Пра вельмі старажытных монстраў, якія нібыта прыйшлі з далёкіх зорак; яны былі багамі чагосьці абсалютна чужога і супрацьлеглага нам. Пра войны між імі і Багамі Сівой Даўніны, іншай вялікай расы, якая разьвівалася ў нашым макракосьме. Поўная лухта, але як усё супадала са *сьненьнямі* і галюцынацыямі! Усе старажытныя протацывілізацыі і плямёны дзікуноў вызнавалі іх крывавыя культы, ператварыўшы чужародных монстраў у дзікіх, незразумелых багоў.

На ранак, калі, здавалася б, абое мусілі валіцца з ног ад стомы, Банзай і Дарця адчувалі нездаровую бадзёрасьць і шалёную энэргію.

У каледжы на перапынку Банзай пайшоў у прыбіральню. На кахлянай сьценцы чырвонымі літарамі было выведзена:

## ЁГ-САТОТ ПГ'НГЛУ'І Н'ГЛЛХ

Рот Банзая перасох, як пясок. Хлопчык, што стаяў пад надпісам, чытаючы пажмяканую шпору, перахапіў яго шалёны позірк і сам зірнуў угару.

— У натуры, здаровы павук, я такога шчэ ня бачыў, — сказаў той, маючы на ўвазе павука на адной з чырвоных літараў.

Халодны, Банзай пайшоў на ўрок. Пасьля ўроку, крадком правёўшы Дарцю ў хлапечую прыбіральню, ён паказаў ёй заклён. Так, я бачу яго, сказала дзяўчына, скаўтнуўшы сьліну.

Зрэшты, тут усё можна патлумачыць: не пасьпіш содні — і не такое прымроіцца.

### 13.

Вяртаючыся дадому, у прыцемках, Банзай пабачыў знаёмую постаць Корыя. Той проста стаяў і назіраў за дзеяньнямі Юрка. Банзай азірнуўся праз плячо, ці няма раптам кагосьці ззаду. А зірнуўшы на месца, дзе толькі што бачыў Корыя, не заўважыў нікога.

Безумоўна, усё гэта было сумным наступствам курэньня гашышу.

Прыйшоўшы дамоў, Банзай уключыў музыку і лёг на ложак. На падушцы, калі прынюхацца, можна было адшукаць пах Дарці. Тады ня так страшна. Пустая кватэра ўпершыню наганяла на яго жах.

Па нейкім часе ён заснуў.

### 14.

А сёмай трыццаць чатыры вечара Банзай усё яшчэ спаў, а таму ня бачыў, як на сэкунду звонку да шыбы яго акна прыліп чыйсьці твар. Бліскучыя вочы агледзелі пакой і таксама бязгучна, як зьявіліся, зьніклі ў цемрыве ночы.

*Заканчэньне ў наступным нумары.*

*Пераклала з украінскай Марыя Мартысевіч*
*паводле: Дереш, Любко. Культ. — Львів: Кальварія, 2006.*
*Пераклад паўстаў у межах праекту «Homines Urbani» Таварыства Villa Decius, Кракаў.*

# ⌘ РЭЦЭНЗІІ

ПАВАЛ УСАЎ

# Тры канцэпцыі беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці

Ioffe, Grigory. *Culture Wars, Soul-Searching, and Belarusian Identity* // East European Politics and Societies. 2007. № 21. P. 348—381.

Праблема нацыянальнай самаідэнтыфікацыі застаецца для беларусаў актуальнай і пакуль да канца ня вырашанай. Ня менш важнай праблемай зьяўляецца выбар ідэнтычнасьці. Выраз «выбар ідэнтычнасьці», напэўна, гучыць дзіўна, бо азначае наяўнасьць некалькіх праектаў ідэнтычнасьці. З гэтага вынікае, што мы, ведаючы, што мы беларусы, не да канца ведаем, хто такія беларусы: ці то «тутэйшыя», ці то «нацыянальныя», «сьвядомыя», ці яшчэ якія.

Усе гэтыя пытаньні вынікаюць з таго, што большасьць жыхароў Беларусі абыякава ставяцца да нацыянальнага пытаньня. Пытаньні ж нацыянальнай ідэнтычнасьці ўзьнікаюць перш за ўсё сярод культурных і палітычных эліт, чыё бачаньне беларусаў і беларускасьці ня толькі адрозьніваецца, але знаходзіцца ў сталым культурным і палітычным канфлікце.

Прафэсар Грыгоры Ёфэ ў артыкуле «Культурныя войны, пошукі душы і беларуская ідэнтычнасьць» мяркуе, што прадстаўнікі заходняга палітычнага істэблішмэнту схільныя спрашчаць сытуацыю ў Беларусі, падганяючы палітычныя, культурныя і сацыяльныя працэсы пад пэўныя ідэалягічныя рамкі.

У беларускім грамадзтве існуе глыбокі палітычны раскол на прыхільнікаў і праціўнікаў рэжыму Лукашэнкі, у ім яўна прасочваецца сур'ёзны канфлікт ідэнтычнасьці як асобных сацыяльных групаў, так і народу ў цэлым. Гэты канфлікт ідэнтычнасьцяў, які Г. Ёфэ акрэсьлівае як вайну культураў, з аднаго боку, сьведчыць пра тое, што беларусы пакуль не аформіліся ў адзіны культурны і палітычны арганізм і па-рознаму глядзяць на сваё месца ў гісторыі і сучаснасьці. Аднак, з другога боку, гэты канфлікт і пошук мадэляў ідэнтыфікацыі сьведчыць пра тое, што бе-

***Павал Усаў*** *— палітоляг, дактарант Варшаўскай Szkoły Nauk Społecznych.*

ларусы ўсё ж такі існуюць і намагаюцца зразумець сваё існаваньне.

У «ARCHE» ўжо ўпаміналася ідэя Г. Ёфэ, што ў Беларусі аформіліся і функцыянуюць тры праекты ідэнтычнасьці: ***«адраджэнскі»***, ***«маскоўска-лібэральны»*** і ***«крэольскі»***. Ва ўсіх гэтых праектах ёсьць свой унутраны зьмест, інтэлектуальнае ядро і пэўная сацыяльная база. Разам з гэтым яны маюць рознае сэмантычнае і ідэалягічнае значэньне і супрацьстаяць адзін аднаму.

Асноўную ідэю адраджэнскага праекту складае культурная і моўная дэкалянізацыя і дэрусіфікацыя краіны, дыстанцыяваньне ад Расеі і вяртаньне Беларусі ва ўлоньне эўрапейскай культурнай прасторы. Асноўнай каштоўнасьцю гэтага праекту, безь якога ён ня мог бы існаваць і які адначасова становіцца мэханізмам яго рэалізацыі, зьяўляецца беларуская мова:

*Касьцяк першага праекту пры кожнай магчымасьці падкрэсьлівае важнасьць таго, каб размаўляць па-беларуску. Для іх гэта толькі адзіная легітымная мова нацыянальнага дыскурсу. Лінгвістычная беларусізацыя Беларусі разглядаецца імі як неабходны інструмэнт для таго, каб сфармаваць выразную нацыянальную ідэнтычнасьць, што ў сваю чаргу будзе спрыяць дэмакратызацыі краіны* (с. 375).

Бяз мовы беларус ня будзе да канца беларусам. Толькі мова можа захаваць беларусаў як асобны народ у палітычнай, гістарычнай і культурнай прасторы. Без засваеньня нацыянальнай мовы насельніцтва Беларусі ня зможа пераадолець аўтарытарную сьвядомасьць і дэмакратызавацца. Умацаваньне нацыянальнай сьвядомасьці і дэрусіфікацыя — гэта адзіны шлях да дэмакратыі. Толькі выразная нацыянальная ідэнтычнасьць, якая можа паўстаць выключна праз карыстаньне роднай мовай, адарве беларусаў ад уплываў расейскай культуры і палітыкі, аўтарытарных саміх па сабе. Ва ўмовах бікультуралізму і моцнага ўсходняга ўплыву для беларусаў будзе існаваць пагроза аўтарытарызму. Пакуль народ ня будзе прывязаны да сваёй мовы, заўсёды будзе існаваць пагроза вяртаньня аўтарытарызму: «Безь пераходу на беларускую мову заданьне адрыву Беларусі ад спрадвечна недэмакратычнай Расеі ня будзе вырашана» (с. 357).

Адраджэнскі праект, на думку Г. Ёфэ, адначасова найбольш цэласны і найбольш адарваны ад рэальнай сытуацыі ў Беларусі. Яго асноўнай праблемай зьяўляецца адсутнасьць шырокай падтрымкі, адчужанасьць і неразуменьне з боку самога беларускага грамадзтва: «Супольнасьць, якая складае гэты праект, падобная да сэкты, ізаляванай ад уласнай краіны» (с. 371).

На сёньняшні дзень уплыў гэтага праекту на масавую ідэнтычнасьць беларусаў вельмі слабы. Сытуацыя можа зьмяніцца ў выпадку, калі да ўлады прыйдзе нацыянальна арыентаваная палітычная эліта. Тым ня менш, застаецца пытаньне: як яна можа прыйсьці да ўлады? Хто абярэ такую ўладу, калі эліта і насельніцтва размаўляюць на розных мовах?

Адраджэнскаму праекту ідэнтычнасьці супрацьстаіць «маскоўска-лібэральны». Гэты праект збольшага не культурны, а палітычны. Яго асноўная мэта не разьвіцьцё беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці на аснове мовы, але прасоўваньне дэмакратычных каштоўнасьцяў у грамадзтве ў імя зьмены палітычнага рэжыму. Ён абапіраецца не на гістарычную традыцыю Беларусі, а на рацыянальнае разуменьне неабходнасьці разьвіцьця дэмакратычнай дзяржавы:

*У другога праекту адсутнічае свой асабісты гістарычны наратыў і дэталёва распрацаваная мадэль будучыні, якая выходзіла б па-за межы канцэпцыі, згодна зь якой Бела-*

*русь павінна захоўваць дзяржаўнасьць і быць дэмакратычнай краінай* (с. 372).

Адразу трэба адзначыць, што Г. Ёфэ ня вельмі выразна акрэсьліў, што менавіта ён меў на ўвазе пад дэфініцыяй «маскоўскі». Ці азначае гэта, што ўсе расейскамоўныя інтэлектуалы — прамаскоўскія і прарасейскія? Тым часам большасьць інтэлектуалаў, якія выказваюцца за дэмакратызацыю краіны, таксама арыентаваныя на інтэграцыю з ЭЗ і зусім не імкнуцца да пабудовы саюзу з Расеяй. Да таго ж варта дадаць, што шмат расейскамоўных прыхільнікаў дэмакратыі білінгвы: размаўляюць як па-беларуску, так і па-расейску.

Іх можна акрэсьліць як «дзяржавацэнтрыстаў». Расейскамоўныя беларускія інтэлектуалы бачаць у Беларускай дзяржаве асноўную каштоўнасьць. Яны прытрымліваюцца прынцыпу фармаваньня нацыі на аснове дзяржавы, а ня мовы і культуры. На іх думку, безь дзяржавы немагчыма пабудаваць нацыі і гарантаваць яе разьвіцьця.

Прадстаўнікі лібэральнага праекту прытрымліваюцца прынцыпу палітычнага разьвіцьця беларускага народу, які можна акрэсьліць як «мова праз дэмакратыю». Гэта азначае, што галоўным прыярытэтам ёсьць пабудова дэмакратыі ў Беларусі, без чаго немагчыма фармаваньне нацыянальнай культуры і захаваньне мовы. На думку Г. Ёфэ, намаганьне навязваць прынцыпы дэмакратыі праз мову, якая зьяўляецца незнаёмай і чужой для значнай часткі беларускага насельніцтва, азначае адштурхнуць насельніцтва ад самой дэмакратыі. І гэтага не разумеюць «адраджэнцы» — «людзі з «ARCHE» і «Нашай Нівы».

Пытаньне беларускай мовы складае асноўную прычыну супрацьстаяньня «адраджэнскага» і «маскоўска-лібэральнага» праектаў. Галоўны аргумэнт у пытаньні «мова» ці «дэмакратыя» з боку «маскоўска-лібэральнага» праекту палягае ў тым, што большасьць грамадзянаў Беларусі ня ведаюць беларускай мовы і не карыстаюцца ёй. Беларусы эмацыянальна не прывязаныя да мовы, і таму яе немагчыма выкарыстоўваць у якасьці палітычнага інструмэнта, мала таго, мова становіцца прычынай расколу паміж беларускай палітычнай дэмакратычнай элітай і астатняй часткай беларусаў. Беларуская мова не спрыяе мабілізацыі грамадзтва.

Трэба адзначыць, што беларуская мова сталася моцна палітызаванай, бо менавіта яна аўтаматычна акрэсьлівае і паказвае палітычныя пазыцыі грамадзяніна ў Беларусі. Нават гаворачы пра штодзённыя і звычайныя рэчы па-беларуску, асоба прыцягвае да сябе ўвагу іншых, бо мова надае ім іншы сэнс і ўспрыманьне. Прымаючы беларускую мову, такі чалавек аўтаматычна становіцца «іншым», а гэта ва ўмовах Беларусі патрабуе вялікай псыхалягічнай і сацыяльнай адвагі. Маўленьне па-беларуску — гэта ўжо дзеяньне, ужо асабістая мадэль паводзінаў, ужо пратэст, ужо апазыцыя, а гэта значыць пагроза рэжыму.

Моўныя прэфэрэнцыі наўпрост уплываюць на палітычныя. Тыя, хто сьвядома гаворыць па-беларуску, а не проста дэкляруе веданьне мовы, непрыхільна ставяцца да рэжыму Лукашэнкі. Значная частка насельніцтва, якая размаўляе па-расейску, наадварот, падтрымлівае палітычны рэжым Лукашэнкі, што робіць расейскую мову мовай «недэмакратычных арыентацыяў».

Нягледзячы на тое, што «адраджэнскі» і «маскоўска-лібэральны» праекты адрозьніваюцца ў поглядах на культурнае і моўнае разьвіцьцё Беларусі, яны ўсё ж такі адзіныя ў сваім непрыманьні рэжыму Лукашэнкі. Апошні мае свой уласны праект нацыянальнай ідэнтычнасьці беларусаў — *«крэольскі»*. Адразу варта зазначыць, што яго назва прыдуманая інтэлек-

туалямі-«адраджэнцамі» дзеля азначэньня «ненацыянальнай» часткі насельніцтва. У сувязі з гэтым можа ўзьнікаць непаразуменьне, бо тыя беларусы, якіх «адраджэнцы» акрэсьліваюць крэоламі, лічаць сябе беларусамі.

Трэці палітычна-ідэалягічны і дзяржаўны праект ідэнтычнасьці, зразумела, не абапіраецца на нацыянальную мову. Але прыхільнікі гэтага праекту (да якіх Г. Ёфэ адносіць Паўла Якубовіча, Эдуарда Скобелева, Лява Крыштаповіча і інш.) ідэнтыфікуюць сябе зь беларусамі і таксама апэруюць такімі паняцьцямі, як Беларусь, беларуская дзяржава і незалежнасьць. Зразумела, што гэтая мадэль ідэнтычнасьці зьвязана з ідэалёгіяй беларускага рэжыму.

На мой погляд, канцэпцыя «крэольства» ня можа быць ужытая для акрэсьленьня трэцяга праекту. Яна заводзіць нас у абстрактны сьвет дэфініцый, які цалкам адарваны ад беларускай рэальнасьці: ужо цяпер аўтар артыкулу больш заклапочаны падгонкай канцэпцыі «крэольства» пад беларускую рэчаіснасьць, а не тлумачэньнем апошняй.

Г. Ёфэ ўжывае такія паняцьці, як крэольскі нацыяналізм, крэольская ідэалёгія, крэольскі прэзыдэнт. Ужо само паняцьце «крэольскі нацыяналізм» прадугледжвае існаваньне «крэольскай» нацыі. Калі крэольская нацыя ўжо сфармаваная, то месца для прышчапленьня ёй беларускасьці ўжо няма.

З тае прычыны, што гэтая ідэнтыфікацыя падбудоўваецца пад асобу Лукашэнкі, чаму б не назваць яе «лукашэнкаўскай ідэнтыфікацыяй»? Бо менавіта ідэалёгія беларускай дзяржавы, уся сыстэма прапаганды працуе на тое, каб захаваць усе тыя якасьці беларускай душы, якія жывяць рэжым Лукашэнкі.

Трэці праект можна акрэсьліць як дзяржаўна-патрыятычны. Ён абапіраецца не на нацыянальнае пачуцьцё беларусаў, а намагаецца стварыць прывязанасьць да дзяржавы, зыходзячы зь бягучай гістарычнай і палітычнай сытуацыі. Палітычны рэжым маніпулюе вобразамі і паняцьцямі, падпарадкоўваючы народ сваім уласным інтарэсам, але разам з тым прывучае грамадзянаў звацца беларусамі.

Канцэпцыя гэтага праекту кадыфікаваная ў зводах «ідэалёгіі беларускай дзяржавы»:

*Галоўным кампанэнтам гэтай ідэалёгіі зьяўляецца гістарычная прывязанасьць Беларусі да Расеі; месца і роля Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг., што ўзмацняе гэтыя сувязі; калектывісцкі й антыпрадпрымальніцкі этас; і нарэшце, як бы іранічна гэта ні гучала пры разглядзе дзяржаўнай ідэалёгіі, антынацыянальны настрой, які накіраваны найперш супраць «адраджэнцаў»* (с. 367).

Ідэалягічны канфлікт паміж «адраджэнскім» і «лукашэнскаўкім» праектамі разгортваецца па наступных пазыцыях:

- мова — расейская *contra* беларуская;
- гісторыя — царска-савецкі пэрыяд, ігнараваньне БНР *contra* акцэнт на гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай, БНР і ігнараваньне савецкага пэрыяду. Гісторыя, якая пішацца беларускім рэжымам, «пакідае пачуцьцё таго, што сапраўдная гісторыя беларусаў пачалася зь «Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі» 1917 г., а тое, што было раней, ня важна» (с. 367).
- палітыка — цэнтралізацыя ўлады, патэрналізм і патрыярхалізм *contra* дэмакратыя і свабода;
- геапалітычныя прыярытэты — саюз з Расеяй альбо трэці шлях *contra* разьвіцьцё Беларусі толькі ў эўрапейскай геапалітычнай прасторы.

Межы паміж «крэольскім» і «маскоўска-лібэральным» праектамі выглядаюць не такімі выразнымі і праходзяць збольшага на палітычным і геапалітычным узроўнях, а не культурным і моўным. Гэтыя два праекты сыходзяцца ў ба-

чаньні незалежнай Беларускай дзяржавы, але разыходзяцца ў пытаньні дэмакратызацыі. Галоўныя ідэолягі «крэолаў» адкрыта сьцьвярджаюць, што беларускае грамадзтва пакуль не гатовае да дэмакратыі, а моцная дзяржаўная ўлада забясьпечвае справядлівасьць і дабрабыт у краіне.

Няўстойлівасьць межаў паміж гэтымі двума праектамі пацьвярджае пераход прыхільнікаў гэтых праектаў з аднаго лягеру ў другі без адчуваньня менавіта культурнай розьніцы. Збольшага гэта датычыць прадстаўнікоў так званага «лукашэнкаўскага праекту». Вельмі часта гэта адбываецца тады, калі яе прыхільнікі адчуваюць сябе пакрыўджанымі ці незадаволенымі (напрыклад, А. Фядута, М. Марыніч, А. Казулін і інш.). Таксама важна зазначыць, што некаторыя прадстаўнікі афіцыйнай інтэлігенцыі і бюракратыі спачуваюць нацыянальнай ідэі.

Выглядае, што матэрыяльны дабрабыт і стабільнае жыцьцё наўпрост уплывае на ідэнтыфікацыю і прыналежнасьць да другога ці трэцяга праекту. Гэта яшчэ раз даказвае, што яны збольшага палітычныя, а не нацыянальныя, хоць і ўплываюць на нацыятворчыя працэсы. Ня выключана, што ў будучыні з мэтай стабілізацыі палітычнага рэжыму афіцыйны бок, які стаіць за трэцім праектам, будзе пераймаць пэўныя каштоўнасьці і ідэалягічныя канцэпцыі з двух першых праектаў. Безумоўна, культурныя канфлікты ўнутры беларускага грамадзтва будуць працягвацца, але яны будуць сьведчыць пра тое, што беларуская нацыя, на шчасьце, існуе.

# SUMMARY, No. 4 (67), 2008

**Piotra Rudkoŭski**, philosopher, logic and methodology professor at EHU, in his «**New Faces of the Odious Opposition**» analyses new visions of Belarusian civic activists in the official ideological/propaganda discourse. Their traditional perception as spiritual descendants of German Nazis has been recently supplemented by their representation as neo-Stalinists (Pavał Jakubovič) or as «an Islamite structural analogues» who «attacks the very basement of European identity» (Jury Šaŭcoŭ). Piotra Rudkoŭski particularly touches upon the Homiel excellent student (and ARCHE's former distributor) Žmicier Žaleźničenka's case, who'd been expelled from Homiel University for political motives and taken to the Belarusian Army. Źmicier refused to make military oath and claimed he would not fulfill orders unless they're given in Belarusian. According to the author, «Žaleźničenka's case is the first ever incident of Belarusian military system being so seriously challenged».

Mahiloŭ based Belarusian-Russian University professor **Alaksiej Baciukoŭ** reflects on the mysterious Belarusian mentality in his «**Essay On the Belarusians**».

The round table «**Bluff as a Face of a Blackmailer State**» joined by «Nashe mnyenye» analytical web-page co-editor Valeryja Kaściuhova, BISS director Vital Silicki, independent expert Janaŭ Paleski and ARCHE's editor Valer Bułhakaŭ is devoted to the events of late March 2008, when KGB agents conducted searches and confiscations in the offices of independent mass media and NGO's, and in private flats of journalists and civic activists. The Lukašenka personal power regime originally was a blackmailer, though initially it pertained to Belarusian society. Now it helps the Belarusian authorities to make the West aware: in case economic pressure (sanctions) on Belarus persists, the civic society and its infrastructure will constantly be jeopardized.

EHU political science and international relations professor **Dzianis Mieljancoŭ** considers advantages and disadvantages of Belarus joining the EU in his «**Why Should Belarus Join the EU?**». Historian, Białystok University's Belarusian culture department chairman **Jaŭhien Miranovič** in his «**Does Europe Need Belarus?**» gives his answer to the question why Belarus has never been needed by Europe as a political subject till 1991, and why it has never performed as one in the European history earlier. **Vital Silicki**'s, EHU professors **Dźmitry Karenka**'s and **Uład Navicki**'s reviews falls on the collection of articles «Belarus' European Prospect: Intellectual Models» (Европейская перспектива Беларуси: интеллектуальные модели / Сост. О. Шпарага. — Вильнюс: ЕГУ, 2007. — 280 с.), which builds of itself an attempt of philosophic comprehension of Europe as a phenomenon and Belarus' place in it, the relations of Belarusian and European ideas and discourses.

The historian **Aleś Paškievič** in his «**A Limit For Belarusian Historians of the New Generation?**» reviews Warsaw University professor Jury Hryboŭski's monograph devoted to Belarusians in Polish regular military units (1918—1945). The book had been published both in the Belarusian and Polish languages in the respective countries but has been undeservedly ignored by professional historians.

# SUMMARY, No. 4 (67), 2008

Horadnia based «Gazeta Wyborcza» journalist and a Central Board member of Union of the Poles in Belarus (unrecognized by the Belarusian authorities) **Andrej Pačobut** in his «**Polish Resistance (1939—1954) through the Eyes of Belarusian Historians**» criticizes the work of Belarusian historians «Polish Underground in Belarus Western Regions (1939—1954)» (Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939—1954 гг.). Гродно: УО «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», 2004). The historian **Anatol Sidarevič** in his «**Belarusian People's Republic Governments and Raman Skirmunt's Cabinet**» taps into the issue of Belarusian People's Republic governments, bringing the documentary evidence of one of the governments being headed by Raman Skirmunt, a big landowner from Paleśsie and former State Duma deputy.

Mahiloŭ State University professor **Ihar Marzaluk** in his «**Nativist» Historiography: Lies Through Historic Facts**» attacks some Belarusian historiography writers as biased and based on primordialistic nationalism myths.

PhD **Andrew Wilson** from University College London in «**Meeting Medvedev: the Politics of the Putin Succession**» examines the process of power transition from V. Putin to D. Medvedev. The choice of the latter as a successor has been conditioned by complicated «apparatchik» games and balancing clan interests, which will definitely have effect on Medvedev's first steps as Russia's president.

Tartu University Professor and a Research Associate of the Estonian Foreign Policy **Piret Ehin** in her «**Political support in the Baltic States, 1993—2004**», maps trends in public support for Baltic political regimes during the transition period. Using a multidimensional model of political support, her article tracks trends in identification with the political community, approval of regime principles, evaluations of regime performance, and trust in political institutions.

This issue is concluded by the Belarusian rendition of «**The Cult**» by the Ukrainian writer **Lubko Deresh**, and «**The Three Concepts of Belarusian National Identity**» by **Pavał Usaŭ**, working in the field of political science. The author concentrates the reader's attention on the controversial opinions by Radford University professor Grigory Ioffe regarding Belarusian nationalism, national identity and the roots of the Lukašenka regime presented in «Culture Wars, Soul-Searching, and Belarusian Identity» (East European Politics and Societies. No. 21. 2007. P. 348—382).

ARCHE
ПАЧАТАК
5-2008

## У НАСТУПНЫХ НУМАРОХ

**СЬВЯТЛАНА МАРОЗАВА**

Тэхналёгія «ўзьяднаньня»:
апрабацыя на Беларусі (1780—1839)

**ЛАРЫ ВУЛЬФ**

Уніяцкая Царква і падзелы Польшчы: самазахаваньне канфэсіі ў век асьвечанага абсалютызму

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**

Дом творчасьці
Выбраныя месцы перапіскі з фрэндамі

**ЭДЎАРД Л. КІНАН**

Доўгачаканая кніга і гіпотэза аб Быкоўскім

**ТОМАС М. БОН**

«Адпор» і «сваволя» ў Менску
Нонканфармісцкія паводзіны ў Савецкім Саюзе

**ОСКАР ЎАЙЛД**

Саламея
Драма ў адной дзеі

**ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ**

Nobody's perfect

**ЁАХІМ ТАЎБЭР**

«Без саюзьнікаў».
Літоўская Тарыба і нацыянальныя меншасьці (1916—1918)